Школьная бібліятэка



# Роднай старонцы

*Школьная бібліятэка*

# *Роднай старонцы*

Зборнік твораў
канца XVIII — пачатку XX ст.

Мінск
«Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі»
2012

УДК 821. 161. 3-93
ББК 84(4Беи)
Р 60

Серыя заснавана ў 1965 годзе

*Для старэйшага школьнага ўзросту*

Укладальнік: *Т. Ф. Рослік*

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу
і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Р 60 **Роднай староньцы** : зб. тв. канца XVIII — пач. XX ст. : для стар. шк. узросту / уклад. Т.Ф.Рослік. — Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2012. — 272 с. — (Школьная бібліятэка).

ISBN 978-985-11-0648-2.

У зборнік уключаны празаічныя, паэтычныя і драматургічныя творы канца XVIII — пачатку XX ст., якія ўвайшлі ў скарбонку беларускай нацыянальнай літаратуры.

**УДК 821. 161. 3-93**
**ББК 84 (4Беи)**

**ISBN 978-985-11-0648-2**

© Рослік Т. Ф., укладанне, 2012
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», 2012

# Энеіда навыварат

Жыў-быў Эней[1], дзяцюк хупавы[2],
Хлапец няўвошта украсіў[3];
Хоць пан, але удаўсь ласкавы,
Даступен, вецел, неграбіў[4].
Ды грэкі вуйму[5] нарабілі:
Як ляда, Трою[6] ўсю спалілі.
Кашэль ён згробшы — наўцёк,
І, швыдка зробіўшы чаўнок,
Траянцамі яго набіў
Ды ў мора з імі ён паплыў.
Але Юнона[7], баба злая, —
Адроддзя панскага, ліхая! —
Шукала ўсё яго згубіць,
На дно у пекла пасадзіць.
За тое, бачыш, не ўзлюбіла,
Яго Венера[8] што радзіла.
Юнона воблак адапхнула
Ды з неба на мара зірнула —

[1] Галоўны герой паэмы «Энеіда» старажытнага рымскага паэта Вергілія.
[2] Лоўкі, спрытны.
[3] Прыгожы.
[4] Нефанабэрысты, негаварлівы.
[5] У сэнсе шмат, многа.
[6] Троя — галоўны горад Троады, разбураны грэкамі ў легендарную Траянскую вайну. (Троада — вобласць у Малой Азіі.)
[7] Згодна рымскай міфалогіі — багіня месяца, крыху пазней — багіня сямейнага дабрабыту, пакравіцельніца жанчын і шлюбу.
[8] Багіня кахання і хараства.

Плыве на чаўнаку Эней!
«Ах ты, някруціна[1], зладзей!
Вось я цябе скручу ў табаку,
Ражном у мора, як сабаку!»
Панёву[2] швыдка нахапіла,
Кашэль сачнямі[3] налажыла,
Ў калёсы села, пакацілась,
Якраз у Эола[4] апынілась.
Ўвайшла ў святліцу, села ў кут.
«Здаровы ўсе! Эол ці тут?»
Эол сядзеў тады ля печкі, —
Мязгу[5] скабліў на перапечкі
Ды лапці лыкам падплятаў.
Ён тут аборы падабраў,
Заткнуў за пояс кацатых[6],
Скаціўся з печы ў адзін міг.
«Здарова, свацейка Юнона,
Даўно цябе я не відаў», —
І тры ёй зробіўшы паклоны,
Мякотнага[7] на стол падаў.
Яна мякотнага паела,
Уцёршысь, так яму запела:
«Ці ведаеш маё ты гора?
Эней з траянцамі плыве.
Спіхні яго ты, сват, у мора, —
Няхай, паганец, воду п'е!
Мяркую, чуў: Эней — то зводнік,
Буянец, злодзей, канаводнік.
Траянцы такжа ўсе латрыгі[8],

---

[1] Прахвост, шэльма.
[2] Панёва — род жаночай вопраткі.
[3] Праснакамі, апрэснакамі.
[4] Эол — згодна старажытнарымскай міфалогіі — бог вятроў.
[5] Мякаць. Мязгой завецца і мяккая абалонь з дрэва і перацёртая моркаў, бульба.
[6] Драўлянае ці касцяное шыла, падкалаўка, падкавырка.
[7] Мяккага.
[8] Латрыга, латруга, лотр — распушчаны чалавек, распуснік, гультай, абібок.

Усе абібокі і юрыгі[1],
Іх трэба ўсіх са свету звесць!
Калі, сват, зробіш тую чэсць,
То я дзявухну украсіву,
Салодкую, як з мёдам сліву,
Табе за тое прывяду».
Эол расшупіў[2] тое дзела, —
З яго аж слюнка пацякла —
Любіў ён цешыць грэшна цела,
Дзявухна па нутру была.
Заскробся, барадой затрос,
Разгладзіў вусы, пацёр нос,
Зажыў у ноздру табаку,
Зачхаўся ўвесь, замармытаў
Ды рэч Юноне ён таку
З паклонам, віш ты, адказаў:
«Ах, вохці мне, мая Юнона!
Ніводнага ж нет ветру дома!
Што буду робіць я цяпер?
Барэй[3] з пахмелля, як вапер[4],
Ляжыць ў святліцы на казёнцы[5],
А Норд[6] учора з'ехаў к жонцы,
Зефір[7] з дзяўчатамі зайграўся,
А Эўр у батракі наняўся.
Як хочаш тут сабе гадай,
Але дзявухну дaставай!
А я ўсё зраблю, грамадзею!
Са ўсіх глуздоў іх сцебану,
З траянцаў выцісну алею,

[1] Назойлівыя, юрлівыя.
[2] Зразумеў, расшалопіў, разабраўся.
[3] Па старажытнагрэчаскай міфалогіі — сын зорнага неба і ранішняй зары, у пазнейшыя часы — паўночны вецер.
[4] Кабан, вепр.
[5] На лаўцы.
[6] Згодна рымскай міфалогіі — бог халодных паўночных вятроў.
[7] Па грэчаскай міфалогіі — бог самых моцных, імклівых вятроў Міжземнага мора; па рымскай — бог пяшчотнага, лёгкага ветрыку.

На дно у мора заганю!
Твайго ж пабольша ліхадзея,
Некрута гэтага Энея,
Я так папру яго вятрамі,
Аж булькаць будзе пузырамі,
Як сторч у вір ўсіх галавой
Намеснік[1] сцягне за сабой!»
І вось Эол, галень схапіўшы,
На паншчыну склікаць пачаў,
І ўсе ён ветры распушчаў,
Бурліць ім мора наказаў.
Калі хто відзеў, як Бакціха[2]
Нямецка піва задаець,
Яко яно падымець ліха,
Запеніцца ды розна прэць, —
От так і мора заравела,
Бублілась, пенілась, шумела.
Эней спалохаўся, ўсхадзіўся.
Матуз ад портак аж зваліўся,
Са страху й нюні распусціў
Ды, як у трасцы, ён завыў.
Траянцы ўсе казлы задралі,
Са ўсіх чаўноў яны гукалі,
Ў балоце быдта лісавей,
Ачухаўшысь, ўскрычаў Эней:
«О, цар-царэвіч, тат Нептун[3]!
Не буду прад табой брахці,
Змілуйся, мора ты зміры.
Картузнай[4] я прышлю цяртухі[5],

---

[1] Ужываецца тут у сэнсе «чорт», вадзянік.
[2] У Віцебскай рэдакцыі «Энеіды навыварат» Бакціха — прозвішча ўтрымальніцы піўнога пограба ў Бешанковічах Віцебскай губерні. У Смаленскай рэдакцыі «Энеіды навыварат» Бак — вядомы ў тыя часы півавар у г. Смаленску.
[3] Адзін з галоўных багоў рымскай міфалогіі, бог мора, пакравіцель мораплавання.
[4] Цудоўная, добрая, якая захоўваецца ў картузе.
[5] Нюхальнай табакі.

Сударскай[1] моцнае сівухі,
А грошы з тайстры[2] сам бяры!»
Нептун на грошы меў ахвоту,
Гарэлку добра ён сцябаў,
Пачуў, што будзе за работу,
На ветраў строга закрычаў:
«А вон, нячысты некруціны!
З якой фантазіі вы тут?!
Глядзі, скаштуеце дубіны,
І ноздры вам ражном утруць!»
Вось досыць ветрам тут дзякацца[3], —
З Нептунам зналі, які жарт, —
Дамоўкі сталі убірацца,
Як ад Кутуза Банапарт[4].
Тут раптам неба спагадзелась,
Усплыла сонейка, з'яснелась,
Эней, уцёкшы так ад бед,
Састрапаць загадаў абед.
Траянцы ўзяліся за ядзенне,
Як з поля панскія харты[5]
Была ў іх з затаўкай крупеня,
Кулагу[6] пхалі ў жываты;
Была ў іх гушча і драчона[7],
І парасяціна смажона.
Пілі гарэлку не каўшом —
Цягнулі ўволю ўсе набгом.
Усячыны панасцябаліся
Ды на палацях спаць паклаліся.
Венера з кірмашу вярнулась

---

[1] Гасударскай, царскай.
[2] Тайстра — кайстра — вешчавы мяшок. (У тэксце ўжыта ў сэнсе грашовы мяшок, каліта.)
[3] Здзекуецца.
[4] Ад Кутузава Банапарт.
[5] Гончыя сабакі.
[6] Ежа, прыгатаваная з густа заваранай жытняй мукі.
[7] Драчона і гушча — каша з ячменных круп, адна з дробных (драных), другая з цэлых.

(На Ушэсці[1], відзіш ты, была)
Ды аб Энеянку дачулась,
Юнона як яго спрагла[2].
Андрак з насоўкай апранула,
З падплётам ўздзела кавярзні[3],
Анучкі рабыя абула,
Як быццам войта[4] селязні;
Твар сыраваткаю абмыла,
Кужэльны ўздзела балахон,
Папранік[5] ў хустачку ўлажыла —
Пайшла да Зеўса[6] на паклон.
А Зеўс тады сядзеў у клеці,
Гарэлку з мёдам там сцябаў,
Без сораму, як малы дзеці,
З падоння пальцам калупаў.
Прыйшла Венера і завыла,
Саплямі змазала ўсё рыла
Й так зазюзюкала яна:
«А чым перад табою, бацька,
Мой абмішуліўся[7] дзіцяцька?
Зюкні, яка яго віна?
Не ўвідзяць Рыму яго вокі,
Калі Юнону не уймеш!
Звядуць на ростанях сарокі,
Сатрэць яна яго ў кулеш».
Тут Зеўс, гарэлачку дапіўшы,
Ражком ў халяву пастучаў,
Цяртухі моцнае зажыўшы,
Таку гаворку распачаў:

[1] Ушэсце — рэлігійнае свята (Вознесенне).
[2] Змучыла, стаміла, выматала.
[3] Лапці.
[4] Галоўны начальнік павета або сельскай акругі; у часы прыгону — сельскі стараста.
[5] Абручык, абцягнены матэрыяй, які спецыяльна адзяваўся на галаву пад хустку.
[6] Згодна старажытнагрэчаскай рэлігіі, Зеўс — галоўны бог, бог багоў.
[7] Праштрафіўся, памыліўся.

«Дапрэ Энеянка да Рыму
І будзе тама ён царом.
Палепшы Чыжаўскіх харом[1]
Паставіць каменны палаты.
Паны ж не будуць там багаты,
Свае чаны ён завядзе.
І ўсё на водкуп забярэ.
Цяпер завернець к Карпагені[2]
(Ў Дыдоны[3], відзіш, талака),
Папрэ уволю ён смажэні,
Ад'есца з добрага быка,
Папарыцца ён там у бані,
Падпусціць хвігля самай пані,
Закруціць моцна галаву —
На любжу[4] прывядзе ўдаву.
Ідзі, дачухна, не турбуйся!
Ды скорамам, глядзі, не псуйся!
Ні з кім саромна не клянісь
І ў Сташкаў Нілу[5] пакланісь!»
Венера тут яму прысела,
Хранцуз паненак як вучыў,
Пайшла, вясельную запела:
Зевес ёй вельмі дагадзіў.
Эней пачухаўся, паскробся,
На ногі лапці падвязаў,
З палацей да кута дагробся
Ды плыць надкорніку казаў.
Плыў, плыў, аж уваччу зазелянелась,
І мора горш ад талакна прыелась —
Ён ведзьмай на яго глядзеў.

---

[1] Палацы князя Пацёмкіна ў маёнтку Чыжова Духаўшчынскага павета, на Смаленшчыне.
[2] Карфагену.
[3] Дыдона — міфалагічная заснавальніца Карфагена.
[4] Да згубы; любжа — атрутная расліна.
[5] Ніл (Сталобенскі) — кананізаваны царквой святы, кляштар якога быў на востраве Сталобіным за сем вёрст ад горада Асташкава Цвярской губерні.

А там пачаў ужо здзікацца
Ды так ні к чому стаў злавацца,
Што я й пісаць тут не пасмеў.
Казаў, што «лепш бы на пагосце
Схаўтурылі мае там косці,
Дарэмна з Троі пакруціўся
Ды валачобнічаць пусціўся».
Ён з гора піпку запаліў,
Ў балону галаву спусціў.
Аж зірк у мора — і сказіўся,
Запеў «Ізбранную»[1], заксціўся:
«Глядзеце, братцы, вунь сяло!»
Тут ўсіх за сэрца узяло.
Якраз на бераг прывалілі,
За плот чаўнок свой прыкруцілі,
Па шклянцы выпілі сівухі,
Паелі нашча саладухі[2],
Камоў з смятанай і глазухі[3],
Пайшлі у горад пагуляць.
Бягуць, як батракі з прыгону,
А ім ў варотах тыц — Дыдона
Ды стала так на іх казаць:
«Глядзі, які ж то абарванцы!
Ці смоль[4] вы з Шчучча[5] вязіцё?!
Ай вы, духоўскія цыганцы!
Курэй з-пад клецця крадзіцё?!
Чаго сюды вас прыкруціла?
Я й так дзесяцкага прыбіла,
Што ён распраўшчыны не знае
Ды без пашпартаў ўсіх пускае».
Як валасні[6], закапашыліся,

---

[1] Малітву «Взбранной воеводе».
[2] Ежа, прыгатаваная з жытняй мукі; рэдка разведзенае цеста, ледзь заквашанае.
[3] Камы — цёртая вараная бульба, глазуха — яешня.
[4] Смалу.
[5] Назва мясцовасці на Смаленшчыне.
[6] Чарвякі.

Пластом траянцы павалілісь,
Сачэнь[1] Дыдоне падняслі,
Таку гаворку зацяглі:
«Мы ўсе з траянскага прыходу,
Сударскі перад тым былі,
Ды ўвосень прошлага мы году
Ад грэкаў ў мора уцяклі.
Эней канторшчыкам у нас,
Пашпорты дзержыць Апанас.
Газеты ж, панюхна, ты маеш:
Спраглі як Трою, аб тым знаеш, —
То нечага табе й казаць.
О, артыкульная[2] Дыдона!
Ты нас у крэпасць запішы[3],
Ў нядзелю роб сабе два згоны —
Мы робіць будзем дадушы!
Мы ўсяку паншчыну смякаем:
У бровара глядзець як, знаем,
Загнеткі[4], сундукі рабіць,
На бочкі абручы набіць.
Піліп наш лепіць гарлачы,
Пракоп жа ступы, таўкачы,
А Саўка зелле ўсяка знае,
Дзяцём ён вогнік адклікае,
Хупаў бабамі варажыць
І скурапеею[5] адхадзіць.
Глядзі, як мы парасшарпаліс,
Аж сорам свеціцца наскрозь,
Ўсе лапці розна растапталісь,
Сарочкі чорныя, як вось.
Калі ўжо ласка твая будзець, —
Вялі нам лазню пратапіць!

[1] Апрэснак. Тут у сэнсе «хлеб-соль», прывітальны падарунак.
[2] Тут у сэнсе высокапастаўленая.
[3] Залічы ў прыгон, у прыгонныя.
[4] Ачагі, камінкі пры печы, куды выграбаюць жар.
[5] Скураную хваробу.

Адзежу трэба нам папрудзіць —
От так кішаць, няможна жыць».
Дыдона румзала і выла.
Цякло, як з лівера[1], з вачэй;
Маністы дзёргала, круціла,
А сэрца — тых-тых-тых у ей!
Яна ўжо чула пра Энея,
Што з гулькаю ў яго і шэя,
Што волас ў галаве скруціўся,
Што нос казюлькай раздваіўся, —
То шупіла[2], які тут смак.
І вось кляўшыла[3] яна так:
«Калі б Эней ваш схамянуўся
Ды сам ка мне ён падвярнуўся, —
Усячыны б тады дастаў...»
Ён — шмык, як быццам з неба спаў!
Ўзышлі ў святліцу, пераксцілісь,
Эней і «Вотча»[4] прачытаў.
За стол ўсе порадам садзілісь,
Мялянік[5] на стале ляжаў.
Дыдона варыва ўлівала,
Шматкамі мяса ў місы клала
І забяляла малаком.
Трупаціла яна крупеню,
Яечню, руднік[6], жур[7], смажэню,
Каму пячэню з часнаком;
Былі й салодкія пацешкі:
Вяземскі пернікі, арэшкі,
Мязгі й мязюму[8] рашаты.

[1] Пасудзіна, звычайна цыліндрычнай формы, маючая дзве невялікія адтуліны.
[2] Здагадвалася, разумела.
[3] Гаварыла, казала.
[4] Малітву «Ойча наш».
[5] Пірог.
[6] Кісель.
[7] Мучны кісель.
[8] Ізюму.

Дуда вярлюем[1] тут равела,
Сапелка[2] гусыняй шыпела,
Скрыпелі скрыпкі, як каткі,
Дзявухны галасу гукалі,
Вясну малоданькі склікалі
І жарты розныя рабілі:
Казу святочную вадзілі,
З загнеткі лося забівалі,
Дугу у браму прадзявалі, —
Пустоты ўволеньку было!
Расхарапушыўся[3] Эней,
Аж іскры сыплюць ад лапцей...

[1] Мядзведзем.
[2] Дудачка накшталт жалейкі.
[3] Разышоўся.

**Адам Міцкевіч**

# Гражына

*Літоўская аповесць*

Штораз цямней, праймае золкі вецер,
Туман ля споду, а ўгары высока
Між чорных хмараў у сівым прасвеце
Няпоўны месяц сонна жмурыў вока.
І свет здаваўся велічэзным гмахам,
А неба ў ім жывым скляпеннем-дахам,
А месяц тым акном, адкуль дзень свеціць.

З гары высокай замак Навагрудка,
Ад месяца прыняўшы пазалоту,
Праз насыпы і рова развароты
Адкідваў ценю слуп, руды і гнуткі,
Глыбока ўніз, туды, адкуль з цясніны
Вада ўздыхала з-пад глыбокай ціны.

Агні ўжо згаслі ў горадзе і замку,
І толькі зрэдку адгукнецца варта
То з вежы, то з другога дзесь напрамку.
Ды вось зблiжацца стала штосьці шпарка:
Якіясь людзі на шляху маячаць,
За кожным цень чарнее сукаваты.
Імчацца хутка — коннікі, няйначай,
А свецяць іхнія, напэўна, латы.
Заржалі коні, грукнула падкова:

Тры рыцары праехалі ўздоўж рова,
Спынілі бег, і першы з іх ударыў
З латуннай трубкі голасам аб хмары,
А потым загрымеў другі раз, трэці.
І з вежы рог адказваў цвёрдым гукам.
Завала бразнула, вось факел свеціць,
І мост пад'ёмны заскрыпеў, загрукаў.

На тупат конскі падбягае варта
Пабачыць рыцараў чужых і зброю.
На першым панцыр быў з выдатным гартам
Якія немцы надзяваюць к бою,
І чорны крыж на белай меў накідцы,
І крыж нагрудны ў залатой пятліцы;
Кап'ё тырчала, ззяла трубка ў змроку,
Мігцеў ружанец, меч блішчаў ля боку.
Пазналі госця ўсе па гэтых цацках,
Адразу зашаптала грамада ўся:
«Дык гэта ж цюцька з псярні злой крыжацкай! —
Пузач, крывёй бо прускай упіваўся.
Каб тут вачэй было не так багата,
Уміг скупаўся б у балоце плюха —
Пад мост я ўпхнуў бы чуб пыхліва ўзняты!»
А ён, нібы не чуе, верне вуха,
Ды зразумеў усё, бо дзіву даўся —
Ў людской гаворцы, мабыць, разбіраўся.

«Ці князь у замку?» — «Ёсць, але такою
Парой яго трывожыць немагчыма,
Бо нельга парушаць яго спакою,
Вось заўтра...» — «Заўтра? Не! Ніякім чынам!
Хоць позні час, але ідзіце скора
І пра пасольства князю далажыце.
Прымаю на сябе гнеў Літавора.
Пярсцёнак гэты толькі пакажыце,
І досыць, бо як знак ён гэты ўбачыць,
Пазнае, хто я, што прыезд мой значыць».

Навокал ціша. Замак спіць спакойна.
Якое ж дзіва! Поўнач, час асенні.
Чаму ж у Літаворавых пакоях,
Як зорка, лямпа разганяе цені?
Вярнуўся сёння — недзе быў далёка,
Спачынак трэба зморанаму воку.

А ён не спіць. Паслалі вартавога:
Не спіць. Але не знойдзецца ў палацы
З паноў і дворні ўсёй такога,
Хто б смеў к яго парогу набліжацца.
Дарма пасол і лаецца і просіць —
Ды просьбы і пагрозы тут без сілы.
Нарэшце Рымвіда будзіць рашылі.
Ён волю пана носіць і заносіць,
Ён першы ў радзе, ён найлепшы рыцар,
Яго князь называў другім сабою.
У полі, ў замку кожнаю парою
Ён права меў да князя даступіцца.

Пакой у змроку. Са стала іскрынкай
Бляск цьмяны каганца рассейваў цені,
А князь хадзіў наўкол бесперапынку,
Пасля на месцы стаў у задуменні.
Пра немцаў Рымвідавых слоў нямнога
Паслухаў, ды не адказаў нічога.
Бялее, чырванее і ўздыхае —
Відаць, грызе яго туга ліхая.
Ідзе да лямпы, каб яе паправіць,
І, быццам кнот сціраючы, нагладка
Агеньчык прытушыў, замест убавіць,
Не ведаю, сумысля ці выпадкам.

Відаць, не мог пазбыць з душы цяжару
І весялейшым трохі паказацца,
А не хацеў, каб з постаці і з твару
Слуга пра справы пана мог дазнацца.
Зноў абыходзіць стаў пакой наўкола,

Але, калі мінаў акна квадраты,
Відаць у бляску месячнага кола,
Якое ў шыбы лезла цераз краты,
Чало, наморшчанае невясёла,
Зацяты рот, і вока бляск суровы,
І сумны твар, і ссунутыя бровы.

Пасля падаўся ў кут і сеў паспешна,
Старому загадаў прыстукнуць дзверы
І, маскіруючы свае намеры,
Загаварыў панура і з насмешкай:

«Ты ж з Вільні вестку сам прывёз, Рымвідзе,
Што Вітаўт, пан наш моцны і ласкавы,
Рашыў мне княскі трон аддаць у Лідзе:
Мае па жонцы землі і дзяржавы,
Нібы свае ці з ратнага набору,
Свайму слузе рашыў даць — Літавору».

«І гэта праўда, князь...» — Таму, з увагі
На дар, яго брацць будзем урачыста:
Ты дай загад сцягі ўзяць для павагі,
Хай факелы палаюць прамяніста.
Дзе трубачы? Няхай, хоць час паўночны,
Ідуць у горад, стануць там на рынку,
І трубяць хай усім вятрам у вочы,
І трубяць хай датуль бесперапынку,
Пакуль усіх вайскоўцаў не разбудзяць.

Хай кожны зразу возьмецца за зброю —
Рыхтуе пікі і мячы да бою.
Каб мелі харч як коні, так і людзі.
Жанчыны хай парупяцца, каб есці
Хапіла кожнаму на дзень, да змроку.
Чый конь на пашы, зараз жа прывесці
І захапіць на цэлы дзень аброку.
А як з-за Шчорсаў выплыве світанне
І бліснe над магілаю Мяндога,

На Лідскай вуліцы хай войска стане,
Статут вайсковы захаваўшы строга!»

Так кажа князь. Як быццам бы размова
Была звычайная перад паходам,
Але чаму загад раптоўны, з ходу?
Чаму князь гэткі змрочны і суровы?
Чаму ў гаворцы ён за словам слова
Так сыпаў, быццам іх за раз раскіне?
Ды, мабыць, іх не сказана й паловы,
А рэшта, стоеная, ў сэрцы стыне.
Благое штось задумаў ён, дый годзе!
І голас з думкаю ў яго не ў згодзе.

І князь замоўк. Здавалася, чакае,
Што Рымвід пойдзе выканаць загады,
Ды той маўчыць, мо спосабу шукае,
Як думкам раптам зблытаным даць рады?
Хоць ён яшчэ не ўсё і разумее,
Ды праўду горкую адчуць умее.

А што ён зробіць? Князя добра знае
І ведае, што ён не мае вуха
Да нечых слоў, парады адхіляе,
Намеры носіць у глыбінях духу,
А як рашыў што, дык на перашкоды
Ніякай не звяртае больш увагі.
Ды Рымвід, верны князю назаўсёды,
Разумны ў радзе, слаўны сын адвагі,
Лічыў за ганьбу ў справу не ўмяшацца,
Дабра з якое век не дачакацца.
Маўчаць ці радзіць? — мучыла пытанне,
Але не доўгае было ваганне.

«Мой пане, да гульні ў нас і да бою
Заўсёды коні знойдуцца і людзі.
Адно скажы — і пойдзем за табою,
Ніхто пытаць, задумвацца не будзе!

І Рымвід твой не застанецца ззаду.
Ды меркаю аднолькавай не мерай
Людзей з натоўпу, з масы цёмнай, шэрай
І тых, што могуць даць табе параду.
І бацька твой, хоць і любіў самотна
Выношваць план, намер якісьці новы,
Ды перш чым меч падняць, склікаў ахвотна
На раду ў замак мудрыя галовы,
Дзе й я не раз выказваў проста, смела
Усё, што знаў, што ў сэрцы набалела.
Дык сёння мне прабач за шчыры голас,
Скажу, што думка вуснам падказала.
Я доўга жыў, і мой ссівелы волас
І спраў, і часу перажыў нямала,
Таму і бачу (толькі б не са шкодай!),
Што новай жыць збіраешся ўжо модай.
Калі ты ў Ліду вырушыш з паходам,
Каб там замацаваць сваю уладу,
Дык твой паход, падобны да нападу,
Разлад пасее між тваім народам:
Здабычы гэта частка пажадае,
А ў кайданах апыніцца другая.

Пасее вестка новых чутак зерне,
А вушы схопяць, праўду перайначаць,
А вочы ўжо згарчэлы плод убачаць,
Які знявечыць згоду, праўду зверне,
Бо скажуць між сваіх і за мяжою,
Што ты захопнік, прагны на чужое.

Інакш рабілі, добра памятаю,
Князі літоўскія ў былыя годы,
Сталіцу пераносячы. Святая
Іх памяць застанецца назаўсёды.
Калі ты хочаш жыць старым парадкам,
Дык мне даверся, і ўсё пойдзе гладка.

Спачатку мы ўсім рыцарам абвесцім:
Няхай і тыя, што паблізу тутка,
І тыя, што жывуць у сёлах дзесьці,
Збіраюцца ў сталіцу нашу хутка.
Радні, панам загад дамо прывесці
Дружыны для бяспекі і аздобы
Тваёй шаноўнай княжацкай асобы.
Пакуль яны збяруцца, я тым часам
Магу наперад ехаць заўтра рана,
Забраўшы слуг з сабой і капелана,
З усім патрэбным на банкет запасам,
Каб загадзя ўжо быць сярод народу,
Сачыць, каб мяса ўсім хапіла й мёду.
Бо не адны рамеснікі, сяляне,
Але і панства ласа на прысмакі.
А як твая ўсім шчодрасць бачнай стане,
Тут ты якраз даслужышся падзякі.
Заўсёды так было ў Літве і Жмудзі.
Не верыш, дык спытай, хай скажуць людзі!»

Закончыў, стаў к акну, прамовіў з ходу:
«Падняўся вецер вунь, на непагоду.
Якісьці конь стаіць там каля вежы,
І рыцар на сядло успёрся збоку,
Два — коней водзяць там непадалёку.
Паслы нямецкія — відаць з адзежы.
Паклікаць іх? Ці, можа, воля пана
Цераз слугу ім будзе пераслана?»

Сказаўшы гэта, фортку зачыняе,
Нібы знячэўку побач аказаўся,
Аднак паслоў тых словам закранае,
Каб князь пра іх таксама адазваўся.

Тут Літавор такім прамовіў словам:
«Калі звяртаюся я ў чым па раду,
Сваёй не верачы, к чужым галовам,
Цаню я больш за ўсё тваю параду,

Бо ты даверу варты, чалавеча:
Юнак у бітве, ў радзе ты — старэча.
Хоць адкрываць я не люблю бясконца
Таемных спраў сваіх чужому воку —
Намер, які народжаны у змроку,
Да часу нельга выстаўляць на сонца —
Падрыхтаванае няхай павісне
І, як пярун, ударыць перш, чым блісне.
Я коратка пытанні ўсе збываю:
«Калі?» — «Ужо». — «Куды?» — «На Русь. Да Жмудзі»
«Не можа быць!» — «Павінна быць, і будзе!»...
Табе ж душу цяпер я расхінаю.

Таму загады я такія выдаў,
Таму іду раптоўна і пры зброі,
Што Вітаўт нездарма стаіць пад Лідай —
Намер нядобры, ведаю, ён тоіць:
Задумаў ён мяне ў свой стан занадзіць,
Каб там забіць. Збіраўся, словам, здрадзіць.

Ды ў нас з магістрам Ордэна тэўтонаў
Заключан дагавор: ён мне за збожжа
Сваёю збройнай сілаю паможа
Забраць, што нам належыць па законе.
Калі паслы магістравы за ровам,
Дык гэта знак, што ён трымае слова.
І перш чым згаснуць зоры Задыяка,
Мы вырушым, а недалёка ў полі
Прымкнуць да нас тры тысячы ваякаў
На конях і пяхоты значна болей.
З яго дазволу, пры самім магістры,
Я выбраў крыжакоў прыдатных к бою —
Вялікіх, дужых і на конях быстрых,
У панцыры закутых з галавою.
У сечы кожны з іх мастак вялікі
І лепш за нашых ужываюць пікі.

А ў кнехтаў ёсць жалезныя гадзюкі,
Якіх накормяць волавам і сажай,
На ворага ўзвядуць, узяўшы ў рукі,
І дражняць іскрай. Гад агонь развяжа
І б'е ці раніць з перуновым гукам
Таго, каго стралок яму пакажа.
Так, трапіўшы ў агонь такі шалёны,
Наш прадзед Гедымін паў ля Велоны.

Гатова ўсё. Пара даўно настала,
Цяпер жа Вітаўт, пэўны ў сваёй сіле,
Трымае ў Лідзе абаронцаў мала,
Дык нам ускочыць толькі і — накрылі!»

І Рымвід пад ударам гэтай весці
Стаяў знямелы ад здзіўлення, ў жалі,
А думкі спрэчным гуртам налятталі,
Дык зноў стараўся іх да ладу звесці.
Ды справа пільная — далоў чаканне!
З вялікай крыўдаю прамовіў: «Пане!
Я не магу сваім вушам даць веры!
На брата брату трэба ўзняць далоні?
Вось ён на немцах вышчарбіў сякеры
І вострыць іх супроць сваіх сягоння!
Нязгода — зло, ды скончыцца бядою
Яднанне гэта. Мы ж — агонь з вадою!

Бывае часам, што сусед суседа,
З якім ці мала год прабыў у злосці,
Абдыме, змякчыць сэрца напаследак,
І сябрам назаве, і клікне ў госці.
Шмат горш, аднак, чым гнеўныя суседзі,
Жывуць з сабою ліцвіны і ляхі,
Ды і яны ў супольнай п'юць бяседзе,
Адны спачынак іх вартуюць дахі,
Мячы іх лучацца ў супольных войнах.
Але шмат горш, чым ліцвіны й палякі,
Спрадвеку ў нас не могуць жыць спакойна

І ўсцяж ваююць людзі і вужакі.
Аднак калі ліцвін к сабе ў парогі,
Як госця добрага, прымае вужа
І для хвалы багоў, пакінуўшы трывогі,
Яго ён корміць, дах дае для сцюжаў,
Тады паўзе яму гад свойскі ў рукі,
З ім разам п'е і есць з той самай міскі,
І мірна цела доўгае гадзюкі
Дзіця спаўе, улезшы ў глыб калыскі.

А вось змяі крыжацкай не аблашчыш,
Ні просьбай, хабарам, хоць лезь са скуры.
Ці ж мала ўперлі прусы і мазуры
Зямлі, дабра, людзей у тую пашчу?
Пажэрла столькі ўжо, а не зарвала —
На рэшту квапіцца, і ўсё ёй мала!

Калі мы не з'яднаемся, загінем.
Дарма штогод наладжваем паходы,
Іх вёскі палім, крышым іх цвярдыні,
Пракляты Ордэн верх бярэ заўсёды!
Ён змей, якому галаву ссякаюць,
Замест якой дзесяткі адрастаюць.
Усе адсеч! Дарма той траціць сілы,
Хто хоча прымірыць нас з крыжаносцам!
Зайдзі ў палац, зірні ў будан пахілы,
Не знойдзеш больш ні ў горадзе, ні ў вёсцы
Таго, хто б іх хлусні даў веры,
Каб іх не абмінаў, як той халеры,
Каб не сказаў, што лепш загінуць сёння,
Чым іхняй дапамогі дачакацца.
Жалеза лепш гарачае ў далоні
Сціскаць, чым з немцам за руку вітацца!

Што Вітаўт страшыць? Ці ж без чужаніцы
Не зможам разгарнуцца мы ўжо ў полі?
Ці ж справа ўжо дайшла да той граніцы,
Што не рашыць яе па добрай волі?

Ці ж самі мы не ўрадзім анічога,
Збярогшы зброю нашу на чужога?
Чаму ты ўпэўнены, што тыя словы
Пра Вітаўтавы здрады і намеры
Не выдумка, не закід нейкі новы?
Пашлі мяне да князя, я праверу,
Адновім дагавор...» — «Пакінь, Рымвідзе,
Мы знаем Вітаўтавы дагаворы.
Такі дзьмуў вецер на яго йшчэ ўчора,
А сёння іншае на думку прыйдзе.
Я ўчора верыў, што ён праўду кажа,
Што можна Ліду браць мне на ўладанне,
А сёння ён другое штосьь наважыў.
Прыкмеціўшы, што войска ў нашым стане
Паменшала, бо частку я адклікаў,
Стаіць пад Вільняй з сілаю вялікай
І весткі распускае, што лідзяне
Мяне прыняць за пана не схацелі.
Ён хоча Ліду ўзяць сабе! Круцель ён!
А мне ўжо быццам іншы край дастане!
Русь, пэўна, голую! Варагаў багны!
Бо, па-ягонаму, там наша месца.
Ён гоніць нас, братоў, але аб'есца,
Сціскаючы Літву ў кулак свой прагны!
Глядзі, што робіць! Як стаў падбірацца:
Ён б'е ў адно, хоць цераз дзве дарогі.
Адзін хацеў бы над усімі ўзняцца
І ўсю раўню зваліць сабе пад ногі.
Ці ж мала, што краіны нашай людзі
На конях дзень і ноч з ягонай ласкі?
Скаваныя жалезам нашы грудзі,
І да галоў папрыраcталі каскі.
На бітву з бітвы, у паход з паходу,
Мы ўжо ўвесь свет аб'ехалі наўкола:
На крыжакоў або на Татры-горы
Ішлі трафеі браць у польскіх сёлах,
Адтуль ізноў па стэпавым прасторы
Ганялі мы вандроўнага Магола.

А што багацця з замкаў наламалі,
Чаго не знішчыў меч з дабра чужога,
Ці голад не даеў, з агню дасталі —
Зганялі, неслі ўсё к яго парогам.
Ён з нашай працы сілай абрастае.
Ад фінскіх водаў да Хазараў мора —
Яго зямля з народам і пустая!
А як жыве! Які ягоны горад!
Нямала ў немцаў замкаў, безумоўна,
Каб бедны прускі люд аблытваць страхам,
Ды не зраўняцца з Вітаўтавым гмахам,
Ні з віленскім, ні трокскім на азёрах!
Прыгожая даліна ёсць пад Коўнам,
А як па ёй русалкі ўвесну, ўлетку
Траву рассцелюць ды рассыплюць кветкі,
Не знойдзеш прыгажэйшай на ўсім свеце.
Павер мне! У Кейстутавага сына
Свяжэйшая трава і кветкі ў клеці!
Падлога гэткай выслана тканінай,
На сценах гэткія вісяць фестоны
Усё з золата і кветак палымяных...
Не лепшы, можа, твор багінь натхнёных,
Чым творы працы ляшскіх паланянак.
Шкляныя шыбы ў вокнах, дзёрзка ўзнятых,
Прывезеныя з далечаў бясконцых,
Блішчыць, як бляха панцыраў багатых
Або як Нёман пад вачыма сонца,
Калі прагляне з-пад снягоў пухнатых.

А я што маю за турботы й раны?
За тое, што з дзіцячых год, з малога,
З пялёнак быў у панцыр закаваны,
Я — князь, нібы татарын, жыў убога?
У сядле ўвесь дзень, не спаў як след ніколі,
Ці раз прастойваў ноч усю ў засадзе,
А ўранні зноў бег па крывавым полі.
Равеснікі ж мае якраз у садзе
Яшчэ скакалі на кіях, калолі

Адзін другога пікамі з лучыны
Пад вокам маці ці сястры-дзяўчыны,
Якіх ваеннай цешылі забавай.
А я татарына ўжо гнаў з айчыны
Ці супраць ляха выступаў са славай.

А вотчына мая з часоў Эрдвіла
Каб хоць на пядзю пашырэла.
Зірні вунь: вал дубовы пакрывіла,
А цэгла ў сценах дома пачарнела.
Прайдзі пакоі — ўсё, як за вякамі!
Дзе шкло ў мяне? Трафеі дзе з металаў?
Заместа золата — вільготны камень,
Замест кілімаў — мох расце з парталаў!
Што вынесці жадаў я з кожнае выправы?
Багацце? Не. Нічога, апроч славы!

А славаю вышэй за ўсе галовы
Узняўся Вітаўт і заняў высоты!
Яго імя, нібы імя Міндовы,
Сягоння славяць нашы вайдалоты.
У гуках песні ці на струнах звонкіх
Вякамі Вітаўт будзе жыць, не змеркне!
А вось пра нас ці будзе хоць гамонкі?
Хто з забыцця імёны нашы верне?

Мы не зайздросцім. Ворагу для згубы
Няхай расце сабе ў багацці, ў славу,
Але хай прагныя не точыць зубы
На тое, што належыць нам па праву.
Ці ж так даўно, у часе міру, згоды
Ад гвалту здрыганулася сталіца?
Ці ж так даўно ён скарыстаў з нагоды,
Каб з вотчын сына Ольгерда пазбыцца
І завалодаць імі? Уладу любіць!
Яго ганец, нібы пасол Крывейты,
Князёў скідае, узвышае, губіць!..
Пара ўжо кончыць з гэтым, зразумей ты!

Больш на сабе мы ездзіць не дазволім!
Пакуль дыханне мне уздымае грудзі,
Пакуль рукі жалеза слухаць будзе
І конь крылаты будзе несці полем —
Той конь, якога з крымскага паходу
Я ўзяў сабе і даў табе другога,
А дзесяць іншых роўнага ім ходу
Раздам, хай толькі прагучыць трывога,—
Пакуль мой конь... пакуль магу яго я...»
Тут гнеў здушыў яму і дух, і словы.
Замоўк, ды раптам зазвінела зброя,
Ускочыў, задрыжаў, на ўсё гатовы.
Які ж прамень заззяў над ім высока?
Як зорка, адарваная ў блакіце,
Ляціць і жар страсае з доўгай ніці,
Так меч пад столь шугнуў і ў момант вока
Падлогу секануў, аж ад удару
Азваўся камень іскрамі пажару.

І зноў глухое надышло маўчанне,
Ды князь сказаў: «Дарэмныя размовы,
Вось ноч ужо даходзіць да паловы,
Другое пеўняў блізіцца пяянне...
Загад вядомы: будзьце ўсе гатовы,
Я лягу, адпачыну трохі духам,
Бо цела так адольвае знямога.
Тры дні не спаў! Хоць звонку цёмна, глуха,
Ды маладзік святлом пальецца з рога,
На досвітку ж чакае нас дарога.
Нашчадкам Кейстутавым горка выйдзе —
Пакінем попел ім, руіны ў Лідзе».

Сказаўшы гэта, сеў, рукамі пляснуў —
Так клікнуў слуг, каб распраналі,
А потым лёг, знак даўшы адначасна,
Каб Рымвід не затрымліваўся ў залі.
А той, убачыўшы, што ўжо нічога
Яго прысутнасць больш не дапаможа,

Падаўся тут жа моўчкі да парога —
Дружыну рыхтаваць у падарожжа.

Перш даў загад трубіць на збор ваенны,
А потым скіраваўся зноў у замак.
Чаго? Прасіць загадаў тых адмены?
Ды не. Цяпер узяў другі напрамак,
Ідзе туды, дзе замка выступ цёмны
Крылом заходзіў аж за мост пад'ёмны,
Дзе быў княгініных пакояў ганак.

А жонкай князевай была ў час гэты
Гражына, з княства Лідскага князёўна.
Яе назвалі так, бо, безумоўна,
У ёй былі ўсе прыгажунь прыкметы.
Хоць выйшла ўжо з пары жыцця дзявочай
І ля паўдня жаночых год стаяла,
Краса княгіні кідалася ў вочы —
Яе аблічча дзве красы злучала.
Павагай здзівіць, свежасцю прывабіць,
І бачыш быццам і вясну і лета:
Румянец кветкі ўсё той самы, мабыць,
Хоць спее плод, на сонейку сагрэты.
Не толькі твар такі знайсці не проста —
Яна адна ў сталіцы і ў палацы
Раўняцца можа з Літаворам ростам
І станам стройным можа з ім раўняцца.
І пара княжая, калі часамі
Яе абступіць чэлядзь грамадою,
Нібы таполі горда над лясамі,
Ўзнімаецца высокай галавою.

Падобная ва ўсім аж да драбніцы,
Яна і сэрцам мужа паўтарала,
Любімыя заняткі маладзіцы
Не раз адкладвала і зброю брала.
Не раз на жмудскім скакуне гарачым
Ў рысінай шапцы, у мядзведжай свіце

Паміж стралкамі, як сапраўдны віцязь,
Бывала, полем ці дарогай скача.
На ўцеху мужу часта ў той адзежы
Сустрэчных абазнацца прымушала,
Не раз ад варты ці з высокай вежы
Пашану княскую яна прымала.

Вось так, з'ядналая любоўю, згодай,
Яна развеяць князеў смутак можа
І дзеліць з ім не толькі сэрца, ложак,
Але і справы ўлады над народам.
Вайна і суд, паход ці змова
Залежыць часта ад княгіні слова,
Хоць гэта іншым цалкам невядома.
Княгіня не раўня была кабетам,
Якія ўладаю сваёй над домам
Не могуць не хваліцца перад светам.
Яна перад чужым таіла вокам,
Якую сілу ў сэрцы мужа мела,
І мала з тых, што там жылі, пад бокам,
Пра гэта знала, праўду разумела.

А вось стары разумны Рымвід ведаў,
Дзе ёсць яшчэ адзіная апора,
І ён княгіні стаў выкладваць скора,
Што думаў і што з княжай знаў бяседы:
Тут выйдзе даўніх звычаяў абраза
І ганьба ўсім ад князевых наказаў.
Гражына вестку прыняла з трывогай,
Але яшчэ валодае сабою,
Нібы не верыць доказам старога,
Не паказаўшы тварам неспакою.
«Не ведаю, — сказала, — я, ці многа
Жанчына зробіць князевай рукою.
Вядома мне, што ён і без парады
Умее бачыць і даваць загады.
Калі, аднак жа, ўспыхне гневу бура
І сэрца князева трывожыць будзе,

Калі, як робяць маладыя людзі,
Ён пойдзе следам за сваёй натурай,
Пакіньма. Час і ціхая заўвага
Раз'ясняць думкі і запал астудзяць,
Сатрэ няпамяць, сказанае блага.
Дык хай за ім пабудзе перавага».

«Прабач, княгіня! Тут не тыя словы,
Што па гарачай выскачаць хвіліне,
З якіх пасля не помніцца й паловы.
Тут не такі намер, што ў блытаніне
Жаданняў, дум з'явіцца ўміг гатовы
І, нібы дым, закружыцца і згіне.
Бо іскры — знак, што дух палае жыва,
А дым — прадвеснік жудаснага ўзрыву!

Не сёння я ля княжае асобы —
Дванаццаць год прабыў яго слугою,
Але не памятаю нават спробы
Так доўга, шчыра гутарыць са мною.
Загад пайшоў, хоць нам не даспадобы,
Каб зрання, перад зоркаю другою,
Сабрацца к Перасекавай магіле
Усёй дазвання нашай збройнай сіле».

«Што чую! Заўтра? Заўтра ўжо ён едзе?
Я не хачу, каб чуткі ўсцяж краіны
Пайшлі, што кроў была праліта недзе
І хтось загінуў за пасаг Гражыны.
Пайду я і на першай жа бяседзе...
Цяпер пайду, хоць познія гадзіны,
І перш чым ночы адплывуць туманы,
Я веру, дасць адказ ён пажаданы».

І разыходзяцца пасля размовы,
Трывогу ў сэрцы несучы абое:
Княгіня хутка са сваёй паловы
Пайшла цішком у князевы пакоі,

А Рымвід цераз двор паўз прыбудовы —
Пад дзверы князевы. І ў неспакоі,
Увайсці не смеўшы, на парог сядае,
Да шчыліны ўсім тварам прыпадае.

Чакаў нядоўга. Засаўка скрыгоча —
І постаць нейкая мільгнула ў белі.
»Хто там?» — сарваўся князь з пасцелі.
«Тут я», — быў голас у адказ жаночы.
І словы гутаркі зашапацелі.
Хоць Рымвід ведаў змест, ды рэха ночы
Глушыла галасы, якія ў зале
Аб сцены біліся і прападалі.

Гаворка то мацнела ўсхвалявана,
То заціхала, слова зловіш рэдка.
Чуваць больш голас панін, рэдка — панаў,
Ен больш маўчаў, нібы ўсміхаўся едка.
Яна мо ўкленчыла там нечакана,
Бо ўскочыў з ложка князь ад просьбы гэткай,
Тлумачыў нешта хутка і нервова,
Пасля замоўк і не сказаў ні слова.
І стала ціха. Постаць тая ў белі
Пайшла к дзвярам, і кляпнулася клямка.
Упрасіла? Ці спрачацца не схацелі?
Вярнулася ў сваю палову замка
Княгіня. Князь падаўся да пасцелі,
Адразу лёг. Магчыма, гэта ціша
Ізноў яго ў сон моцны закалыша.

А Рымвід, пастаяўшы час каторы,
Пайшоў і бачыць: з левага балкона
Слуга з паслом вядзе перагаворы.
Наставіў вушы, ды не чуў і тону,
Бо вецер сеяў гукі па прасторы.
На браму паказаў слуга тэўтону,
І Рымвід зразумеў размову скора.
Ускіпеў крыжак за гэткую абразу —

І на каня ў сядло ўзляцеў адразу.
«Клянуся крыжам, — верашчаў у злосці, —
Каб не паслом я быў у вас сягоння,
Мне за абразу паплаціўся б хтосьці
Адпомсціў бы я гэтаю далонню!
Сярод манархаў жыў я з маладосці,
Але і ў тых, што ходзяць у кароне,
Не меў таго, што ў гэтага паўпанка:
Пад чыстым небам дачакацца ранка
І прэч ісці пры ўсім прыдворным збродзе!
Асцерагаю: нас не ашукае
Паганскі выкрут і дарма не пройдзе!
Глядзі, ён нас на Вітаўта склікае,
Каб тут на нас напасці з ім у згодзе!
Убачым жа, ці Вітаўт вас прыкрые
Ад тых мячоў, што ў вас вісяць над шыяй!

Скажы ж ты князю, а не дасць ён веры,
Спытае хай, я паўтарыць гатовы
Яму разоў хоць дзесяць тыя словы,
Бо слова рыцара ў той самай меры
Непарушальнае, як слова веры,
Магу мячом пацвердзіць гэта з ходу:
Вы тую яму, што для нас капалі,
І на сваю падрыхтавалі шкоду,
Глядзіце, сёння ж каб туды не ўпалі!
Вам кажа Дытрых Гальштарк фон Кніпродэ,
Тэўтонскі комтур. Кнехты, паскакалі!»

Крыху счакаў тэўтон ды па хвіліне,
Нічога не пачуўшы, ў цемры тоне.
Ледзь часам зброя бліснe на даліне,
Часамі звякне сталь на каляіне,
Часамі данясецца ржанне коней.
Атрад змяншаецца і цалкам гіне
За ўзгоркам на залесеным адхоне.

«Шчасліва едзьце! Дай Бог каб ніколі
Вы больш не ездзілі тут нашай сцежкай! —
Прамовіў Рымвід ім услед з усмешкай. —
Хвала княгіні! Праз яе ж найболей
Такая змена! Ну цяпер мне хто тут
Пахваліцца, што сэрцы іншых знае?
Той гнеўны голас — доказ цвёрдай волі,
Пра слова вернага слугі не дбае!
Пазычыў бы, здаецца, ў птушак лёту,
Каб рынуцца на Вітаўта ўсёй сілай,
Слаўцо ж мядовае, усмешка мілай
Уміг адбілі да вайны ахвоту.
Ну што ж, забыўся я, сівабароды,
Пра іх гады і пра закон прыроды!»

Вось так гаворачы, ўзнімае вочы —
Мо промень лямпы дзе на краты ляжа,
Але дарма — навокал цемра ночы.
Тады назад на ганак зноў пакрочыў,
Бо, можа, князь пазваць яго накажа.
Дарма чакаў, пытаўся ў варты княжай.
Ідзе пад дзверы: цішыня ў пакоі,
Відаць, князь моцна спіць. Тут штось не тое...

Тут дзіва нейкае! Не ясна штосьці,
Якою сёння ўсё ідзе дарогай:
Вось толькі што выкрыкваў князь ад злосці,
Збірацца на вайну загадваў строга,
А спіць дагэтуль. Думаў ехаць рана,
Вунь раць даўно стаіць ужо ў чаканні,
А немцаў так адправілі пагана.
Хто ж вынес той загад? Прыдворны панін!

«Наколькі зразумеў я з іх размовы,
Хоць слоў і не пачуў амаль ні разу,
Ды просьбы, голас пана так суровы?..
Няўжо яна без князевага ўказу
На крок такі рашылася бядовы,

Так верачы у моц сваёй пяшчоты?
Каб не прыйшлося ёй трымаць адказу
З-за гэткія ўсёй справы павароты!
Хоць смеласцю яна даўно здзіўляла,
Ды сёння меру яўна перабрала!»
І тут пасланец зблытаў разважанні:
Падходзіў ціха і міргаў здалёку —
Маўляў, хадзі хутчэй, бо кліча пані.
На ганку ўжо сустрэлі пакаёўку,
А ў сенях і княгіня сустракае —
Старога ўводзіць, дзверы замыкае.

«Стары мой дружа, кепскія падзеі,
Але ж у роспач кідацца не трэба;
Калі ўжо сёння нас звялі надзеі,
Дык заўтра мо ласкавей будзе неба.
Цяпер маўчаць нам трэба вельмі строга —
І з войскам, і паміж сабою.
Пасла адправім, хай жджэ дня другога,
Каб сёння князь паспешнасцю сваёю
Не абяцаў яму таго чагосьці,
Што будзе рад вярнуць, астыўшы з злосці.

А ты не бойся! Як яно ні будзе,
Намерам пана гэта не пашкодзіць.
І войска гэтаксама ўміг прыбудзе,
Калі ўсё ж князя час не ахалодзіць.
Збірайся ехаць, ды яго намеры
У мяне, прызнаюся, не будзяць веры.

Пераступіўшы ледзьве ў дом парогі
І ледзь адклаўшы баявую зброю,
Не адпачыўшы ані дня з дарогі,
Няўжо сягоння зноў шукаў бы бою?»

«Што чую, пані?! Тут няма адкладу!
На жаль, пустыя нашы разважанні!

Ўжо запозна! Бачу я з загадаў,
Што князь не будзе думаць аб чаканні,
Але пабачым... Ды ўсё ж наколькі
Карысныя былі ў вас з ім размовы?»
Гражына адказаць хацела, толькі
Тут перашкодзіў выпадак ім новы.
Пачуўся тупат конскі на дзядзінцы,
Задыханы пасланец убягае,
Прыносіць вестку ён, што там, пад гаем,
Па Лідскім прабягаючы гасцінцы,
Разведка наша языка дастала,
Што конніца тэўтонаў выйшла з бору,
За ёй — абоз, пяхоты йдзе нямала
І што, здаецца, на світанні, скора
Крыжацкія перадавыя часці
На замак раптам думаюць напасці.

«Дык хай цяпер да князя Рымвід скочыць,
Каб разбудзіць яго і хутка ўрадзіць,
Ці абарону ў замку лепей ладзіць,
Ці ў полі немцу глянуць смела ў вочы?»
Разведчык раіць падысці употай,
Бо ўжо яны не вельмі і далёка,
На конных выскачыць і ў момант вока,
Перш чым гарматы прыпаўзуць з пяхотай,
Разбіць райтараў. «І абавязкова,
Як толькі конных вояў паразносім,
Уміг фускнехтаў возьмем пад падковы
І гадавае племя гладка скосім».
Здзівіла моцна Рымвіда навіна,
Ды больш яшчэ здзівілася Гражына.

«Скажы, а дзе паслы?» — пытае ў пажа,
А той маўчыць, збянтэжаны пытаннем,
Глядзіць княгіні ў вочы з хваляваннем.
«Што чую, пані? — ён нарэшце кажа. —
Ці ж вы забыліся, што з волі княжай,

Як пеўні праспявалі час паўночы,
Загад вы князеў мне перадавалі
Сказаць паслам, каб марна не чакалі,
Бо ён наогул іх прыняць не хоча!»

«Ах, так, — адказвае спакойна быццам,
Ды ў гэты момант галаву схіляе
І злёгку пачынае мітусіцца. —
Так, праўду кажаш, я прыпамінаю...
І як жа я магла аж так забыцца!
Бягу — не! стойце, або... я ўжо знаю...»
Стаіць, маўчыць. Прыжмуранае вока,
Чало — уніз, відаць, што ў ім трывожна
Намер якісьці цьмяны дзесь далёка
То ўспыхне, то адступіць асцярожна,
То твар акрые змрочнай павалокай.
Намер, відаць, якісьці вельмі важны,
Абдумала і робіць крок адважны.

«Ну так, іду будзіць яшчэ раз пана...
Хай войска ўраз выходзіць на дарогу!
Сядлайце хутка князю верхавога,
Выносьце зброю, што нарыхтавана!
Хутчэй, і не ўпусціць найменшай рэчы!
Загадваю цяпер вам імем князя.
Адказнасць на цябе кладу, старэча.
Куды, чаго ідзём, ні ў якім разе
Ніхто няхай не ведае да ранку.
Ідзіце князя сустракаць на ганку!»

Пабегла, зачыніўшы з трэскам дзверы.
Пабег і Рымвід, ды спыніўся хутка:
Куды? Чаго? Гатовы ўжо жаўнеры,
Загад дайшоў да кожнага закутка!
Дык уздыхнуў і збавіў трохі кроку,
Спыніўся, звесіў галаву на грудзі
І думкамі яе няспынна нудзіў,
Бо ў нейкім дзіўным непраглядным змроку

Таўкуцца думкі гуртам, бездарожжам,
Абняць іх розум стомлены не можа.

«Дарма чакаю. Блізка ўжо і ранак,
А дзень загадкі, пэўна, ўсё развяжа.
Пайду да князя, што цяпер ён скажа».
І ўжо ўзыходзіць пачынаў на ганак,
Як раптам дзверы скрыпнулі абое
І Літавор з'явіўся на парозе
У сваіх даспехах, вопратцы для бою,
У поўнай баявой і грознай позе.
Сталёвы шлем, чырвоны плашч на зброі
І панцыр лёгкі, верны перамозе,
У левай шчыт з залочанай аправай,
А пояс ад мяча ў руцэ нёс правай.

Бядой ці гневам быў усхваляваны,
Ступаў няроўным і няпэўным крокам,
Ні рыцара ніводнага, ні пана
Ласкавым не хацеў пацешыць вокам.
З дрыжаннем лук прыняў з калчанам
І меч падперазаў над правым бокам.
А хоць памылку гэту бачыў кожан,
Ніхто адважыцца сказаць не можа.
Сыходзіць з ганка, зброі пазалота
Вітае ўжо крывавае світанне.
Сядае на каня, а побач рота
Гатовая крычаць яму вітанне;
Ён знак падаў рукой: замкнуць вароты
І ехаць ціха, моўчкі, без пытанняў.
А чэлядзі загадвае з палаца
За мост на двор сумежны перабрацца.

Не ўздоўж гасцінца рушыла ўся сіла,
Але направа павярнула долам.
Перш між кустоў, узгоркаў калясіла,
Пасля на шлях ізноў выходзіць колам.
Вядзе іх змрочны яр праз зараснікі глогу

Штораз далей, на светлую дарогу.
Ад гарадской мяжы непадалёку,
Адкуль мог вецер гром стральбы данесці,
Вузенькая, прыкметная ледзь воку,
Па лесе рэчка працякала дзесьці,
Ля шляху ж разлівалася шырока
І ў возеры гублялася нарэшце.
Чарнела пушча над азёрнай гладдзю,
А спераду — гары высокай паўнаўладдзе.

Калі Літва дайшла да павароту,
З гары тэўтонаў процьма наступала.
Асвечваў месяц пікі, шлемы, роты...
Вось бліснуў раптам выстрал самапала,
За ім — стук капытоў, мячоў грымоты,
І конніца тэўтонаў мурам стала.
Вось так прыгожа, велічна, ўрачыста
Панарскі бор уночы выглядае,
Калі вятры асыплюць ліст дачыста,
А ўся раса, што бісерам сядае,
Замерзне ў серабрыстыя маністы.

І дзівіцца хадок, прыйшоўшы з даляў,
Што голле з серабра, а ліст з крышталю.
Малюнак гэты князя абурае,
Дык скочыў, меч ускінуўшы сталёвы,
А ўслед дружына кінулася краем.
Старых здзівіў напад так бесталковы:
Чаму забыта тактыка старая
І не гучаць каманды словы?
Дзе хоча князь галоўны ўдар нанесці?
Каму, дзе, як свае атрады весці?

Дык Рымвід князеву спаўняе ролю —
Наводзіць лад ужо сярод дарогі.
Сціскае ўзгор'е ўвогнутым паўколлем:
У цэнтр — хто ў латах, лучнікі — як рогі.
Заўсёды так Літва займае поле.

Па знаку — лукі схілены на ногі,
Вурчаць цяцівы, вые стрэлаў хмара.
«Ісус! Марыя!» — «Гоп! Ура! Бі з жарам!»

І толькі дрэўкі пік скрышыўшы ў скоку,
Бліжэй самкнуцца, грудзі б'юцца ў грудзі...
Чаму ж не суджана нашчадкаў воку
Убачыць, як змагаліся там людзі?!
Адны другім не саступаюць кроку,
Вакол крык, гром шчытоў; меч не марудзіць —
Ляцяць пад ногі пікі і галовы...
Хто ўпаў з каня, таго даб'юць падковы.

А князь вакол сябе мячом махае,
Адважна ўецца ў самым пекле бою.
Чырвоны плашч ягоны вораг знае,
І ўсе пазналі герб яго на зброі,
Дык адступаюць немцы з сечы,
А ён ляціць, сядае ім на плечы.

Але ж каторага вініць тут Бога,
Што князь слабы? Хоць ворагаў ён гоніць
І спрытна б'е, ды не забіў нікога.
Па панцырах мячом бяссільна звоніць,
А меч саслізгваецца раз за разам
І не трапляе ці кладзецца плазам.

Дык немцы бачаць, што ўцякаць не варта,
Адважна падымаюць крык вялікі,
Вяртаюцца, стаяць на месцы ўпарта,
На князя лесам настаўляюць пікі.
А ён ад страху больш знясілеў быццам, —
Не можа ад напасці той адбіцца.

І галаве яго не быць бы цэлай:
Тэўтоны насядаюць, б'юць, страляюць,
Але раптоўнаю атакай смелай
З бяды ліцвіны князя вызваляюць:

Той князевы памылкі папраўляе,
Той ад мяча сабою засланяе.

Мінае ноч, зары ружовай косы
На ўсходзе раскладаюцца ў хмурыне,
Віруе бой, людзей ляжаць пакосы,
І што далей, то больш і больш іх гіне.
А бог вайны змагання важыць лёсы,
Бярэ крывёй даніну з кожнай смерці,
І шалі ўсё стаяць на той адметцы.

Так Нёман, бацька наш ласкавы, дбалы,
Сустрэўшы румшыцкага велікана,
Рукою мокрай абхіне завалы,
Капае дно і дзьмецца ўсхвалявана.
А той, баронячыся ад навалы,
Плячмі цяжар стрымоўвае старанна.
Не рушыцца скала з рачнога ложа,
І рэчка каменю ўступіць не можа.

Дык немцы, каб дабіцца перамогі,
Апошніх ратнікаў з гары з запасу
Кідаюць на Літву ў парадку строгім.
Вядзе сам комтур баявую масу
На аслабелых з ран і ад знямогі
І, перастроіцца не даўшы часу,
Ламае строй, вядзе ў ім барозны...
Ды раптам крык з гары пачуўся грозны.

Адразу ўсе ў той бок кіруюць вочы.
Там рыцар быў. І як з лясной яліны
Шырокім ценем стройных кос жаночых,
На снег кладуцца чорныя галіны,
Так чорны плашч адзеў яго ў змрок ночы,
Бо чорны быў і шлем, і конь былінны.
Ускрыкнуў тройчы, рынуўся ўніз громам,
Ды з кім, супроць каго ён — невядома.
Дабег да немцаў і ў натоўпе тоне.

Не ўбачыш бітвы, але грукат, крыкі
Падказваюць, дзе ў жудасным разгоне
Грыміць мяча яго пярун шматлікі.
Там знікне шлем, там стройны сцяг абсядзе,
І раць бяжыць на ўсе бакі ў бязладдзі.

І як у цёмнай пушчы лесарубы,
Калі б дзялянку высекчы жадалі,
Пашлюць сякеры ў ход і пілаў зубы;
Глядзіш, там-сям вярхі дрэў пазнікалі,
А ў просеках пакладаліся пні ў зрубы,
І ўбачыш і людзей, і бляск іх сталі —
Вось так, між немцаў высекшы праломы,
К Літве выходзіў рыцар незнаёмы.

Спяшайся, рыцар, ажыві адвагу,
Знямоглых падмацуй, ратуй ад гора!
Бо немцы здабылі ўжо перавагу —
Ліцвінам пікі болей не апора,
А комтур той крывёй патоліў смагу
І ўжо шукае ў полі Літавора.
Аж вось абодва павярнулі коней
І ўжо збліжаюцца на ўсім разгоне.

Князь Літавор падняў свой меч для ўдару,
А комтур пальнуў з перуновай зброі.
Хвалюецца Літва, праз дыму хмары
Глядзіць на князя ў страшным неспакоі.
На жаль, не біцца ўжо табе, ўладару!
Пусціў паводдзе, меч апаў з рукою,
А сам з сядла сплывае на дарогу,
Ды тут бягуць яму на дапамогу.

Ускрыкнуў чорны муж і чорнай хмарай,
Сыпнуўшы вокал перуновым градам,
Рвануўся да забойцы з грознай карай.
Ледзь толькі з першым стрэліся нападам,

Умомант комтур на зямлю злятае,
І конь над ім узвіўся капытамі.

Да князя праз натоўп усхваляваны
Падскочыў рыцар, рве зашчэпкі латаў,
Здымае панцыр, кроўю сфарбаваны,
Знайшоў прастрэл, ды ледзь яго пакратаў,
Як кроў нанова палілася з раны.
Свядомасць князева святлее з болю,
Ён здзіўлена глядзіць на наваколле
І зноўку хоча шлемам засланіцца.
Сказаў пайсці ўсім прэч, хто тут сабраўся,
А Рымвіду загад даў нахіліцца.
«Канец ужо мне, — ціха адазваўся, —
Не руш грудзей, шануйце таямніцу.
Няма ратунку, бачу, мне ад смерці,
Вязіце ў замак — там хачу памерці».

Глядзіць і дзівіцца стары ваяка,
Не верыць сам сабе, дык зрок узносіць,
Руку ўпускае, над якою плакаў,
Уздрыгвае, лоб пот халодны росіць.
Цяпер пазнаў ён голас, чуты ўчора.
О, гэты голас быў не Літавораў!

Тым часам рыцар Рымвіду ў трывозе
Паводдзе кінуў, зноў прыпаў да пана,
Сказаў, каб коней кіраваў к дарозе,
А сам, абняўшы князя ўсхвалявана,
Заціснуў рану на грудзях рукою,
Даў знак, і ўтрох імчацца з поля бою.

А вунь і горад, замка камяніца,
Народ цікаўны выбег на спатканне,
А тыя шпораць коней, каб прабіцца
Хутчэй, і, між агульнага маўчання,

Спяшаюцца за мурам зачыніцца.
Спусцілі мост і загадалі строга
Не выпускаць і не ўпускаць нікога.

Вяртаюцца дружыннікі ў сталіцу,
Аднак, хоць мужна адстаялі волю,
Ніхто не цешыцца, не весяліцца,
Усім ад жальбы цісне сэрца з болю.
Трывожна ўсе пытаюцца пра пана:
Што з ім? Дзе ён? Ці лёгкая хоць рана?

Што ў замку дзеецца, ніхто не знае,
Бо ўзняты мост, зачынены вароты,
Ды з моста вось сышло, кусты мінае
Народу шмат на нейкія работы.
І вось гурт секчы дрэвы пачынае,
Пасля ствалы, галлё, снапы чароту
У горад носіць, возіць на падводзе,
Дык страх і жаль расце ва ўсім народзе.

Там, дзе меў хорам бог пярунаўладны
І бог, які вятрамі злосна свішча,
Дзе коні ды валы, авечак стады
Штодзень кроў пралівалі ў папялішча,
Касцёр кладуць пад самыя аблокі,
На дваццаць сажняў доўгі і шырокі.

У цэнтры дуб стаяў, а між бярвення
Крыжацкі комтур на кані магутным
Сядзеў цяпер у поўным узбраенні,
Да той дубіны ланцугом прыкуты.
Той самы гэта пасланец нязгоды,
Забойца князёў, Дзітарых з Кніпроды.

Бягуць мяшчане, рыцары, жанчыны,
Але маўчаць усе, ніхто не смее

Назваць уголас зборышча прычыны.
Абняты страхам, жалем і надзеяй,
Глядзіць народ збянтэжаны на замак
І настаўляе слых на той напрамак.

Аж вось труба зайграла гулка з вежы,
Спадае мост, і брама заскрыпела,
І шэсце ў чорных рушыла адзежах,
Усклаўшы на шчыты героя цела.
Пры ім меч, піка і калчан стрэл свежых —
Усё на чырвані плашча зіхцела.
Аблічча князя не відаць, забрала
Цяжкога шолама яго схавала.

Дык вось наш князь! Пан горада і краю!
Рукі нястомнай муж, герой вядомы!
Ці немцаў біць, ці гнаць арду нагаяў,
Ці клапаціцца пра ўсіх без стомы!
Чаму князь звычай даўні парушае,
Вандруючы ў нябесныя харомы?
Бо старажытнасць наша тут, бывала,
Не так князёў, дзядоў сваіх хавала.
Чаму з табою не ідзе да неба
Слуга, які таптаў з табой дарогі?
Чаму не йдзе з пустым сядлом, як трэба,
Твой сябар верны — конь аленяногі;
Дзе ганчакі, дзе сокал дальнявокі?
Дзе зграя, слаўная за нюх далёкі!
Шумеў натоўп. Байцы ўзнімаюць цела
На верх кастра, мёд, малако ўзліваюць.
Труба зайграла, флейта засвірчэла,
І вайдалоты сумны гімн спяваюць.
Бярэ адзін паходню, нож ахвярны...
«Пастойце!» Сталі. Муж над'ехаў хмарны.

«Хто ён? — пытаюць. Хто той храбры рыцар?»
Пазнала войска: ён на полі ўчора,

Калі Літва ўжо не магла адбіцца
І немцы акружылі Літавора,
Надбег, адвагу ўзняў, прагнаў трывогі,
Сек крыжакоў, збіў комтура пад ногі.

Вось што пра чорнага героя зналі.
А сёння — конь той самы, плашч і зброя.
Ды хто ён? І з якой з'явіўся далі?
Здымае шолам... Гляньце на героя!
Дык гэта ж князь! Зірніце на аблічча!
Спярша заціхла грамада нямая,
Ды радасць з сэрца люду голас кліча,
І грамада крычыць, што сілы мае:
«Жыве наш князь! Жыць будзе з Літаворам!»
І гэты бурны крык ляціць аж к зорам.

Стаяў ён сумны, бледны, адзінокі,
А гул грымеў, разносячыся рэхам.
Узняў чало і паглядзеў навокал,
За крыкі лёгкім дзякаваў усмехам.
Ды ўсмешка не была з душы пачата,
Не з тых, што асвятляюць твар і вочы,
А нейкаю здавалася крылатай,
Што, ледзь з'явіўшыся, сарвацца хоча,
Што твар ледзь так сагрэе і асвеціць,
Як рукі мёртвага вяночак з веццяя.

«Падпальвайце касцёр!» Паплыў дым сіні...
А князь пытае: «Знаеце, чые тут
Гараць астанкі? — Ціша ў той хвіліне. —
Пад зброяй мужа бачыце кабету,
Жанчыну целам, духам гераіню!
Адпомсціў я — яна ж пайшла са свету!»

Сказаўшы, ўзбег на лоўж, прыпаў да мілай,
І хмара дыму ўраз іх засланіла.

## ЭПІЛОГ ВЫДАЎЦА

Калі ты ўсё, чытач, прагледзеўшы цярпліва,
Канцом не задаволены, што і не дзіва,
Бо хай цікавасць спраў як след не разматае,
Дык тая, ненасычаная, запытае:
Чаму князь жонку выправіў, а сам застаўся?
Чаму прыбыць раней на бой не пастараўся?
Ці мо сама княгіня рушыла ў вір бою?
Чаму ўзняў Літавор сваю на немцаў зброю?
Шукаць адказаў дастатковых — што карысці?
Бо ведай, што і аўтар той, які калісьці
Пра гэта напісаў (ён быў тады у месце),
Спісаў, што знаў ці чуў, але маўчаў аб рэшце,
Не могучы ў адно звязаць усіх выпадкаў
І не жадаючы сфальшывіць іх здагадкай.
Як ён памёр, забраў я рукапіс старога
І з думкай, што мне ўдзячны будзе люд нямнога,
Калі ўся праўда выйдзе на свет Божы
І датачыць канец да сказанага зможам.
У Навагрудку я ў старым распытваў годзе,
Ды толькі Рымвід ведаў праўду,больш ніводзін.
Але і ён такі расстаўся з белым светам,
А пры жыцці не размаўляў ні з кім пра гэта,
Прысягай звязаны ці словам чэсці.
На шчасце, жыў яшчэ адзін у нашым месце,
Хто ў замку быў тады і ведаў таямніцу —
Слуга княгінін. Ён згадзіўся мне адкрыцца.
Казаў, а я запісваў, бо ў апавяданні
Заўважыў сувязь з рукапісным тым паданнем.
Аднак, ці ўсё тут праўда, не магу ручацца
І з тым, хто ўбачыць фальш, не думаю спрачацца.
Бо не прыдумаў я ніякай праўды новай,
А тое, што пачуў, запісваў слова ў слова.
Слуга ж той так казаў:
«Княгіня ва ўтрапенні
Прасіла князя, нават стаўшы на калені,
Ды князь яе ўсё роўна слухаць адмаўляўся.

І так у гневе тым ён на сваім заця́ўся,
Што жончын плач і просьбы на нішто не ставіў
І так яе з адказам — «не і не» адправіў.
Разлічвала, што ўпросіць, можа, ў іншым часе.
Дала загад паслоў пакінуць на тэрасе
Ці выправіць за мур, дык я прапёр іх к ліху.
І так стварылі мы тады неразбярыху,
Што комтур, жорсткаю адмовай раззлаваны,
Замест падмогі вёз гарматы і тараны.
Калі княгіня, здзіўленая весткай тою,
Пабегла зноў да мужа, я здалёк — за ёю.
Уваходзім. Цёмна, глуха ў памяшканні пана,
Відаць, князь моцна спаў. Княгіня ўсхвалявана
Каля пасцелі стала, ды будзіць не смела —
Пашкадавала ці прасіць больш не хацела,
Бо тут жа кінулася ўжо на спосаб новы:
Бярэ каля ўзгалоўя князеў меч сталёвы,
Ускладае панцыр мужаў, плашч бярэ на плечы
І адпраўляецца на ганак для сустрэчы,
Загад мне даўшы, каб — нідзе ні слова.
Калі ўжо на каня сядаць была гатова,
Мяча я не заўважыў у яе пры боку,
Забылася мо ўзяць ці дзе згубіла ў змроку.
Пабег шукаць, гляджу — зачынены вароты.
Я — да акна, ажно за брамаю ўжо роты.
Тут страх мяне прабраў і, як абліты варам,
Кручуся ўжо пад розных дум сваіх цяжарам.
Тут бліснула, і гром гармат пачуўся ў зале.
Я зразумеў, што немцы бітву пачыналі.
Адразу Літавор, ці то крыху праспаўся,
Ці, можа, грукатам разбуджаны, ўзарваўся,
Крычыць і б'е ў далоні, кліча слуг.
Я ўсунуўся паўзком у шчыліну ля даху
І бачыў, як шукаў ён вопраткі і зброі,
Як стукаў, кінуўся ў княгініны пакоі,
Вярнуўся, выламаў запоры, ўзбег на ганак.
А на дварэ тым часам бралася на ранак,
Дык князь глядзіць навокал, настаўляе вуха,

Крычыць і кліча, але ў замку пуста, глуха.
Пабег на ніз і, быццам з думкай аб пагоні,
У стайню ўбег, дзе ратныя стаялі коні.
Паехаў на акопы, стаў як скамянелы
І слухаў, скуль нясецца грукат крык і стрэлы,
Аж папусціўшы повад, быццам бліскавіца,
Праз мост і браму паскакаў з сталіцы.
А я чакаў канца, прыліпшы да аконца.
Усё заціхла, згасла. Каля ўсходу сонца
Над'ехаў князь і Рымвід, і Гражыну сталі
Здымаць з сядла. Калі ж яе пранеслі цераз зал
Успомніць страх: дзе ступяць, след крывавы,
У грудзі раненая, цяжкае дыханне, —
Яна, упаўшы, ногі князю абдымала,
То рукі, прасціраючы к яму, ламала:
«Прабач адзіную перад табою здраду!»
Князь плача, падымае... Дзе знайсці тут раду?
Сканала. Устаў ён, адступіў, заплюшчыў вочы
І так стаяў. Мне зрок схавала цемра ночы.
А як нябожчыцу пасля на ложак клалі,
Я ўцёк. Вядома ўсім, што адбылося далей».

Вось што сказаў слуга, парушыўшы маўчанне,
Ды з смерцю Рымвіда прыйшоў канец і тайне
(Бо Рымвід жа забараняў пра гэта плесці).
Пасля штораз шырэй пайшлі ў народзе весці.
Не знойдзецца сягоння ў Навагрудскай гміне
Ніводзін, хто не знаў бы песні аб Гражыне.
Бо й дудары пяюць, і паўтараюць дзеўкі...
А месца бітвы той цяпер завуць Літэўкі.

**Ян Баршчэўскі**

# Шляхціц Завальня

Дзядзька мой пан Завальня, досыць заможны шляхціц на загродзе[1], жыў у паўночным і дзікім баку Беларусі. Яго сядзіба стаяла ў чароўнай мясціне. На поўнач паблізу жылля — Нешчарда, велізарнае возера накшталт марской затокі. Калі ўсходзіцца вецер, ад возера плыве роўны шум і відаць праз вакно, як пакрытыя пенаю хвалі падымаюць угору і зноў кідаюць уніз рыбацкія лодкі. На поўдзень ад дому нізіны зелянеюць кустамі лазы, дзе-нідзе ўзгоркі, парослыя бярозамі і ліпамі, на захад — разлогія лугавіны, і рака бяжыць з усходу — пераразаючы гэтыя ваколіцы, уліваецца ў Нешчарду. Вясна там надзвычай прыгожая; па лугах разліваецца вада, і ў паветры над возерам і ў лясах гучаць галасы птушак, што вяртаюцца з выраю.

Пан Завальня любіў прыроду, найбольшай прыемнасцю для яго было садзіць дрэвы, і таму хоць дом яго стаяў на гары, за паўвярсты нельга яго ўбачыць, бо быў ён з усіх бакоў прыкрыты лесам. Толькі рыбакам, што плылі па возеры, адкрывалася ўся будова. Ён таксама меў прыроджаную душу паэта і хоць сам не пісаў ні прозай, ні вершам, але кожнае апавяданне пра разбойнікаў, герояў, пра чары і цуды надзвычай яго займала, і кожную ноч ён засынаў, не іначай як слухаючы чарадзейныя гісторыі. Таму ўжо было зазвычаена, што, пакуль ён не засне, хто-небудзь з

[1] Дробны шляхціц, які меў невялікі маёнтак з абгароджанай сядзібаю.

чэлядзі мусіў апавядаць яму якую простанародную аповесць, і ён слухаў цярпліва, хоць бы адна і тая ж гісторыя паўтаралася некалькі дзесяткаў разоў. Калі хто прыязджаў да яго, маючы якую патрэбу, які-небудзь падарожны ці зборшчык ахвяраванняў, ён найласкавей яго прымаў, частаваў, пакідаў начаваць і выконваў усе жадункі, узнагароджваў, абы толькі той расказваў яму якую казку. А асабліва ўвосень, калі ночы доўгія. Той госць быў для яго наймілейшы, які меў у запасе найбольш гісторый, розных здарэнняў і паказак.

Калі я прыехаў да яго, ён быў вельмі мне рады, распытваў пра шаноўных людзей, у якіх я праслужыў столькі гадоў, расказваў пра сваю гаспадарку, пра бярозы, ліпы і клёны, якія шырока распасцёрлі свае галіны над дахам. Некаторых суседзяў хваліў, іншых жа ганіў, што яны займаліся толькі сабакамі і паляваннем. Нарэшце, пасля доўгай размовы пра сёе-тое, кажа мне:

— Ты чалавек вучоны, хадзіў у езуіцкую школу, чытаў многа кніжак, гутарыў з вучонымі людзьмі, павінен ведаць шмат разнастайных гісторый, сёння ўвечары распавядзі мне што-небудзь цікавае.

Дык я пачаў прыпамінаць, чым бы пахваліцца. Я нічога не чытаў, апрача гісторыкаў і класікаў. Гісторыя народаў — не займальная рэч для таго, каго не цікавіць тэатр свету і асобы, што іграюць розныя сцэны. Для майго дзядзькі адзінай гісторыяй былі Біблія, са свецкіх жа паданняў ён дзесьці вычытаў, што Аляксандр Македонскі, прагнучы даведацца пра вышыню неба і глыбіню мора, лятаў на грыфах і апускаўся на дно акіяна, і такая чалавечая смеласць яго, дзядзьку, здзіўляла і займала. Трэба было і мне расказаць што-небудзь падобнае, таму вырашыў пачаць з «Адысеі» Гамера, бо ў гэтай паэме поўна чараў і дзіваў, як і ў нашых простанародных аповесцях.

Блізу дзесятай гадзіны вечара, калі сельскія жыхары канчаюць сваю працу, мой дзядзька пасля малітвы ідзе спачываць. Ужо сабралася ўся чэлядзь паслухаць новыя аповесці, а ён сказаў так:

— Ну, Янка, раскажы ж нам што цікавага, я буду пільна слухаць, бо сёння адчуваю, што не хутка засну.

Тады я, каб мае аповесці былі лепш зразумелыя для слухачоў, расказаў коратка пра самых галоўных грэчаскіх багоў, багінь і герояў, пасля пра залаты яблык, пра суд Парыса, пра аблогу Троі. Усе слухалі з цікавасцю і здзіўленнем. Я чуў, як некаторыя з чэлядзі гаварылі:

— Гэтай басні прыпомніць не можна, дужа цяжкая.

— А ці было калі ў сапраўднасці тое, што ты расказваеш? — пасля доўгага маўчання перапыніў дзядзька.

— Але, некалі верылі ва ўсё гэта паганцы, бо было яно да нараджэння Хрыстовага. Вядома з гісторыі пра гэты народ, вядома таксама і пра яго рэлігію.

— І такому вас вучаць езуіты ў школах, навошта ж гэта прыдасца?

— Хто вучыцца, — адказаў я, — той павінен пра ўсё ведаць.

— Ну, то кажы далей.

І далей я апавядаў без перапынку. Ужо было пасля паўночы. Чэлядзь, разыходзячыся, ціха паўтарала паміж сабой:

— Нам гэтай басні ня выўчыцца, усё штó-то ні панашаму, тут нічога ні прыпомніш.

Праз пэўны час я пачуў моцны храп майго дзядзькі і, усцешаны з гэтае прычыны, пераджагнаўся і заснуў.

На другі дзень ён як сельскі гаспадар устаў вельмі рана, агледзеў увесь свой маленькі маёнтачак, вярнуўся ў дом і, набліжаючыся да мяне, калі я яшчэ драмаў, закрычаў:

— О, як бачу, вашэць любіць спаць па-панску; уставай, у простых людзей гэта грэх, і цябе назавуць гультаём! Але твая ўчарашняя гісторыя вельмі вучоная, хоць забі, не помню аніводнага прозвішча тых паганскіх багоў. Дый гэта не апошні раз, пагасцюеш у мяне да вясны і за доўгія зімовыя ночы шмат мне раскажаш пра сёе і пра тое.

У час майго побыту ў дзядзькавым доме мусіў я амаль пяць тыдняў кожную ноч усыпляць яго перказам сла-

вутых паэм грэчаскіх або лацінскіх класікаў, аднак найбольш яму падабалася з «Адысеі» мудрасць Уліса[1] на берагах Цырцэі і на востраве цыклопаў. Паўтараў мне няраз:

— А можа, некалі даўно і бывалі такія агромністыя веліканы, толькі дзіўна, што з адным вокам на лбе. Але ж і хітрун гэты Уліс — напаіў, выкалаў вока і выехаў на баране.

Не мог таксама ён забыць шостай песні з Вергілія, дзе Эней увайшоў у пекла. Паўтараў некалькі разоў такія словы:

— Хоць ён быў і паганін, ды якое шляхетнае пачуццё і любасць да бацькі — ісці ў такое небяспечнае месца. Але якая ў іх дзіўная вера, у нас душачкі збавёныя ідуць у неба, а яны сабе прыдумалі нябеснае валадарства так глыбока пад зямлёй. Дзіўная рэч!

Аднаго разу, размаўляючы са мною, запытаўся ён, ці даўно я быў у Полацку.

— Амаль год не меў выпадку быць у гэтым горадзе.

— Калі надарыцца там быць, добра было б даведацца ад ксяндзоў езуітаў, як вучацца мае Стась і Юзік. О, не кепска быць чалавекам вучоным! От, як вашэць апавядаеш з розных кніжак, таго невук і ў сне не ўбачыць! Добра ўсё ведаць. Я, будучы ў Полацку, і мая нябожчыца жонка, вечная ёй памяць, прасілі ксяндза-прэфекта[2], каб не шкадавалі розгаў.

Розгаю дух святы дзетак біць радзіць,
Розга аніяк здароўю не вадзіць.

О, гэта цудоўныя вершы — розга вучыць розуму і веры. Сёй-той з нашых панічоў, якіх песцяць у бацькоў, толькі і бавяцца з коньмі і сабакамі, а прыйдзе які ў касцёл, дык нават не перажагнаецца. Якая ўцеха бацькам — толькі кара Божая!

Ужо былі першыя дні лістапада. Самотны, седзячы ля вакна, я слухаў завыванне асенніх вятроў і пошум бяроз

[1] Уліс — Адысей.
[2] Прэфект — загадчык, інспектар або настаўнік рэлігіі ў школе.

і клёнаў, якія густа ўздымаліся над дахам. Віхор круціў па двары жоўтае лісце і ўзнімаў яго ўгору. Усюды глуха, толькі зрэдку забрэша сабака, калі мінае прахожы або пакажацца з лесу звер. Думкі мае былі занятыя нейкімі тужлівымі марамі. Тут уваходзіць кабета, што жыве за гаспадыню ў майго дзядзькі. Гэта была сястра яго жонкі-нябожчыцы, ужо ў сталых гадах. Убачыўшы, што я задумаўся, сказала:

— Нудзішся ты ў нас, пане Янка. Ты малады чалавек, а адпаведнай кампаніі не маеш, а можа, ужо і гэтыя начныя апавяданні апрыкралі. Крышку патрывай, — як толькі замёрзне Нешчарда, паўз гэты фальварак праз возера будзе вялікая дарога. О! Тады пан Завальня запросіць да сябе шмат гасцей, каб расказвалі, што каму заманецца.

Прайшло колькі дзён. Яснымі і пагодлівымі начамі заіскрыліся маразы. Заснула возера пад тоўстай лядовай глыбай, пасыпаўся снег з аблокаў — і ўжо зіма. Уздоўж Нешчарды з'явілася шырокая дарога, праходзяць падарожныя і цягнуцца ў Рыгу вазы, гружаныя лёнам і пянькою, паказаўся гурт рыбаловаў на лёдзе. Мы з дзядзькам любілі часта наведваць тоні і глядзець на багаты ўлоў, а тут яшчэ і тая была карысць, што ён, прабыўшы цэлы дзень на марозе, хутка засынаў, і я вечарамі быў вольны. Да таго ж мы часцей мелі і заезджых гасцей, перад якімі дзядзька вельмі хваліў мяне і езуіцкія навукі, расказваючы, што чуў ад мяне шмат новых і такіх разумных аповесцей, што і запомніць цяжка. Быў і я рады гасцям, бо сёй-той з іх заступаў маё месца, і мне ўжо было прыемней слухаць, чым гаварыць.

Вечар быў цёмны, неба пакрыта хмарамі, нідзе ані воднай зоркі, падаў густы снег. Раптам пачынае дзьмуць паўночны вецер, навокал страшная бура і завіруха, вокны засыпала, за сцяною завылі сумным голасам віхуры, быццам над магілаю самой прыроды, за адзін крок вока нічога не бачыць, і сабакі на падворку брэшуць: кідаюцца, быццам напалі на нейкага звера. Выходжу з дому, слухаю, ці не падышла зграя ваўкоў, бо ў такую завіруху гэтыя драпежныя звяры найчасцей шукаюць сабе здабычу, гойса-

ючы тут і там каля вёсак. Узяў набітую стрэльбу, каб хоць папужаць іх, калі здолею заўважыць зіхатлівыя воўчыя вочы. Раптам пачуў крык на возеры, там і тут пераклікаліся паміж сабою мноства адчайных галасоў, быццам не могучы даць рады ў страшнай небяспецы. Я вяртаюся ў хату і кажу пра гэта дзядзьку.

— Гэта падарожныя, — адказаў ён, — дуйка снегам замяла дарогу, і яны, блукаючы па возеры, не ведаюць, у які бок падацца. — Гаворачы гэта, ён узяў запалепую свечку і паставіў яе на падваконні.

Пан Завальня меў звычай рабіць гэта ў кожную завейную ноч ужо таму, што жыла ў ягоным хрысціянскім сэрцы любоў да бліжняга, і рады быў заўсёды гасцям, каб з імі пагаварыць і паслухаць іхнія гісторыі. Падарожныя, што заблудзіліся, заўважыўшы з возера агонь у вакне, радаваліся, як мараходы, змучаныя марскімі хвалямі, калі ўгледзяць здалёк сярод начной цямрэчы святло партовага ліхтара, радаваліся і з'язджаліся ўсе да сядзібы майго дзядзькі, быццам да прыдарожнай карчмы, каб пагрэцца і даць адпачынак коням,

Вецер не спыняўся, і дом, быццам высокія валы, акружалі снежныя сумёты; сярод шуму буры чуваць рыпенне снегу пад нагружанымі вазамі, стукаюць у зачыненыя вароты і крычаць:

— Рандар! Рандар! Адчыні вароты, ахці, якая мяцеліца, саўсём паразяблі, і коні прысталі, чуць цягнуць. Рандар! Рандар! Адчыні вароты!

На гэты крык выходзіць парабак, незадаволены, што ўваліўся ў глыбокі снег:

— Пагадзіця, адчыню, чаго вы крычыця, тут не рандар жывець, а пан Завальня.

— Ах, паночак (думалі, што гэта сам гаспадар), пусці нас пераначаваць, ноч цёмная, нічаго не відна, і дарогу так замяло, што і найці няможна.

— А ці ўмееце казкі ды прыказкі?

— Да ўжо ж як-небудзь скажым, калі толькі будзе ласка панская.

Адчыняюцца вароты, на падворак заязджае некалькі вазоў, насустрач выходзіць дзядзька і кажа:

— Ну, добра, будзеце мець вячэру і сена для коней, толькі з умовай, што хто-небудзь з вас павінен распавесці мне цікавую казку.

— Добра, паночык, — адказваюць сяляне, здымаючы шапкі і кланяючыся.

Вось выпраглі яны і прывязалі да вазоў сваіх коней, паклалі ім сена, зайшлі ў пакой для чэлядзі, абтрэслі снег, там далі ім вячэру; пасля яе сёй-той з іх прыйшоў у пакой да майго дзядзькі, ён даў ім яшчэ па кілішку гарэлкі, пасадзіў падарожных каля сябе і ўлёгся ў пасцель з намерам, аднак, слухаць казкі. Сабраліся сямейнікі, і я сеў паблізу, з вялікай цікавасцю жадаючы пачуць новыя яшчэ для мяне простанародныя аповесці.

## Белая Сарока

Вы, панове, ведаеце акружанае цёмным лесам возера Язна, дзе мяжуюць тры паветы: Полацкі, Себежскі і Невельскі. Недалёка ад гэтага возера быў вялікі маёнтак, жыў у ім пан, якога і цяпер, успамінаючы, называюць Скамарохам, і ён меў падданых у тых трох паветах.

Дык вось той пан Скамароха быў надзвычай неспакойнага нораву, фанабэрлівы і хцівы, да суседзяў ездзіў толькі з прэтэнзіямі, меў грошы і заўсёды судзіўся, крыўдзіў бедных, удоў і сірот. Яго падданыя мелі пекла на гэтым свеце.

Рэдка хто наведваў яго дом. Пры ім неадступна быў вялізны чорны сабака. Лёкаі заходзілі ў пакой толькі тады, калі ён свістам даваў знаць, што нехта з іх патрэбен.

Скамароха быў адзін у пакоі. Ён як зазвычай пазіраў у люстэрка, падкручваў вус і ўважліва прыглядаўся да свайго круглага твару, што, як расказваюць, быў накшталт поўні. Пасля сеў у крэсла, закурыў люльку і задумаўся, а побач на падлозе заснуў чорны сабака.

Між тым, калі ён перабіраў у думках розныя спосабы, як павялічыць свае ўладанні, на зямлю апусціўся вечар і шэры змрок. Нечакана над яго жытлом павіслі хмары, зашумеў за сцяною вецер і лінуў дождж. У пакоі цёмна, толькі цьмяна свяціліся шыбы.

Ледзь Скамароха ачнуўся ад думак, як бліскавіца асвяціла пакой і ён убачыў, што нейкая дзіўная і страшная постаць стаіць у кутку ля дзвярэй. Пан спалохана закрычаў, стаў клікаць да сябе лёкаяў, але грымоты і шум ветру глушылі крык, ніхто не пачуў яго і не прыбег.

Высокая худая постаць падышла да пана.

— Не крычы, — сказала яна. — Ніхто не пачуе твой голас, і твой чорны сабака моцна спіць.

— Хто ты і як сюды трапіў?

— Пачакай крыху і пра ўсё даведаешся, — кажучы гэта, прывід выкрасаў агонь і запаліў свечку, якая стаяла на стале перад люстэркам.

Пры святле Скамароха ўбачыў дзіўнае стварэнне: чалавек на танюсенькіх нагах, худы, вочы круглыя, дробным і вострым тварам падобны да птушкі. Закрычаў пан дрыготкім голасам:

— Які жахлівы твар! Відаць, перада мною злы дух.

— Не крычы, я падобны да цябе і магу табе шмат добрага зрабіць.

— Чаго ты сюды прыйшоў, ды так ціха, што і сабака не ўчуў?

— Чуеш шум навальніцы? Я схаваўся тут ад залевы і перуноў, а сабака зараз спіць моцным сном і датуль будзе спаць, пакуль я не абуджу яго.

— Скажы, хто ты?

— Сядзь у сваё крэсла, супакойся, і ўсё раскажу табе. Я днём адпачываю, а пасля заходу сонца блукаю па свеце і выведваю, пра што людзі думаюць, пра што гавораць, што ядуць і п'юць. Ведаю сакрэт, як наслаць моцны сон на сабак і варту; слухаю, пра што гаворыць прасталюдзін, і выведваю думкі паноў; маё вока хуткае, а слых такі тонкі, што за сцяною (няхай гэта будуць найтаўсцейшыя муры)

магу чуць шэпт; па рысах твару пазнаю характары людзей, змушаю іх гаварыць паміж сабою і памятаю пра ўсё; заходжу праз маленькую шчылінку, і дзверы не скрыпяць, калі я іх адчыняю.

Скамароха свіснуў, клічучы да сябе людзей, і штурхануў нагою сабаку.

— Дарэмна свішчаш: ніхто не пачуе. Шуміць вецер, лье дождж, і сабаку не абудзіш.

— Чаго ты блукаеш па свеце? Навошта ты ўсё выведваеш?

— Я — пасланец Белае Сарокі, даведаўся пра твае памысныя думкі і прывабныя намеры.

— І хто ж тая Белая Сарока, якую ты ўспомніў?

— О! Белая Сарока мудрасцю свет здзіўляе, яе твар — цуд прыгажосці, постаць высокая, велічная; адзенне з дарагіх дыяментаў і перлаў, жыве ў палацы, якога ты яшчэ ніколі не бачыў; ёй кланяюцца багатыя паны і мудрыя галовы, духі па яе загадзе здабываюць скарбы з зямлі і мора, дзікіх мядзведзяў прывучыла да сябе, і яны, як пакорлівыя сабакі, заўсёды гатовыя ёй служыць. Словам, яна мацнейшая за ўсіх чарнакніжнікаў. Толькі часам убіраецца ў пёры белае птушкі, калі хоча бачыць тых, хто спрыяе ёй; і іх узнагароджвае, узбагачае, робіць шчаслівымі.

Бледны Скамароха, гледзячы на пасланца, вымавіў:

— Дзіўныя і незразумелыя рэчы мне гаворыш.

— Заўтра гэтай парою я буду ў цябе, і Белая Сарока прыляціць пад твой дах адпачыць. Пастарайся прыняць яе добра і будзь у размове абачлівы; апоўначы лёкаі няхай не заходзяць у твой пакой, няхай першы візіт гэтае пані будзе таемны.

Ён адчыніў вакно, паглядзеў угору:

— Хмары разышліся, толькі вецер шуміць. Здаецца, стрэлы перуноў не спаткаюць мяне на дарозе, не міне і паўгадзіны, як буду размаўляць пра цябе з Белай Сарокаю.

Сказаў гэта і выскачыў у вакно. Гаспадар бачыў толькі, быццам нейкі чорны звер прабег праз панадворак і імгненна знік.

Доўга Скамароха стаяў, нібыта слуп, сярод пакоя; нейкая трывога апанавала думкі, і дрыготка прабегла па целе. Што значыць гэты прывід? Няўжо гэта відма? А можа, злы дух хоча ўблытаць яго ў нейкае няшчасце? На сцяне прабіў гадзіннік. Скамароха глянуў на яго і ўбачыў, што ўжо поўнач. Свіснуў. Сабака прачнуўся, натапырыў поўсць, вочы загарэліся агнём, і ён, скуголячы, абышоў пакой. Прыбеглі лёкаі і, стоячы ля дзвярэй, чакалі панскага загаду.

— Таму з паўгадзіны, не больш, я клікаў вас да сябе, але аніводзін не з'явіўся. Што гэта значыць? Мурожыце вочы на святле — спалі, мала вам ночы, гультаі!

Першы лёкай. Не ведаю, пане, што гэта такое, але на нас напала нейкая туга. Мы доўга сядзелі моўчкі, не маглі слова прамовіць адзін да аднаго. Потым адчулі ў сабе незвычайны цяжар, стомленыя вочы не маглі глядзець, і мы ўсе мімаволі заснулі.

Скамароха нейкі час стаяў задуманы.

— А ці мроілася вам што-небудзь у сне?

Першы лёкай. Мне сніўся дзіўны сон: бачыў старога пана нябожчыка, быццам з ім пераходзіў нейкую пустэльню, дзе шмат было страшных гадзюк. Яны ўвесь час заступалі пану дарогу, нібыта хацелі ўтнуць. Ён, журботны, не кажучы мне ані слова, усё далей і далей ішоў сярод нейкіх скалаў. Потым бачыў я мясцовасць, зусім не падобную да нашых ваколіц, і нейкія руіны. На захадзе ў чорных хмарах гасла сонца і шумеў голы лес. Я ўбачыў недалёка ад дарогі жахлівых звяроў і закрычаў: «Пане, давайце вернемся дахаты. Нас напаткае цёмная ноч, а падарожжа небяспечнае». — «О, доўгая і страшная будзе ноч, — адказаў ён мне, плачучы. — Не хутка звон і ранішняя малітва прывітаюць узыход сонца, гэтых звяроў я не баюся, але цябе яны могуць загрызці, дык не адыходзься ад мяне». Тут пачвары кінуліся на нас. Я перапалохаўся і страціў прытомнасць, а цяпер вось абудзіўся і яшчэ дрыжу ад страху.

Другі лёкай. А мне здавалася, што я хадзіў ля каламутнае рэчкі, а на берагах з аднаго і другога боку тырчалі

камяні, і яны былі падобныя да нейкіх сядзячых людзей у доўгіх брудных апранахах. Потым мне сустрэўся волат, тоўсты, шыракаплечы, вочы страшныя. Хацеў ад яго ўцячы, але ногі мае былі нібы закутыя ў кайданы, з месца зрушыцца не мог. Ён падышоў да мяне і выцяў так моцна, што я заляцеў амаль на самую сярэдзіну рэчкі. Калі мяне несла вада, я крычаў, просячы дапамогі, ды на мой крык толькі камяні адказвалі дзікім смехам, і гул ад іх здзекаў лунаў над берагамі. Пасля я ўбачыў: здалёк мой бацька падымаў да неба рукі і маці млела, бо мне не маглі дапамагчы. Затым зноў нечаканая перамена: я стаяў над нейкаю прорваю і там мяне зноў спаткаў той страшны чалавек. Ён папхнуў мяне ў прорву — і я імгненна прачнуўся ў вялікім страху.

Трэці лёкай. Мне снілася бура. Яна зрывала дахі з дамоў, а вецер нёс нейкага шатана і скінуў яго перад самым ганкам...

— Годзе, годзе ўжо слухаць гэтае глупства; шум ветру і вільготнае паветра наслалі на вас цяжар і санлівасць, а гарачая кроў абудзіла ў галовах мудрагелістыя мроі. Ідзіце да сябе і кладзіцеся спаць.

Скамароха зноў у адзіноце неспакойна хадзіў па пакоі. Дзіўныя думкі снаваліся ў ягонай галаве, жахлівая здань увесь час стаяла перад ім. Уздрыгваў, прыгадваючы яе агідную постаць, але золата любіў так, што хацеў мець яго як мага болей, няхай сабе і з шатанавых рук, і прыгажосць Белае Сарокі вабіла яго. Хацеў пабачыць яе як найхутчэй і быць у ліку яе прыяцеляў.

Ён то парывіста хадзіў па пакоі, то, задумаўшыся, стаяў як слуп. Браў кніжку і адразу кідаў яе ды гладзіў свайго сабаку. Спадзяваўся, што стомленыя думкі супакоіць сном, але імгненна ўскокваў з ложка, запальваў святло і думаў усё пра адно. Толькі перад узыходам сонца крыху задрамаў, ды і ў тым неспакойным сне мроіўся яму пасланец Белае Сарокі.

Ціхі ранак. Ужо сонца было высока. На пагорках пасвіліся чароды, аратыя працавалі ў полі. Пан Скамароха на

ложку разважаў пра дзіўны ўчарашні выпадак і прарочыя сны. Нарэшце свіснуў. Прыбег лёкай і стаў чакаць загаду.

— Паспяшайце, каб сёння ўсе пакоі былі як найлепей прыбраныя. Вымыць падлогу, сцены і столь добра агледзець, каб не было пылу і павуціны. Таксама адпаліраваць мэблю і бронзу; люстры каб адбівалі найяснейшае святло; абразы і шыбы старанна пачысціць, каб былі як новыя. Скажы аканому, каб паўсюль вакол маёнтка таксама быў парадак.

— Пан сёння чакае нейкіх знакамітых гасцей? — спытаўся здзіўлены лёкай.

— Не твой клопат ведаць, каго чакаю, выконвай, што чуў. Ідзі і гэты мой загад перадай іншым.

Сказаўшы гэта, пан Скамароха выйшаў у парк, доўга хадзіў у задуменні пад шатамі ліп, свіснуў, паклікаў сабаку да сябе і пайшоў у поле. Блукаючы паўсюль, нецярпліва чакаў вечара.

Тым часам лёкаі, гаворачы між сабою, дзівіліся нечаканай перамене пана, апавядалі адзін аднаму страшныя сны, якія бачылі ў час учарашняе буры. А між тым праца ў пакоях ішла спорна, і перад заходам сонца адпаліраваная мэбля, бронза і люстры былі як новыя.

Вось ужо і вечарэе. Скамароха загадаў лёкаям вывесці сабаку і каб ніводзін з іх не заходзіў да яго, пакуль не пакліча. Самотна ходзячы па пакоі, паліў люльку. Пасля адчыніў вакно: усюды панавала цішыня і ўжо колькі зорак свяцілася на небе. Запаліў свечку, паставіў на стале — і тут убачыў у куце ўчарашняга госця. На тонкіх нагах, вочы, як дзве іскрынкі, кідалі святло, і дзікая ўсмешка прабягала па яго брыдкім твары. Перапалоханы Скамароха адскочыў на некалькі крокаў і сказаў:

— Не магу глядзець на цябе без агіды, твой твар мне страшны.

— Слабыя нервы маеш. Калі пазнаёмімся бліжэй, дык на ўсё будзеш глядзець без прыкрасці ды страху і лепш уладкуешся на свеце. Ты добра падрыхтаваўся прыняць госцю, зараз яна прыляціць.

Толькі сказаў гэта — залятае ў вакно сарока, большая і зграбнейшая за іншых сарок, пёры на ёй белыя як снег, вочы чорныя. Апусцілася на стол. Здзіўлены гаспадар паглядае на жвавыя і імклівыя рухі прыгожае птушкі. Яна зляцела на падлогу — і ў міг вока стаіць пасярод пакоя кабета чароўнае красы: рост высокі, твар ружовы, вочы вялікія, поўныя прывабнасці, на галаве і на ўсім адзенні зіхацяць дыяменты і каштоўныя камяні. Скамароха аслупянеў, слова вымавіць не асмельваецца.

Яна ж такімі словамі перапыніла маўчанне:

— Калі ляцела, дык бачыла прыгожыя горы і лясы гэтае краіны, тут вельмі шмат азёр. Думаю, жыхарам нічога не бракуе?

— Так, пані, — сказаў з паклонам ціхім голасам гаспадар. — Наш край прырода адарыла ўсім, што толькі трэба чалавеку.

— Я даўно мелася пабываць тут, спазнаць гэты край і яго жыхароў. Спадзяюся, што знайду тут сабе зычлівых прыяцеляў.

— Шмат хто будзе мець за шчасце ўбачыць пані.

— А як маюцца тутэйшыя падданыя?

— І яны шчаслівыя. На лугах і пагорках даволі травы для вялікіх чародаў.

Белая Сарока села на крэсла, а пан Скамароха — ля яе. Доўга апавядаў ёй пра берагі Дрысы і Дзвіны. Расказваў, хто і як жыве ў ваколіцы, якую славу мае сярод суседзяў, якія даходы фальваркаў. Расказваў, як гандлююць з Рыгаю, калі разальюцца вясною рэкі, і якая выгада ад таго жыхарам гэтага краю. Размова без перапынку цягнулася да поўначы.

— Я яшчэ наведаю гэты край. І ты пазнаёміш мяне са сваімі добрымі суседзямі. А зараз мушу спяшацца дадому: ужо поўнач, а дарога далёкая.

Сказаўшы гэта, пакланілася гаспадару, імгненна перамянілася ў Белую Сароку і вылецела ў вакно.

Скамароха доўга стаяў здзіўлены і глядзеў туды, дзе схавалася яна ў начной цемры. Вярнуўшыся да крэсла, на

якім сядзела гэтая прыгажуня, убачыў пасярод пакоя яе пасланца. Той трымаў велізарны мех золата.

— Белая Сарока ахвяруе табе гэты падарунак, каб быў верны сам і іншых знайшоў, адданых ёй. Яна наведае твой дом, калі тут ужо будзе некалькі тваіх суседзяў, сапраўды зычлівых да яе.

Сказаўшы гэта, пасланец выскачыў у вакно і знік.

Скамароха самотны хадзіў па пакоі. Дзіўныя мроі сналіся ў ягонай галаве. Багаты ўбор і незвычайная прыгажосць Белае Сарокі і цяпер стаялі ў яго ўваччу. Ні на хвіліну не мог забыць пра яе, і ад гэтых думак прапаў сон. Ні на волас не заснуў, а ўжо ўсё прачнулася, і сонца было высока.

Свіснуў. На панаў выклік прыбег лёкай, і, скуголячы, ускочыў у пакой чорны сабака. Гладзячы сабаку, Скамароха загаварыў да слугі:

— А што, і сёння, можа, мучылі вас жахлівыя сны?

— Ах, пане! Нейкая туга напала на нас і гэтае начы, — адказаў лёкай. — Ва ўсіх нас сон быў кароткі і неспакойны. Вартаўнікі расказваюць, што чулі яны ўначы, як па вёсках вылі сабакі, рыкала жывёла, і бачылі, як з поўначы, шугаючы полымем, ляцеў цмок і іскры сыпаліся з яго; пэўна, нёс золата для нейкае душы, што пабраталася з д'яблам. А аканом казаў, што некаторыя бачылі кабету, якая плакала на цвінтары, ды так, што яе голас наводзіў на ўсіх трывогу і смутак.

Скамароха, крыху змяніўшыся з твару і задумаўшыся, шпарка прайшоўся па пакоі.

— Не кажы больш такое лухты. У вас заўсёды ў размовах нейкія цуды і прароцтвы, вы як тыя забабонныя бабы — кожная рэч вас узрушае і пазбаўляе спакою. Скажы, каб запрагалі коней, паеду сёння да пана Л. і пана С. , а можа, і іншых суседзяў наведаю.

Ездзячы ад маёнтка да маёнтка, ён усюды з захапленнем апісваў прыгажосць, багацце, розум і шчодрасць Белае Сарокі. Са здзіўленнем усе слухалі гэтыя апавяданні і featured рознае пра іх казалі. Некаторыя даводзілі: тут схавана

нейкая здрада і што заплацяць за яе вялікім няшчасцем. Іншыя радаваліся і прасілі пана Скамароху, каб пахваліў іх перад Белай Сарокаю, калі яна другі раз наведаецца ў ягоны палац, і з нецярплівасцю чакалі дня, калі змогуць яе ўбачыць.

Прыехалі да Скамарохі госці. Былі яны ўсе з ліку заўзятых прыхільнікаў Сарокі, хоць бачыць яе яшчэ не мелі мажлівасці. З самага пачатку забаранілі лёкаям заходзіць у святліцу, каб тыя не чулі сакрэтных панскіх размоваў. Келіхі з цудоўным віном стаялі на стале. Скамароха весела апавядаў, якую гаворку меў некалі з Белай Сарокаю. Натхнёна і з запалам гаварыў пра яе розум і хараство, даводзячы, што за ўсё жыццё не бачыў, нават на дасканалых і дарагіх карцінах, такіх высакародных і прыгожых кабетаў.

Гадзіннік прабіў поўнач. Ноч была пагодная, ціхая, і поўня свяціла ў адчыненае вакно.

Гаспадар наліў у келіхі віно:

— Вып'ем за здароўе пані, якая ўвесь час была галоўнай асобаю нашых прыемных размоў.

Ледзь сказаў — з хуткасцю бліскавіцы залятае ў вакно Белая Сарока і апускаецца на стол пасярод поўных келіхаў. Уражаныя гэтым, усе, гледзячы на яе, паўскоквалі са сваіх месцаў. Нечаканае маўчанне ў пакоі. Зрабіўшы колькі хуткіх рухаў на стале, яна глянула на гасцей, лёгка, як вецер, зляцела на падлогу, — і вось ужо бачаць усе перад сабою кабету дзіўнае прыгажосці, усю ў дыяментах і перлах.

— Здалёку спяшалася да вас, спадзеючыся знайсці тут зычлівых сваіх прыяцеляў, — сказала яна. — Не памылілася ў спадзяваннях: бачу, у гэтай грамадзе ўсе добрыя сэрцы. Я ўмею ацаніць іх жаданні і буду шчыра думаць пра ваша шчасце.

— Так, пані, — сказаў гаспадар. — Імя Вашай Мосці ўвесь гэты час нязменна было на нашых вуснах. Усе, каго пані бачыць перад сабою, найшчырэйшыя вашы прыхільнікі і самыя адданыя лёкаі — да скону.

Затым Белая Сарока села ў крэсла, ласкава размаўляла з кожным госцем, распытвала пра гаспадарку і прыбытак з фальваркаў, выказвала свае заўвагі і давала парады.

Хутка бег у гэтых размовах час. Гаспадар узяў са стала поўны келіх і сказаў:

— Давайце вып'ем за здароўе нашае пані.

І ўсе госці з поўнымі келіхамі ў руках закрычалі разам:

— Няхай жыве Белая Сарока! — І адным глытком выпілі да дна.

Яна ўстала з крэсла, дзякуючы ўсяму застоллю, пакаштавала віна і паставіла келіх на стол. Так амаль уся ноч прамінула ў размовах і віватах.

Ужо заранка паказалася на небе, заружавеліся воблакі перад узыходам сонца. Яна падзякавала гаспадару за гасціннасць, а гасцям за іх зычлівыя пажаданні, перамянілася ў Белую Сароку і вылецела ў вакно.

Кажуць, што яна гэткім чынам наведвала начамі ўсіх тых, з кім пазнаёмілася ў палацы пана Скамарохі, і ўсюды за яе здароўе лілося віно і гучалі віваты.

У хуткім часе пачалі спраўджвацца прадчуванні простых людзей. Тая страшная чараўніца патаемна разаслала ва ўсе бакі шкоднікаў, каб яны крыўдзілі бедных сялян. Раскажу панам выпадак, які ў той час здарыўся недалёка адсюль у вёсцы Клішкове, там усе пра гэта і зараз успамінаюць.

Дойныя каровы, усе адразу, пачалі сохнуць, і малако ў іх зусім прапала. Бясспрэчна, чары. Па ўсіх ваколіцах былі чуваць скаргі і нараканні, ды не можна было ўведаць, адкуль прыйшло тое зло. Выпадкам адзін вартаўнік з Клішкова, перад самым узыходам сонца вяртаўшыся дадому, убачыў, што сарока, белая як снег, вылецела з хаты аднае кабеты, якой пан у той вёсцы пабудаваў новую хату з вялізнымі вокнамі. Вартаўнік расказаў гэта іншым. Сталі падазраваць, што там жыве чараўніца, пачалі сачыць рознымі спосабамі, каб вывесці на чыстую ваду гэта злачынства.

Нарэшце пра ўсё даведаліся дзіўным чынам. Калі чараўніца на Купалле, схаваўшыся ў дзікім лесе, бра-

ла ў прыгаршчы расу і заклікала злых духаў, каб яны, збіраючы з усіх ваколіц малако, напаўнялі яе посуд, а нанятая за колькі дзён перад тым пахолка, не ведаючы пра намеры свае гаспадыні, павымывала ўсе гліняныя збанкі і драўлянае начынне, перакуліўшы, паставіла сушыць. Злыя духі, не ўбачыўшы гэтага, цэлую ноч насілі малако, вылівалі на падлогу, і раніцаю ўся вёска ўбачыла, што з-пад чараўніцынай хаты плыве глыбокая малочная рака. Не мінула б чараўніцу смерць, ды, калі даведалася пра ўсё, імгненна ператварылася ў птушку і адляцела недзе далёка.

Тады было шмат заломаў у жыце, з'явіліся такія порсткія звяркі, што забіць іх было немагчыма, і яны па аборах стрыглі авечак, а мядзведзі, нападаючы ўсюды на пчальнікі, нішчылі пчол.

Яшчэ больш дзіўную рэч скажу панам: паўсюль снавалі такія зграі ваўкалакаў, што страх было выйсці ў поле.

— Чаму ты іх называеш ваўкалакамі? — спытаўся дзядзька. — А можа, гэта былі сапраўдныя ваўкі, што набеглі з іншых лясоў, ратуючыся ад пажараў? Гэтак мядзведзі і іншыя звяры пераходзяць з аднае мясціны ў другую.

— Ведаю добра, — сказаў Якуш, — што гэта былі ваўкалакі, бо, як расказваюць, шыі ў некаторых з іх былі белыя, чорныя і іншых колераў.

— А чаму?

— Таму што яны — людзі, перавернутыя ў звяроў. Якога колеру раней насілі хусткі на шыях, такая поўсць на шыях зрабілася.

— Дзіўныя кажаш рэчы!

— Але праўдзівыя. Нешчаслівы быў час, наракалі на гора сваё людзі, раздзірала сэрца выццё ваўкалакаў.

— Што ж потым здарылася з панам Скамарохам і іншымі прыхільнікамі Белае Сарокі?

— Белая Сарока, чуючы людскія праклёны і даведаўшыся ад д'яблаў, што стральцы з набітымі стрэльбамі сочаць за ёю, адляцела далёка і больш не з'яўлялася ў нашым краі. Але зло, якое яна пакінула, распаўзлося па наваколлі. Тыя, хто пілі віно за яе здароўе, п'юць слёзы няшчаснага

люду. Пан Скамароха выехаў з гэтае мясцовасці, і кажуць, быццам ён у палацы Белае Сарокі ў абліччы страшнага мядзведзя вартаваў яе незлічоныя скарбы.

Тут Якуш скончыў сваю аповесць пра Белую Сароку, узяў шапку.

— Куды спяшаешся? — спытаўся дзядзька. — Ці табе пан казаў абавязкова сёння вярнуцца?

— Пан дазволіў мне зайсці ў карчму на ігрышча, пабачыцца са знаёмымі ды павесяліцца. А заўтра перад світаннем, перш чым устануць у маёнтку, абавязкова трэба быць дома. Ужо сонца нізка, хутка цямнець пачне.

— Кланяйся ад мяне пану і скажы, што Янка заўтра пасля святое імшы абавязкова ў яго будзе.

## Плачка

Кабета тая незвычайна прыгожая. Вопратка яе — белая, як снег, на галаве — чорны ўбор, і чорная хустка накінута на плечы. Твар хоць і смуглы ад сонца і ветру, але гожы і паглядны, вочы жывыя, і заўсёды блішчаць на іх слезы. Яна з'яўляецца найчасцей у пакінутых дамах, у пустых касцёлах і на руінах. Бачылі яе таксама пад дрэвамі або пасярод поля. Пасля захаду сонца яна сядае на камяні, наракае на лёс жаласным голасам і заліваецца слязьмі. Кажуць, тыя, хто набліжаўся да яе, чулі такія словы: «Няма каму даверыць таямніцу сэрца майго!»

Калі я ехаў з Полацка, на папасе, апавядаў мне карчмар, што там, вобліз дарогі, за бярозавым гаем стаіць пустая хата. Ля яе быў адно невялікі вішнёвы садок. Жыў там даўней селянін, якога з усёй радзінаю выслалі паны кудысьці далёка, забраўшы ў яго некалькі кароў і коней.

Ішоў там убогі сляпы, якога вёў маленькі хлопчык. Пачуўшы ў тым доме журботны спеў, яны падумалі, што там ужо нехта жыве. Дык ідуць туды жабраваць. Заходзяць у хату, сляпы заспяваў песню: «О! Спасіцелю, наш Пане».

— Дом без дзвярэй і вакон, ніхто тут не жыве, — сказаў хлопчык сляпому. — Дарэмна толькі звярнулі з дарогі.

Але тут пасярод хаты з'явілася кабета ў жалобнай вопратцы і са смутным тварам.

— Маліцеся! — кажа. — Усюды ёсць Бог, які будзе вам дапамагаць.

Яна кінула жменю срэбраных манет сляпому ў шапку і імгненна знікла.

Гэты ўбогі, ходзячы ад хаты да хаты, паказваў тыя грошы, на якіх з аднаго боку былі выявы каралёў, а з другога — Пагоня.

Непадалёку ад дарогі, калі едзеш на Віцебск, стаіць пустая каплічка. Там, пасля заходу сонца, бачылі, што яна плакала, седзячы на парозе, і яе маркотны голас далёка адзываўся.

Рознае думалі людзі пра гэтую Плачку. Адны баяліся, што яна вяшчуе нейкае вялікае няшчасце, вайну, паморак або голад ва ўсім краі.

Па вёсках старыя людзі гаварылі між сабою пра гэтую кабету, заўсёды прадказваючы нешта дрэннае. Некаторыя ж з маладых мелі думку зусім іншую. Яны даводзілі, што там, дзе з'яўляецца Плачка, напэўна, скарб у зямлі. І ўся ваколіца гэтую думку ўпадабала.

На канцы тае вёскі жыў убогі чалавек, які даўней увесь свет абышоў. Вярнуўшыся да сваёй сям'і, жыў толькі з міласці. Ён часта паўтараў усім такія словы:

— Браты! Слёзы і нараканні гэтай жанчыны абяцаюць вам не золата і срэбра. Кабета плача на парозе забытае вамі святыні. Вы думаеце толькі пра багацце, а вас чакаюць беднасць і пакуты.

Аднаго дня, пасмяяўшыся са слоў гэтага старога, вырашылі: калі ўсе будуць спаць, ісці туды і выкапаць з зямлі скарб.

Старая капліца была за чатыры вярсты ад вёскі. Дык колькі маладых сялян, узяўшы з сабою струмант, борзда выправіліся туды, каб пачаць свае пошукі раней, чым заспявае першы певень.

Прыйшлі на месца. Змрочны выгляд той ваколіцы наводзіў на іх неспакой і страх. Непадалёку шумеў густы

яловы лес, там маркотна вухала сава, і месяц вельмі рэдка паказваўся з-за чорных хмараў. Капліца, нібы магільны помнік, стаяла на пагорку ў засені бяроз.

Шчыравалі ўсю ноч. Выкапалі глыбокія ямы ў некалькіх мясцінах, але знайшлі толькі спарахнелыя дошкі ды чарапы. Зразумелі, што былі тут калісьці могілкі, хоць і не ацалела на паверхні знакаў, апрача некалькіх ледзь прыкметных абымшэлых камянёў.

Улетку ноч кароткая. Вось ужо на ўсходзе пачынае ружавець ранак. Шукалі дарэмна. Дык засыпалі ямы і вяртаюцца дахаты.

Узыходзіла сонца. Заспяваў у небе жаўрук, і імгла ўжо знікала. Бачаць перад сабою недалёка ад дарогі ля кустоў ляшчыны — стаіць Плачка, тварам на ўсход. У руках ветрык матляе яркую стужку, тая трымціць у паветры, як бліскавіца. Толькі адзін з іх сказаў: «Пайшлі смела да яе» — прывід імгненна знік.

На тым месцы, дзе стаяла Плачка, вісела велізарнае асінае гняздо. Жамярыцы, што залятлі і вылятлі з гэтага гнязда, снавалі ў ранішніх сонечных промнях, нібы залатыя іскры.

— Паслухайце мае рады, — сказаў адзін з іх. — Мы абвяжам асінае гняздо хусткаю. Прыйдзем да старога, разбудзім і скажам, што ля капліцы выкапалі скарб і частку ахвяруем яму. А калі ўстане з пасцелі, укінем яму ў вакно асінае гняздо. Няхай ашалее стары.

Усе пагадзіліся. Разбудзілі старога, укінулі ў хату асінае гняздо, а самі, смеючыся, уцяклі.

Дзіва нечуванае! Стары бачыць перад сабою рассыпанае на зямлі золата. І калі задуменна глядзеў на гэта, кажуць, з'явілася перад ім кабета, тая самая, што плакала на парозе старое капліцы, і сказала:

— Бяры палову гэтага золата сабе, а другую — раздай убогім. Бог дапамагае маім пакутным дзецям.

Сказаўшы гэта, яна ўмомант знікла.

У Інфлянтах жа было такое здарэнне. У маёнтку пана М. узвышаліся руіны нейкага старажытнага замка. Ка-

жуць, што ў пракаветныя часы быў там горад, бо цяпер паводка размывае часам пясок і дастае да падмуркаў старажытных камяніц. Там часта знаходзяць шкляныя або ржавыя жалезныя рэчы, што даўней рабілі дзеля аздобы, а зрэдчас медныя і срэбныя грошы, што вякамі ляжалі ў зямлі.

Сюды штовечар, пасля захаду сонца, прыходзіла Плачка. Яна вешала на руіны вянкі палявых красак, садзілася на камень і, ламаючы рукі, залівалася слязьмі. Не адзін прахожы, чуючы здалёк яе нараканні, смутны вяртаўся дадому і апавядаў пра гэта іншым.

Былі такія цікаўныя, што чуючы лямант дзіўнае кабеты, падышлі ў вечаровым змроку да яе і са слоў, якія пачулі, зразумелі, што нейкая нешчаслівая маці плача па сваіх дзецях. Але толькі надумалі ісці да яе і запытацца, хто яна і якая напаткала яе нядоля, ужо больш не бачылі яе і голас не адзываўся да наступнага вечара.

Не зразумеў ніхто, што за ўсім гэтым хаваецца. Розныя здагадкі хадзілі па наваколлі. Усюды гаварылі пра яе толькі як пра дзіўную камету, што з'яўляецца на небе ў выглядзе вогненнай мятлы. Хацелі даведацца, дзе яна жыве і адкуль прыходзіць, але ўсё марна, нібы які дух, апускалася яна на зямлю і знікала ў паветры.

Кажуць, што і сам пан М. не пярэчыў гэтым дзіўным апавяданням, бо таксама і ён сустрэў яе аднаго разу, вяртаючыся позняй парою дахаты, і чуў, як плакала яна на руінах замка. Не разумеў пан гэтае праявы, аднак, разважаючы, паверыў тым людзям, якія думаюць усё жыццё пра выгоду, хочуць, каб чароўны дух спяваў ім толькі пра золата і срэбра і паказваў скарбы, схаваныя ў зямлі. Дык паклікаў пан аканома і такі даў яму загад:

— Збірай людзей, і заўтра пачынайце капаць на замкавых руінах. Там у зямлі мусіць быць золата, бо як іначай растлумачыш тую праяву? Пэўна, Плачка хоча паказаць нам нейкія скарбы, якія ўзнагародзяць нас за гэтую працу.

— Я чуў словы той Плачкі. Яна аплаквала смерць нейкіх нешчаслівых дзяцей, а пра скарбы, схаваныя ў зямлі, і не

ўспаміналa. Гэтая таямніца нам недаступная. Мне здаецца, тут нейкае папярэджанне і перасцярога.

— Ты падобны да няясыці ці то да савы, якая страшыць людзей жахлівымі прароцтвамі. Я ні ў што такое не веру і не хачу спрачацца пра гэтую таямніцу. Даўно быў у мяне намер раскапаць руіны. Можа, знойдзем там памяткі старажытнасці. Дзеля гэтага не шкада і працы. А калі хто думае, што гэты скарб будзе ў абліччы Плачкі, дык і гэта нядрэнна. Што б там ні было, заўтра пачнём раскопкі.

— А калі гэты скарб закляты і вартуюць яго злыя духі, ды немагчыма яго дастаць, бо ён будзе ўсё глыбей і глыбей апускацца ў зямлю, — тады толькі час страцім, а калі і здабудзем што, дык больш будзе бяды, як чаго добрага. Бо я чуў, што недзе даставалі з зямлі зачараваныя скарбы, і калі нехта ўзяў з іх толькі пенязь[1], таму нейкая хвароба скруціла абедзве рукі.

— Брыдка слухаць. Пляцеш лухту, як дурны мужык. Мне ніякі пенязь не шкодзіць.

— А чаму ж разумныя і багатыя паны пакутуюць ад нуды і хвароб?

— Годзе. Збярэш заўтра людзей і вядзі на руіны. Я сам прыеду і пакажу, дзе пачынаць.

Аканом быў з засцянковае шляхты, заможны гаспадар, але верыў у тое самае, што і просты люд; згорбіўся ён і пайшоў выконваць панскі загад.

Яшчэ толькі паказалася сонца, а гурт сялян ужо стаяў на руінах і чакаў каманды. Калі прыехаў пан М., дык загадаў капаць глыбока на тым самым месцы, дзе заўсёды бачылі на камені Плачку.

Дол быў не глыбейшы, чым на паўтара локця[2]. Знайшлі мураваны склеп, дык раскапалі і вакол, каб адкрыць з усіх бакоў засыпаныя зямлёю сцены. Людзі працавалі не адзін дзень. Адпачынак іх быў кароткі: апоўдні, у самую спякоту. Нарэшце знайшлі жалезныя дзверы. З абодвух бакоў гэ-

[1]Самая дробная манета ў грашовай сістэме Вялікага Княства Літоўскага.
[2] Локаць — адзінка вымярэння даўжыні ў Вялікім Княстве Літоўскім раўняўся 64,96 см.

тага склада былі маленькія вакенцы, на якіх яшчэ моцна трымаліся жалезныя праржавелыя краты.

Выламалі дзверы і адчынілі гэты склеп, куды стагоддзяў колькі не заглядваў сонечны прамень, — глуха там, бы ў магіле. Заходзяць з агнём. Усіх апанаваў страх: паўсюль — пасярод і ля сцен — у розных паставах ляжаць шкілеты; косці рук і ног яшчэ ў цяжкіх кайданах. Здранцвелі людзі, гледзячы на такі жах.

— Здыміце кайданы з гэтых шкілетаў, — сказаў пан М., — і прывязіце мне. Варта захаваць гэтыя памяткі мінуўшчыны.

Завезлі кайданы пану. Ён, паказваючы іх гасцям і сваім суседзям, ганарыўся, што такія старажытныя рэчы здабыў з зямлі, хоць з выгляду яны былі зусім падобныя да цяперашніх.

Косці нябожчыкавыя людзі сабралі, пахавалі ў адной магіле на бліжэйшых могілках, запрасілі ксяндза і з набажэнствам паставілі велізарны драўляны крыж.

Кажуць, што ў той самы вечар з'явілася Плачка ў сваім звычайным жалобным уборы, аздобіла магілу кветачкамі і, укленчыўшы перад драўляным крыжам, тварыла малітвы, заліваючыся слязьмі. Людзі бачылі гэта, але ніхто не падышоў да яе. Паглядаючы здалёк, яны адмаўлялі «Вечны супакой» за душы памерлых.

Яшчэ колькі вечароў Плачка малілася, пасыпала магілу кветкамі, але цяпер ужо яе ніхто не бачыў.

На беразе Палаты, за пяць вёрст ад горада, дзе гэтая рэчка мінае пушчы і набліжаецца праз абшары палеткаў да Дзвіны, з'явілася тая самая Плачка. Бачылі яе на пагорку, таксама пры заходзе сонца. Яна сядала на камень, які там ляжаў у засені разложыстых бяроз. Бачылі яе сяляне, ідучы дахаты пасля дзённае працы, і падарожныя, што вярталіся з горада ўвечары.

Разышлася вестка пра гэтую праяву. Людзі, так як і ўсюды, мелі розныя меркаванні, але большасць трымалася тае думкі, што там ляжаць закапаныя ў зямлі скарбы. У Полацку некаторыя казалі, што ваколіцы іх горада і даўней

вельмі часта былі тэатрам вайны. Засталася легенда, быццам частка нейкага войска, зразумеўшы трагічнасць свайго становішча і баючыся, каб іх багацце не дасталося непрыяцелю, закапала золата і срэбра, якое мела пры сабе, на тым пагорку ў зямлю, паклала наверх дзікі камень, каб пазначыць гэтае месца, калі хто з іх вернецца шукаць схаваны там скарб. Але прайшлі стагоддзі, той камень ляжаў на тым самым месцы, а пад ім — некрануты скарб.

Чуючы такія размовы, колькі юнакоў, што жылі ў Полацку, дамовіліся між сабою, каб пайсці ноччу на той пагорак, дастаць скарб і падзяліць яго між сабою. Узялі патрэбны струмант і, калі ўсе спалі, выйшлі за горад.

Ноч была пагодлівая. Неба — высыпанае зоркамі, і поўня плыла ўверсе. Ішлі яны ціха і асцярожна, каб ніхто не сустрэў іх на дарозе. Мінулі касцёл св. Ксаверыя, дзе спачываюць астанкі законнікаў[1] і абывацеляў гэтага краю. Пачуўшы на Спасе голас вартаўнікоў, што пераклікаліся між сабою, яны звярнулі з дарогі і доўга ішлі берагам рэчкі аж да самага месца.

Прыйшлі на ўзгорак, знайшлі дзікі камень. Палова яго была ў зямлі, а верх пакрываў сухі мох. Акапалі яго вакол і супольна сапхнулі з таго месца. Глыбока ў зямлю ўбілі рапіру. Востры канец стукнуў так, нібы крануў нейкую металёвую рэч. Бясспрэчна, тут скарб. Пачалі капаць.

Працавалі доўга. Часта паролі зямлю рапіраю. Скарб быў неглыбока, але пясок колькі разоў засыпаў яму. Стаялі нейкі час задуменныя: ім здавалася, што зачараваны скарб хаваецца глыбей, не хоча давацца ім у рукі.

Пакуль раіліся між сабою, што рабіць, з усходу паплылі чорныя хмары, закрылі ўсё неба і схавалі месяц. Зрабілася так цёмна, што яны адзін аднаго ледзь бачылі. Зацерусіў дожджык.

— Лепей будзе капаць, калі пясок зробіцца мокры, — сказаў нехта з іх. — Дык давайце не марнаваць часу.

І, падахвочваючы адзін аднаго, супольна пачалі капаць.

[1] Манахаў.

Яму выкапалі доўгую і шырокую, такую, што ўжо лёгка не засыплецца.

Рыдлёўкі скрабуць па жалезе.

— Чыгун! Чыгун з грашыма! — закрычалі ўсе з вялікай радасцю, але, калі абкапалі вакол і хацелі падняць чугун з зямлі, — убачылі, што гэта цяжкі жалезны панцыр. Ён закрываў грудзі шкілета, ля якога ляжаў меч, а на чэрапе — жалезны шалом-шышак. Стаяць усе задуменныя, бачачы, якім дзіўным чынам падманула іх надзея.

Тут адзін смялейшы кажа:

— Давайце пакінем гэты шкілет, а зброю забяром сабе. Няхай хоць яна будзе памяткаю пра гэтую ноч.

Толькі хацелі зрабіць гэтак — аж раптам маланка асвятліла пагорак, бачаць: стаіць Волат у жалезным панцыры, трымаючы агнёвы меч у іх над галовамі. Страх працяў сэрцы. Гром скалануў зямлю. І Волат такімі словамі азваўся:

— Нікчэмныя людзі! Золату і срэбру прадалі вы свае душы. Думаючы адно пра багацце, вы зняважылі прах Героя, які слаўна скончыў тут сваё жыццё. Прыйдзе час падняцца з магіл мёртвым, і вы будзеце зганьбаваныя перад усім светам!

Азваўся ў хмарах гром, і Волат знік.

Страх апанаваў іх душы. Доўга стаялі нема, як начныя здані. У святле бліскавіцы бачаць перад сабою пяском засыпаны дол, і здаецца, што на гэтым месцы зямля некранутая.

Забылі на пагорку рапіру і свае рыдлёўкі; забылі, якая дарога вядзе да горада; беглі праз лугі і палеткі, і здавалася ім, што той Волат з мячом у руках доўга гнаўся за імі.

Раніцаю вярнуліся ў горад. Знясіленыя, з бледнымі тварамі — нібы змучаныя цяжкаю хваробаю, са страхам успаміналі тое здарэнне. Расказвалі іншым, але не ўсе далі веры.

Пасля гэтага Плачку бачылі ў розных мясцінах паблізу горада, на могілках, сярод якіх стаіць мураваны касцёл св. Ксаверыя. Там, ламаючы рукі, хадзіла яна ад адной

магілы да другой, часам, як слуп мураваны, моўчкі стаяла над астанкамі нябожчыкаў. Не адзін прахожы, мінаючы начной парою гэтыя мясціны, уцякаў спалоханы, нібы ад вампіра, і расказваў дзівы іншым.

Бачылі яе і ля касцёла св. Казіміра. Сядзела яна перад дзвярыма гэтай святыні ад захаду аж да ўзыходу сонца, няраз плакала ў полі, седзячы на камені або на беразе Дзвіны. Але плач яе і нараканні не шмат каму кранулі сэрца. Мала было такіх, што, узняўшы вочы ў неба, прасілі міласэрнасці Божай. Адны не зважалі, другія марылі пра скарбы.

— На маю думку, — сказаў Завальня, — гэта папярэджанне людзям, каб выправілі свае норавы. Але прыкра, што людзі цяпер такія разумныя, што ўсё яны ўжо ведаюць, ні ў якія цуды не вераць. Ім трэба скарбы, каб, не працуючы, мець усё, што толькі заманецца. Яны за золата прададуць усё тое, што нашы бацькі цанілі некалі даражэй за жыццё.

— Аднак няблага і скарбы шукаць, — сказаў я. — Багаты чалавек шмат дабра можа зрабіць.

— Багаты чалавек можа шмат добрага зрабіць. Гэта праўда, — сказаў дзядзька. — Але няхай жа ён навучыцца перш пазнаваць і любіць тое, што ёсць дабро. А тады Бог зробіць яго годным уладаром зямных скарбаў, як таго старога чалавека, якому ў вакно кінулі асінае гняздо, і яно перамянілася на вачах яго ў залатыя пенязі. Людзі ганяюцца за багаццем не дзеля таго, каб рабіць бліжнім дабро, а каб нічога не рабіць або — што яшчэ горш — каб шкодзіць. Але што ж далей?

— Калі некаторыя нашы багатыя і вучоныя паны падарожнічаюць у шыкоўных фаэтонах або на ловах гойсаюць з ганчакамі па лясах, гарах і пустках, гэтая Плачка часта сустракае іх, нібы сірата, ва ўбогім сялянскім уборы, моўчкі падымае на іх блакітныя, слязьмі залітыя вочы, быццам просячы ў іх літасці, але з гэтых паноў ніхто на яе не зважае.

Недалёка ад возера Рабло, дзе цяпер на выспе стаіць мой дамок, калі пан Завальня ведае той край, пэўна,

бачыў ён Пачаноўскую гару, яна там вышэйшая ад усіх іншых. Схілы яе пазарасталі лесам, а вяршыня роўная і гладкая.

Пра гэтую гару між людзей розныя ходзяць апавяданні. Кажуць, што колісь там быў кляштар і касцёл, і хоць не відаць ніякіх знакаў, кажуць, быццам чуваць з-пад зямлі спевы і галасы званоў.

Іншыя расказваюць, што на самай вяршыні гэтае гары, уначы, у сваім жалобным уборы, упаўшы на калені, рукі і вочы ўздымаючы да зорак, малілася са слязьмі Плачка. Перад ёю адкрылася неба, найяснейшае сонечнае святло разлілося ўверсе гэтак, што ў лясах і на палетках прачнуліся ўсе птушкі і звяры і ад слёз гэтае кабеты ўтварылася крыніца жывое вады.

З таго часу чалавек, які першы раз наведае вяршыню Пачаноўскай гары, той, хто раней не чуў пра гэтае дзіва, сустрэне чысцюткую крыніцу, а недалёка ад яе стаіць журботная сіраціна ў сялянскім уборы. Хто нап'ецца з гэтай крыніцы і пазнае сірату, той будзе вешчуном, усе таямніцы ўбачыць ён з вяршыні гары.

Узыходзілі людзі на гару. Былі і такія, што бачылі крыніцу і смутную сіраціну, аднак не зважалі на іх. Пачуўшы ад іншых пра тыя дзівы, узыходзілі другі раз, але ўжо не сустракалі нікога і не знаходзілі месца, дзе была тая крыніца.

— Няўжо гэта тая самая Плачка, якую бачылі ў ваколіцах Полацка і ў іншых кутках Беларусі, прыходзіць у абліччы сялянскае сіраты?

— Пэўна, тая самая, — сказаў сляпы Францішак, — але людзі шукаюць адно выгод, поўныя пыхі, яны не пазналі яе, хоць яна па ўсім краі з'яўляецца ў адным вобліку. Ніхто яе не зразумеў.

— Ты, Янка, — чалавек вучоны. А ці разумееш, хто была тая Плачка?

— Цуды можна разумець сэрцам, а не навукаю.

Яшчэ нейкі час мы гамонілі пра гэтую Плачку, і заспяваў певень.

— За поўнач ужо, — сказаў сляпы Францішак. — Дазволь, пане Завальня, падарожнаму адпачыць.

— Дзякуй табе, — сказаў дзядзька, — цудоўнае апавяданне.

Ён патушыў святло, і я пайшоў у свой пакой. Пра Плачку думаў, аж пакуль другі раз не праспяваў певень.

## *Сын Буры*

Узыходзіла, прабіваючыся праз імглу, сонца. Моцны мароз замаляваў узорамі шыбы. Бярозавыя дровы гарэлі ў печы. Завальня і сляпы Францішак сядзелі ля агню, размаўляючы пра знаёмых суседзяў, пра багатых і бедных, пра жабракоў, што блукаюць па свеце, пра шчаслівае жыццё, аб прадказаннях і дзівах незразумелых.

— Зімою, — сказаў Завальня, — заязджаюць да мяне людзі, і толькі ў гэтую пару маю выпадак, каб мне хтонебудзь расказаў, што дзеецца на свеце, а ўвесну і ўлетку жыву як пустэльнік. Бачу вакол ваду і цёмныя лясы, рог паляўнічага і стрэлы часам толькі даносяць вестку пра блізкіх гасцей. З лясоў выходзяць сюды на адпачынак з гуртамі лоўчых панічы гэтых краёў, але ад іх не пачуеш такога, што магло б заняць думку. Іх размовы толькі пра сабак і коней.

— Я амаль усё сваё жыццё быў вандроўнікам, сустракаў людзей з рознымі думкамі і душамі. Будучы сляпым, не бачу іхніх твараў і постацяў. У маім уяўленні яны паўстаюць у выглядзе нейкіх страшных і дзіўных духаў. Размовы іх, снуючыся ў маёй галаве, нагадваюць, як рознымі шляхамі ў жыццёвым віры Усёмагутнасць Божая вядзе нас да вечнасці, дзе мы чакаем адпачынку, уцехі і ўзнагароды.

— Размовы людзей, якія пакутуюць, кранаюць сэрца і надоўга застаюцца ў памяці. І як сумна слухаць показкі тых паноў, якія, жывучы заўсёды сярод вясёлых забаваў, хочуць паказаць свой розум і іншых пацешыць!

— Я сустракаў некалі ў вандроўках пілігрыма — не ведаю, хто ён быў і адкуль, — які называў сябе Сынам Буры. Ад яго я даведаўся, што ў жыцці паспытаў ён гора на ўсю поўніцу. Не выгнанне хвалявала і не давала спакою ягоным думкам, а іншае разуменне шчасця.

— Ці расказваў ён пра сваё жыццё? Дзіўны нейкі чалавек! Называў сябе Сынам Буры.

— Ён гаварыў са мною некалькі гадзін.

— Мусіць, цікавая была размова?

— Раскажу, як было. У дарозе напаткала мяне бура, лінуў дождж, падзьмуў моцны вецер. Мой павадыр, не бачачы нідзе блізка ані карчмы, ані вёскі, пагнаў каня да густога лесу, каб, прынамсі, схавацца ад залевы пад дрэвамі. Шумелі вакол лес і дождж з градам. Стрэлы перуноў наводзілі трывогу. Я, накрыўшы галаву плашчом, пад шатамі густое яліны прамаўляў малітвы.

— Нехта стаіць недалёка ад нас, — сказаў мой спадарожнік. — Вандруе ён пеша, у бурцы, на плячах уздзеты на кій хатулёк, пазірае ў неба. Здаецца, грымоты і маланкі не палохаюць яго, а забаўляюць. Твар апалены сонцам і бледны, нібыта змучаны доўгім падарожжам.

— Можа, які чужаземец вандруе праз Беларусь далей на поўнач.

— З буркі льецца вада. Ён, здаецца, на гэта не зважае. Па дарозе ідзе ціхай ступою да нас.

— Пэўна, гэта ў яго не першая бура, — сказаў я. — Прызвычаіўся да нягодаў.

— Не першая для мяне гэтая бура, — кажа пілігрым, пачуўшы мае словы. — Прызвачаіўся да нягодаў. І яшчэ болей скажу: люблю слухаць шум ветру, люблю глядзець на хвалі чорных хмараў і на пажары перуноў.

Падышоў да мяне і кажа:

— Я бачыў справа ад гэтых лясоў, на гары, мураваны палац. Ці не ведаеш, чый ён?

— Я не тутэйшы жыхар, а да таго ж — сляпы. Усё схаванае ад мяне.

— Сляпы! Жывеш на свеце, не бачачы яго. Журботнае такое жыццё!

— Што ж рабіць! Бог паслаў гэтае няшчасце. Трэба цярпліва трываць.

— А ці ўмееш цярпліва трываць? О! Тады ты шчаслівы. Я такім быць не магу, хоць вандрую па ўсім свеце адзін, без павадыра.

— І што пагнала цябе ў далёкае падарожжа?

— Так мне наканавана. О! Калі б ты меў вочы, сляды пакут на маім твары шмат сказалі б табе пра маё жыццё.

— З якіх ты ідзеш краёў і як завуць цябе?

— З далёкіх краёў. А імя маё — Сын Буры.

— Дзіўнае імя.

— Няма тут нічога дзіўнага. У багатым палацы, абкружаны мноствам лёкаяў і лісліўцаў, жыве Сын Шчасця. Ён ясны і халодны, як кавалак золата, з пагардаю пазірае на сваіх падданых, якія мусяць, як пчолы, дзеля яго выгоды і ўцехі збіраць па лугах мёд. У хаце, пад саламянай страхою, жыве Сын Цярпення. Гэты ўсім сэрцам прывязаўся да таго кутка зямлі, які корміць яго і апранае. Я — Сын бацькоў, гнаных Бураю і Неспакоем. Мой бацька не разарваў жалезных кайданаў, якія колькі год упіваліся ў яго рукі і ногі. Нескангчоныя слёзы і наракання маці мае, калі быў яшчэ ў яе ўлонні, паўплывалі на ўсю маю натуру. Я нарадзіўся з адзнакаю няшчасця на чале.

— Ты не падобны на тую Плачку, — сказаў я, — пра якую чуў, што нядаўна з'яўлялася ў розных мясцінах, заломваючы рукі і заліваючыся слязьмі.

— Чуў ты, але не бачыў яе, бо не маеш вачэй.

— І тыя, хто яе бачылі, не зразумелі і цяпер не ведаюць, хто яна і адкуль.

— Не зразумелі, — сказаў ён, — бо ніхто пра яе не думаў. Ах! Як хутка прамінуў той час, калі я ведаў толькі палі і гай, якія акружалі ўбогі дамок бацькоў маіх. Любіў самотна блукаць па гарах і лясах, кожнае дрэўца і красачка жывілі мае мары. О цудоўная багіня! Ты спаткала мяне ў той час у сукенцы вясёлкавых барваў і з кветкамі на галаве, з высокіх гор паказала ты мне далёкі свет, над якім пад аблокамі лунаі арлы. З таго часу гэты цуд заняў

усе мае думкі і жаданні. Вырашыў я высока, далёка ляцець і пабачыць, што дзеецца на свеце. Але ты знікла, і я блукаю па волі буры!

— І хто ж была тая багіня, пра якую ты ўзгадаў цяпер?

— Тая самая, якую ты называеш Плачкаю.

— Дык ты яе ведаеш?

— Я наведаў далёкія краіны, сярод чужога народа яе тужлівы голас заўсёды гучаў у маіх вушах. Пераплываў моры, — шумныя хвалі не маглі заглушыць яе журботнага спеву. Усюды яна была маёй адзінаю марай. Вось ужо вецер разагнаў аблокі. Бывайце! Да заходу сонца я буду далёка.

Ён пайшоў. Але яго дзіўнае імя і сумнае апавяданне так запалі ў мае думкі, што колькі начэй, уяўляючы дзіўны характар гэтага чалавека, не мог я заснуць.

— І ніколі больш яго не сустракаў?

— І не чуў нават, каб хто-небудзь успамінаў пра яго.

— Нешчаслівае стварэнне! Будзе туляцца па ўсім свеце і ўсюды пакутваць. Чаму ж ён не прыйдзе да Бога: заступніцтва Божае ўваскрашае надзеі. Госпад супакоіў бы ягоны смутак.

**Канстанцін Вераніцын**

# Тарас на Парнасе

## I

Ці знаў хто, братцы, з вас Тараса,
У палясоўшчыках што быў?
На Пуцявішчы, у Панаса,
Ён там ля лазні блізка жыў.
Што ж, чалавек ён быў рахманы,
Гарэлкі ў губы ён не браў,
Затое ж у ласцы быў у пана —
Яго пан дужа шанаваў.
Любіла тож Тараса й паня,
І войт ні разу не збрахаў,
Затое ж ён балота з рання
Да цёмнай ночы пільнаваў.
Чуць золак — стрэльбу ён за плечы,
Заткне сякеру за паяс, —
Заўсёды ходзіць бор сцярэгчы
Ды птушак біць з ружжа Тарас.
Хадзіў ці доўга ён, ці мала,
Ды толькі нешта адзін раз
Бяда ў бары яго спаткала...
Во, як казаў нам сам Тарас.

II

«На самага Кузьму-Дзям'яна[1]
Пайшоў я біць цецерукоў.
Устаў я нешта дужа рана, —
Здаецца, з першых петухоў.
Іду сабе я панямногу,
Але на пень крыху прысеў,
Аж тут — лоп-лоп! — цераз дарогу
Як быццам цецярук зляцеў.
Злажыўся стрэльбай — кляпсь! — не паліць,
Крамзель з другога! — не пякець!
Гляджу — аж вось з-за елі валіць
Як ёсць хароміна-мядзведзь!
Хоць не труслівы я дзяціна,
Але затросся, як асіна,
Зубом, як цюцька, лепячу.
Аж бачу — зломана лясіна,
І ўздумаў: дай-ка ўскачу!

III

Скакнуў — не трапіў, праслізнуўся
І ў яму старчаком лячу!
Ляцеў, ляцеў — як разануўся, —
Аж стала зелена ў ваччу!
Ляцеў ці доўга я, ці мала,
Таго ніяк не ўцямлю,
Але ўжо ладна рассвітала,
Як я зваліўся на зямлю.
Устаў з зямлі, абкалаціўся, —
Бо быў у гразі я, як свіння,
І доўга сам сабе дзівіўся —
Дзе апынуўся гэта я?

[1] Народнае свята, якое прыпадае на глыбокую восень. Кузьма і Дзям'ян — апекуны кавалёў.

Рукой паскробшы каля вуха,
Дастаў з кішэні рагавень[1]
І храпы напіхаў цяртухай, —
Бо ўжо ня нюхаў цэлы дзень!
Як прасвятлелі мае вочы,
Мядзведзя ўжо я не шукаў.
Закінуў стрэльбу я за плечы
І па бакох глядзець пачаў.

IV

А вохці мне! Як там прыгожа!
Як быццам хто намаляваў!
Чырвоны краскі, мак і рожы, —
Ну, як сукенку хто паслаў!
І птушкі ёсць там, дужа стройна
Пяюць, палепш за салаўя!
А вохці мне, а-а-а-войя!
Куды патрапіў гэта я?
Стаяў я доўга і дзівіўся,
Разявіў зяпу і глядзеў,
Аж вось адкулечка з'явіўся —
Ці то прышоў, ці прыляцеў —
Хлапчына нейкі круглалікі,
Увесь кудравы, як баран,
І за плячыма ў яго вялікі
Прычэплен лук быў і калчан.
— Адкуль, куды дарога гэта? —
Спытаў я ў хлопчыка той час.
— Дарога гэта з таго света,
Ідзе прамою на Парнас! —
Сказаўшы, хлопчык таго часу
На крыллях шпарка паляцеў
Дарогу ж паказаць Тарасу,
Ня меўшы часу, не хацеў.

---
[1] Табакерка з валоўяга рога для нюхальнага табаку.

## V

Падумаў я тады нямнога:
Што за шайтан[1] Парнас такі?
Пайшоў я проста той дарогай,
Узяўшы ў рукі добры кій.
Прайшоў вёрст дзевяць той дарогай,
Аж бачу я — гара стаіць;
А пад гарой народу многа,
Як бы кірмаш які кіпіць.
Прыйшоў я бліжэй, што за ліха:
Народ не просты, ўсё паны!
Хто дужа шпарка, хто паціху,
Усе лезуць на гару яны
І, як у школе, галасуюць,
Гатоў адзін другога з'есць,
Бо кожны морду ўперад суець,
Каб першым на гару ўзлесць.

## VI

Усе з сабой цягаюць кніжкі,
Аж з іншых пот руччом плюшчыць,
Друг дружцы выціскаюць кішкі.
Аж нехта з-паміж іх крычыць:
«Памалу, братцы, не душыце
Мой фельетон вы і «Пчалу»[2],
Мяне ж самога вы пусціце
І не дзяржыце за палу!
А не, дык дадушы, ў газеце
Я вас аблаю на ўвесь свет,
Як Гогаля ў прошлым леце, —
Я ж сам рэдактар ўсіх газет!»
Гляджу сабе — аж гэта сівы,

[1] Сатана, нячыстая сіла.

[2] «Северная пчела» — рэакцыйная газета. Выходзіла ў Пецярбургу з 1825 па 1867 гг. Да 1859 выдавалася Ф.В. Булгарыным і Н.І. Грэчам.

Кароткі, тоўсты, як кабан,
Плюгавы, дужа некрасівы,
Крычыць, як ашалелы, пан[1].
Нясе вялікі мех пан гэты,
Паўным-паўнюсенька набіт.
Усё там кніжкі ды газеты,
Ну, як каробачнік які!
Таварыш[2] поплеч з ім ідзе
І несці кніжкі пасабляе,
А сам граматыку нясе,
Што ў семінар'ях вывучаюць.
Вось нехта, сеўшы ў тарантасе[3],
На гору цягнецца трушком;
Знаць, любяць тых і на Парнасе,
Хто ездзіць конна, — не пяшком.

VII

Во, нешта разам зашумелі,
Народ раздаўся на канцы,
І, як бы птушкі, праляцелі
Чатыры добрых малайцы.
Народ то быў усё не такоўскі:
Сам Пушкін, Лермантаў, Жукоўскі
І Гогаль, шпарка каля нас
Прайшлі, як павы, на Парнас.
Ну, словам, многа тут народу
Сабралась лезці на Парнас.
Былі паны, было і зброду,
Як часам і на свеце ў нас.
Праміж людзей і я штурхаўся
І ціснуўся, што ёсць пары;
Вось чуць-не-чуць такі прабраўся
І лезу проста да гары.

---

[1] Маецца на ўвазе Ф.В. Булгарын.
[2] Падразумяваецца Н.І. Грэч, аднадумца і паплечнік Ф.В. Булгарына.
[3] Намёк на У.А. Салагуба — вядомага ў свой час рускага пісьменніка, аўтара аповесці «Тарантас» (1845).

## VIII

Узлез. Гляджу — аж хата нова
Стаіць, зазвычай панскі двор,
Кругом яго там тын яловы:
Нябойсь не плох — не ўлезе вор!
А на дварэ тым свінні ходзяць,
Сабакі, козы, бараны...
Знаць, і багі хазяйства водзяць,
Калі свіней дзяржаць яны.
На грошы ў тронкі[1] тут гуляюць
Парнаскі хлопцы-дзецюкі,
А хто капейкі з іх не маець,
Той лупіць толькі на шчаўчкі.
Улез к багам тады я ў хату...
А вохці мне! Ні даць, ні ўзяць,
Як у казарме там салдатаў —
Багоў — не можна пашчытаць!»

## IX

Тарасу ліха што здаецца, —
Ну, як бы ў рандзе[2] ён сядзіць:
Хто піпку курыць, хто смяецца,
А іншы песню бурудзіць[3].
Глядзіць ён, аж на лаўцы шыюць
Шаўцы багіням хадакі,
Багіні ж у начоўках мыюць
Багам кашулі і парткі.
Сатурн[4] там, лыкі размачыўшы,
Падвіркай лапці падплятаў;
Па свеце добра пахадзіўшы,
Лапцей ён многа патаптаў.

---

[1] Складаны, перачынны ножык.
[2] У карчме.
[3] Бармоча, цягне сабе пад нос.
[4] Па старажытнарымскай міфалогіі — бог часу і пладароднасці.

Няптун на лаўцы чыніць сеці
І восці садзіць на шасты,
Пры ім жа, мусіць, яго дзеці,
Дзіравы ладзяць нераты.

X

Вось б'юцца Марс[1] ды з Геркулесам[2],
А Геркулес, як той мядзведзь, —
Каб цешыць старага Зевеса,
Хахол ён Марсу добра мнець.
Зевес жа наўзніч лёг на печы,
Сярмягу ў голавы паклаў...
Ён грэў на печы стары плечы
І нешта ў барадзе шукаў.
Во перад люстрам задам меліць
І маслам мажа валасы
Ды нечым белым твар свой беліць
Вянера, знаць, дзеля красы.
Амур[3] жа з дзеўкамі жартуе,
Ну, проста смех ажно бярэ!
То ён знянацку пацалуе,
То хустку з галавы здзярэ;
То на гармоніку зайграе,
То німфам песню запяе,
То адным вокам заміргае,
Як быццам бы каго заве.

XI

Вось затраслася ўся гара:
Зевес на печы зварухнуўся
Зяўнуў і дужа пацягнуўся
Ды кажа: «Есці ўжо пара!»

---

[1] Па старажытнарымскай міфалогіі — бог вайны.
[2] Грэчаскі міфалагічны герой, які вызначаўся незвычайнай сілай.
[3] Па рымскай міфалогіі — бог кахання.

Тады праворна дзеўка Геба
Гарэлкі ў чаркі наліла
І, як жарон, букатку[1] хлеба,
Прынёсшы, — бразь! — сярод стала!
Яна ў найміткі ў неба ўзята,
Каб есць варыць і плацці мыць.
Нябось, не дарам яе плата —
Ці ж лёгка столькіх накарміць?!
Во, з усяго сабраліс неба!
Як тараканы каля хлеба,
Багі паселі ўкруг стала,
І стравы смачны з печы Геба[2]
Насіць да столу пачала.

XII

Наперш дала яна капусту,
Тады са скваркамі кулеш,
На малацэ крупеню густу
Дае ўволю, толькі еж.
І з пастаялкай жур сцюдзёны,
А з кашы сала аж цякло,
Ды і гусяціны смажонай
Уволю ўсім багом было.
Як унясла ж на стол каўбасы,
Бліны аўсяны ў рашаце,
Аж слінкі пацяклі ў Тараса
І забурчала ў жываце.
Багі гарэлку піць пачалі,
З насадкі[3] ў чаркі так і льюць!
Падпіўшы, песні запявалі
Ну, як у рандзе, ўсе пяюць.
Бах сп'яну пеў такі прыпеўкі,
Што аж ня можна гаварыць,

[1] Бохан.
[2] Багіня маладосці, дачка Зеўса.
[3] Пасудзіна з рыльцам.

Аж засаромеліся дзеўкі,
Так стаў ён брыдка развадзіць.
А Зеўс тым часам насцябаўся,
Што носам чуць зямлю ня рыў, —
Ён вочы плюшчыў і ківаўся
Ды быццам нешта гаварыў.
Хоць не мае то, праўда, дзела,
Не след мне, можа, і казаць,
Любіў ён цешыць грэшна цела
Ды часам лоўка падгуляць.

XIII

Але багі-такі ўсталі,
Як ўсё паелі, папілі.
Во... разам у дуду зайгралі,
Скакаць багіні пачалі.
Узяўшы хустачку, Вянера
Пайшла «мяцеліцу» скакаць.
Прыгожа, стройна цераз меру,
Пяром не можна апісаць.
Чырвона, тоўста, круглаліца
І вочы, як на калясе,
Як жар, гарыць яе спадніца,
Істужкі ўплецены ў касе.
Хапіўшы келішак гарэлкі,
Амур яшчэ павесялеў —
Іграць пачаў ён на жалейцы
І дзеўкам стройна песні пеў.
Няптун з прыгожанькай наядай[1]
Пайшоў упрысядку «казака»;
Нябось, і ў старога гада
Кроў грае, як і ў дзецюка,

[1] Німфай.

А во і сам Юпітар[1] з Вестай[2], —
Пусціўся, стары хрэн, у пляс,
Як бы жаніх перад нявестай,
Заткнуў ён рукі за паяс.
А во і Марс у новых ботах;
Ён, мусіць, ботаў не жалеў,
Бо з німфамі скакаў да поту,
Гуляў у жмуркі і шалеў.
І кожны бог так разгуляўся,
Што аж не можна ўдзяржаць.
А хто гарэлкі насцябаўся,
Таго пад лаўку клалі спаць.

XIV

Вось як зайграў дудар плясуху,
Ніяк Тарас наш не ўцярпеў,
І ад парога, што ёсць духу,
Скакаць на хату палящеў.
Як стаў прыстуківаць атопкам,
Аж рот разінулі багі:
То ён прысвісне, то прытопне,
То шпарка пойдзе ў кругі.
Глядзеў Юпітар і дзівіўся,
І пад дуду ў далоні біў,
У канцы к Тарасу прыбліжыўся
І так яго перапыніў:
«А ты адкулечка, прыяцель?
Зачым прыйшоў ты на Парнас?
Ты хто такі? Ты не пісацель?»
«Не, мой панок! — сказаў Тарас, —
Я палясоўшчык з Пуцявішча,
Чуць золак сёння са двара,
Прыйшоў сюды я да паўдня шчэ,
Ды ўжо й дадому мне пара.

[1] Згодна рымскай міфалогіі — бог багоў.
[2] Багіня сямейнага ачага і ахвярнага агню.

Ці не была б, паночак, ласка
Адсюль дамоў мяне завесці?
Хадзіўшы па гары Парнаскай
Мне дужа захацелась есці...»

XV

Кіўнуў Зевес — і мігам Геба
Крупені ў міску наліла
І добрую краюху хлеба,
Сказаўшы: «Еж», — мне падала.
Крупені смачнай пахлябаўшы,
Усіх падзякаваў багоў;
Кашэль за плечы прывязаўшы,
Сабраўся ўжо ісці дамоў.
Але зефіры падхапілі,
Хто за руку, хто за пояс,
І, як бы птушкі, паташчылі
Яны мяне цераз Парнас.
Няслі на крыллях, быццам вецер,
І проста прынеслі ў наш лес.
Гляжу я: мусіць, ужо вечар,
Бо маладзік на неба ўзлез...»

З тых пор Тарас ужо не ходзіць
Так дужа рана па лясах,
А дзеля гэтага не шкодзіць
Бярвенне красці па начах.
Дык вось што бачыў наш Тарас,
К багам узлезшы на Парнас.
Ён гэта мне апавядаў,
А я ў паперку запісаў.

**Тарас Шаўчэнка**

# *Думка*

Цяжка-цяжка жыць на свеце
Сіраце без роду:
Няма куды прыхіліцца, —
Хоць з гары ды ў воду!
Утапіўся б маладзенькі
У той быстрай рэчцы;
Утапіўся б — цяжка жыці,
І няма дзе дзецца.
Ходзіць доля ў каго полем,
Каласкі збірае,
А мая дзесь, нягодніца,
За морам блукае.
Добра таму багатаму:
Яго людзі знаюць;
А са мною сустрэнуцца —
Вокам абмінаюць.
Багатага, губатага
Дзяўчына шануе;
З мяне, сіраты гаротнай,
Смяецца, жартуе.
«Ці я ж табе не прыгожы,
Ці не ў цябе ўдаўся,
Ці не люблю цябе шчыра,
Ці з цябе смяяўся?

Любі ж сабе, маё сэрца,
Любі, каго знаеш,
Але з мяне ты не смейся,
Калі ўспамінаеш.
А я пайду на край свету...
На чужой старонцы
Знайду лепшую ці згіну,
Як той ліст на сонцы».
Пайшоў казак сумуючы —
Нікога не кінуў;
Шукаў долі ў чужым полі
Ды там і загінуў.
Уміраючы, ўглядаўся,
Дзе сонейка ззяе...
Цяжка-цяжка уміраці,
Цяжка ў чужым краі!

* * *

Садок вішнёвы каля хаты,
Хрушчы над вішнямі гудуць,
Ратаі з ворыва ідуць,
У вёску спеў нясуць дзяўчаты —
І рады маткі іх пачуць.

Сям'я сабралася ля хаты,
Зара вячэрняя ўстае.
Дачка вячэраць падае,
Ёй маці хоча даць парады,
Дык салавейка не дае.

Паклала маці каля хаты
Маленькіх дзетачак сваіх,
Сама заснула каля іх,
Заціхла ўсё... адно дзяўчаты
Ды салавейка не заціх.

# Цары

*Паэма*

Сястра старая Апалона[1]!
Калі б вы часам, хоць на час,
Прыдыбалі б такі да нас,
Ды, як бывала у дні оны,
Узвысілі б свой божы глас
Да оды пышна-баявое,
Дый захадзіліся абое
Цароў, напрыклад, апяваць!
Бо як папраўдзе вам сказаць,
Дык вельмі ўжо і мне самому
Абрыдлі тыя мужыкі,
Пакрыткі, панічы, панкі;
Хацелася б сагнаць аскому
На каранованых галовах,
На тых памазанніках божых...
Ды што ж? Не ўтну! А як паможаш,
Пакажаш птахаў тых упрах
Скубці і патрашыць, дык, можа,
Й мы патрымаем у руках
Памазаннікаву чупрыну.
Пакіньце ж свой святы Парнас[2],
Прыдыбайце хоць на гадзіну
Ды хоць старэнькі божы глас
Узвысьце, дзядзіна! Ды ладам,
Ды добрым складам, хоць на час,
Хоць па гадзіначку у нас
Мы венцаносную грамаду
Пакажам спераду і ззаду

[1] Бог сонца і мастацтва ў старажытных грэкаў. Яго сёстры — музы (іх было дзевяць) — пакравіцельніцы розных відаў мастацтва.
[2] Гара ў Грэцыі, дзе па ўяўленні старажытных грэкаў жылі Апалон і яго сёстры — музы.

Сляпым людзям. У добры час
Давай пачнём, мая парада!

I

У Ерусаліме не бачна нікога.
Вароты замкнёны, як быццам чума
Ў Давідавым месце, захованым богам,
Сядзіць на пляцы. Не, чумы — дык няма!
А горшае ліха, благая часіна
Пакрыла Ізраіль: царова вайна!
    Князі царовы, і ўсе сілы,
    І юнакі, і ўвесь народ,
    Замкнуўшы ў горадзе ківот,
    Гурмой у поле павалілі
    І там у бітвах сіразцілі
    Маленькіх дзетачак сваіх.
    А ў месце маладыя ўдовы,
    Ў сваіх святліцах адмысловых
    Замкнуўшыся, дзяцей малых
    Калышуць, плачучы. Прарока,
    Давіда[1], прагнага цара,
    Клянуць свайго гаспадара.
    А ён, узяўшыся у бокі,
    Па даху кедравых палат
    У срэбнай рызе пахаджае
    І, нібы кот той, пазірае
    На сала, на зялёны сад
    Суседа Гурыя[2]. А ў садзе,
    У тым зялёным вертаградзе[3],
        Вірсавія[4] купалася,

[1] Давід — ізраільскі цар (з 1055 па 1015 да н. э.). Лічыцца, што ён валодаў паэтычным дарам і складаў рэлігійныя песні — псалмы.
[2] Гурый — военачальнік пры цару Давідзе.
[3] Вертаград — фруктовы сад, вінаграднік.
[4] Вірсавія — жонка Гурыя, а пасля яго смерці — цара Давіда, маці цара Саламона.

Як у райскай плыні,
Таго Гурыя сябрыня,
Царова рабыня;
Купалася сабе з богам,
Грудзі свае мыла
І цара свайго святога
У дурні пашыла.
Сцямнела, і, цемрай кругом ахінёны,
Сумуе ў дрымотнасці Ерусалім.
У пышных палацах, нібыта шалёны,
Давід пахаджае — о цар неўпынёны!
І сам сабе кажа: «Я... Мы павялім!
Я цар над божым над народам!
І сам я — бог маёй зямлі!
Я — ўсё!..» А трохі потым
Рабы вячэру падалі
І кубак добрага сікеру[1]...
І цар сказаў, каб на вячэру...
Рабы рабыню прывялі,
Такі ж Вірсавію. Няўрокам —
Да божага цара-прарока
Сама Вірсавія прыйшла
І павячэрала, сікеру
З прарокам выпіла й пайшла.
Крыху спачыць пасля вячэры
З сваім царом. І Гурый спаў.
Яму й не снілася, вядома,
Што ціха дзеялася дома,
Што з дому цар яго украў
Не золата, не серабро,
А лепшае яго дабро,
Яго Вірсавію украў.
А каб не ведаў ён аб шкодзе,
Дык цар забіў яго, і годзе!
А после цар пры ўсім народзе

[1] Сікер — хмялёвы напітак.

Заплакаў трохі, абдурыў
Псалмом старога Анафана[1]...
І зноў вясёлы, і зноў п'яны
Каля рабыні захадзіў.

Святыя так цары жывуць.
А як жа простыя? Не знаю,
І раю вам таго не знаць
Ды і ні ў кога не пытаць,
Каб не зашкодзіла, бывае!..

II

Давід, святы прарок і цар,
Не вельмі быў благачасцівы.
Была дачка ў яго Фамар
І сын Амон[2]. І нам не дзіва:
Бываюць дзеці і ў святых,
Ды не такія, як другіх,
А іншыя... Амон шчаслівы,
Прыгожы першы сын яго,
Ляжыць, хварэючы чагось.
Давід і стогне, і рыдае,
Рве рызу, попел пасыпае
З бяды сабе на галаву:
«Я без цябе не пажыву
І дня адзінага, мой сыне,
Мой лепшы, дарагі хлапчына!
Не ўбачу сонца і зару,
Я без цябе памру, памру!»
І, плачучы, ідзе да сына,
Ажно трушком нібы бяжыць,
А той, бугай сабе здаровы,

[1] Анафан — біблейскі прарок часоў Давіда, абвінавачваў цара ў забойстве Гурыя. Цар, каючыся, напісаў пакаянны псалом.
[2] Амон — старшы сын цара Давіда. Быў забіты сваім братам, які помсціў за сястру Фамар.

У харомах сваіх кедровых
Ляжыць, — аж стогне, а ляжыць.
Смяецца з дурня; аж галосіць,
Аж плача, бедны, бацьку просіць,
Каб да яго Фамар прыйшла.
«Мой добры бацька і мой цару!
Скажы сястры маёй Фамары,
Каб коржыкаў мне напякла
Ды каб сама і падала,
Пакаштаваўшы іх, устану
І ачуняю я». Назаўтра рана
Фамар спякла і падала
Для брата коржыкі. За рукі
Амон бярэ яе, вядзе
Ў пакоі цёмныя, кладзе
Сястру на ложак. Ломіць рукі,
Сястра рыдае і, рвучыся,
Крычыць да брата: «Схамяніся!
Амоне, браце мой здрадлівы!
Адзіны браце мой! Я... Я...
Сястра адзіная твая!
Дзе дзецца мне? Дзе грэх жахлівы
І сорам дзець? Цябе самога
І бог, і людзі праклянуць!..»
Не памагло-такі нічога!..
Вось так царэвічы жывуць,
Дурэючы на свеце.
Любуйцеся, людскія дзеці.

III

І вось пражыў Давід на свеце
Ужо нямала год.
Абнядужаў, пакрывалі
Старога рызамі яго.
А ўсё ж такі не награвалі
Ката блудлівага свайго.
Вось хлопцы і прымеркавалі

(Натуру воўка добра зналі!)
І, каб нагрэць яго, ўзялі
Найлепшых за царыц красою
Дзяўчат старому навялі —
Хай грэюць кроўю маладою
Свайго цара. І прэч пайшлі,
Замкнуўшы дзверы за сабою.
Аблізаўся кот нядошлы
І распусціў сліны.
Кіпцюры распасцірае
Да Саманцяніны[1],
Бо была сабе на ліха
Лепшая між імі,
Між дзяўчат, — нібы лілея
Пышная ў даліне
Паміж кветак. Ды яна вось
І грэла сабою
Цара свайго, а дзяўчаты
Між сабой гулялі
Голенькія. Як яна там
Грэла, я не знаю,
Знаю толькі, што цар грэўся
І... і не позна ю[2].

IV

Па двары ціха пахаджае
Стары вясёлы Рагвалод[3],
Дружына, юнакі, народ
У золаце навокал ззяюць.
У князя свята: выглядае
З Літвы ён князя-жаніха
У сваты да дачкі Рагнеды[4].

---

[1] Саманцяніна — Авісага Сунаміцянка, дзяўчына з палесцінскага племені сунаміцян.
[2] Ю (царк.-слав.) — яе.
[3] Рагвалод — полацкі князь канца X ст.
[4] Рагнеда — дачка Рагвалода.

Перад багамі Лель і Лада[1]
Агонь Рагнеда разьвяла,
Алеем пахкім паліла
І сыпала на вугаль ладан,
Нібы валькірыі[2], навокал
Танцуюць, цешацца дзяўчаты
    і прыпяваюць:
    «Гой, гоя, гоя!
    Новыя пакоі
    Кветкамі ўбіраці
    Ды гасцей чакаці!»

За Полацкам, як тая хмара,
Чарнее пыл. Бягом ляцяць
Хлапцы і сівыя баяры
З Літвы вясельных сустракаць.
Сама Рагнеда з Рагвалодам
Пайшла з дзяўчатамі, з народам.

Не з Літвы йдзе князь спадзяваны,
Шчэ незнаёмы, ды чаканы,
А там з Кіева турам-буйвалам
Па Рагнеду йдзе, ідзе вепрышчам
Уладзімір[3] князь з кіяўлянамі.

Прыйшлі, і горад абступілі
Кругом, і горад запалілі,
Уладзімір князь перад народам
Забіў старога Рагвалода,
Паця[4] народ, княжну пая[5].

---

[1] Лель і Лада — у славян Лада — багіня вясны і кахання, Лель — яе сын.

[2] Валькірыі — у скандынаўскай міфалогіі ваяўнічыя дзевы, якія пераносілі душы загінуўшых герояў з поля бою ў Вальхалу — мясціну, дзе жылі багі.

[3] Уладзімір — вялікі князь кіеўскі. З яго імем звязана хрышчэнне Русі. Царква абвясціла яго святым.

[4] Паця (царк.-слав.) — парэзаў, пабіў.

[5] Пая (царкв.-слав.) — узяў.

Адыдзе ў воласці свая —
Адыдзе з шумам. І растлі ю[1],
Рагнеду тую маладую,
І пражане ю[2], і княжна
Па свеце блукае адна,
Не зробіць з ворагам нічога.
Дык вось наколькі ў іх святога
У тых царах!

V

Бадай іх каты расціналі
Усіх цароў, гадзюк людскіх!
Дакука з імі, каб вы зналі!
Як дурань ходзіш каля іх,
Не знаеш, як і дзе ступіці!
Дык што, парайце, мне рабіці
Цяпер з паганымі? Скажы,
Сястра старая Апалона!
Наўчы, галубка! Памажы
Палазіць трохі каля трона!
Каралечкі, як зараблю,
Табе к Вялікадню куплю.
Дык пададзімся ж у лакеі
І дбайна ў новенькай ліўрэі
Пачнем цароў сваіх любіць.
Шкада і алавок тупіць,
Бо дзе няма святое волі,
Не будзе там дабра ніколі.
Навошта ж нам сябе дурыць?
Хадзем у селішчы, там людзі,
А там, дзе людзі, — добра будзе;
Там будзем жыць, людзей любіць,
Святога госпада хваліць!

---

[1] Растлі ю — згвалціў яе.
[2] Пражане ю — прагнаў яе.

**Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч**

# П*інская шляхта*

*Фарс-вадэвіль у адной дзеі*

## АСОБЫ

| | |
|---|---|
| Кручкоў — станавы прыстаў. | |
| Пісулькін — яго пісарчук. | |
| Ціхон Пратасавіцкі.<br>Куліна — яго жонка.<br>Марыся — іх дачка.<br>Іван Цюхай-Ліпскі.<br>Грышка — яго сын.<br>Цімох Альпенскі.<br>Базыль Статкевіч.<br>Харытон Куторга.<br>Дзесяць іншых асоб.<br>Дзесяцкі. | пінская ваколічная шляхта |

Дзея адбываецца ў ваколіцы О.... паміж балотаў, у глушы Пінскага павета. Сцэна паказвае шляхецкую ваколіцу. Гаспадарскія будынкі раздзелены садамі з боку сцэны — хата заможнага гаспадара; пры ёй — лаўка.

## З'ява I

М а р ы с я *(седзячы на лаўцы, прадзе і прыпявае)*

Цяжка жыці мне, дзяўчаці,
З міленькім ў разлуцы, —
Лае бацька, лае маці,
Што сэрцайка ў скуцы.
Годзе сядзець над прасніцай, —
Я хачу быць маладзіцай!
Маці кажа: век малоды,
Ой, ты яшчэ мала!
А сама ўжо ў гэты годы
Бацьку пакахала.
Годзе сядзець над прасніцай, —
Я хачу быць маладзіцай!

Ой, так! Няхай ганіць бацька, няхай лае маці, а я люблю Грышку і любіць яго век буду. Ой, бедныя ж нашы галованькі!.. Што гэта за дур напаў на бацькоў? П'яныя завяліся ды пабіліся з сабою за шляхецтва, а мы з Грышкам праз тое гаруем і ныем. Яго бацька падаў на майго ў суд скаргу, і сягоння прыедзе ў ваколіцу найяснейшая карона[1] на прасоку. У ім цэлае наша спасенне. Як прыедзе, дык мы з Грышкам паклонімся яму ў пояс ды будзем прасіць ды маліць, каб ён пагодзіў нашых бацькоў ды каб яны дазволілі нам пажаніцца. А ён такі сярдзіты, не дапускай ты госпад! Як наставіць адзін вус угору, а другі ўніз ды крыкне: па найяснейшаму ўказу! — то бацькі спалохаюцца ды зладзяць нам вяселле... Ды што гэта зрабілася Грышку?

Грышка паціху паказваецца з-за дрэва, крадучыся да Марысі.

[1] Даўней асэсараў, або засядацеляў, а потым станавых прыставаў, таму што першыя выбіраліся падчас шляхецкіх выбараў, а другія назначаліся ўрадам, — пінская шляхта велічала найяснейшай каронай.

Баюся, каб не паўставалі бацькі, — нельга было б пабачыцца з ім. *(Устаўшы, пахаджваючы па сцэне, гаворыць.)* Ой, Грышка, Грышка! Ты штось цяпер зрабіўся вельмі лянівы. Табе, пэўна, сэрца цяпер так ужо не ные па мне... Як прыйдзе, дык пакажуся перад ім сярдзітаю і хоць будзе прасіць і маліць, каб пацалавала, дык не пацалую. Дальбог, што не пацалую!

## З'ява II

Грышка і Марыся.

Грышка. Дык я ж і прасіць не буду, сам цябе пацалую. *(Цалуе яе.)*

Марыся. Ах, Грышка, нядобры! Як ты спалохаў мяне, гневаюся не жартам!..

Грышка. Гневаешся? Няпраўда! А чаму ж ты на мяне так міленька пазіраеш?

Марыся. Так, са злосці!.. Нягодны, дзе ты забаўляўся? Гэта ж зараз прыйдуць бацькі, а мы так многа маем з табою перагаварыць.

Грышка. Выбачай, мілая Марыся, — чуць золак, я з'ездзіў ужо да места, кінуўся ў ногі асэсару і прасіў, каб ён узяў нас пад сваю апеку.

Марыся. Трэба было завезці які гасцінчык.

Грышка. Дык я ж завёз яму двух зайцоў, тры пары цецерукоў ды кадобчык мёду. Ён усе прыняў ласкава і сказаў, што сёння ж прыедзе на разборку справы майго бацькі з тваім. Ой, наварылі бацькі сабе кашы, будзе што есці! Ён вельмі сярдзіты, — бо адзін вус калом угору стаў. Будзе вазня!

Марыся. Дай Бог, каб гэта каша нам зубоў не папрышчыла!

Грышка. Ён дакляраваў зрабіць нам вяселле. На Богу ды на ім — уся наша надзея.

ДУЭТ

Паклаўшы надзеі на Бога,
Чаго ж гараваць?
Прысяглі любіці да гроба, —
Дык будзем жа ждаць.
Хоча няшчасная доля
Навек разлучыці, —
А Бог скажа: мая воля
Ім з сабою жыці!
Не памогуць злыя языкі,
Ні бацькоў старожа, —
Ён жа такі пан вялікі,
Што хоча, то зможа!

## З'ява III

Тыя самыя, Ціхон Пратасавіцкі і яго жонка Куліна.

Ціхон. Хрэн табе ў вочы, — жонка, а жонка! Хадзі да паўзірайся, як дачка твая з Грышкам Цюхайчыкам галубіцца!

Куліна *(за сцэнай)*. Хто? Дачка? Бойся Бога, ды яна ж яшчэ малая. *(Уваходзіць.)*

Ціхон. Які чорт малая! Хрэн табе ў вочы, — хадзі палюбуйся!

Марыся. Якая ж я малая, калі мне на Спаса скончыцца семнаццаць год?!

Куліна. Маўчы ты, хітрая лісіца! Бачыш ты, як яна скора палічыла гады!

Ціхон. Ах ты, чортаў сыну, — хрэн табе ў вочы! Не годзе таго, што бацька да жывога мяне пакрыўдзіў, назваўшы не шляхціцам, дык яшчэ сынок дачку нам баламуціць.

Грышка. Ды я ж яе люблю і хачу з ёю жаніцца...

Ціхон. Ось я цябе так пажаню, як твайго бацьку! Жонка, а жонка! Дай мятлу, — хрэн табе ў вочы!

Грышка. Што хочаце, тое рабіце, а ўсё-такі Марыся будзе мая! *(Да Марысі.)* Бывай здарова! *(Выходзячы, спатыкаецца з Куторгам і збівае таго з ног.)*

Марыся ўцякае ў хату.

### З'ява IV

Тыя ж і Куторга.

Куторга. Ах, ты, паганец! *(Устаючы.)* Татарын ты нехрышчоны! Вот збіў мяне, як шведаў Хадкевіч пад Кіргольмам. Пачакай жа, я ж табе не дарую гэтай штукі, — не цяпер, то ў чацвер. *(Вітаецца.)* Дзень добры, пане Пратасавіцкі! Здарова, пані Пратасавіцкая! *(Цалуе яе ў руку.)* Відна, відна, — дзякуй богу! Здаровы, як рыжкі баровы... А я к вам з вялікаю навіною. Не ведаеце? Толькі што пан асэсар прыехаў, а такі сярдзіты, не дапускай госпад! Як ліхі татарын. Як толькі ўехаў у ваколіцу ды стаў каля Бэркі, дык зараз і закрычаў — дзесяцкіх, соцкіх! Сабраць усю шляхту да Ціхона Пратасавіцкага, ды каб Іван Цюхай-Ліпскі прыйшоў з сынам туды ж.

Ціхон. Хрэн яму ў вочы, — будзе бяда, будзе! Гэты сабака Ліпскі падаў на мяне ў суд, што я яго адлупцаваў, дык вот і асэсара прыслалі. Ну, абдзярэ, як ліпку!

Куторга. Вот дзіва, — на тое ён і асэсар! Заўваж толькі — у яго і рукі даўжэй, як у другіх людзей. Ты ведаеш яго прыпавесць: чырвонае — белае ўсё перадзелае.

Гдзе унадзіцца юрыста,
Вымеце хату дачыста,
Такіх дзіваў нагаворыць,
Так многа кручкоў натворыць,
Што, пачасаўшы затылак,
Не рассупоніш памылак.
Не дасі, — цябе замучыць.

Добра стара казка вучыць:
Дзярэ каза ў лесе лозу,
Воўк дзярэ у лесе козу,
А ваўка — мужык Іван,
А Івана — ясны пан,
Пана ўжо дзярэ юрыста,
А юрысту — д'яблаў трыста!

Ціхон. Хрэн табе ў вочы! Добра табе прастарэкаваць, калі няма на шыі бяды. Ось скажы лепш, што рабіць? Пане Куторга, ты ж такі пісьменны чалавек, — можаш падаць разумную раду.

Куторга. А прымеце ж чэсна маіх сватоў да вашай Марысі?

Куліна. Бойся Бога, пане Куторга, — яна ж яшчэ маладзенькая! Гэта ж дзіця горкае.

Ціхон. Які чорт дзіця, калі з хлопцамі цалуецца!

Куторга. Дык чаго ж чакаць! Гэта, кажуць, кепскі тавар: мый ды чашы, потым спяшы, — заплаці каму, каб вывез з даму.

Ціхон. Добра, пане Куторга, — бяры сабе дачку, і пасаг дам, толькі зрабі ласку: выцягні з бяды.

Куторга. Як чорта з балота.

Куліна. Парадзь, пане Куторга, — ты ж такі чалавек бывалы і па судах цягаўся.

Куторга. Ну, я гатоў вам удружыць, толькі як ваша дачка захімерычыцца ды адцураецца ад мяне, то што тады? Вы ж ведаеце прыпавесць: даганяючы не нацалавацца.

Ціхон. Ратуй, ратуй, пане Куторга! Марысю ты ладам утамоніш, — чалавек ты разумны. Як падпусціш лёстачак, як падплывеш селезнем, дык яна і расплывецца.

Куторга. То ведаеце што, пане Пратасавіцкі? Як прыйдзе к вам асэсар, то стаўляйце мяне ў сведкі; хоць я і не бачыў, але буду сведчыць, што ён цябе біў, а ты толькі бараніўся. Не жаль для Марысі скрывіць душою. Толькі ж, пані Пратасавіцкая, прышліце сюды Марысю, каб я мог з

ёю пагаварыць ды ўгаманіць дурную, бач, каб не цуралася разумнага чалавека.

Куліна. Памагайце толькі майму Ціхону, а ўжо Марыся будзе ваша; я ёй сама ладам напілую вушы... Пойдзем, Ціхон, прыгатуемся, каб па-гаспадарску прыняць найяснейшую карону. А ты, пане Куторга, пачакай, — зараз прышлю Марысю. *(Выходзіць з Ціхонам.)*

### З'ява V

Куторга (адзін).

Куторга. Ну, хвала Богу, бацькоў удалося атуманіць! Цяпер трэба пайсці ў галаву па розум, каб дзеўку амарочыць. Прынадны, бач, кусочак. *(Цалуе пальцы, як бы смакуючы.)* Тварык — як сонейка яснае, шчочкі — як малінкі красныя, губкі — мо тыя каралі, а як засмяецца срэбным галасочкам ды вышчарыць зубкі — то, здаецца, бачыш два перлавыя шнурочкі. Ды і пасаг мае гаспадарскі: адна ў бацькоў, а стары грошы асьмінаю мерыць; у гумне поўна, у хаце дастатак, і абора багата. Добра гутарка кажа: калі абора цячэ, — гаспадыня бліны пячэ, а калі гумно цячэ, — гаспадар з хаты ўцячэ. Дык няхай жа дзень у дзень блінамі гасцей прымае. Праўда, век не схожы: я ўжо шосты дзесятак дажываю, а яна — семнаццаты гадок. Будзе клопату нямала, — о-ёй! Не раз пачашу патыліцу, — моладзь, як пчолы ў вуллі, будуць аблягаць маю хату; прыяцеляў копамі лічыць буду. Дык што ж рабіць? Не я першы, не я апошні, — дурных дзядоў нямала на Божым свеце. Каб сарваць такую прыгожую і багатую кветачку, не шкода і ў балоце пакачацца.

Хто на старасць парыскуе,
Той хоць часам бяду чуе.
А пры маладзенькай жонцы,
Пры руплівай гаспадыньцы

Быць філосафам — то значыць:
Не бач, што не трэба бачыць.

*(Выцягвае над галавою пальцы, паказваючы рогі.)*

Вырастуць над галавой грушы,
Думай, што даўгія вушы.
Гуляе жонка паночы, —
Ты мэрам спіш, зажмур і вочы.
Тады табе — жыццё небам:
Ўсялякім тваім патрэбам
Жонка рада дагадзіці;
Стане крэпка ця любіці.
Скажа: муж мой, хоць старэнькі,
Ды разумны і міленькі!

Так, так! У цяперашнім разумным веку хочаш спакойна жыць? Будзь філосафам: бачыш — не бачыш, чуеш — не чуеш, — ба, ба, бы! Ды вось і Марыся ідзе сюды. Якая красачка! Гледзячы на яе, аж слінка па губах цячэ. Ану, Куторга, падпусці ёй лёстачкі...

**З'ява VI**

Марыся і Куторга.

Куторга *(салодка пасміхаючыся, заляцаецца)*. Дабрыдзень, панна Мар'яна!

Марыся *(сарамліва)*. Дабрыдзень, пан Куторга!

Куторга. А як панна Мар'яна прыгожа выглядае, які свежы тварык, моў ружачка толькі што з пучка! З якой нецярпячкай я ждаў шчаслівага моманту, каб пацалаваць беленькую ручку панны. (Падыходзіць з камічнай зграбнасцю і цалуе руку Марысі. Тая, адступіўшы назад, абцірае руку фартушком.) Панна Мар'яна! Вы не чуеце, вы не ведаеце, як я вас крэпка люблю, як па вас ныю.

### РАМАНС

Рвецца маё сэрца да красненькай розы,
Быццам бы пры колах атоса із лозы.
Па панне Мар'яне душа ўся сумуе,
Быццам бы зязюля жалосна кукуе.
Як не бачу панны, жыццё мне — магіла,
Галоўцы цяжэнька, уцякае сіла.
Ой, высах я, высах, як лапаць у печы!
Горка ж мая доля, хто мяне улечы?
Як цетраў ў лясочку жалосна балбоча,
Так мае сэрцайка да панны сакоча.
Ні верашчака, каўбасы дзялянка, —
Нішто не смакуе без цябе, каханка!
Дам табе зэгар вялікі, як рэпа,
Няхай ён пры сэрцы крэпка тваім клепа
Ды напамінае, як цяжка я ною
І ні ўдзень, ні ўночы не маю спакою...

М а р ы с я *(перабіваючы)*. А ведаеце ад чаго гэта, пане Куторга? — Ад старасці! Ды ты ўжо нямала пажыў, — пара аб дзяўчатах перастаць думаць, а маліцца Богу, каб даў спасенне.

К у т о р г а. Стары, стары!!! *(У гневе)*.

### ДУЭТ

Кажаш, што я ладам стары, —
Але — відны, але — яры!
Буду крэпка ця любіці,
Век табе верай служыці.
Малады ж — часта няшчэры,
Не шукай ў ем добрай веры:
Пры табе — табе клянецца,
А з другой — з цябе смяецца.

Марыся
Ды што мне з мужа старога?!
Я хачу майго мілога,
Бо стары, заміж гуляці,
Будзе кашляць і стагнаці.
Грышка мой — хлапец матарны,
Малады, відны ды гарны,
Глядзь! Аж душа к яму рвецца
І сэрцайка мацней б'ецца.

Куторга
Але Грышка твой няшчэры,
Не шукай ў ём добрай веры!
Пры табе — табе клянецца,
А з другой — з цябе смяецца.

Падчас спеву ўваходзяць станавы з Пісулькіным
і хаваюцца па баках, каб падслухаць іх размову.

Бач, сабака Грышка! Ён клешчам упіўся табе ў сэрца, ды нічога з таго не будзе. Бацька твой дакляраваў мне тваю руку за тое, што я буду сведкай проціў Цюхая-Ліпскага. Найяснейшая карона прыехаў на прасоку па жалобе Цюхая на твайго бацьку, што ён яго пабіў; і калі ты пойдзеш за мяне, дык я гатоў і душою пакрывіць, ды даказаць на следстве, што бацька твой не біў Цюхая; а калі маё не ў лад, то я з сваім назад. Заспрачаўся толькі, дык я зараз буду сведкай проціў твайго бацькі. Уехаў твой родны ў нерат — ні ўзад, ні ўперад. Папаўся юрысту ў кіпці, — выссе ён яго, як упыр непамысную дзяўчыну. А калі б яму і ўдалося перапрасіць найяснейшую карону, то не канец яшчэ бядзе. Ведаеш, што кажуць людзі: чорт бяду перабудзе — адна згіне, дзесяць будзе. Справа ў суд як пойдзе, дык так дапякуць юрысты, моў баравіка на вуголлях, — адцураецца і сваіх.

Марыся. Дарма ты мяне палохаеш! Мы з Грышкам паклонімся ў пояс найяснейшай кароне, дык ён пагодзіць нашых бацькоў, а табе за крывое паказанне дасць харошую гонку.

Куторга. Што?! Ты думаеш, я баюся асэсара? Ды я такой задам яму пары, што ён не згадае, дзе ўюны зімуюць. Я чалавек бывалы, маю розум і патраплю ладам яго вывесці ў поле, як зайчыка пад хартоў.

## З'ява VII

Тыя самыя, Кручкоў і Пісулькін. Кручкоў падыходзіць ціха к Куторгу ды б'е яго па плячы; Пісулькін жа з камічнаю ўхваткаю падыходзіць да Марысі, каторая сарамліва і баючыся кланяецца.

Кручкоў. Дык ты мяне думаеш вывесці ў поле? Хочаш павучыць, дзе ўюны зімуюць? Пачакай жа, галубчык! Я ж цябе навучу, куды няправых сведкаў садзяць. Гэй, дзесяцкі!

Куторга *(зляканы)*. Ваша благароднае сіяцельства! Найяснейша карона! Ды я ж толькі сабе жартаваў, — вот страшыў дурное дзяўчатка, каб яна прызволіла пайсці за мяне замуж. Бацькі благаслаўляюць, а яна казырыцца, — дык я вось так здуру сказаў ёй.

Кручкоў. Здуру хочаш крыва прысягнуць? А знаеш, чым гэта пахне? Па ўказу ўсеміласцівейшага цара Пятра Вялікага, 1779 года, аўгуста 10-га і па Статуту літоўскаму раздзела 3-га, параграфа 375-га гэта ўгалоўнае прэступленне, Сібірам пахне. Сібір, Сібір, галубчык! Гэй, дзесяцкі!

Дзесяцкі ўваходзіць.

Пасадзі гэтага моладца ў асобую святліцу ды глядзі, каб ён не бачыўся ні з кім, а барані Божа, з гаспадаром не згаварыўся.

Куторга *(выходзячы з дзесяцкім)*. Найяснейшая карона! Бойцеся Бога, не губіце беднага чалавека! Мала што язык малоў, — добра прыказка кажа: млын меле — мука будзе, язык меле — бяда будзе. Выбачайце майму дуру!

Кручкоў. Якому дуру? Ты ж чалавек бывалы і нядаўна хваліўся сваім розумам.

Куторга *(з бакавых дзвярэй).* Які тут у чорта розум, калі так неасцярожна папаўся ў бяду, бы швед пад Палтавай! *(Выходзіць з дзесяцкім.)*

### З'ява VIII

Тыя самыя, апрача Куторгі.

Кручкоў. Ну, пане Пісулькін, пакінь ваша заляцанне, а бярыся за дзела. Тут, брат, нам харошае жніво!.. Гэй, дзесяцкі!

Той уваходзіць.

Пастаў тут пасярэдзіне стол ды накрый яго судовым сукном.

Дзесяцкі выпаўняе прыказанне.

Харошая пагода, можна і на дварэ папрацаваць. Садзіся, пане Пісулькін, ды прыбяры бумагі.

Пісулькін важна садзіцца, вымае корак з чарніліцы, разбірае паперы і іншыя падае станавому, каторы садзіцца таксама пры стале, задам да Пісулькіна, а потым гаворыць да Марысі.

Ну, Марыся, хадзі сюды, пабліжэ, дык кажы мне шчырую праўду, — ты ж бачыш, што ў мяне вусы не натапыраны, дык я не сярдзіты, — кажы: любіш ты Грышку Ліпскага?

Марыся *(саромячыся і перабіраючы хфартушок).* Ну, дык што?..

Кручкоў. За што ж ты яго палюбіла?

Марыся. Сама не ведаю, — вот так штось прыпаў к сэрцу. Ды як жа яго не любіць, калі ён малады, прыгожы хлопец, а сэрца ў яго залатое.

Кручкоў. Дык хош за яго замуж выйсці?

Марыся *(з сарамлівасцю).* Але, хочу... калі за яго не пайду, то ўжо век мне, беднай, гараваці дзеўкай. Найяс-

нейшая карона! Злітуйцеся над намі ды сатварыце наша шчасце! *(Кланяецца яму).*

Кручкоў. Чаго ж ты хочаш ад мяне?

Марыся. Найяснейшая карона! Скончыце дзела няшчаснае між нашымі бацькамі не па-судоваму, а па хрысціянскаму абычаю: пагадзіце іх з сабою, — няхай больш не індычацца, ды прымусьце, каб яны нас з Грышкам злучылі. Найяснейшая карона! *(Кланяецца яшчэ ніжэй і жаласліва кажа далей).* Ты ж такі, хоць чалавек судовы, чыноўны, ды, пэўна, верыш у Бога, — дык дзеля ласкі Божай сатвары ты нам ласку, зладзь нашае шчасце, а мы век будзем за цябе, тваіх дзетак і ўнучкаў Бога прасіць.

Кручкоў. Но, но, мілая, будзь спакойна! Я хоць чалавек, як кажаш, судовы, але ўсё зраблю па-хрысціянску ды яшчэ на тваім вяселлі паскачу... Гэй, дзесяцкі!

Той уваходзіць.

А чы сабралася шляхта з ваколіцы?

Дзесяцкі. Усе сабраліся, хто з курыцаю, хто з кадобчыкам мёду, а хто з сушонай рыбай. Чакаюць, што ваша міласць ім прыкажа.

Кручкоў. Добра! Няхай усе аддадуць хурману, ды спакуйце там харашэнька ў возе... Ты пакліч сюды Ціхона Пратасавіцкага з кабетаю. А Цюхай-Ліпскі з сынам ёсць?

Дзесяцкі. Цюхай, апроч мёду і рыбы, прыцяг дзесяць вянкоў сушаных баравікоў, а сын яго — капу ражынкаўуюноў.

Кручкоў. Добра, добра! Усё ўпакаваць асцярожна! Ды кліч усіх сюды!

Дзесяцкі выходзіць. Кручкоў строіць сур'ёзную фізіяномію: адзін вус ставіць угору, другі ўніз. З глыбіні сцэны выходзіць шляхта, баіцца, кланяецца нізка і хаваючыся адзін за другога. З бакавых дзвярэй выходзіць Ціхон Пратасавіцкі з жонкаю. Марыся зыходзіцца ў глыбіні сцэны з Грышкам і ціха шэпчуцца паміж сабою.

## З'ява IX

Тыя самыя і Ціхон Пратасавіцкі, яго жонка, Цюхай-Ліпскі, яго сын Грышка, Цімох Альпенскі, Базыль Статкевіч і іншая шляхта

Ціхон. Жонка, а жонка! Будзе бяда! Паглядзі, як у найяснейшай кароны вус адзін уніз, а другі ўгору задраўся. Ідзі ты наперад ды пакланіся яму, хрэн яму ў вочы.

Куліна. Што ты мяне пасылаеш! Ты сам наварыў піва, сам і папівай здароў, я баюся.

Ціхон. Ты — кабета, хрэн табе ў вочы, — ён жа цябе не з'есць! Вазьмі гэтыя грошы, — тут іх пяць дзесятак, — пакланіся ў ногі ды палажы на стол; ён жа юрыста, не адцураецца грошай, — тады і дзела пойдзе, як па салу.

Куліна. Ну, што рабіць, — папытаю. *(Яна боязна падыходзіць, кладзе грошы на стол, пасля нізка кланяецца станавому.)* Найяснейшая карона...

Кручкоў. Цішэ!

Куліна са страху адыходзіць ад стала ды хаваецца за мужа.

*(Трымаючы паперу, устаў ды, не пазіраючы на шляхту, гаворыць.)* Па ўказу Пінскага земскага суда от 23-го мая сего года за № 2312 прыбыл я в околіцу для расследованія уголовного дзела о побоях, нанесенных Ціхоном Протосавіцкім Івану Цюхаю-Ліпскому... Ліпскі, маеш сведкаў?

Ліпскі. Маю, найяснейшая карона.

Кручкоў. Пусць выступят вперед!

Трое шляхтаў выходзяць наперад.

Пратасавіцкі, за што ты яго біў?

Ціхон. Дык ён жа назваў мяне мужыком, хрэн яму ў вочы.

Кручкоў. Маеш сведкаў?

Ціхон. Маю, Куторгу.

Кручкоў. Яго няможна ставіць, — ён пад судом. *(Абярнуўшыся да сведкаў Ліпскага.)* Вы бачылі, як Пратасавіцкі біў Ліпскага?

Т р ы   с в е д к і *(боязна кланяючыся)*. Бачылі, найяснейшая карона.

К р у ч к о ў *(абярнуўшыся да іншай шляхты)*. А вы бачылі?

У с е   і н ш ы я. Не, не бачылі, найяснейшая карона!

К р у ч к о ў. Ну, дык добра! Следства кончана, цяпер будзе суд, а наўперад: па указу всеміласцівейшай гасударыні Елісаветы Петровны 49-га апреля 1893-га года і всеміласцівейшай Екацярыны Вялікай от 23-го сенцябра 1903-га года, а равномерно в смысле Статута літоўскаго раздзела 8-га, параграфа 193-га, коім назначается в пользу суда от цяжушчыхся грывны. Обжалованный Протосавіцкі імеет зараз жа ўплаціць пошлін 20, прогонных 16 і на канцэлярыю 10 рублёў. Жалуюшчыйся Ліпскі ў палавіне того; сведкі, каторыя бачылі драку, а не баранілі, — па 9 рублёў, а вся прочая шляхта, што не бачыла дракі, за тое, што не бачыла, — па 3 рублі. Плаціце! *(Садзіцца на месца ды піша)*.

Шляхта шэпчацца паміж сабою, пасля выбраны ўсімі зборшчык Цімох Альпенскі падыходзіць да Пратасавіцкага, Ліпскага і іншае шляхты, збірае грошы і, злажыўшы грошы ў адзін мяшок, падносіць, баючыся, да станавога ды кладзе на стол.

Ц і х о н *(адлічыўшы зборшчыку грошы, калі той пайшоў збіраць ад другіх)*. Э... глядзі ты! Як ён на бяду нашу ўсе ўказы і законы як рэпу грызе і не заікнецца, — хрэн яму ў вочы!

К у л і н а. Чаго тут дзівіцца? Відаць, судовы чалавек, дык ён на тым і зубы згрыз, — такая, бач, парода.

К р у ч к о ў *(як Альпенскі палажыў на стол грошы)*. А ўсе?

А л ь п е н с к і. Да капеечкі, найяснейшая карона!

К р у ч к о ў. Ладна, ідзі! Зараз будзе дэкрэт.

Ц і х о н. Ух, госпадзі! Што гэта будзе, — хрэн яму ў вочы?!

К у л і н а. А што будзе? Вядома, юрыста, — абдзярэ ўсіх дачыста дый паедзе з Богам дахаты.

Ціхон. Хрэн табе ў вочы, — каб прынаймні шкура была цэла, а то як дабярэцца да яе, будзе нячысты інтэрас!

Кручкоў *(устаў і выходзіць з папераю на сярэдзіну сцэны)*. Слухайце з увагаю!..

Усе кланяюцца.

Буду чытаць дэкрэт.

Зноў кланяюцца.

Па указу его імператарскаго вялічаства, во врэменном прысуцтвіі, в комплекце, саставленном із участковага заседацеля і его пісьмавадзіцеля, слушалі дзело, коего абстаяцельства следуюшчыя: Іван Цюхай-Ліпскі назвал Ціхона Протасавіцкаго мужыком; тот за такую обіду пабіл Ліпскаго, на что сей последній прэдставіл і свідзецелей. Расследовав таковое дзело, врэменнае прысуцтвіе, сообразно указу всеміласцівейшаго гасудара Пятра Вялікаго в 1688 г. марта 69 дня паследававшего і прымяняясь к Статуту літоўскаму раздела 5-га, параграфа 18-га, — опрэдзеліло: а) Ціхону Протосавіцкаму, как угалоўнаму прэступніку, назначается: 1-е) 25 лоз на голай земле без дывана, і 2-е) штрафа 25 руб. в пользу врэменнаго прысуцтвія; б) Івану Цюхаю-Ліпскаму, как нанёсшаму лічнае аскарбленіе Протосавіцкаму, назначается: 1-е) 15 лоз на дыване і 2-е) 15 руб. штрафа в пользу врэменнаго прысуцтвія; в) свідзецелям, каторыя відзелі драку і не разнялі дзерушчыхся, — 1-е) па 10 лоз на дыване і 2-е) па 10 руб. штрафа в пользу врэменнаго прысуцтвія; д) всей прочэй шляхце, каторая не відзела дракі, за то, што не відзела, а цем самым не магла і разняць дзерушчыхся, назначается: 1-е) па 5 лоз на дыване і 2-е) па 5 руб. штрафа в пользу того же прысуцтвія. Напаследак: г) прымяняясь к указу яе вялічаства Анны Іаанаўны 1764 г. акцябра 45-га чысла за негербовую бумагу, упатрэблённую і імеюшчуюся ўпатрэбіцца па сему дзелу, — Протосавіцкі 5, Ліпскі 3, свідзецелі па 2, а все прочыя па 1 рублю ўплоцят... Кончэна! Цяпер зборшчык няхай збірае грошы, пасля жа прымемся

за лазу. *(Падыходзіць да стала і ўглыбляецца ў паперы.)*

Ц і х о н. У... у... у... бацькі мае родныя! Хрэн яму ў вочы, — 25 лоз ды яшчэ і не на дыване, а на голай зямлі! Даў бы сто рублёў, каб дыван падаслалі.

Кручкоў нібыта ўглыбляецца ў чытанне папераў; зборшчык збірае грошы, пачынаючы ад Пратасавіцкага, каторы, аддаўшы зборшчыку грошы, падкрадваецца к Пісулькіну, адклікае таго ўбок і совае 25-рублёвую бумажку.

Дабрадзею, ратуй няшчаснага ды навучы, як ад лазы збавіцца!

П і с у л ь к і н *(убок, разглядаючы бумажку).* Харашо быць пісьмавадзіцелем у разумнага чалавека, маляваныя госцікі! *(Паказваючы на бумажку.)* Самі ў карман лезуць, не нада і рук выцягваць. *(Да, Ціхона.)* Не ведаю, што рабіць! Ён сам баіцца, каб, зрабіўшы вам палёгку, перад судом не адказваць. Але папробуйце.

Тут падыходзіць другая шляхта і слухае яго рады.

Злажыце яму добры гасцінчык, авось паквапіцца? Пагаварыце з сабою і злажыце, а я, тым часам, папрабую ўгаманіць яго. *(Падыходзіць да Кручкова і шэпча, той злосна адказвае.)*

К р у ч к о ў. Не магу, не магу! Знаеш, па всеміласцівейшаму ўказу нашага гасудара 1881 года, сенцябра 75-га дня какой вялікі адказ за паблажку сторанам в угаловнам прэступленіі?! Не толькі пасаду магу страціць, но і лічнасць падвергнется опасносці.

Ц і х о н. Жонка, а жонка, — хрэн табе ў вочы! Прынясі шкураны мяшок, што ляжыць у кубле з грэчкаю; там ёсць сто рублёў, трэба выкупіць шкуру. Ох, даражэй яна каштаваць будзе, — хрэн ёй у вочы!

К у л і н а. Што? Нацярушыў бяды, а цяпер расплачвайся. *(Выходзіць ды праз мінуту варочаецца з мяшком.)*

Г р ы ш к а *(да бацькі).* Ану, бацька, рассупонь свой мяшок ды вынь якіх рублёў з 50, — можа і тваю пашануюць

шкуру. *(Да іншае шляхты.)* І вы разварушыцеся; каторыя бачылі драку — па дзесяць, а каторыя не бачылі — па пяць рублёў, — зламжыце ў кучу ды паднясіце найяснейшай кароне. Дык ён зжаліцца над вамі і дзела кончыць; вось як яны, людзі судовыя, умеюць: і воўк будзе сыты, і козы цэлы.

Шляхта збірае грошы, пасля, зложаныя ў адзін мяшок, аддаюць Грышку, падпіхаючы яго да станавога і ўгаворваючы, каб ён асмеліўся аддаць іх Кручкову і прасіць даравацьім.

Л і п с к і. Ідзі ты, сынку, — палажы на стол ды прасі і малі, каб ён памілаваў нашу шкуру ды скасаваў строгі свой дэкрэт.

Г р ы ш к а. Бачыце, бацька, як нядобра, што вы зводзіцеся з суседзямі. Добра, я асмелюся падысці, толькі каб вы пагадзіліся з Ціхонам ды каб паслалі ад мяне сватоў к яго дачцэ Марысі.

Л і п с к і. Д'ябал яго бяры! Няхай толькі ўладзіцца дзела, а я не адкажуся. Ідзі, прасі!

Грышка з аднаго, а Пратасавіцкі з другога боку баязліва падыходзяць да стала, пры каторым Кручкоў, нібыта ўглыблены ў чытанне папераў, ды кладуць мяшок з грашыма; Грышка, моцна кашлянуўшы, кланяецца нізка станавому ды гаворыць

Г р ы ш к а. Найяснейшая карона! Мы — адвеку пінская шляхта і ты шляхціц. Не глумі ж, не пэцкай у балоце шляхецкай, братняе табе, крыві! Скасуй строгі твой дэкрэт, на сорам нашай ваколіцы пісаны, — паміры майго бацьку з Ціхонам, ствары мае і Марысі шчасце, а мы ўсе, цэлаю ваколіцай, век за цябе будзем Бога прасіць і век табе дзякаваць!

П і с у л ь к і н. І я вас прашу, ваша благародзіе, — пусць подадут міровую і канцы в воду.

К р у ч к о ў *(да Пісулькіна, але моцна)*. Харашо! Для вас это здзелаю, прыму грэх і ответ на себя... Ціхон Пратасавіцкі і Цюхай-Ліпскі! Падыдзіце сюды бліжэй.

Тыя падыходзяць, за ім і Грышка і Марыся.

Абніміцеся і пацалуйцеся на згоду, — ну, што ж?

Марыся свайго бацьку, а Грышка свайго патхаюць, каторыя потым абнімаюцца і цалуюцца з сабою.

Ціхон! На згоду каб быў крупнік[1].

Ціхон. Гатовы, найяснейшая карона! Схадзіце, жонка і Марыся, ды прынясіце, — хрэн вам у вочы.

Куліна і Марыся ідуць у хату.

Кручкоў. Вы думаеце, што мне міла паняверыць кроў шляхецкую? Я ж сам шляхціц, вам родны, але што ж рабіць? Служба — не дружба. Законы, міленькія, законы! Годзячы вас, бяду на сябе бяру; толькі пад такою кандыдацыяй, каб Ціхон з Ліпскім навек з сабою памірыліся ды каб я з-за вас не ўлез у нерат. Канечна трэбую, каб тут жа, пры мне, дзетак сваіх заручылі, а там і павянчалі.

Тут Куліна і Марыся ўносяць дзве міскі гарачага крупніку ды ставяць на стол з кубкамі

Ну, што, Ціхон, — аддасі за Грышку сваю Марысю?

Куліна *(ставячы міску)*. Гарачая, ой, гарачая, найяснейшая карона!

Кручкоў. Адкуль жа ты ведаеш?

Куліна. Дык я ж сама яе зладзіла...

Кручкоў. Што?

Куліна. Да гарэлку. Толькі што перагарэла, шафрану і розных прыпраў насуліла многа, мёду ж цэлы кадобчык укінула.

Кручкоў. А... ты талкуеш аб крупніку!

Ціхон. Хрэн табе ў вочы! Чуеш, што найяснейшая карона кажа?

Куліна. А як жа, аб прыправе...

Ціхон. Аб якой прыправе? Хрэн табе ў вочы, — аб Марысі! Ці аддасі яе за Грышку Ліпскага...

Куліна. А што будзе з Куторгаю?

---

[1] Крупнікам завецца пітво, прыгатаванае на агні з гарэлкі і патакі з рознымі прыправамі.

Ц і х о н. Хрэн яму ў вочы! Твой Куторга толькі хваліцца ўмее, а як прыйшло да дзела, дык чуць у бяду з сабою разам і мяне не ўцяг.

К р у ч к о ў. Вот я тут зараз цэлую справу кончу. Налівайце кубкі!

Куліна з Ціхонам наліваюць, падаюць Кручкову, Пісулькіну і ўсім іншым.

Грышка, любіш ты Марысю? Хочаш з ёю да шлюбу?

Г р ы ш к а. Ой, хачу, вельмі хачу! Найяснейшая карона! Бог мяне пакарай, калі я не дам ёй шчасця адружыўшыся.

К р у ч к о ў. А ты, Марыся, любіш Грышку? Хочаш з ім век дзяліць шчасце і гора?

Марыся, засаромеўшыся, паварочваецца тварам да сцяны ды дзёрпае яе пальцам.

Ну, што? Чаго маўчыш?

М а р ы с я. А ўжо ж, калі маўчу...

К р у ч к о ў. Дык — хачу? Ладна! Любіш ты Грышку?

М а р ы с я *(сарамліва)*. Але...

К р у ч к о ў. Крэпка яго любіш?

М а р ы с я

РАМАНС

Найяснейшая карона!
Трудна мне без Грышкі жыці.
Ніяка земска прэпона
Не ў сілах нас разлучыці!
Сэрца маё — яго менне,
Яго любоў — мая сіла.
Без яго мне смерць — спасенне,
Без яго мне свет — магіла.
Няхай бацькі лаюць, мучаць,
Ні з кім другім не зручуся.
Калі з ім мяне разлучаць,
Я ў Прыпяці ўтаплюся.

К р у ч к о ў. Ну, калі так крэпка яго мілуеш, дык ужо няма чаго раздумваць. Панове бацькі! Трэба іх злучыць, а

то новае ўгалоўнае дзела зваліцца на вашы галавы. Пане Ліпскі, чы прымаеш, вашэ, мяне за свата для свайго сына?

Ліпскі. Ды ўжо ж, найяснейшая карона! Задумалі дзела, то і канчайце яго з Богам, — я рад буду благаславіць.

Кручкоў. Дайце сюды ручнік! *(Падаюць, і ён закідае яго сабе на плячо.)* Ну, вот я і сват! Што, панове Пратасавіцкія, — аддаеце вашу дачку за Грышку?

Ціхон. Такога свата трудна не ўважыць. Хадзі, жонка, хадзі, пане Ліпскі, — хрэн табе ў вочы! Паблагаславім дзяцей, а там потым адгуляем вяселле. На пасаг дам два гарцы грошай і шляхецкую худобу, а па смерці ж нашай і самі ўсё забяруць.

Куліна. Ды і на выправу не пашкадуем, — яна ж у нас ядыначка: што маем, тое ўсё яе, каб толькі Бог даў ім шчасную долю.

Бацькі сходзяцца і злучаюць маладым рукі.

Кручкоў. Вот так, добра! Цяпер, панове бацькі, падпішыце міравую і злажыце міравых пошлін па тры капейкі.

Тыя падпісваюцца трыма крыжыкамі. Пісулькін за іх распісваецца.

Альпенскі *(убок)*. Не быў бы судовы чалавек! Пабраў рублі ды яшчэ па капейкі сягае. У іх ужо такая натура: без капеек і чвэрцяў, як без солі ў страву, ніяк не абойдуцца: капейкі і чвэрці — да скарбу, а рублі — сабе.

Кручкоў. Дзесяцкі!

Той уваходзіць.

Прывядзі сюды Куторгу!

Дзесяцкі выходзіць.

Ну, што ж, — налівайце зноў кубкі ды вып'ем за здароўе маладой пары.

Усе *(падымаючы ўгору кубкі)*. Будзьце здаровы, маладыя! Дай Бог вам век з сабою шчасліва пражываць!

## З'ява апошняя

Тыя самыя і Куторга.

Куторга *(кланяецца ўсім).* Дзякуй, дзякуй, панове грамада! Буду старацца ўшчасліўіць Марысю.

Кручкоў. Маўчы, стары хрэн, не аб табе тут ідзе дзела! Бяры кубак ды выпі за здароўе маладых, Грышкі Ліпскага з Марысяю, і падзякуй Богу, што так лёгка вырабіўся ад суда.

Куторга. Дык гэта не я малады? Не за мае пілі здароўе?

Кручкоў. Пакінь, стары хрыч, думаць аб жаніцьбе, а заматай сабе на вус, каб крэпка дзяржаць язык за зубамі.

Куторга. Ой, найяснейшая карона! Буду сабе часта браць на розум філасофскую прыпавесць: на тое Бог даў людзям язык, каб умець маўчаць. *(П'е з кубка.)*

Кручкоў. Дзесяцкі!

Той уваходзіць.

Коні гатовы?

Дзесяцкі. Запрагаюць, найяснейшая карона! *(Выходзіць.)*

Кручкоў. Ну, панове шляхта-брацця! Я вам родны, я вам брат, дык на прашчанне вып'ем яшчэ па кубку крупніку, заспяваем нашу родную песню ды паскачам на заручынах. Пане Куторга, у цябе яшчэ не вельмі курыцца чупрына, — ты вядзі пункты, а мы пакруцімся, прыпяваючы.

Усе. Віват наш брат, найяснейшая карона!

Хор

Эй, чух чумадра,<br>
Чумадрыха весяла!

Куторга

Нашы Пінскі акаліцы —<br>
Жыцце хоць цару, царыцы!<br>
Ўсяго досыць — прызірніся:<br>
Еж, пі, хоць расперажыся.

Хор
Эй, чух чумадра,
Чумадрыха весяла!

Куторга
Ёсць гарэлка, луста хлеба,
Уюны і сушона рыба.
Чаго ж болей людзям трэба?
Пінчуку тут даў Бог неба!

Хор
Эй, чух чумадра,
Чумадрыха весяла!

Куторга
Як збяром дабро дачыста,
Завязём на торг да места,
Тады квартаю чырвонцы,
Гарцам мерым карбавонцы.

Хор
Эй, чух чумадра,
Чумадрыха весяла!

Куторга
Дзяўчаты нашы, як лані,
Харашэйшы як ясны пані.
Зіркне катора — маспане! —
Сэрца з-пад жыбра дастане.

Хор
Эй, чух чумадра,
Чумадрыха весяла!

Чуваць звонікі. Шляхта, ап'янелая, хістаецца па сцэне без парадку; гутарка агульная без сэнсу; Куторга пасярэдзіне сцэны выпускае з рук кубак і засыпае.

Кручкоў *(бярэ ўбок Альпенскага і кажа яму)*. Ведаеш, што на цябе казаў Статкевіч?

Альпенскі. А што?

Кручкоў. Ён казаў, што ты не шляхціц.

Альпенскі. Што? Ён мяне так зневажае? Вось я ж яму пакажу маё шляхецтва!

Кручкоў. Не пры мне, — як паеду, тады з ім расправішся! *(Адыходзіцца, бярэ ўбок Статкевіча.)* Знаеш? Цябе Альпенскі аблаяў мужыком.

Статкевіч. Ён смеў назваць мяне мужыком? Мне сам Юры Кабылінскі падпісаў грамату, — дык я ж на шкуры яго выпішу сваё шляхецтва! *(Шугаецца да Альпенскага і пачынаюць біцца.)*

Ліпскі. Найяснейшая карона! Шляхта напілася і завялася біцца. Бойцеся Бога, раздыміце, а то і з вас штраф будзе належыць!

Кручкоў. Не ка мне, не ка мне, — няхай у суд падаюць, тады прыеду на следства! Бывайце здаровы! *(Выходзіць з Пісулькіным.)*

Ціхон. Віват, найяснейшая карона!!

Усе *(апрача тых, што б'юцца).* Віват, найяснейшая карона!

Заслона апускаецца, пакідаючы наперадзе сцэны Куторгу;
той прачынаецца.

Куторга. Што? Ужо разышліся? А там чутна і бойка! Добра прыпавесць кажа: пінска шляхта як нап'ецца, то напэўна падзярэцца. *(Да публікі.)* Ды вы ўжо, найяснейшыя панове, спаць хочаце? А што? Няпраўда? Дык:

Найяснейшая публіка!
Прашу цябе, не дзівіся,
Бяда гэта невяліка,
Што мы крыху папіліся.
Няхай шчасная развязка
Пінскай шляхце ад вас будзе, —
Дайце брава, калі ласка,
Ды і з Богам, добры людзі!

*Канец*

**Альгерд Абуховіч**

# *Ваўкалак*

Чараўніца уракла —
Быў я колісь ваўкалакам,
Бегаў чортам ўздоўж сяла,
І к гавядам поўзаў ракам,
І людскую знаў гаворку,
І з сабакамі з надворку
Гаварыць я спосаб меў.
За гумном раз ціха сеў,
Ажно Лыска прыляцеў, —
Як на панскай службе стаў,
Па прыязні ён мне кажа:
— Кінь ты, куме, жытло ўражжа:
Цяпер марна прападаеш.
А ты ж гэткі спосаб знаеш:
Майму пану стань служыць,
Табе добра будзе жыць.
— Ах ты, дурню, — думаў я. —
Мне вярнуцца да сяла?
З сваім панам і сялом
Задушыся ты калом!
Хоць галодзен — я свабодзен,
Дзе мне цягне — там бягу.
На свабодзе прападу,
А ў няволю — не пайду!
Буду вольным ваўкалакам,
Ты ж — на прывязі сабакам!

# Воўк і лісіца

«На табе, нябожа,
Што мне нягожа!»
Раз папалася лісіцы
Ажно тры злавіць курыцы.
Прыдушыла, дзве з іх з'ела,
Трэцю скрыла. Сама села —
Як па працы — пад стажком.
Воўк галодны йшоў нішком,
А што з кумою быў знаём,
То такую рэч павёў:
— Ах, сястрыца, — кажа кум, —
Я ад рання браў на вум,
Каб што-кольвек мне пад'есці,
А тут, на злосць, негдзе ўлезці.
Падхапіў бы я хоць птушку...
Да авец падходзіў збочку,
Ды пастух чупрыну чэша,
І сабака прытым брэша —
Прыступіцца няма складу!..
Дай ты, кумка, яку раду!
— Ох, мой куме даражэнькі!
То ж стог сена цалюсенькі,
Еж, як хочаш, — не шкадую,
Хоць апошнім, ды частую!
А маўчыць наша лісіца,
Што пад корчам ёсць курыца.
— Дзякуй, дзякуй! — сказаў шэры
І пацягся без вячэры.

# *Старшына*

Хоць які парадак дай,
Адно тое, братка, знай,
Што крутнёю ўсё пакруціш
І найлепша — збаламуціш.
Льва-манарха воўк прасіў,
Каб вайтом яго зрабіў.
Бо авечкі скрозь ў бязладдзі,
Вельмі шкодзяць ў панскім садзе
Ды і самі прападаюць,
Бо, як жыць, яны не знаюць.
І ліса за ім прасіла
(Яе жонка льва любіла).
Воўк з лісіцаю звязаўся
І, як можна, так стараўся:
Дзе прасілі, дзе ўздыхнулі,
Дзе гасцінца падаткнулі,
Каб дабіцца да медалі,
І плацілі, і стагналі...
Леў сказаў: — Ходзяць толкі,
Што авец з'ядаюць воўкі. —
І сазваць сказаў народ
На звярыны вольны сход,
Папытаць усіх звярат:
Воўк ці добры, ці ён гад?
Чыны важны ўсе прыйшлі,
Ўсё начальства тут было,
Ды прычыны не знайшлі,
Зла аб воўку не чутно.
Пад судом ён, бач, не быў
І з начальствам добра жыў,
Дык медаль пан войт надзеў
На авечы цэлы хлеў.
А авечкі што сказалі? —
Іх на сход зусім не звалі,
А ўпісана ў пратаколе,
Што «авечкам дана воля».

# *Суд*

Там, дзе пушча, за прасёлкам,
Колісь ліс жыў з шэрым воўкам,
І, як весць людская кажа,
Жыло згодна племя ўражжа.
Ды да часу.
Хутка сварка там пайшла:
Скрыўдзіў нечым ліс ваўка.
Дайшло дзела да суда.
Можа, праўда, можа, не,
Адвакаты — два сабакі на судзе.
Кожны брэша, на праціўніка вядзе.
А суддзёю быў глушэц,
Ён разумны ці глупец,
Тое трудна разгадаць,
Адно толькі, як чуваць,
Што рашыў ён дзела так:
Выгнаць з суду ўсіх сабак,
А воўк з лісам плоцяць штраф.
Воўк — бо хлусіць ён напрасна,
Ліс — бо злодзей.
Гэта ясна:
Круцялёў чым разбіраць,
Лепш абодвух пакараць.

## Кастусь Каліноўскі

* * *

Марыська чарнаброва, галубка мая,
Дзе ж падзелася шчасце і ясна доля твая?
Усё прайшло, прайшло, як бы не бывала,
Адна страшна горыч у грудзях застала.

Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці
Ды ў прадвечнага суду вялеў прападаці,
То мы прападзем марна, но праўды не кінем,
Хутчэй неба і шчасце, як праўду, абмінем...

Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе
І часам спамяні пра Яську свайго,
Што загінуў за праўду для дабра твайго.

А калі слова пяройдзе у дзела,
Тады за праўду станавіся смела,
Бо адно з праўдай у грамадзе згодна
Дажджэш, народзе, старасці свабодна.

## Пісьмо з-пад шыбеніцы

Браты мае, мужыкі родныя! З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіць мне да вас пісаці, і, можа, раз астатні. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, но не жаль згінуць за тваю праўду.

Прымі, народзе, па шчырасці маё слова прадсмертнае, бо яно як бы з таго свету толькі для дабра твайго напісана.

Няма, браткі, большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек у галаве мае розум і навуку. Тады ён толькі можа быць у радзе, жыць у дастатках і тады толькі, памаліўшыся Богу, заслужыць неба, бо, збагаціўшы навукай розум, разаўе сэрца і народ свой шчыра палюбіць. Но як дзень з ночай не ходзяць разам, так не ідзе разам навука праўдзіва з няволяй маскоўскай. Ды пакуль яна ў нас будзе, у нас нічога не будзе, не будзе праўды, багацтва і ніякой навукі, адно намі, як скацінай, варочаць будуць, не для дабра, но на пагібель нашу.

Для таго-то, народзе, як толькі калі пачуеш, што браты твае з-пад Варшавы б'юцца за праўду і свабоду, тады і ты не аставайся ззаду, но, ухапіўшы за што зможаш, за касу, сякеру, і цэлай грамадой ідзі ваяваці за сваё чалавечае і народнае права, за сваю зямлю родную. Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, народзе, што тады толькі зажывеш шчасліва, калі над табой маскаля ўжо не будзе!

Твой слуга Яська-гаспадар з-пад Вільні

## Газета «Мужыцкая праўда», №2

Дзецюкі!

Калі Бог стварыў усіх людзей вольнымі і ўсім даў адзінакую душу, так скуль жа гэта ўзялося, што адзін мар-

нуе да і над людзьмі збыткуе, а другі, бедны, паншчыну служыць альбо аброкі ў казну плаціць?

Кожны па-свойму талкуе, на сваю старану цягне. Цар кажа, што ён добра нам думае, а паны кажуць, што яны добра думаюць нам зрабіці, а мужык бедны ад іх дабросці як прападаў, так і прападае.

Каб растлакаваць людзям, у чом праўда, я пішу пісьмо, а пісаці буду, як Бог і сумленне кажа — вы адно мяне, такога самага мужыка, як і вы, паслухайце добра.

Быў то калісьці народ наш вольны і багаты. Не помняць гэтага нашыя бацькі і дзяды, но я вычытаў у старых ксёнжках, што так калісьці бывала. Паншчыны тагды ніякай не было. І няма чаго таму дзівавацісся, бо было лесу шмат, поля колька хочаш, а людзей то мала, так нашто ж служыць паншчыну за зямлю, калі кожны мог лесу выцерабіць, хату сабе паставіць і меці сваё поле.

Но ў суседстве з намі жыў Немец і Маскаль. Аднаму і другому багацтва нашае калола ў очы — каб іх так колька схапіла, да і хацелі нас сагнаць з нашай бацькаўшчыны. Трэба было бараніціся, так Кароль кажа — «хадзем бараніці», а тут не ўсе ідуць, да і мала нашых пайшло. Выгналі то Маскаля і Немца — но каб жэнкі да і дзеці гэтых, што хадзілі на вайну, мелі за чым пражыці, так Кароль наш і напісаў такое права: «Гэтыя, што не хочуць ісці бараніці сваей зямлі, няхай абрабляюць поле гэтым, што б'юцца за вольнасць і шчасце ўсіх». І гэтак было доўга: адне баранілі краю, усё хадзілі па войнах, а другія то гаралі, то сеялі, то касілі, то жалі. З гэтуль то і ўзялася гэта паншчына. Судзеце ж цяпер самі, чы можна было зрабіці справядлівей, як зрабіў калісьці наш Кароль Польскі да і Літоўскі? Но калі Маскаль з Немцам хітрасцею нас падбіў і пайшоў ронд маскоўскі, так і ўсё зрабілася па-чартоўску. Стаў зараз маскаль свой ронд уводзіць у нашым краю і кажа: «Мужык, давай рэкрута, мужык, давай падаткі, да і паншчыну яшчэ служы альбо плаці аброк у казну!» Так якая ж тут ужэ справядлівасць, калі ўсенька, што цяжка, зваляюць на мужыка, калі з яго дзяруць астат-

ню шкуру, б'юць і плакаць не даюць! Ачунялі то былі мужыкі, угледзелі, што кепска, дай давай бунтавацiся пад Касьцюшкаю, а Касьцюшка то кажа: «Калі мужыкі хочуць ужэ самі бараніці сваю зямлю, так няхай жа не служаць паншчыны дый не плацяць у казну аброку за зямлю». От гэта так справядлівасць! Но што ж, калі маскаль спыніў Маніхвэст Касьцюшкі, каб не пабунтаваў усіх мужыкоў. Для таго-то і пабілі маскале Касьцюшку, бо каб мужыкі ўсе разам былі збунтаваліся і ўхапілі за сакеры, нажы і косы, так бы маскаль мусіў бы прапасці без паўстаня і мы на век вякаў ужэ былі бы вольныя.

Так з гэтага пісьма і відна: што мужыкі панскія і казённыя не павінні плаціць ані чыншу паном, ані аброку ў казну за зямлю, бо гэта зямля да нас належыць; но калі будзе вайна з маскалём за нашу вольнасць, то той час трэба ўсім ісці на вайну проціў маскаля. А то для таго, каб хутчэй прагнаць маскаля з яго сабачым рондам, і каб ніколі, ніякай нікому мужыкі паншчыны не служылі і ніякага ў казну аброку не плацілі, і каб на век вякоў народ наш быў вольны і шчаслівы. А калі вас хто будзе падмаўляць рабіці іначай: чы то спраўнік, чы то акружны, чы то лапсэсар, чы то пан, то вы яго не слухайце, бо то пэўна ашуканства, што за царскія альбо панскія грошы вечнай вашай згубы хоча!!!

Яська-гаспадар з-пад Вільні

**Францішак Багушэвіч**

# **П**радмова да зборніка «Дудка беларуская»

Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маей! Вам ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, ды і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя «мужыцкай» завуць, а завецца яна «беларускай». Я сам калісь думаў, што мова наша — «мужыцкая» мова, і толькі таго! Але, паздароў Божа добрых людцоў, як навучылі мяне чытаць-пісаць, з той пары я шмат дзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў: і праканаўся, што мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая. Чытаў я ці мала старых папераў, па дзвесце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі а нашай мовай чысцюсенькай, як бы вот цяпер пісалася. Увідзеўшы гэта, я часта думаў: Божа ж мой, Божа! Што ж мы за такія бяздольныя? Якась маленькая Булгарыя — са жменя таго народу, — якіясьці Харваты, Чэхі, Маларосы і другія пабратымцы нашыя і ружны чужы зброд, жыды маюць па-свайму пісаныя і друкованыя ксёнжачкі і газэты, і набожныя, і смешныя, і слёзныя, і гісторыйкі, і баячкі; і дзеткі іх чытаюць так, як і гавораць, а ў нас як бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык, можа б, і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што «піша па-мужыцку», і як дурня абсмяялі б! А можа, і праўды наша мова такая, што

ёю нічога добрага ні сказаць, ні напісаць не можна? Ой, не! Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людцам, і гаворым жа мы ёю шмат і добрага, але так ужо мы самі пусцілі яе на здзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахотней гавораць па-французску, як пасвойму. Нас жа не жменька, а шэсць мільёнаў — больш і шмат больш, не раўнуючы, як жыдоў, напрыклад, або татар, ці армян, а пакажы ж, ваша, хоць адну ксёнжачку ці аб гаспадарцы, ці так аб жыцці нашым, каб па-нашаму?

Ці ж ужо нам канечне толькі на чужой мове чытаць і пісаць можна? Яно добра, а навет і трэба знаць суседскую мову, але наперш трэба знаць сваю. Передумаўшы ўсё гэта, я, братцы, адважыўся напісаць для вас сякія-такія вершыкі: хто іх спадабае, таму дзякуй! А хто падумае лепш і больш напісаць, таму чэсць вечная і ад жывых людзей, і ад бацькавых касцей! А пісаць ёсць шмат чаго!

Спрадвеку, як наша зямелька з Літвой злучылася, як і з Польшчай з'ядналася дабравольна, дык усе яе «Беларусяй» звалі, і недарма ж гэта! Не вялікая, не малая, не чырвоная, не чорная яна была, а белая, чыстая; нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася.

Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы.

Ужо больш як пяцьсот гадоў таму, да панавання князя Вітэнэса на Літве, Беларусія разам з Літвой баранілася ад крыжацкіх напасці, і шмат местаў, як Полацк, прызнавалі над сабой панаванне князёў Літоўскіх, а после Вітэнэса Літоўскі князь Гядымін злучыў зусім Беларусію з Літвой у адно сільнае каралеўства і адваяваў шмат зямлі ад крыжакоў і ад другіх суседаў. Літва пяцьсот дваццаць гадоў таму назад ужо была ад Балтыцкага мора ўдоўжкі аж да Чорнага, ад Дняпра і Днястра-ракі да Нёмна; ад Каменьца-места аж да Вязьмы — у сярэдзіне Вялікаросіі; ад Дына-

бурга і за Краманьчук, а ў сярэдзіне Літвы, як тое зярно ў гарэху, была наша зямліца — Беларусь! Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак...

Мацей Бурачок

## Прадмова да зборніка «Смык беларускі»

А праўду сказаў Бурачок у сваёй «Дудцы», што ўсе мы завём нашу мову «мужыцкай», і так — нічагусенька, як бы так і трэба! Здарывалася і мне чытаць і ксёнжачкі, хоць не надта старыя, друкаваныя нават, якогась пана Марцінкевіча, але ўсе як бы смеючыся з нашага брата пісаны; чытаў я і так перапісаныя вершыкі якогасьці Юркі «Панскае ігрышча», гдзе Юрка надта дзівуецца і як бы завідуе панам тым, каторыя, можа, і больш ад Юркі таго працуюць, толькі, ведама, вучоныя, дык лягчэй і спарней. Я перапісаў і сюды тое «Ігрышча», няхай выбачае пан Юрка, але, дальбог, аж злосць узяла, што Юрка спадабаў тое, што толькі блазну можа спадабацца. Я тыкі і чыркнуў яму «Адказ», але так думаю, што гэта ён, смеючыся з нашага цёмнага брата, напісаў; гэтак думаў, што дурны мужык, дык ужо нічога і не відзе, і не знае! Ой, памыліўся!

Не раўня я Бурачку, — ён лепей, можа, знае жыццё мужыцкае, больш, можа, відзеў і чуў; але так мне спадабаліся, яго тыя вершы, што і я здумаў папрабаваць штокольвек напісаць. Ёсць шмат друкованых песняў нашага народа; пісаў Пачабут, Я. Тышкевіч, апісуючы наш Барысаўскі павет, і шмат хто спісываў іх, а шмат ёсць і не спісаных, але песні ўсе тыя не надта, каб сказаць праўду, харошыя, і нота наша плакучая, аднастайная, і песняў васолых

не шмат, да і тых ужо рэдка пачуць. Надта за хлебам народ гоніцца, а хлеба дастане, дык і за крамнай вопраткай, і за ляксаванымі ботамі гоніцца, і ўсё маркоціцца. Даўней, кажуць, людзі, як меншым абходзіліся, то больш мелі і васалейшыя былі. Вот я і напісаў з дзесятак песняў «сякіх-такіх». Граю трошкі на скрыпачцы, ну дык няхай і мая ксёнжачка завецца струментам якім; вот я і назваў яе «Смык». Смык ёсць, а хтось скрыпку, можа, даробе, а там была «Дудка» — вот і мы зробім музыку, як тыя жыдкі, што на цымбалах іграюць.

Сымон Рэўка з-пад Барысава

## Мая дудка

Эх, скручу я дудку!
Такое зайграю,
Што ўсім будзе чутка
Ад краю да краю!
Ой! то будзе гранне,
Як на павітанне
І як на васэле,
Нядоўга тыкеле[1]:
Прэндка скончу песні...
Покі дудка трэсне,
Ці паглохнуць людзі,
Ці высахнуць грудзі,
Сілы надарвуцца
На радаснай дудца,
І выцякуць слёзы
На сухія лозы...
Выйдзе душа парай,
Падымецца з хмарай,
Туманом па рэчца
Расой разліецца,
Каласочкі зрося,

[1] Тыкеле — толькі.

Каб жыта ўдалося,
А хлеб з'ядуць людзе,
І зноў сляза будзе.
Ну, дык грай жа, дудка,
Каб жа была чутка,
Каб аж вушы драла;
Каб ты так іграла,
Каб зямля скакала!
Заграй так васола,
Каб усе у кола,
Узяўшыся ў бокі,
Ды пайшлі у скокі,
Як віхор у полю —
Аж выючы з болю,
Каб аж рагаталі,
А усё скакалі...
Каб скакалі горы,
Як фаля на моры,
Як паны на балі, —
Каб вот як скакалі!
Каб аж пыл курыўся,
Каб свет заваліўся
Ды усё круціўся,
Як у нашага брата
У п'янога хата...
Га! Чаму ж не граеш?
Хіба ты не знаеш,
Не ведаеш хіба,
Што, як тая рыба
Ды на лёдзе б'ецца,
Так вот я, здаецца,
Сорак гадоў б'юся,
Ніяк не звярнуся,
Ніяк не натраплю
Вадзіцы хоць каплю,
Ды такой вадзіцы,
Ды з такой крыніцы,
Што як хто нап'ецца,

Дык вольным стаецца.
Грай, васола ж грай
Альбо долю дай!..

....................

Енчыш безумолку!
Не, не будзе толку!
Кіну ж дудку тую,
А зраблю другую,
Цяпер зраблю дудку
Ад жалю, ад смутку,
Га! зраблю ж другую,
Жалейку смутную, —
Ды каб так заграла,
Каб зямля стагнала,
От каб як заграла:
Каб слязьмі прабрала,
Каб аж было жудка,
От то мая дудка!..
Вот зрабіў такую!
Дай жа папрабую...
Ну, дык грай жа, грай жа,
Усё спамінай жа...
Штодзень і штоночы
Плач, як мае вочы,
Над народу доляй,
І плач штораз болей.
Плач так да астатка,
Галасі, як матка,
Хаваючы дзеці,
Дзень, другі і трэці
Іграй слёзным тонам
Над народу сконам!
Каб ты так іграла,
Каб немарасць брала.
Як слязы не стане,
Заціхне ігранне, —

Кінь наўкола вокам,
Дык крывавым сокам —
Не слязой — заплачыш,
Як усё абачыш.
Як крыві не стане,
Тагды кончу гранне!

## Ахвяра

Маліся ж, бабулька, да Бога,
Каб я панам ніколі не быў:
Не жадаў бы ніколі чужога,
Сваё дзела як трэба рабіў.
Каб прад меншым я носу ня драў,
А прад большым ня корчыў сьпіны,
Каб грэх свой прад сабой я пазнаў,
У другіх каб не відзеў віны;
Чужых жон каб не вёў да граху,
А сваю каб як трэба любіў,
Каб мне дзеці былі у слуху,
Каб я бацькам для іх век дажыў.
Каб людзей прызнаваў за братоў,
А багацтва сваё меў за іх,
Каб за край быў умёрці гатоў,
Каб не прагнуў айчызны чужых.
Каб я Бога сваго не акпіў,
Каб не здрадзіў за грошы свой люд,
Каб сваго я дабра не прапіў
І нізашто не меў чужы труд.
Каб па двойчы мне грошы не браць
За падданы кусочак ральлі.
Каб сваю мне зямельку араць
І умёрці на ёй хоць калі.
Дык прасі ж ты у Бога, малі,
Каб я панам ніколі не быў!

## Хмаркі

Хмаркі цёмныя, мае братанькі!
Вецер гоне вас без дарожанькі,
І нідзе ж для вас няма хатанькі...
Адпачынеце аж у Божанькі!

Гдзе радзіліся, гдзе ж вы, хмарачкі,
Гдзе «тутэйшымі» называліся!
Леціцё усё, так як ярачкі...
Хоць бы трошкі дзе затрымаліся!

Зямлі родненькай, знаць, няма у вас,
Ні вуголчыка, ні прытулачку.
А тут вецер дзьме горшы раз у раз,
Леціце жа вы без ратуначку!..

Летучы, слязой зямлю росіце,
Аж шумяць лісткі, зелянее лес;
Уміраючы, жыццё носіце,
Усяму жыццё, сабе толькі крэс!

## Бог не роўна дзеле

Бог сіроты любе, але долі не дае.
*Прыказка*

Чым-то дзеіцца на свеце,
Што не роўна дзеле Бог?
  Адзін ходзе у саеце[1],
У золаце з плеч да ног,
А другому, каб прыкрыцца
Хоць анучай — велькі труд;

---

[1] Сает — тонкае фабрычнае сукно лепшага гатунку.

Весь, як рэшата, свіціцца,
Адны латы, адзін бруд!
Адзін мае хатаў многа,
А вялікіх — касцёл моў;
Увясці б туды хоць Бога,
І той бы з іх не пайшоў.
У другога ў сцяне дзюры,
Вецер ходзе, дым і снег;
Тут карова, свінні, куры...
Тут пакута, тут і грэх!
Гэты едзе у вагоне, —
Цёпла, мякка, толькі жыць!
А ляціць, як віхар гоне,
А ён сабе толькі спіць!
Той ў мяцеліцу, ў марозе,
Што аж вон яму прэ дух,
Паўзе з клункам па дарозе,
У снягу увесь па брух!
Гэты хлеба і не знае,
Толькі мяса ды пірог,
І сабакам выкідае
Усё тое, што не змог.
А той хлеб жуе з мякінкай,
Хлёбча квас ды лебяду,
Разам жывець і есць з свінкай,
З канём разам п'ець ваду!
Аднаму дзесяткі-служкі
Зарабляюць сотні сот;
Рукі ў яго, як падушкі,
Як кісель, дрыжыць жывот!
Другі ж сам, аж на дзесятак
Працуючы, лье свой пот,
А высахшы, як аплатак,
Цянюсенькі, як той кнот.

# **М***ая хата*

Бедна ж мая хатка расселася з краю,
Між пяскоў, каменняў, ля самага гаю,
Ля самага бору, на беражку лесу;
Ніхто тут не трафе, хоць бы з інтарэсу.
Як няма гарэлкі, няма куска хлеба,
Дык які ж інтэрас, каму сюды трэба?
Да хоць няма хлеба, жабраваць не буду,
Пражыву як-кольвек ад працы, ад труду!

Кепска ж мая хатка, падваліна згніла,
І дымна, і зімна, а мне яна міла;
Не буду мяняцца хоць бы і на замкі, —
Калок свой мілейшы, як чужыя клямкі.
На страсе мох вырас, на маху бярозка, —
Мільшая мне хатка, як чужая вёска.

Сваталі ж мне ў прымы у новую хату,
На зямлю ражайну і дзеўку багату;
Буду жыць, казалі, як які пасэсар[1],
Ездзіць парай коні, як сам пан асэсар[2];
Да мне даражэйшы вугал гэты гнілы,
Камень пры дарозе, пясок ля магілы,
Як чужое поле, як дом мураваны! —
Не аддам за сурдут каптан свой падраны.

Клікалі ж у госці і клічуць суседзі —
Не пайду, не трэба, бо, кажуць, заедзі
Ад чужога хлеба губы абсядаюць,
Што чужога прагнуць, то сваё кідаюць.
Я не кіну хаты, хоць вы мяне рэжце,
Не пайду да вас я, хіба у арэшце.
А хоць сілай навет адарвалі б з дому,

[1] Пасэсар — арандатар.
[2] Асэсар — станавы прыстаў.

Калісьці вярнуўся б, як мядзведзь да лому.
Заваліцца й хата, зарастуць пакосы,
Усё б я вярнуўся, хоць голы да босы!

Насек бы бярвенняў, нацягаў бы моху,
Зноў бы склеціў хату як-кольвек патроху,
Зрабіў бы камору, выкаваў бы жорны, —
Усё ж свой хлеб еў бы, хоць бы сабе чорны!
Ну дык жа адстаньце, нашто я вам трэба:
Ці каб ваш хлеб есці, ці рабіць вам хлеба?

## *Быў у чысцы!*

Раз у дзень задушны[1], якраз апаўночы,
Іду я дадому... а цёмна і ўюга —
Не каб заліўшы саўсім ужо вочы,
Але так, у меру падвыпіўшы туга;
Іду і мяркую: ці то цяпер шчасце,
Як паноў не стала, ці то была доля?
І лічу на пальцах: паншчызны дванасце,
А гадоў да трыццаць, як настала воля...
Там быў аконам, камісар і цівун,
Наместнік, ляснічы, хмістрыня, паны.
І кожны меў права узяць за бізун,
І кожны меў права да нашай спіны...
А цяпер?.. Ой, штосьці кепска выходзе,
Цяпер ці не болей настала паноў,
Не надта свабодна у гэтай свабодзе.
І давай я лічыць паноў новых зноў:
Стараста, соцкі, пісар, старшына,
Пасрэднік,ураднік, асэсар і суд,
З'езд міравы, прысутства і сход...
Аж паднялася са страху чупрына,
Аж пальцаў не стала на весь гэты шчот.

[1] Дзень задушны — дзень памяці памерлых, 1 лістапада.

А пальцамі ж трэба карміць гэты люд!..
Іду... калі, шусць, як маланкай спаліць,
Стаіць, так якраз, што умёр, аканом.
Прыгледжуся — ён, тыкі ён і стаіць,
І стрыжаны ж вус, і стаіць з бізуном...
Схудаўшыся толькі: скура ды косць.
А белы весь чыста, белы, як снег,
Толькі на сэрцы плямачкі ёсць
І плямкі на пальцах — мусіць, то грэх?..
«Брацiку, — кажа, — браце Мацей!
Ратуй маю грэшную душу
З чысца[1], з рук подлых чарцей,
Альбо навекі загінуць я мушу!
Дваццаць пяць лет, што у чысцы я пёкся,
Усе грахі выбыў, усіх жа адрокся,
Толькі на сэрцы вот грэх, як смала,
Прыліп да мяне і не змыты;
То за жонку тваю: саграшыў, як жыла,
За цябе, што нявінне быў біты.
Ох, ідзі ты са мной, зачарпнуўшы вады,
Аж да чысцу таго, аж на дне,
І выбач ты мяне, што як быў малады,
Твая жонка-краса спадабалася мне.
І палій ты вадой мне на сэрца, Мацей,
Буду Бога маліць за цябе, за дзяцей!»
Я заплакаў з жалю, але думаю: досць
Нацярпеўся і ён, балазе што жывы,
Гэтак ссох ад агню — толькі скура ды косць.
Пайду ў чысцец я той, пагляджу на дзівы!
І дзівы ж, браце мой, у тым чысцу, але!
Чэрці кормяць смалой і гатуюць ў смале,
І цягаюць, і рвуць, запрагаюць у воз,
Кручком цягнуць кішкі і зубамі за нос,

[1] Чысцец — паводле каталіцызму, месца часовай кары за дробныя грахі па смерці чалавека, куды ён трапляе пасля апошняга «Божага суда» і дзе адбывае пакуты; адпакутаваўшы (з дапамогаю родных і блізкіх, якія ў гэты час моляцца за душу нябожчыка), ён трапляе на неба.

Вочы колюць ражном, пазурамі рвуць твар,
Скрабуць скуру нажом, як на боты тавар.
І каго ж тут няма? — тут і пан, і жабрак,
Ганарал і салдат, аканом і мужык.
А што баб і дзявок — сказаць так —
Ўтрое больш, як мужчын ёсць на лік.
Хто за што, а як баб — дык найбольш за язык.
Языкі ж даўжыні — так, як добры ручнік.
Іх і паляць смалой, і нажамі скрабуць,
І ніяк дабяла прапаліць не магуць.
Надта шмат маладых, што дурылі мужоў;
Чараўніц, а і зводняў старых,
Тут я шмат і знаёмых найшоў,
Але так не чапаў ужо іх.
З мужыкоў тут не надта каб шмат,
А ўсё больш дык багатых паноў.
На зямлі адцярпеўшы, наш брат
На той свет, як па масле, пайшоў.
А панам дык і трудна цярпець
Без прывычкі, дык стогнуць, аж страх!
Глянеш, пан, як, здаецца, мядзведзь,
А чорт дышлам запрог і трах-тарарах,
Бічам б'е, ражном пора у тыл,
Морду круце набок і за кудлы трасе;
Стук і крык, аж віхор круце пыл,
Так пан чортавы воз той нясе.
Там паны і муруюць й аруць,
Вымятаюць і свінні пасуць,
А смалу дык, як мёд, там жаруць,
А каменні, як горы, нясуць, —
Усё ў пекле каб дно як зрабіць,
А ўсё толку няма іх работы нігдзе:
Тут яны робяць усё, абы збыць,
І там ім гэтак работа ідзе.
Я ж то думаў, што ксяндзоў тут няма.
Калі зірк! аж і ксёндз тут сядзіць:
Чорт яго аблажыў грашыма,

Запаліў у грашах тых, і ксёндз так гарыць.
А другі дык вісіць, але як? —
Дык і стыдна мне вам гаварыць,
А са стыду чырвоны, як рак,
Вочы жмура, як кот, і гарыць.
А тут баба яго так кляне
Ды так лае з астатніх жа слоў,
Што, каб гэтак хто лаяў мяне,
Я б яго з свету даўно перавёў.
Станавы, старшына і тый тут.
Тым дык чорт усё грошы збярэ,
Скруце цвёрды круцель або жмут
Ды ў горла запрэ і даўбешкай пярэ;
Каласірам[1] ці чым там паліў,
І жмут той у горле агнём запаліў...
Але ж і ёсць там народу, аж цьма!
І роду ўсякага, і стану, і веку,
Хто не жыў на зямлі, таго тут няма;
Няхай Бог сцеражэ там быць чалавеку!
Ледзь я прайшоў аж у тую кануру,
Дзе аконам Бізуньскі цярпіць.
Чорт і яго запрагае у фуру.
Спацеўшы бедны, а енча: «Дай піць!»
Я брызнуў крапідлам на твар,
Ён аж зрадзеў, як дзіця,
Як хапіўся рукой за той каламар[2],
Што ўзяў я з вадой яму для піцця,
Дык высахла зараз вада аж да дна;
Ён стаў такі светлы, як гэты дымок,
Стаў нікнуць, засталася пара адна,
І знік так, як нікне на сонцы аблок.
Не помню, як выйшаў я з чысцу таго,
Праснуўся у хаце на печы аж днём.
Усе кругом плачуць, не ведаць чаго,
А пале мяне дык так, як агнём!

---

[1] Каласір — газа.
[2] Каламар — чарніліца; тут у сэнсе конаўка або іншая пасудзіна.

Трашчыць галава, баляць усе косці,
І надта вады зажадалася піць.
Напіўся і зноў паў я у млосці!..
От давялося ж у чысцы мне быць.

## Калыханка

Люлі, сынок, люлі, люлі!
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі;
А ты чаго не спіш, сынку,
Як бы чуў ліху гадзінку?
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
А як матка прыйдзе ў госці,
Ой, то будзе ёй радосці...
Сядзе матка ў кут на лаве,
Сын хлеб-соль прад ёй паставе,
Ручкі, ножкі пацалуе,
Памілуе, пажалуе;
Пачастуе мядком сытным,
Блінком мякенькім падсітным,
Піражочкам і з начынкай,
Верашчачкай гарачынкай...
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Ой, то будзе рада матка,
Хоць і простая салдатка,
А ўсякі шапку здыме,
Як дазнаецца аб сыне.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,

Людцоў Божых будзеш біці,
Цяжка будзе ў свеце жыці,
Будуць клясці, як ліхога,
Прасіць смертанькі ад Бога.
Люлі, сынок, люлі, лголі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Тады матка прыйдзе ў госці,
Сын выкіне стары косці,
Жабруючы, пойдзе ў вёску,
Будзе прасіць Матку Боску,
Каб забыцца ёй аб сыне,
Каб не ведаць, дзе ён згіне.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Ой, не будзь ты лепей панам,
Ні вялікім капітанам,
Будзь, чым матанька радзіла,
Каб у госці не хадзіла,
Каб век з табой векавала,
Гаравала, працавала...
Люлі, сынок, люлі, люлі.
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі...

## Кепска будзе!

### *Паэма*

Як я толькі нарадзіўся —
Бацька сказаў: «Кепска будзе!»
Ну дык жа ж не памыліўся:
Здзекаваліс Бог і людзе.
А чым кепска? — бо на марцы
Я радзіўся (пост праўдзівы,

Цяжкі месяц гаспадарцы.
Як пражыў хто, — будзе жывы).
Пераеўся хлеб да крышкі,
Бульбы толькі як пасеяць,
І прыварку[1] ані лыжкі,
І скаціна — хоць развеяць;
Ні саломкі, ні то сена,
Хоць бы на раз для скаціны;
А тут дроў ані палена,
А тут яшчэ нарадзіны!
Трэба ж бабе бохан хлеба
І гарэлкі ж трэба пляшку,
Яшчэ ж хрысціць хлопца трэба...
Вот і думай, як сярмяжку
Нясці жыду пад заставу[2]
Ці прадаць каня, кароўку?
«Сеў, — казаў ён, — я на лаву,
Узяўшыся за галоўку,
І заплакаў, аж заліўся,
Так, як бацьку пахаваўшы...
Кепска зрабіў, што радзіўся,
Кепска будзе, свет пазнаўшы!»
Ці то слова йшло урокам,
Што сказаў у кепскім часе,
Ці хто кінуў такім вокам?..
Ну і доля ж удалася!
І збылося ж бацькі слова!
Вот у тыдзень вязуць гэта
Хрысціць мяне да Макрова
Кумоў двое і кабета.
У Аборках[3] мост сарвала,

[1] Прыварак — мука лепшага гатунку, грачаная, гарохавая, бабовая, а найчасцей ячная для прыгатавання розных страў.
[2] Пад заставу — пад заклад.
[3] Аборкі — вёска пад Маладзечнам каля Палачанаў са слынным старажытным драўляным касцёлам, рэшткі якога захаваліся дагэтуль (пабудаваны ў 1443 г., перабудаваны ў 1773 г.).

А я ж быў — чуць жывы, слабы.
Рада — ў раду, на тым стала,
Што ахрысцяць з вады бабы.
З Беразіны[1] жменяй вады
Кума сама зачарпнула,
Паматала сюды-туды.
Трэйчы на мяне лінула.
«Вот і хрэст увесь тут, — кажа, —
І ксёндз хрысце гэтаксама,
Толькі яшчэ чымсь памажа,
А хлопцу ўсё роўна — яма!
Хоць бы жывым хоць давезці,
Каб дарогай не сканала, —
Скажуць — кепска вязла гдзесьці
Або туга спавівала!..»
Гэтак мяне пахрысціўшы,
Вязуць назад ужо да маткі,
Вочы добра пазаліўшы,
Ледзьве уняслі да хаткі.
Закусіўшы тут як трэба,
Пакумаліся, і квіта:
Баба ўзяла бохан хлеба,
Пляшку водкі, торбу жыта;
Разышліся і паснулі.
Матка ж мяне калыхае:
«Люлі, — шэпча, — сынок, люлі...»
А як зваць? — сама не знае.
Вот назаўтра спазарання
Бяжыць матка да кумошкі
Ды пытае: як празванне
Далі сыну? Лёну трошкі
Тут прынесла пры здарэнню,
Трошкі сала, круп са жменю...
А кума ж была праворна:
Хоць што збрэша — не запнецца;

[1] Беразіна — рэчка ў Аборках.

Круце сабе ў сенях жорна,
Трэба ж салгаць! Куды ж дзецца?
«Імя, — кажа, — твайму сыну
Ксёндз хацеў даць па кантычцы,
Думаў ён, можа, з гадзіну,
Узяў ксёнжку, як стаў рыцца,
Дык даў потым з каліндарка»[1]!
Матка прандзей з хаты ў сені,
Як бы цівун гнаў па карку,
Усё шэпча то імене:
«Аліндарку, Аліндарку!»
Прыляцеўшы так дадому,
За калыску узялася
І зрадзела, як святому,
Што аж слязьмі залілася.
І калыша, і галосе:
Надта імя спадабала,
Надта добрае здалося,
Што такога і не знала!
Вот і клікаць мяне сталі
Скаліндаркай, Аліндаркай...
Ну, як знали, так і звалі.
Але вот што з гаспадаркай?
Наперш конь здох таго ж лета,
І цялушка, як лань, пала...
Матка ж, ведама, кабета,
Затужыла і запала,
Гадкоў зо тры пацягнула,
Ў марцы й ручанькі згарнула.
(А ўсё ў марцы, трэба ж гэта!
А разумная была кабета!)
З таго гора бацька бедны
Стаў маркотны, як магіла.
Было сядзіць такі бледны...
«Што ж ты гэта нарабіла?!»

---

[1] З каліндарка — з календара.

Гэтак скажа і заплача.
(Хто ж пачуе, хто забача?)
Потым дай памалу сватаць;
Трэба ж, ведама, жаніцца,
Каб было каму палатаць,
Каб было у што змяніцца,
А так усё памарнела:
Куры, гусі, навет свінне.
І свіння дзяцей паела,
І карова марне гіне...
Увосень давай шукаць пары,
Ды ніводная не хоча;
Аднэй бедны, другой стары,
Трэця, чорт ве — што тароча:
«Аддай, — кажа, — Аліндарку
Куды-кольвек хоць на людзе,
Сядзь на нашу гаспадарку,
Тагды выйду, добра будзе!»
Бацька кідаўсь зо тры тыдні,
Яшчэ горай зажурыўся,
Прадаў сякі-такі злыдні[1],
Разлайдачыўся, распіўся
І ўмёр так пад гародам,
Устраміўшы ў плот галоўку!
Шапку найшлі аж за бродам
І у шапцы залатоўку.
А назаўтра прывёў соцкі
Асэсара, паноў трое.
Труп той зрэзалі на клёцкі...
(А у марцы ж было й тое!)
Мяне цётка, у апеку
Ўзяўшы, трошкі падрасціла
Ды якомусь чалавеку,
Як за сына, адпусціла.
Незадоўга змёрла цётка,

[1] Злыдні — дробныя гаспадарчыя рэчы, транты.

Я стаў круглая сіротка.
Ці дзе днюю, ці начую,
А ўсё бяду сваю чую!
Пастухі збяруцца ў гаю,
Пяюць песні ля бярозы,
А мне чагось, сам не знаю,
Смутна, цяжка, цякуць слёзы.
Рос я гэтак за вачыма,
Ужо трэйчы спавядаўся,
Калі зімой да айчыма
Ды ураднік заблукаўся.
Я сяджу сабе на печы,
Пляту лапці, ўю аборы,
Ён паказуе праз плечы:
«Што-то сын твой, — кажа, — хворы?»
«То не сын! — айчым той кажа. —
Ўзяў сіротку; дзякуй Богу,
Добры ўдаўся: позна ляжа,
Рана ўстане і адлогу
Не запусце... спагадлівы;
Маю сына, хоць не родны.
Ажаню, як буду жывы,
Будзе Богу й людзям годны!»
«А лет сколькі?» — той пытае.
«Дваццаць, — кажа, — мусіць, мае?»
«А зваць як?» — «Да Каліндарка!..»
Ратнік піша усё шпарка.
Як радзіўся, дзе хрысціўся?..
Пісаў, пісаў дый паехаў!
Бацька яго угасцілі,
Далі торбачку гарэхаў...
После таго, так не далей,
Як у тыдзень і асэсар
Шусць у хату (і з мадаляй).
«А дзе, — кажа, — той пасэсар,
Твой Ліндарка, ці як звецца,
Што хаваецца з някруцтва,

Пляцець лапцікі на печцы?..
Ашуканства, баламуцтва!..»

А я ж ехаць меў па дровы,
Бацька клікнуў, іду ў хату...
А асэсар — той — здаровы!..
Лясь мне ў морду, потым тату.
Я ж узяў яго за грудзі
І піхнуў лыбом у дзверы.
Ён як раўкне: «Гэй вы, людзі,
Тут разбой! Прыміце меры!..
Тут рыштант, брадзяга скрыты, —
Вот і лэб калісь быў брыты, —
Вяжы ўсіх, нараджайся!..»
Мяне лясь! «Ты хто? Сазнайся!..» —
«Скаліндар, — кажу, — сірота!..»
Пацягнулі па дарозе,
Завязалі і варота,
Мы ж спыніліся ў астрозе...
Астрог, братцы, паглядзеўшы
Мімаходам, выглядае,
І нічога: шык, не еўшы,
І ў астрозе не бывае,
Але лепшы ў хаце голад,
У дарозе велькі холад,
Найцяжэйша праца ў полі,
Як у той астрожнай долі!
Відзеў пташку я у клетца,
Як галоўкай потым б'ецца,
Аж скрыдэлкам затрапоча —
І сканае... жыць не хоча.
Раз лісіцу, адкапаўшы,
Прывязалі мы да кола:
Стала ж грызці што папаўшы,
Сабе бруха распарола,
Растрыбушылась на часці,
Каб не жыць так, хоць прапасці.

Нашто — гадзіну, мядзянку,
Пусці ў шклянае начынне, —
Сама сябе без прастанку
Будзе жаліць, покі згіне!..
Як ужо ж скаціна тая
Або гадзіна праклята
І та цану волі знае,
Што ж для нашага-то брата,
Меўшы розум не скацінны,
Як знаць волю мы павінны?..
А ў астрозе ж няма волі,
Ні ў чом няма і ніколі!
У жалезе тыя дзверы,
Пры дзвярах стаяць жаўнеры,
А народ усё сярдзіты —
Так як бы яшчэ не сыты
Людскіх слёзаў, мукі, енку;
Не гавораць памаленьку,
А ўсё зыкам, а ўсё з лайкай,
А ўсё з боем, ўсё з нагайкай.
У дзядзінец нас як пхнулі,
Дзвярмі тымі як грукнулі,
Дык і свет мне тым закрыўся,
Як бы у труну забіўся...
Зараз старшы ўзяў за плечы,
Хляснуў трэйчы, так, без рэчы,
Ключы кінуў: «У халодну!»
І аблаяў матку родну.
Нас піхнулі, як у яму,
Ў цёмну хату чварагранну[1],
Далі хлеба, вады меру
І запёрлі, як за веру
У цямніцах калісь гэта
Замыкаліся ад света.
Цёмна, зімна... Прытуліцца
Няма куды! А каганец,

[1] Чварагранну — чатырохкутную.

Як бы губка, толькі тліцца...
Заспявалі мы ражанец[1].
Пяём, плачым, аж галосім,
Божай ласкі — Праўды просім!
Ў такім енку, са слязамі
І паснулі у той яме!
Абудзіўся я з здзівення:
Глядзіць ў шчэлачку праменне!
Я падумаў: ласка ж Божа
І сюды пралезці можа?
Аглядаюся вакола,
Як бы шукаў і тут Бога.
Мне зрабілася васола,
Не баюся я нікога,
Зноў ражанец: «Byg ucieczką»[2]
Бляю сабе, як авечка,
Калі бразць ключом у дзверы,
І крычыць хтось: «Гэй, вы, зверы,
Вы, бунтоўнікі, паскуды,
Выбірайцеся адсюды!
Тут важнейшым трэба сесці,
Вас у вобшчу здадзім гдзесьці!..»
Павялі нас аж на гору...
Па якомусь калідору...
Дзверы, дзверы, ў дзверах дзюрка,
І у каждай жа хвігурка
Як бы тая ж выглядае,
Гдзе ні глянеш, усё ж тая:
Блішчаць вочы, твар, як гліна,
І абросшы, як скаціна...
У турме, як у тым гробе,
Ў адну твар усіх паробе!
Ішлі, ішлі гэтак з гоні.
А смрод такі, што ад воні

[1] Ражанец — ружанец, пацеры.
[2] Byg ucieczką (польск.) — Бог маё сховішча, мой ратунак; пачатковыя словы каталіцкай малітвы.

Мне аж дух у грудзях спёрла,
Як бы цісне хто за горла.
Тут нам хату паказалі,
Упусцілі, развязалі,
Вады далі, трохі хлеба
І запёрлі зноў як трэба.
Тут народу шмат сядзела.
Глянуў я — душа самлела:
Як падушкі, у іх твары,
Ў хаце пуста, толькі нары.
Ляжаць усе, з нас рагочуць,
Навет мейсца даць не хочуць.
«Давай, — кажа, — хоць на пляшку;
А не даўшы, дык парашку
Цёнгле[1] ты выносіць мусіш,
А ўжо хлеба, дык не ўкусіш, —
Мы табе наб'ём аскому,
Покі вернешся дадому!»
Я спалохаўся, баюся.
«Войча наш!» — кажу, малюся...
Бог даў спомніць: залатоўка
Гдзесь была ў кашулі ўшыта,
Што дала калісь жыдоўка,
Што падвёз у млын ёй жыта.
Прэндка сарваў тую лату,
Кінуў злоты той на хату...
І не ўгледзеў, як хапілі,
Толькі відзеў — водку пілі.
Тагды сталі нас пытацца,
Ці застаўся хто у хатца?
Адкуль, за што пасадзілі,
Па якіх турмах хадзілі?
Іншы вуча, на пытанне
Даць якое паказанне:
«Кажы, — кажуць, — знаць не знаю,

[1] Цёнгле — заўсёды.

Чый я ёсць, з якога краю.
Малым быўшы, сляпых вадзіў;
А падросшы, і сам брадзіў;
Не прыпісаны да сказкі[1],
І так жыву з Божай ласкі.
Бог мой бацька, зямля матка;
Знаць не знаю» — уся гадка!
Так да марца сядзім ціха,
Не чуваць дабра, ні ліха,
А у марцы шлюць бумагу,
Каб дастаўлена брадзягу,
Супраціўніка уласці,
Улажэння першай часці,
Што мянуецца «Ліндарам»
Ды йшчэ б'ецца з асэсарам,
Ды каб быў ў ланцуг закуты,
На нагах каб былі путы,
Праважацелі каб срогі[2],
Каб не сходзілі з дарогі,
А каб проста да начала...
І ці мала там пісана?!

Вот назаўтра рана-рана
Нам адзежка наша дана;
Паскідалі мы сярмягі,
Салдат узяў дзве бумагі,
Нас звязалі — і ў дарогу!..
Я падумаў: «Дзякуй Богу!
Хоць нас слоначка сагрэе!
Вецерчык на нас павее!
Можа, дожджык срыбны змоча!
Можа, пташка засвяргоча?..»
Аж заплакаў я, зрадзеўшы!
От, здаецца б, і не еўшы

[1] Сказка — рэвізская сказка; спіс асоб падатковага стану, які складаўся пры рэвізіі-перапісе.
[2] Срогі — строгі, суровы.

Быў бы сыты на свабодзе,
Як той кролік у гародзе.
Тут, здаецца, і сканаў бы,
За свабоду жыццё б даў бы!

Скаўронячкі Бога хваляць,
А пастушкі агонь паляць,
А і слоначка прыгрэла,
Аж мне ў душы паяснела.
Да палудня ішлі гэтак,
Пры дарозе шмат і кветак:
То пралескі, то сасонка,
Выгравае Божа слонка!
Так пад вечар ў мейсцы сталі,
У халоднай начавалі, —
Было позна. Заўтра зрання,
Якраз у дзень Звеставання[1],
Клічуць мяне да дапросу
(Задаваць-то ужо чосу!).
Той судзебнік маладзенькі,
Такі быстры, хоць маленькі,
Ўсё пытаецца ды піша
І нагой усё калыша.
Як спытаўся мяне, хто я?
Я і спомніў сабе тое,
Як вучыў там той з астрога:
«Знаць не знаю я нічога!»
І старога тут клікнулі,
Папыталіся, раскулі
І дадому павярнулі.
А мне кажа: «Ты, брадзяжка,
Сакрыў званне, будзе цяжка:
Сорак розаг, потым роты!
Скажы лепей — адкуль, хто ты?»
А ўсё піша, піша, піша

[1] Звеставанне — веснавое свята 25 сакавіка.

І нагой усё калыша.
Пісаў, пісаў, даў другому
І сам пайшоў кудысь з дому.
Мяне зноў жа да астрогу,
Толькі цяпер, дзякуй Богу,
Адзінокі я застаўся.
Айчым плакаў, як жагнаўся.
«Помні, — кажа, — мяне, сыну,
А я хіба што сам згіну,
А цябе вярну да вёскі,
Хіба б ужо гнеў быў Боскі
Або б Праўда гдзесьці змёрла!
Вырву цябе ім із горла:
Бог паможа, процi сілы
Праўда выйдзе, як з магілы!»
Сказаў гэта, пакланіўся
Ды ізноў слязьмі заліўся.
І мне стала ў вачах цьмяна,
Зашчымела ў сэрцы рана,
Як бы штосьці адарвала,
Сам не знаю, што мне стала?
Калі гляну, ачунеўшы, —
Я ў шпіталі, захварэўшы...
Галава мая абрыта,
Твар вадой ці чым абліты,
А піць хочацца... здаецца,
Рэчку б выпіў, каб пры рэчцэ!
Так я праляжаў тры тыдні,
Прадаў усе свае злыдні;
Надта есці стаў памногу
І паправіўсь, дзякуй Богу!
Я ж тут ляжу, і ні рэчы,
Што там стары гаспадара.
А ён торбу ўзяў на плечы,
Па начальству просьбы жара!
Трэйчы Вільню, сем раз Ліду
Ён адведаў. Трэба ж ведаць, —

Прысягнуў, пакі я выйду,
Навет дома не абедаць!
Раздабыў усе паперы,
Запісаў мяне у сказку...
Што і бацька б, можа, шчэры
Не зрабіў такую ласку.
Так увосень, ў замарозкі
Прывялі мяне да вёскі,
Пазбіралі шмат суседаў!..
Кожны гаварыў, што ведаў:
Як я тут, калі радзіўся,
Як і бацька мой жаніўся...
Паказалі усё чыста,
І што імя мне Каліста,
Што завуць мяне Ліндарка,
Так, на смех, што чыста гол,
Як ліндар, што на фальварку:
Весь маёнтак — ён ды вол.
Асэсар быў ужо новы,
Чалавечак так, нічога,
Якісь ціхі, нездаровы
І цярплівы... хваліць Бога!
Пасля таго праз паўгоду
Ў марцы ж мяне на свабоду,
Дзякуй Богу, адпусцілі
У той дзень, як і хрысцілі.

## Адам Гурыновіч

* * *

Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею,
За тое, што ў сэрцы збудзіў ты надзею,
Што між братоў нашых знаходзяцца людзі
З кахаючым сэрцам і баляшчай грудзяй.
Дзякуй табе, браце, і за тыя словы,
Што ўспомнілі звукі нашай роднай мовы.
Бяры, браце, дудку, наладзь і жалейку,
Няхай песнь смутная ідзе у калейку
І будзіць у сэрцах мысль аб лепшай долі,
Якой мы не зналі дагэтуль ніколі.

**Янка Лучына**

# Роднай старонцы

Ты параскінулась лесам, балотамі,
Выдмай пясчанай, неураджайнаю,
Маці-зямліца, і умалотамі
Хлеба нам мерку не даш звычайную.

А сын твой, беднаю адзет сярмягаю,
З лыка пляцёныя лапці абуўшы,
Едзе драбінамі ці калымагаю,
Конем, што цягне, як бы заснуўшы...

Усё ў табе бедна. Часта заплача
Мужык-араты дзеля злой долі,
Цяжка працуючы. Ён жа, аднача,
З табой расстацца не жджэ ніколі.

І непрыглядную хату з пажыткамі,
І поле скупое, выган без пашы
Мы, апрануўшыся старымі світкамі,
Любім і цэнім — бо яны нашы.

Дасць Бог, крывавым потам аратаму
Здабрыць пясчану зямліцу здарыцца,
Быць добра сытаму, хоць не багатаму,
А дзеля празніка і чарка нам зварыцца.

Сонца навукі скрозь хмары цёмныя
Прагляне ясна над нашай ніваю,
І будуць жыці дзеткі патомныя
Добраю доляй — доляй шчасліваю!..

## Паляўнічыя акварэлькі з Палесся

*Паэма*

### I. ЗАМЕСТ УСТУПУ

«Цікава, мой панічу, што ў жыцці настане? —
Вёў мову Грышка, як прылёг быў на паляне,
Дзе адпачыць спыніліся стральцы ў бары. —
Мо не да ладу я кажу, мо ўжо стары?
Што змена часу дасць нам, страты ці прыбыткі?
Выходзіць, пане, як у бабкі-варажбіткі.

Спрачацца не хачу, заўвага ж ёсць адна:
Я, не раўнуючы, як той кравец з сукна,
Вам лёгка з кожнага тутэйшага нязломка
Двух выкраю мешчанчукоў ды меры ёмкай.
А хіба ліха нашу чэлядзь, дабрадзей,
Не гладзіць гэтак, як барсук сваіх дзяцей?
Го! го!.. каб злыбеды зубоў не вышчаралі,
З асілкамі-дубамі люд бы раўнавалі.
Вось! — блізка беручы, на пана паглядзеў:
І цьфу! — аж падступае злосць, паніч схуднеў,
Запалі шчокі, не пазнаць людзіны з места!
А як пашастаем па лесе мы сумесна,
Дасць Бог, за восень пан паправіцца ў мяне,
Пакуль зноў жыць на лад мястовы не зачне.
Ды, мой панічу, праз паўгода быць вам потым,
Нібыта той камар, што хворы на сухоты». —
«Шчыруе той, хто мусіць». —
«Думкі мне адны
Спакою не даюць: хай спаляць перуны

Хвалёны гэты лад і новыя парадкі!..
Чыгунку пракладацьмуць тут і даастатку
Павысякаюць Ляды Чорныя, сюды
Збярэцца набрыдзь, купай з'едуцца жыды,
Каб зыскі выдзіраць усюды зграяй цэлай
Да Князя, возера, ад Машукоў і Цэпры,
Спусцее Паграбішча, пойдзе ўсё на звод,
І ў Муты схоча ліпкі на прыбыткі зброд,
Сок высмакчуць увесь, нібы кляшчы, з зямелькі,
Прастоту ўрэшцe высмее прыблуда нейкі,
Да ніткі абскубуць...
Як рады дасць жыхар,
Што ў Чорных Лядах меў усё як гаспадар,
Калі за венік нават, што цяпер дармовы,
Плаціць з кішэні будзе!.. А кантракту ўмовы,
Калі падпіша?..
Год ад году — і канец,
Не толькі знікне звер у нас, але й глушэц.
А прыйдзе час, што й качкі не пабачаць людзі,
Што на драздоў і дзятлаў ставіць сеткі будзем,
Цьфу!» — так правіў Грышка погляд просты свой.
Аблічча, постаць, а таксама світкі крой
Яскрава сведчылі, што ён дзіця прыроды,
Палесся сын і спадкаемец варты, годны,
Выхоўвалі яго імшарыны, чарот,
Віры і плыні, душагубкі, што з калод.
Спрачацца з Грышкам цяжка, лоб яго закуты
На дыспуты, на спосаб новы і нячуты.
Ляпей узважма, скідку робячы прытым,
Ці ёсць хоць частка праўды ў поглядзе старым?

Ідзе да люду поступ, хай ідуць і людзі,
Гудок фабрычны кліча, паравозы будзяць,
Свет белы абягае тэлеграф ганцом,
Развеяў цемру Томас Эдысан святлом.
Што ўбачым, цяжка праракаць, як ад навукі
Дужэць, спрытнець у чалавека будуць рукі!

Пад ногі поступ падабраў вякі, падспод,
Усё, што адпадзе, асуджана на звод.
Пратэставаць дарэмна і навошта збочваць,
Бо людзі кажуць: «Жыць і карыстаць мы хочам!»
На акіяне хвалі марна люцяць бой:
Іх топча карабель, з іх пена за кармой.
Што небасяжных гораў тоўшча значыць будзе,
Калі тунэлі іх наскрозь прабілі грудзі?

Які ты ў нашым часе, о палескі край,
З адменаю тваёй, куды ні завітай,
Дзе гожасць дзікае прыроды — ад пачатку,
Дзе памяткі князёў, тых Рурыка нашчадкаў,
Што ў стэп на полаўцаў збіралі вояў раць,
На дзіды тураў колісь сілу мелі браць?
Ты край глухі, твае аблогі векавыя
Плуг поступу ўзарэ пад нівы залатыя.

Вы, мшары й пушчы, знікнеце, як марны сон!
Звядзецца звычай, зменіцца стары закон,
І ўсё, што слушна да мінуўшчыны належыць,
Памрэ павольным сконам зубра ў Белавежы.

Паверма, шчасце заквітнее на зямлі,
Шумець там жыту, дзе балоты век былі.
Палескай простай грамады нашчадкі ў хатах
За стол шырокі сядуць у бяседзе братняй,
Нарэшце скажуць: шчасце — ява нашых мар!
Паверма!.. хоць і Шапенгаўэр скрывіць твар.

Вось колькі абразкоў, сабраных у прастоты
На полі, сенажаці, ў пушчы, на балотах,
Каму сама прырода твор складае свой
З найцікавейшым зместам, з моваю жывой,
Каму і рыфмы (што цяпер выходзяць з моды)
Не замінаюць і не чыняць перашкоды.
Хто мае за людзей усіх палешукоў,

Таму не збрыдзее змест гэтых абразкоў.
Мы з праўдаю не размінуліся ў прысудзе,
Што гэтак ёсць, што так было, ды так не будзе.

## II. ПЕРШАЕ МАЁ ПАЛЯВАННЕ НА ЛАСЁЎ

Папуску даўшы паляўнічай раз ахвоце,
Страляў каліс чачотак, вераб'ёў на плоце.
Стары пабачыў Грышка, йшоў кудысь сабе,
Сярдзіта плюнуў ды сказаў быў у журбе:
«Панічу! эх, панічу! пахвалы не мецьмеш,
Хоць стрэліш трапна й пташку, што ўпадзе, прыкмеціш.
Набою шкода — раз, другое ж — без віны
За што ж іх, дробных, бедных, біць, калі яны
Завеяй, маразамі туляцца пад стрэхі?
Дапраўды, грэх вялікі з гэтакай уцехі.
Хіба ў лясох звяроў няма, панічу мой?
Няхай бы волю там ахвоце даў сваёй.
Забіць лася, ваўка, хоць шарака не тое,
Што на чачотак, вераб'ёў псаваць набоі.

Панічу, згода ёсць на ўмовіны? Як мне
Пан слова дасць — ніколі ў пташку не стральне,
Я сам лася аб'еду, так пастаўлю пана —
За крокі будзе тры рагач неспадзявана». —
«Так, згода, згода!»

* * *

Тыдня не мінула шчэ,
Чакаў старога Грышку, недзе знік з вачэй,
Нарэшце ён з'явіўся. Значылася з міны,
Што ім прынесены шчаслівыя навіны.

«Панічу, блізка, дзе чароту гушчыня,
Ёсць лось-рагач, ласіха, з імі ласяня.
Дык рушым заўтра з панічом, як ледзь заднее.
Мароз слабы, без ветру, ёсць тады надзея

На шчасце ў паляванні добраю парой.
Вазьму я сані пад'яздовыя з сабой,
Свайго каня, сыноў, упэўнены, панічу,
Ў лася, бы ў сена стог, страляцьме паляўнічы.
На паляванне ці гатовы пан як след?» —
«А як жа, як заўсёды». —
«Клопат наш сакрэт,
Усё дапільнаваць. А стрэльба ці набіта?» —
«Не». —
«Што? Мы ж вырушым да дня шчэ менавіта.
Зашыў у скурку кулі?.. браў іх на замер?» —
«Не». —
«Як жа быць, панічу?» —
«Ат! зраблю цяпер,
Ці стрэльбу набіваць мне будзе клопат нейкі?» —

«Панічу, прабачай! Ласі не верабейкі.
Не выйдзе анічога! Хай дазволіць пан
Самому мне дагледзець паляўнічы стан.
Трэ гэткія дапасаваць набоі ў рулю,
Каб стрэліў — і пайшла раўнюткім шнурам куля.
Даць пудла нельга, бо мне клопат немалы
Шукаць... Вось тут мае, панічу, пасталы,
У іх не холадна і ўзімку, то ж не ў ботах,
Лацвей на снезе ў лапцях і трымацца потым.
Апратка ё?» —
«Ў мядзведжым футры йду на дзіч». —
«Ха! ха! А снег? З яго не выпаўзе паніч!
Лісінае ёсць бацькавае футра пану,
Вось чым падперазацца?» —
«Шалем». —
«На загану!
Дапраўды, з гэтым панам тысяча пацех!
Паніч, як тычка на мяжы, то ж проста смех!
Мы ж едзем на ласёў, яны ж бо не цяляты.
Няхай усё абдумае стралец заўзяты,
Драбніца можа загубіць надзею ў нас,

Ласі не верабейкі, паўтару шчэ раз,
Ад сораму згарэць, як уцякуць з-пад носу.
А Божа ж мой! паніч якую стрэльбу носіць!
Цьфу!
З руляў нешта сыплецца на дол само.

На соек, можа, едзе пан, на дзятлаў мо?
Дальбог, паніч мне насланнё ліхое!
У стрэльбе бруд, ці ж пэўныя дасі набоі?
Бяру я стрэльбу, зрання прынясу сюды
Набітай добра, чыстай, — і палюй тады.

Ха! ха! не можа ў паляўніцтве пан кумекаць.
Бывай здароў! Хвала Хрысту!» —
«Хвала навекі».

* * *

На ўсходзе ледзьве толькі пачало віднець,
Быў да паслуг ужо стары асочнік мне.
Апратку ўбачыў Грышка і здзівіўся шчасна:
«Мо добры паляўнічы з пана будзе з часам.
Дык едзьма, бо пара ўжо падганяе нас,
На досвітку пяе пявун астатні раз.
Ласі тут блізка, хутка ім заступім ховы.
Не стрэлі бабы — ўдача будзе адмысловай».

На санях, гэтакія толькі на Палессі,
Дзе хочаш, там і едзь сабе — балотам, лесам,
Не шпаркі бег у іх з-за палазоў высокіх,
Затое снег ужо не падапрэ глыбокі, —
Мы рушылі, радком сядзелі ўчатырох.
Хоць моцны, конь ішоў ступою, сані цёг,
Яны, здавалася мне, рухаюцца ледзьве.
Сплыло так манатонна з дзве гадзіны недзе.
Прашу я Грышку:
«Едзь хутчэй! задаў нуды». —
«Паспех людзям на смех. Што станецца тады?

Ці ж лось прывязаны чакае ў лесе дзесьці?
Пайсці ён можа і далёка нас завесці,
А конь прыстане, ўнікне ўся яго мага,
І працай марнаю прыніжаны слуга!»

Я змоўкнуць мусіў і сумотнаю хвілінай,
Перш грэбліва чамусь, паглядваў на мясціны.
Абшары дзікія, без сцежак і дарог,
Асочнік толькі знаць ды звер палескі мог.

Край гожы, некрануты быў перада мною,
Чарот бязмежны, пушча з сіняй глыбінёю,
Дзе хвой выносістых завершаны стажок,
Як галаву, траха пасерабрыў сняжок,
А побач клён раскошны, дуб стары, гарбаты,
З разлогаю сукоў магутных, вузлаватых.
Падшыта ўсё густым ляшчыннікам, лазой,
Каб таямніцы ў глыбіні схаваць лясной.
Ціхота... толькі дзятла стук заўзяты, бойкі,
Ці крыкне папялістая ў спалоху сойка,
Ці свіст арэхаўкі, аўсянкі цвірк чуваць,
Ці піск гілёў, што чырванню зімой гарацць.

Язда мне здоўжылася, і сказаў тут Грышка:
«Хай папяроскі курыць пан, як часу лішкі.
Сваё як толькі займе ў лесе месца хтось,
Курыць ні-ні! бо не падыдзе блізка лось.
Нюх добры мае. Я дзе сена жменьку кіну,
Хай там саскокне пан у гэтую ж хвіліну,
Ціхутка стане за алешынай грубой,
Наставіць вушы ды глядзіць перад сабой —
Прыйсці да пана мае лось-рагач з чароту.
Няхай паніч падпусціць, цэліцца трэ потым
У грудзі, ў шыю, пад лапатку — як зручней,
Абы папаў, каб марна не ўпусціць надзей!
Ласі тут блізка. Пан, пабач! — то ж след ласёвы.

Цішэй! не гаманіць, бо звера спудзіць мова».
Падрыхтаваўся скокнуць і сяджу маўчком...
Мы едзем, едзем!.. Знецярпеўся і цішком
Спытацца вырашыў: «Ці скора?» — ў гэту хвілю
Заўважыў, што набок штось голаў Грышка хіліць
І сена кінуў жменьку.
Гоп! — я ў гушчары.
Паехаў Грышка.
Справа — волат-дуб стары,
А злева цягнецца чарот густы, балота.
Парушыў цішыню крумкач паспешным лётам.
Каля алешыны я ўперад паглядзеў,
Непадалёку ад мяне чарот радзеў,
У ім неспадзявана вынікла паляна,
Яна была лясной гушчэчай прыхавана.

Я пільна слухаў, пільна ўглядваўся ў чарот,
Вялікі пазначаўся ім абшар балот.
Калі мяцёлкі пташка парушала часам,
Стаяў як укапаны, сэрца біла часта.
Здавалася ад шамацення шмат разоў:
То ж лось надходзіць! — Не! — я памыляўся зноў!
Бо шолах той змаўкаў, была наўкола ціша,
Мяцёлкі ветрык ледзьве толькі пакалыша,
Як пташка толькі сядзе, хіліцца гучок,
Сініччын толькі чуўся ценькі галасок.
Трывала гэтае чаканне мо з гадзіну,
Заеў быў нуд. І вось шчаслівая хвіліна —
Бег ліс палянай. Цэль хоць ледзь відаць,
Сабе падумаў: стрэлю! Стане там чакаць
Хто тых ласёў, няхай іх д'яблы!..
Ліс наўцёкі,
Як бы пачуў мяне за вольхаю высокай.
Шчыпаў марозік злёгку і калоў траха,
Зноў думаю: да ліха! рукі грэць жа льга.
Спусціў куркі, засунуў я ў кішэні рукі,

Прысеў на снег, гляджу бяздумна ў даль з дакукі.
Ахвотна папяроску закурыў пасля.
Ці ж можа дым той даляцець аж да лася?
І раптам нешта затрашчэла на паляне,
Як быццам чую я каня: то йдзе, то стане...
Ускокваю! шчоўк! шчоўк! куркі. Лаўлю гук той,
А сэрца б'ецца, хваляў у грудзёх прыбой.
Яшчэ хвіліна — рукі, ногі задрыжэлі:
За крокаў сто мо лось стаяў вялікі вельмі,
Выцягваў храпы звер — адразу, як нюхнуў,
І дух чужы пазнаў, і небяспеку ўчуў.

Раз! два! з дзвюх руляў пакаціўся гром усюды,
Лось скочыў у чарот маланкай з перапуду —
Ягоны тупат чуецца штораз слабей.
Зноў цішыня, чарот калышацца сабе.

Дзесь грымнуў стрэл, за ім другі адразу ляснуў,
Зноў ціша мёртвая.
 Мінула многа часу,
Аж бачу — на паляне рухаецца штось,
Прыгледзеўся: там Грышка, з ім сыны і лось
На санях. Звер прыкметна іх сабой абцяжыў.
Курылі люлькі, йшлі радком утрох паважна.

* * *

Як я апавядаў пра свой залішні спех,
Смяяўся Грышка, саркастычны быў той смех,
За звычаем п'ючы з бутэлькі паляўнічай,
Дадаў:
«Ласі не верабейкі?! Так, панічу?»

## III. ПЕРАД КУЦЦЁЙ

«Куцця, паночку, заўтра, трэба ў поле рушыць,
Вялося так спрадвеку». —

«З дому йсці не мушу:
Мароз вялікі, вецер, дзе ні стань — шарпак,
Псы лапы зраняць».
Як сказаў я, Грышка так
І пляснуў у далоні з роспачы, няйначай.
«Паночку! што я чую?! Што ўсё гэта значыць?
Якая завіруха нават ні была б,
А трэба йсці. Няхай не слухае пан баб!
Ад іх, ад гэтага стварэння, шмат ліхога,
Не абышлося й тут без языка даўгога:
Зашкодзіць! — ляп! няможна! — ляп! абы мянціць.
Цьфу! — заўтра з паляўнічых дома хто сядзіць?
У дзень куцці паўсюдна ловы ладзяць людзі.
Як заўтра пан заб'е, дык цэлы год біць будзе,
Як пудла дасць, пасля і ўлетку, і зімой
Натрапіць... стрэліць... папакруціць галавой!
Шарак, забіты заўтра, многае пакажа, —
Як лось, казуля ў іншым часе, столькі ж важыць.
Ну хоць дразда забіць, хоць амялушкі дзве,
На птаства будзе шчасціць, і не дзе-нідзе.
Нам конча трэба йсці!» —
«Ат! слухаю пустое!
Лухта! Стары, а шчэ ўсё верыш у такое». —
«Лухта? Паночку!.. Вось жа ў недалёкі час
Базыль з Крывога Логу ў дзень куцці якраз
Ваўка і не забіў. Такі стралец!.. год цэлы
Пасля партач быў з партачоў, а ўсюды смелы.
Сам бачыў, схібіў у дзіка — хоць бы кусток,
Пытаюся: мо хворы?.. мо п'яны, браток?
Панурыўся, стаіць ён як дурны, аж шкода,
Мне ў дзень куцці той, кажа, воўк папсуў. Я згодны.
Забіў тады... аж радасна на сэрцы мне!
Клаў звера!.. хоць на крокаў сто і хвасянеш.
Пасыпалася шчасце мне, як з меха зерне.
Сава! — гляджу раз... луп!.. а падае цяцерка.
Абход удачлівы. Нагледжу свежы след

І адгадаю месца звера, ўвесь сакрэт». —
«Ну, досыць!.. Заўтра йдзем куды на паляванне?» —
«Ў лазняк». —
«А там ці знойдзем?» —
«З-пад зямлі дастанем!» —
«А потым?» —
«Праз хмызняк, што справа ад сяла,
З другога боку трэ заняць. Хрысту хвала!»

## IV. НА ЛАСЁЎ НА РЫК

«Панічу любы! завітаў да нас нарэшце!
Сядзеў паніч задоўга ў гэным клятым месце,
Пыталіся штодня ў двары, на вёсцы ўсёй,
Калі ж да нас наведаецца вучань мой?!» —
«Не мог прыехаць я праз розныя замінкі». —
«Здароўе як?» —
«Нічога». —
«Не відно жывінкі
З аднэй прычыны: места — не вясковы кут,
Мудрэйшыя вы там, ды жваўшыя мы тут:
Я дзед, гадоў — шэсць крыжыкаў, вось век старога,
А шчэ з вас кожнага падужаць хопіць змогі». —
«Хвальба». —
«Ды не зусім! — шчэ не слабы на ўсё.
Пан знае?.. пачаліся вабы на ласёў». —
«То добра». —
«Сёння ж паспрабуем надвячоркам:
Удвух мы з панам рушым памаленьку борам,
У Лядах вабіць трэ, пры возеры Гнілым». —
«А ў Круглiцы?» —
«Хай крые Бог на слове тым!
Крушыны дзе няма, там часу лось не бавіць». —
«За рэчкай мо?» —
«Там не было на лекі нават!..
І начаваць да Базыля. Як стане днец,
Дадому рушым праз імшары, і канец.

Як прыйдзе лось на ваб, забіты будзе намі,
А не, дык што ж... хіба ж адважваюць кіямі.
Мо ў Чорных Лядах пан ваўка ўпалюе сам!
Сядзіць, хітруга, як на варце сочыць там.
Спанадзіўся... і як цялё вялізны, шэльма.
Вастру я зубы на яго, мне кроў псуў вельмі!» —

«Як жывяце?» —
«Патроху нейк жывем сабе». —
«Тытунь, фунт пораху і шапка вось табе». —

«А мой жа дабрадзею! любыя паняты!
Дарункаў кожны з вас прывозіць мне багата!
Над тытунямі гэты панавы тытунь!
Сягае ў мозак — аж да слёз, пад нос не сунь!
Тутэйшы местачковец, мешчанчук насаты,
Калі нюхнуў, быў чых — паліў, нібы з гарматы.
Якое дзіва!.. спірт!.. І шапка! Божа мой!
Пайду я на Вялікдзень да касцёла ў ёй.
Ангельскі, пэўна, порах... Шмат з яго рахубы:
Драбнюткі — нібы пыл, а з пысы выб'е зубы,
Дай мерку добрую... То ж, браце, дзівіна:
І дыму мала, й гук — як ляск у бізуна,
Нясе ў раўнюткі шнур!
Ды нам пара ў дарогу,
Да Лядаў шмат, да возера таксама многа,
З прычыны гэтай збор прыспешваць трэба край.
Да стайні йду, хурман парупіцца няхай».

Мо не пазней як з паўгадзіны, між палеткаў,
Якія спелым жытам залацелі ўлетку,
Каля жытнёвых коп на ржышчы за грудком,
Паўз ніву грэчкі, што духмяніла мядком,
Цёг трухам просты воз, драбінкамі названы,
Таварыш паляўнічых, конік наш буланы.
Я ехаў з Грышкам, а ў бары ўжо быў душой,
Акрылены надзеяй добрай і думой.

Нібыта стужка, лес наперадзе далёка
Раскінуўся, абняўшы небакрай шырока.
А жнівеньскае сонца прыспарала жар,
Блакітны промнямі выбельвала абшар,
Хіліла бег свой дзённы пакрысе. За возам
Клубіўся хмаркай пыл, узбіты на дарозе.
Клубоў разрост супыніць неўзабаве лес,
Кружляе каня ў небе з крыкам жальным спрэс.
Ды зрэшты — ціша. Спіць, спавітая спякотай,
Уся прырода, толькі капытоў стукота
І тарахценне воза будзіць той куток.
Вось мы і ў лесе! Чуўся тут і халадок,
І смольны водар, што струменіў бор хваёвы.
Драбінкі трэсліся на сплётах каранёвых.
Дарожка вузкая вужакай лесавой
Вілася між кустоў ляшчынавых і хвой.
Выстукваў дзяцел на ствале, і невысока
Над галавою з крыкам праляцела сойка.
Я свіснуў — і памкнула з пуду. Шчэ ляцеў
Над намі нейкі птах, варону выдаў цень.

«Но! но! стары буланку! — Грышка панукае
Ды на каня і на дарогу наракае. —
Удача, можа, будзе заўтра ў паніча,
Як пойдзем разам паляваць на рагача.
Надзеі мала сёння. Ёсць ласі далёка,
Дзе матачнік, я без пары не б'ю. Як вока
Пільную іх. А мо надарыцца пасля
Нам з панам хвіля на шляху да Базыля.
Калі там ні бываў, як нейкая мне кара
Той воўк, крадзе мой час. Задам калісь прыпаркі
Я шкодніку! — крыві мне колькі ён псуе!
Не паддаецца воўк на хітрыкі мае,
Ў адным заўсёды месцы, шэльма, чыніць варту.
Бывалец ён, але ж і я натуры ўпартай».

Штораз гусцейшы лес, хіліцца ўжо зачаў,
Бо блізка тут вада. Дарога праз гушчак
Віецца. Елка, вольха, цёмны граб, асіна.
Прыемны халадок ад вільгаці ў нізіне.
Раўчак, як шыба, блíснуў у кутку лясным,
Тулілася сядзіба Грышкава за ім.

«Гэй! гэй! — ёсць дома хто ці не?! — сюды, і жыва!
Няма, напэўна, анікога, зараз жніва.
Што ж мне рабіць?.. Стаяцьме дворскі конь у той
Аборы, скемяць... ах, Вінцук не знае мой,
Што ў Базыля мы будзем, ён прыйшоў бы ўночы,
Прыдаўся б заўтра, дапамог бы нам ахвоча.
Пацёгся ў поле мо?.. Што ж мне рабіць далей?..
Ага!.. пакінем торбу й стрэльбу на стале.
Пабачыць, здагадаецца тады, што клічам,
Пазнакай шлях падкажам... Добра ўсё, панічу!
Паставіць трэ каня, сянца буланку даць,
І рушым. Запрашаю ў хату завітаць».

Гаспода. Посуд на паліцы. Чыста ў хаце.
Абраз з выявай Божай Вастрабрамскай Маці.
Таўстуха-печ, палаці, што амаль пад столь,
Дзве лавы, зэдлік і засланы просты стол.
На ім выглядваў хлеб з-пад чыстай палатніны,
Нож побач, соль на сподку. Ток чысцюткі з гліны
Заместа мосту, — гаспадыніна хвала.
Пры печы вілы, качарга і чапяла.

Карцінкі на сцяне наклеены. Змест кожнай
Без повязі. Выяву ўбачыш Маці Божай,
А побач войска — шыхт ваярскі за шыхтом,
Малюнак пекла — плата за грахі агнём,
Святы чаргуе Юры ў шышаку стажковым
І этыкетка ад бутэлькі каньяковай,

Красуецца французскі надпіс «fine champagne[1]».
Пайшла і мода вось — дзяўчынкі ля дзвюх пань,
Якісьці зноў святы з шатанам і анёлам.
Пад ложкам скрынкі розныя, пад самай столяй
На рыбу восці, невад, вязкі сушаных грыбоў,
Шмат усялякіх зёлак — не злічыць пучкоў,
Вянкі цыбулі, белы часнаку вяночак.

Віселі стрэльбы, торбы шэрыя ў куточках,
Рагаціна ў куце выстойвала адна,
То ж ловы помніла на медзвядзя яна,
Стапырыўся над ёю цацярук напханы,
На ваб, няйначай, паляўнічым ужываны.
Гарэлі на вакне вазоны ад двара —
Ў гаршчэчках месячная ружа і герань.
«Наб'ю шчэ стрэльбу я, і выбірацца можна.
Пакуль там што, пан ліпцу паспытае, можа,
Свяжуткі, сёлетні, ільсніцца серабром», —
Казаў Рыгор, нёс місу з сотавым мядком.

* * *

Ляснымі йшлі шляхамі. Дзе былі загібы,
Ламаў галінку Грышка, каб Вінцук не хібіў.
Сын мусіў знак чытаць, рабіць высновак свой.
Праходзячы каля бярозы маладой,
З-за паса Грышка выняў вострую сякерку,
Надцяў кару і здзёр, дапільнаваўшы мерку.
Бяросту белую накшталт стажка скруціў,
Лазовай стужкай змацаваў і затрубіў —
Разлёгся голас, вабіць так самца ласіца,
І з гуку, і з адлегласці не надзівіцца.
Хоць побач я стаяў, здалося мне ў барку,
Што голас плыў здалёк, губляўся ў гушчаку.

---
[1] Fine champagne (фр.) — адборны каньяк.

Мы ўсё далей, далей у цішы йшлі знямелай.
Лес дзікі станавіўся і параскашнелы,
Раскінуўся ў сваёй магутнасці, красе.
Замілаваны мог даследнік пакрысе,
Бы кнігу, тут чытаць гісторыю развою
Прыроды, што спрадвек не ведае спакою.

Вось волат-дуб, над гуртам дрэў дасяг ён хмар.
Разложысты. Наўкол дзяржавец-валадар
Забраў вялікую прастору ад суседзяў.
Пад ім не маюць росту, выжываюць ледзьве
Гатункаў розных карлікі — падданцы ўсе
Манарха, прышласць ім надзей не прынясе.
Хіба што волату імхі ўкароцяць часу,
Зашмат на дубе развялося чужапасаў.
Памчалася ўгару вавёрка да жытла,
У жарало нарэшце скокнула дупла.
За ёй яшчэ адна панеслася вяртляста:
Выходзіць, смерць гасцюе ў волаце дуплястым.

Дарма ўдаваў ласіху на трубе Рыгор,
Дарма напагатове штуцэр быў яго,
Бо толькі адказала здрадным тонам рэха,
Ўзляцелі з крыкам сойкі ў палахлівым спеху.
Брыдзем далей.
«Няхай паніч у хмызняку
Схаваецца і пытлю дасць таму ваўку,
У гэтым месцы, шэльма, часта прабягае,
І стрэліць тут лацвей, заслона не густая.
Наўкола абыду, здаля мой будзе ваб».

Нырнуў я ў куст ляшчыны. Побач волат-граб.
Прысеў я. Грышка знік у лесавой гушчэчы.

Ніжэла сонца, спёка ўнікла, камарэча
Напала, толькі й чуў дакучны звон,

Пісклівы не сціхаў каля вушэй паўтон.
Пабольшала ў аркестры камаровых піскаў,
Хоць і замоўкла шмат на твары ад прыціскаў.
Не адстрашала нават кара камарні,
Маглі заесці крыважэрныя раі,
Свярбела скура — насланнё на паляўнічых.
Не бачыў я красы, ў якую таямніча
Прыбрала пушчу развітальнае святло,
Калі да сну хіліцца сонца пачало,
Залоцячы вяршкі хваінаў.
Грышка ў лесе
Здалёк, нібы ласіха, абазваўся дзесьці,
Пасля завабіў зноўку і крыху счакаў,
Хацеў я ўстаць і тут жа высачыў ваўка,
Убачыў, як перамахнуў кусток лазовы
І лесам пёр далей. Кроў хлынула раптова
Да галавы... Чакай, дружок! Зручней я стаў,
Прыцэліўся й трымаў на мушцы з-за куста,
Націснуў. Тут жа засціла мне ўсё дымота.
Я выскачыў, бы з прашчы, і панёсся лётам
Туды, дзе трапіў пад прыцэл лясны хіжак.
Ваўчугі не было — ну хоць бы нейкі знак.
Я схібіў!.. Злы й нямы стаю. Уцёк ён, значыць.
У гэты момант Грышка надышоў.
«Пабачым,
Як пан патрактаваў ваўка. Здаецца мне,
Панёс ён кулю. Зглядзеў — штось не тое, не.
І вушы прытуліў, ішоў не так, як трэба.
Як браў, паніч?» — «А па баку». — «Дзесь лапай трэпле.
Ці бачыш?.. юха!.. о!.. ў ляшчыннік шыўся звер!..
Вось дык сумеўся ўрэшце з міны кавалер!..
Пазнаў адразу я! о!.. о!.. тут крапляў шэраг!..»

Трыумфаваў так Грышка і ўжо бег уперад,
З пазнакай радасці яго быў кожны рух —
На хітрым ворагу здаволіў помсты дух.

«Сядзеў!.. паглянь, паніч, сядзеў!.. о!.. юха кажа!
Звялі з табой урэшце парахункі!.. Ляжа!..
Заліўся юшкай, дужы — шэльма! — ў лес глыбей
Шчэ сунецца... Пад вуха вытрымаць ляпей
Ці пад лапатку». —
«Лёгка гаварыць, вядома,
Ў канец хваста патрапіць хоць бы лотру тому,
Як лесам прэ, — й за гэта ўсё Хрысту хвала!» —

«То пэўна!» — «Што ж пляцеш?» — «Ат! звычка павяла...
Я з радасці, панічу мой! Дый не зашкодзіць
Практыкавацца маладому пры нагодзе,
Калі стары й павучыць... О!.. ў гушчар, туды!
Як стуль не йшоў, не будзе выкруту тады.
Вакол хай пан бяжыць, а я ў сярэдак самы!
Схаваўся там, дык мецьме напатканне з намі».

Пабег... Не ўспеў я пацераў дагаварыць,
Як чую моцны Грышкаў голас: «Тут ляжыць!»

Я дзёрся праз кусты, разносіліся ўдары,
Яшчэ нябожчыка ўсё Грышка кіем жарыў,
Чыніў страшэнны здзек — аж анямеў быў лес,
Як з трупа Гектара калісьці Ахілес.

«Пакінуць звера — то ж не ўчуць ганаравання!
Хоць скура ўлетку й дрэнь.
Адно з ваўком вязданне,
На ўцеху пану нейк зацягнем, зробім штось,
Кол высеку і зачашу я гладка — вось!
Звязаўшы лапы, сунем, на плячо канцамі —
І марш! Заходзіць сонца, не марудзьма самі».

Была ў бары ўжо ноч, як з хаты Базыля
Неспадзявана бліснуў нам прамень святла.
Вястуючы пра нас, заходзіліся брэхам
Псы-дварнякі, будзілі ў сонным лесе рэха.
Пасля завылі, блізка як былі з ваўком.

«Учулі воўчы дух — трывога ў дварнякоў».
Дзвярыма хтосьці скрыпнуў. «Ціха!.. вон, шатаны!» —
На псоў азваўся голас.
«Хто там?» — «Грышка з панам!»

* * *

У Базылёвай хаце чыстай за сталом
Сядзелі на куце мы гаманкім гуртом,
Нас вельмі ўсцешыла часіна адпачынку,
Патрэсквала яечня гучна на камінку,
Здалёку чуўся нам прыемны пах яе,
Настрой вясёлы быў ад смакаты тае.
Тацяна, жонка Базылёва, маладзіца,
З румянкам ад агню, з яе не надзівіцца,
Расставіла талеркі на абрус уміг.
«Што маю, тым прымаю!» — запрасіла ўсіх.
Базыль да нас быў піць гатовы...
Бясклапотна
На сене, як забітыя, паснулі потым.

* * *

Нас раскатурхаў сын Рыгораў у гумне,
Вінцук пазнакі бацькавыя зразумеў,
Ляцеў, як птах, час скарачаючы дарожны,
Пару заўзяты паляўнічы знае кожны.

Абмыўшы каля студні рэшткі сну з павек,
Пайшлі бадзёра мы.
Сабою там спрадвек
Другія засланяла пушча таямніцы,
Другія краявіды — проста задзівіцца.
Абшар дрыгвы, бясконцыя кілімы мхоў
І хвойкі нізкія, хоць шмат растуць гадоў.
А цвёрдыя, бо мае іхняя драўніна
Валокны гэтак моцна збітыя ў адно —
Не паддаецца нат сякеры валакно.
Вяршкамі хвойкі — быццам пальмінкі пустыні.

Завальваліся ногі ў пух, у мох буйны,
Стральцу ж то мукі нечуваныя адны.
На ім шмат ягад.
Тут жа буякі, або дурніцы,
Абсыпала кусты зямелька-дараўніца;
Сцвярджае Грышка, і без выдумак якіх,
Што доўгі й моцны боль у галаве, як іх
З куста спажыць, а назбіраныя не шкодзяць.
Таксама журавіны вельмі шчодра родзяць
У мхох пушыстых.
У імшарыне глухой
Цецерукі, глушцы бываюць чарадой,
Ды большае вагі быў лоў у нас на мэце,
Ніякі птах не зацікавіў бы на свеце.

Імшарышчам свой прыспаралі мы паход,
Здалёку лес хваёвы ды густы чарот
Нас вабілі надзеяй.
Зранку дужа росна,
Упэрліў дрэўцы, мох і верас кропляў россып.
Ледзь сонца дыск заззяў — і ажыла краса,
Паўсюль зайскрылася вясёлкаю раса,
Мох шэры стаў, хваёвыя галіны ўранні
Як золатам абліты, ў дыяменты ўбраны.
Згаворваў Грышка пацеры, чуваць былі
Святыя словы, што з душы яго плылі.
Напрыканцы ён заспяваў да Маці Божай,
Узрушыўшы мяне вячыстай песняй гожай,
Вітаннем нашае Заступніцы Святой,
Хвалой узнебнай над імшарай і дрыгвой,
Прыпадабненнем трапным Панны да заранкі,
Якая дзень папераджае, час світанку.

* * *

Лаўцы ўжо разышліся, толькі ні на крок
Не адыходзіў я ад Грышкі. Вось здалёк,
Здалося раптам нам, адказ на ваб Рыгораў
Данёсся. Голас быў слабы, няпэўны з бору.

«Пан чуў?.. надходзіць лось... ай, латва! добра, ай!..
Да нас, напэўна, йдзе... Паніч тут ляжа хай!..
Маўчаць, як рыбіна ў вадзе, каб не нашкодзіць!..
Трэ вычакаць!.. Куркі, панічу, на адводзе!..» —
Шаптаў мне Грышка, стрэльбу сціснуўшы рукой,
Сагнуўся і прыпаў да хвоечкі малой.
Я лёг, раса студзіла ўранку праз адзенне,
Ды не зважаў, глядзеў на зараснік з надзеяй,
Туды, скуль, думалася, выскачыць рагач...
Завабіў Грышка... Слых і зрок свой як мага
Напружваў, ды дарма... Рыгор штурхнуў, я трохі
Паварачаю голаў, кінулася ў скроні
Раптоўна кроў, як справа праз лясны гушчар
Ішоў вялікі лось, я ўбачыў рагача...

Той дзіўны стан не паддаецца апісанню,
Як трапіць гэткае стральцу на паляванні.

Дрыжэў, нібы ў гарачцы, — прыбліжаўся звер.
Як трапным стрэлам прывітаць яго цяпер?
Змагаўся я з сабой... Рука мая трымцела,
Нарэшце нейкі момант вытрымаў на цэлі...
Пальнуў...
Лось — дыба, павярнуўся, потым скок...
Раздаўся стрэл другі... Памкнуў быў лось убок,
Хіснуўся... на калені ўпаў неспадзявана.
«Як ад гарачкі гэтай адвучыць мне пана?
За крокі тры ад нас лось быў бы акурат,
Пан не падпусціць!.. звык смаліць за пяцьдзесят!..
Скажу, пан трапіў, праўда, і пры першым стрэле». —
«Буркун! Ляжыць жа лось!.. лепш пахваліў бы!» —
«Вельмі Хвалю!.. Пан добры паляўнічы! Толькі вось
Дрыжэў увесь, нібы кісель аўсяны, штось,
Апамятаўся ўрэшце неяк, дзякуй Богу,
Не схібіў пан у цэль, што выглядала стогам!» —
«Саромеўся б казаць, стары! сваё ўсё гнеш!..
Шанцуе гэтак, як сягоння, рэдка мне». —

«То праўда, даражэнькі!.. Хоць бурчу з нагоды,
Цябе, як роднае дзіця, люблю заўсёды».

## V. ГОЛАД

«Нялюдскую забаву кіньце, мой панічу,
Паслухайце старога, што дабра вам зычыць,
Грэх хлеб круціць у галкі ды кідацца ім,
Бо гэта Божы дар, хлеб госцем дарагім,
Яго заўжды людзіне трэба шанаваці,
Каб з хлебам хлеб штогод спаткаўся ў хаце.

Калісьці, помніцца, нябожчык наш сваяк,
Абы пабачыў, галкі хто круціў вось так,
Ці свой там, ці чужы, — не выпушчаў ніколі,
Мне вуха надарваў за гэткую сваволю.
Заўсёды помню родзіча ды ўчынак той
І за душу малюся — вечны супакой!

Стары я і ўсяго нагледзеўся даволі,
Быў двойчы на вяку маім вялікі голад.
Сягоння зразумела мне, чаму не раз
Ксёндз Бога ў суплікацыі прасіў за нас,
Пра голад прамаўляў». —
«Дык раскажы, Рыгору,
Калі і як было?» —
«Такога бачыць гора
Не дапушчай жа, Божа! Быў я дзіцянём
І на запечку разам шчэ сядзеў з катом
У голад першы той; у лобе засталося
Праз пятае ў дзесятае, тады жылося
І матцы й бацьку дужа цяжка — плач, адчай.
Усё пазней я толькі разумець пачаў,
Калі падрос, і тое й гэта сам сабою
Разблытаў неяк пасталелай галавою.
Панічу, каб краіне ўсёй апекуны

Не надаслалі на віцінах збажыны,
На той бы свет пайшла палова люду марна.
Вось гэтак — Бог калі замкне сваю спіжарню!
То ж кара за грахі, як глуміць хто дары,
Не верыць моладзь, хоць і скажа ёй стары.

Другі вялікі голад, я малакасосам
Шчэ быў, траха чарнелі вусікі пад носам.
На ловы першы раз пайшоў адзін-адным,
Сваю пакінуць мог я скуру ў лесе тым
Заместа медзвядзёвай». —
«Раскажы дакладна». —
«Спатрэбілася б гутаркі на гэта ладнай.
Спімо! Як зорка, служка Бога, ў ранні час
Заблісkaціць, пасцягваю я з ложка вас». —

«Пра што, Рыгору, мова! кожны сам устане.
Дык раскажы». —
«Во боскае мне пакаранне!
І самі не спіцё, і я з-за вас не сплю». —
«Мой даражэнькі!» —
«Ну, вось люльку запалю!..
З чаго ж пачаць? Хай будзе споведзь у зачыне.
У кожным маладым нячысціка часціна.
Даруй жа, Божа, грэх, тады ў душы маёй
Сядзеў рагаты чорт з казлінай барадой,
Шаленствам голаў скаламуціў. Ці то йгрышча,
Ці ловы, аніколі ў кут не шыўся Грышка.
Да скокаў размаітых і да калатні
Быў здатны, шпаркі я, не меў сабе раўні.
Маю з мядзведзем, з дубам сілу раўнавалі.

І вось у вока мне тады дзяўчына ўпала,
На згубу сэрцам пакахаў, куды ні глянь —
Красуня, зграбная была яна, як лань.
Румяная, цвіла, як мак, чарняўка тая,
А моцы, вытне кулаком — духі займае.

І многа бабскай спрытнасці было ў яе,
Бы ў пытлі меле, як падскочыць да мяне
З усмешкай. Маладому ўцеха!.. Папалётаў,
Гатовы быў на сценку лезці з тых залётаў.
Уляна звалася, Мікіты каваля
Была старэйшая дачка.
Ды вось здаля
Трымаліся ад іхняга ўсе хаты роду,
Бо род цыганскі быў. Іх трапілася продку
Прывандраваць, асесці тутака сям'ёй.

Ці ж маладому ў галаве гатунак той
Іх роду й племя? Цешыўся з дзяўчыны гладкай.
Хіба мяне абходзіў род? Але мой татка,
Калі пранюхаў і залёты, і намер,
Даў пытлю гэткага, што ў памяці й цяпер.

Уляна, толькі потым зразумеў я справу,
За нос мяне вадзіла, здоўжыла забаву,
З жаўнерам уцякла. А верыў я тады,
Што закахалася ў мяне, не знаў бяды.

Тут голад надышоў. Усю вясну напасці —
За маразамі спёка, сухавей зачасціў,
Ні кроплі з неба, аж балотны ўсох абшар.
Улетку здоўжыўся сухмень, нясцерпны вар,
А ў дзень сямёх святых абложны дождж пачаўся,
Два месяцы ішоў, усім у знакі даўся,
Згнілі на полі й рэшткі восеньскай парой,
Узімку голад, холад люты, Божа мой!
Шчэ нам — сяк-так. У нас былі на тыя часы
Ў каморы і ў таку хоць нейкія запасы,
Ды паляўнічы, зрэшты, мог падацца ў бор,
Тады нам трохі дапамог і панскі двор.
А што да чэлядзі вясковай, люд убогі
Тады шчэ нават рады быў бы з хлеба тога,

Што напалам з амеццем, елі хлеб такі —
Мог хутка запалаць, агнём вось толькі ткні,
Ды брак і гэтага. Кару ўжо дзерлі з дрэва!
І страх было глядзець на люд худы, схварэлы.

Каваль Мікіта жыў у горшай шчэ бядзе
Ад жыхароў другіх. Запасу анідзе,
Яму забракавала шчэ й работы з хатаў,
Расстацца мусіў кожны з конікам астатнім,
Бо ратаваў жыццё. Я шляхам патайным
Валок што-кольвек часта-густа з дому ім,
Ды ў збытках не жылі і мы тады, васпане.

Я й думаю сабе: галубцы вось Уляне
Адзін мядзведзя паспрабую аблажыць,
Не будзе сведкі, як употайку зрабіць,
Прадам я жыду скуру, грошы — на патрэбы.

І першы снег якраз, спрыяла ў гэтым неба.
Мы з бацькам рушылі, парадаваў абход:
Сляды ласёў, дзікі заходзілі на лёд,
Мядзведжыя два тропы да Крывога Логу,
Напэўна, праставалі да свайго бярлогу;
Медзведзяняты тушы, мусібыць, малой,
Як на сляды зважаць. Пасля ў глушы лясной
На медзвядзёвы тор надарылася трапіць —
У следзе шэльмы мой увесь хаваўся лапаць.
У пушчу, ўглыб сляды, падумаў я сабе:
Як добра! ўжо цяпер не выпушчу цябе.
Вяду сумысля бацьку бокам, доўгім крукам.
Назаўтра ўзяў да звера вучаную суку
І стрэльбу на плячо, за пас сякеру ткнуў
Ды йсці. Спаткаўся з бацькам, моўчкі не мінуў.
«Куды?» — «Ласёў сачыць». — «Бярэш навошта сучку?
Штось маніш! Сцеражыся, сынку, дам навучку!»
Пайшоў у хату, пальцам на мяне патрос.

Мінуў быў неяк — дзякуй Богу! — бацькаў чос.
Я рушыў. Адшукаць сляды пашанцавала,
Ды абысці мядзведзя клопату нямала.
Далёка йшоў, да высекі старой, за ім,
Стуль не выходзіў, дзесь у берлагу сваім.
Я зменшыў кола раз, другі, аж нечакана
Рванула сучка вераўчаны смык... Мой пане!
Капою сена блізка ад мяне як бач
На чалавечы рост падняўся быў кудлач.
Аж лыткі задрыжэлі! Сучка безупынку
Ірвалася, пусціў з рукі, сам да хваінкі
Адскочыў. І за стрэльбу! Цэліцца — ды стоп!..
Накінулася сучка і за лыткі хоп.

Мядзведзь раве, ўцякае!.. падае ў ламачча...
Бароніцца ад сучкі, трэск чуваць... няйначай,
Спрабуе ўжо схапіць. Я напралом валю,
Забег і падпусціў, узяў у лоб — палю!
Мядзведзь прысеў і лапамі — за лоб, а потым
Галопам — проста на мяне! за дуб я — лётам!
Затаньчылі наўкола дуба мы таго,
За зверам сучка, нападае на яго,
Падскочыць, скубяне. Скачу я ўлева, ўправа.
Ратуй, Заступніца Святая!» — паўтараю.
Тут — бах! — стрэл грымнуў.
Татка мой спусціў курок
І пад лапатку кудлачу ўсадзіў пянёк.
Той духу не ўказаў!
Да ног упаў быў таты.
«Расказвай шчыра мне, малакасос смаркаты! —
Спакойна й грозна мой прамовіў дабрадзей. —
Чаго вышмыгваў з хаты й злодзеем глядзеў?
Чаго ў абход мядзведзевы адзін падаўся?»
Адказваць мусіў. Як на споведзі, прызнаўся,
Не ўтойваў — то ж Уляне любай, дарагой.
Што скажаце, панічу! — родны тата мой
Не біў мяне, не лаяў, даў Мікіту збожжа.

«Калі, — сказаў, — ты без Уляны й жыць не можаш,
Дык што ж? — пасватаю, ды перш як у сваты,
Шчэ пачакаць, смаркач, да лета мусіш ты.
Пабачым вось, ці ёсць якая спадзяванка
На добрую нявестку й жонку з тэй каханкі?»

І што ж? ці ж памыліўся?.. Ведзьма ўжо была
Заручаная і з жаўнерам уцякла,
Якая ганьба!.. цьфу!..
Меў кару шчэ, заўважу,
Мядзведзя ў двор адвезці. Пан стары, разважны,
Прыстойным і лагодным слыў сярод людзей,
І добры паляўнічы быў з яго раней.
Набраўся сораму, як стаў я перад панам!
Я ж бацьку прысягнуў выкладваць без падману,
А многа на той час гасцей было ў двары,
Да ўсіх пра гэта давялося гаварыць.
Нямала там з мяне пацехі мелі госці,
Бо плакаў, як расказваў. Даў учынак штосьці:
Тады ў душы я прысягнуў за грэшны чын —
Ніводнага шальмоўства не зраблю ні ў чым.

Панове ў складчыну далі на дапамогу,
Прызначыў жыта пан чатыры абарогі,
З апекай, хоць і ціснула бяда нас тут,
Вясны няшчасны дачакаўся неяк люд.

Сказаць забыўся панічом, а як па стрэле
Было маім. Аж люба, куля ў лобе села,
Ды не пайшла, а знесла з чэрапа якраз
І скуру й кудлы, не раўнуючы, як пас.
Пянёк браць толькі трэ, як з медзвядзём мецць справу,
Пад вуха цэліць, кулі круглае не раю...

Даволі пра даўнейшчыну тут згадваць мне!
Цьфу!.. спаць калі ж мы будзем?.. хутка днець пачне».

## VI. НА ГЛУШЦОЎ

Вялікдзень набліжаецца. Вадой вясновай
Паразрывана крышталёвая закова.
Заліты і папас, і поплаў, і загон:
За хваляй хваля мкне пры ветры наўздагон.
Звіняць у полі раўчукі, вада рачная
Зіхціць на сонцы, бы луска ў ёй залатая.
Вясною пахне. Бусел, любасна глядзець,
Ляціць і з клёкатам сядае на гняздзе.
Кігіча, енчыць чайка над прасторай воднай
І моўкне ў далечы, спускаецца галоднай.
Вароны парамі чакаюць тэй пары,
Ці ж хутка на загоне ім гаспадары
Зямелькі чорнае сахой адвернуць скібы?
Уночы на рацэ агні. Пільнуюць рыбу.
З лучынай яснаю на чоўне калыўным,
Нібы Нептун з трызубам, з восценем даўгім
Плыве адважны сын Палесся, вёскі ўбогай,
Не ўвекавечыў пэндзаль Рэмбранта такога,
У мроку пры святле лучыны век-вяком
Здаецца духам чалавек, вадзяніком.

* * *

«Хвала Хрысту!» — «Навекі!» — «Пэўна, пан Рыгора
Чакаў ужо і на глушцоў не здоўжыць збораў?
Сяк-так, дзе бокам-скокам, дзе пералячу —
І тута, кланяюся земна панічу». —

«То дзякуй! — што ж чуваць там?» —
«Проста з хаты, пане,
Мой форт ледзь-ледзь пакінуў. Хто не абазнаны
З мясцінаю, дык загавецць таму душой,
Бо не дабрацца да кута майго вясной.
Вада вялікая. Дарма што час разводдзя,
Цямком у лес на подслухі Вінцук мой ходзіць.

І я махнуў, ды ў Кругліцы няма глушцоў,
А з Чорных Лядаў дужа ўсцешаны прыйшоў,
Нам пашанцуе ў паляванні. Лік ім губіш:
І тут!.. і там!.. мецъ трэба голаў як на шрубе,
Каб іх злічыць. Якраз да пана ў гэты дом
З'явіўся ўжо адзін ад грамады паслом
З запросінамі ў лес. Бач, пан, каго трымаю!
Што за вага!.. фігура!..» —
«Як дабрацца маю?» —
«Фу!.. фу!.. паніч пытаецца! — як пад вадой
Балота, дык на чоўне, рэшту — пехатой.
Пытанне вось: ці ў кут мой трэба? То ж нязручна,
Ляпей да возера адгэтуль рушма.
Адтуль да месца мо з паўмілі, не далей». —

«Праз лугавіны праплывем?» —
«Там найзручней!» —
«Сягоння добра б рушыць. Толькі ты, Рыгору,
Стаміўся, мабыць?» —
«Дык і што! абы не хворы!
Мы пойдзем. Лес вялікі, дзень кароткі шчэ,
Скажы, каб мне спажыць чаго далі хутчэй,
Падсілкавацца трэ, спачыць хоць трошкі ў хаце.
Уфф!.. праляцеў сягоння я тры мілі, браце».

* * *

Разводдзем човен дзесь пад вечаровы час
У Ляды Чорныя занёс на спевы нас.
За мшарамі пачаўся лес штораз цямнейшы
Ды больш дрымучы, чым далей — дзічэйшы.
Не чуешся ў магутнай пушчы векавой
Прыроды панам, а часцінкаю малой.

Рыгор тут раз, другі і трэці пагалёкаў,
Прыслухаліся: нам адказ ляціць здалёку.

«Там хлопцы! то і добра, што прыйшлі раней,
Агледзелі, начлег спарадкуюць лацвей».

На выспе гэтак званай, на малым пагорку,
Чакалі нас дарослыя сыны Рыгора,
Два хлопцы. Мокрыя, з гразёю, пасталы
І крыссе ўподтык прамаўлялі, што паслы
Рыгоравы балота мусілі так мераць.
У кожнага ў іх стрэльба, торба і сякера,
Заткнутая за пас сырцовы на баку.

«Хвала Хрысту!» — «Навекі!» —
«Янку, Вінцуку
І панічу трэ спевакоў сачыць на токах,
Я завінуся тут, ачышчу месца збоку
Нам пад начлег, з ламачча раскладу агонь.
Ідзеце з Богам, бо запала ўжо сутонь».

Штораз цямней. Здаецца, хвоі ды яліны
Вышэйшыя шчэ сталі ў гэтыя хвіліны.
Ківаюць, здэцца, веліканы галавой
І з вышыні няспынна сочаць за табой.
Таемнасць шолаху, гамоняць ціха дрэвы,
Крык сойкі, чорнага дразда ліюцца спевы.
Далей праз гушчыню! Як плавень без стырна,
Як птах начны, бясшумна ў морак парынаў!
Штокрок стаю і слухаю... прысеў, чакаю...
Зблудзіць я не баюся, лес вялікі знаю.
Ад вусцішнае цішы, мроку, сценяў тых
Уражанне на нервах дзіўнае маіх.
Я ўслухаўся... пачуўся раптам лопат крылаў,
Ляціць над самай галавой глушэц-страшыла,
Адразу завярнуў улева неўспадзеў,
Залапатаў і сціх — на дрэва, пэўна, сеў.

Я чуў, як сэрца стукацела з хвалявання,
Каб не парушыць цішы, стрымліваў дыханне.

Глушэц затакаваў і змоўк, зноў песні зык,
Птушыны спеў разлёгся. Брава! такавік!
Назад стараўся адыходзіць асцярожна,
Бо ў лесе кожны сук заўсёды здрадзіць можа.
Дапамагаў мне мяккі пад нагамі мох,
Без шолаху, паціху адыходзіць мог.

Сцямнела ўжо, прыкмеціў зорачкі паходню
І вырашыў урэшце йсці далей свабодна.
Агледзеўся, вагаўся шчэ ў душы крыху,
Ці не змыліўся, ці патрапіць я змагу.
Ды зніклі думкі невясёлыя адразу,
Як стук Рыгоравай сякеры ўчуў выразна —
Звароту нітка вось. І неўзабаве стрэў
Святло пурпурнае на вершалінах дрэў
Ад вогнішча начнога.
Лесам брыў цямраным,
Спыніўся, тым відовішчам зачараваны:
Эфект святла і ценю панаваў наўкол,
Забарвіліся дрэвы, мох, кусты і дол,
А людзі пры агні — не ўздумаеш такога,
Як быццам з чарадзейскага жыцця ляснога.

* * *

«Шатана ці русалак бачыў ты хіба?» —
«Фу!.. цьфу!.. Панічу! ну навошта пахвальба?
Нібыта не баіцца сілы пан нячыстай?!.
Мо тут шатан сядзіць на хвоі дзе камлістай!
Нячысціка ды клікаць?!. У імя Айца!..
Мы ў пушчы, а не ў хаце свячанай!.. Жыцця
Яе не перадаць... гм!.. кніжкі пан чытае
І верыць, што бязлюдны лес душы не мае?
Прабач. Дык слухайма, лавем жа кожны гук,
Ад пушчы пан не спадзяецца гэткіх штук.

..............................

Паніч ці чуе?!. Я звяроў і птахаў знаю,
Ды што за д'ябал, голас чый, не адгадаю!..
Фу!.. цьфу!.. спакуса панава... пачаў вярзці!
Я ж вернік, пад святой апекай у жыцці!»

..............................

Шаптанне пацераў... Дапраўды ў пушчы ночнай
Усякіх гукаў тысяча. Пазнаць захочаш,
Не разбярэш дзесятай часткі з іх ніяк.
Хіхікне хтось, а там заплача горка так,
Тон часам жаласлівы, часам востры, дзікі.
Таемныя спрадвеку пушча мае зыкі.
Хто скажа, што ў сабе захоўвае яна?..
Яе ўрачысты й грозны голас — цішыня,
Як тону вушы аніводнага не ўловяць.
Не дзіва, што ў праявы верыць люд вясковы.
До ў пушчы раз паначаваць і там без слоў
У гукі ўслухацца таемных тых размоў.
Так думалася мне, як лёг я адмыслова,
Акрыўся буркаю на купе лап яловых,
Яліну Грышка ссек. Прыемнае цяпло
Ад полымя вялікага няспынна йшло.
Снапы бліскучых іскраў угару ляцелі
Зігзагам фантастычным. Ніклі летуценні.

На ловах лёгка спіцца...
Цёмнай шчэ парой,
Нібы вупыр, схіліўся Грышка нада мной:
«Панічу, трэ ўставаць!»
Мяне прабрала крыху,
Дарма што цёплае адзенне. Цёмна й ціха.
Між хмарак дыяменты зор. Я ўстаў, мацней
На голаў шапку нацягнуў і сеў хутчэй
Да вогнішча.

«Глушца на токах не адстрашыш,
Калі з'ясі на адыходзе цёплай кашы,
Сагрэе пэўна... Ўчора запытаўся пан,
Ці ў пушчы часам Грышку не спаткаў шатан?
Гм!.. Што ж сказаць на гэта?!. Кпяць за кожным разам
З нас, прасцякоў, панове... Трасца й ёсць жа назва
Таго вось ліха. Пан жа згодны! На яе,
Як чар, стары тут Грышка радзіў бы свае
Спажывы з'есці цёплай... Выбач, пане, ўчора
Быў не да смаку жарт!.. нядобра!.. Што ж да чорта?
Ці ёсць? не знаю... Пан па гутарцы такой
Хай будзе асцярожны ў глыбіні лясной...
Дахаты мой Вінцук пабег быў ночай цёмнай
Па казанок... Заснуў пан без вячэры цёплай».

* * *

Я памаленьку з астраўка пайшоў у мрок,
Тут угрузаў, дугою гнуўся там штокрок,
Інстынктам кіраваўся памяці ў надзеі
І пільна прыслухоўваўся, што пушча дзее.
Агню не бачыў я, ўрачысты супакой,
Лес толькі, бы гаворыць, верх хістае свой,
На смельчака дзівуецца, які пакрочыць
Адважыўся ў абшары лесавыя ўночы
Далей — уперад!..
Раптам блізка трэск зусім,
Вушам спачатку веры не даваў маім.
Прыслухаўся, дапраўды тросся куст вяршкамі,
Сухое лісце шамацела гэтаксама,
Ступае хтосьці... Глянуў... здрыгануўся ўвесь,
Аж сталі дыба валасы на мне — мядзведзь!..
Ягоныя абрысы ў мроку ўбачыў толькі,
Прыблізіўся і стаў за крокаў пяць, не болей...
Ці збегчы — паратуе бліскавічны рух,
Ці хуткія два стрэлы шротам з метраў двух!

Пасля за дрэва.
Колькі часу я выстойваў
Сярод бязлюднай пушчы, ельніку густога,
Не знаю, дрыжыкі ўзялі мяне суздром,
Быў вока ў вока я з пушчанскім каралём...
За мною раптам шолах!.. Тут мядзведзь вачыма
Павёў туды, дзе шум, і з гэтае прычыны
Ён адышоў, мармычучы... І там яго
Замоўкла крокаў водгулле... Пасля ўсяго
З палёгкай уздыхнуў — мінулася ліхое,
Шчэ вуха наваструў на месца на другое,
Туды, скуль шолах даляцеў, але дарма
Я сіліўся пачуць — знік шум, нідзе няма,
Спакою анішто не парушала ўранні;
Я зноў уперад рушыў, яснае світанне
На цёмным небе, ўжо займалася на дзень.
У пушчы глуха шчэ, ды гукі дзе-нідзе
Вітаюць сонца, першыя снапы прамёнаў.
Агледзеўся, чакаючы знаёмых тонаў...
Я не блуджу, бо той куток пазнаў, дзе быў,
Дзе ўчора поблізу такавіка сачыў.
Вось чую зык... выразны... то ж глушцова песня!..
Няма сумнення!..
Бы падушка, мох у лесе,
Зраблю два крокі асцярожна і далей
Набліжуся на столькі ж як мага цішэй.
І ў спеху і ў трывозе праставаў да токаў,
Дыханне стрымліваў сваё на кожным кроку.
Як толькі даляціць глушцовы ў лесе спеў,
Я скокну і замру ў тэй позе. Паглядзеў —
Сядзіць глушэц, задраўшы дзюбу на асіне,
Спявае песню, пушча гэтаю часінай
Заслухалася, хвост, як веер, распусціў,
Няпомны ў спеве, ў гімне любасным на здзіў.

З грудзей не выскачыць ледзь сэрца, як нарэшце
Наблізіўся я неяк праз замінкі ў спешцы...

Пара!..
Прыцэліўся: стрэл грымнуў, дым пайшоў,
Хіснуўся птах, з асіны каменем далоў,
Галіны ломячы, і ў шэры мох аж бухнуў,
За ім ляцяць сукі сухія, пацяруха.

«Ніпто сабе! ніпто!.. віншую!» —
«Дык ты тут?» —
«А на выпадак... што?.. быў пану перапуд?
Ды шчэ які!!.
Я чую, хтось яшчэ там ходзіць,
Падумаў, мне туды падбегчы не зашкодзіць,
Падрапаць пану скуру лапай мог мядзведзь.
Загнаў у рульку кулю, рупіўся паспець,
Сякера шчэ за пасам... Гора з панам многа,
Пільнуй яго, нібы дзіця!» —
«Не знаў нічога,
Твае чуў крокі, хто ж яшчэ з'явіцца мог?
А што, калі другі!..
Хай укрывае Бог!..
Ды наша вогнішча было з таго вось боку
Раскладзенае на начлег непадалёку,
Мядзведзь стуль быць не мог...» —
«Дам раду, павучу,
Не трэ шукаць шатана ўночы панічу!»

Пачуўся стрэл далёкі.
«То Вінцук страляе!..
Вось і наслаў мядзведзя!» —
«Хто?» —
«Шатан праклятый...
Панічу, ціха!.. добра спеў цяпер чуваць...
О!.. о!.. і не перастае глушэц спяваць.
Скачэм!»
За гэтым разам стаўся я віною:
Глушца спалохаў сук, што хруснуў пад нагою,

Як блізка быў.
Цьфу! цьфу! навуку кагадзе
Пан меў, а на глушца, нібы на дзятла, йдзе.
Тут мох кілімам, а паніч у лом пацігнуў,
У горшае шчэ месца пхнецца там наўмысна.
Глядзець пад ногі трэ!»
Пачуўшы нагоняй,
Не змоўчаў я:
«Тут голаў толькі й задзірай,
Як хочаш бачыць, дзе сядзіць». —
«Ды не, наліха,
Выгледжваюць пасля, як падкрадуцца ціха.
Глушэц не дроздзік!.. Годзе, зачало світаць,
І з дрэва мусіць такавік ужо злятаць».

## VII. АБЛАВА НА ВАЎКОЎ

«Паночку, ёсць!.. знайшоў! каб колька ім падпала!
Ажно за Цэпрай, пад смалярняй заняпалай.
Нядобры час цяпер, каб іх упаляваць.
Ці — мала ўжо ваўкоў? Бадзягі ўсё чуваць,
Тут сёння абзавуцца, заўтра аж за мілю!

Тутэйшыя лясы я знаю непамыльна,
Цвярджу: няхай мне паляўнічы плюне ў вочы,
Калі непадалёк бярлог асочыць воўчы.
Нарэшце племя іх амаль прапала марна,
Завабіць вырашыў ваўкоў аж пад смалярняй —
Маўчаць, а блізка — ранак, час ужо не той.
На спробу зацягнуў іх песню Янка мой.
Фі!.. фі!.. аркестра, пане! бы кадрылю грае!
Як з Капыля ці з Клецку музыка жывая!!.
Мы бокам — граюць зноў!..
Каб пэўнасць мець далей,
Смалярня ўчора шчэ прывеціла гасцей.

Разы чатыры з боку вабілі другога —
Тамсама выюць... Мог бы тычкамі ля логу,
Заняўшы паўвалокі, значыць іх кубло.

Сачу даўно — асочкі лепшай не было.
Аблеткі ёсць, і пераяркі, і старыя,
Ці шэсць, ці сем — да ладу не дайшоў тады я.
Кутом у лесе будзе лінія паноў,
Ваўкам канец, мы іх паб'ем, як бараноў.
Каб не марудзіць толькі, не губіць надзеі,
Хай піша пан лісты і просіць на нядзелю.
На тракце пры карчме гасцей далёкіх збор,
Туды ж аблаўнікам ісці накажа двор.
У косці ўвернем гэтым шкоднікам праклятым.
Хвала Хрысту!.. Пара вяртацца мне дахаты».

* * *

Нядзеля. Пры карчме дружына, ўсякі люд:
Паноў і з міны, і з чупрыны колькі тут,
Асобнымі грамадкамі трымацца мусяць
Пры іх службоўцы, шляхта. Кручаныя вусы,
Асмужаныя твары і адменны рух,
Мажныя, дужыя, відочнай моцы дух —
Кантраст між шляхтай і службоўцамі, бо тыя
З блядым аблiччам, без крывінкі і худыя.

Далей стральцы — лясная варта, каля іх
Падпанкі, хурманы, прыслуга, між усіх
Паводзяцца свавольна франты-местачкоўцы,
Да дзевак прыстаюць, хіхікаюць бясконца,
На ўцеху ганчакоў уздумалі дражніць.
Стары іх Грышка мусіў тут жа абсадзіць.

Загоншчыкі на прызбе, ганку і пад плотам
Былі наводдаль, не раўнуючы, як сплёты
Даўжэзнае вужакі чорнай, што паўзла

І ўсю вялікую карчму апавіла.
З аблавы кожны быў узброены ці стрэльбай,
Ці кіем — помстаю кіпеў на воўка, шэльму.
Пацешныя між імі надта хлапчукі:
Ледзь ад зямлі адрос, а цягне кол такі —
Падняць яго не можа, татава налезла
На вушы шапка, голаў скрыўшы ўсю гарэзы.

Вазы і брычкі скупіліся за карчмой,
Падпіў з засценка шляхціч, пры гурме чужой
Крычыць на сына: «Паказаў сябе, праславіў!..»
Ад смеху Грышка клаўся, ведаючы справу.
«Ну й паляўнічы ў нас — на камароў яму!
Ці ў стрэльбе помніць што?.. Хто веры дасць таму?
Хай пан адкажа нам!» —
«Курок... шчэ шомпал, шрубка». —
«Ха! ха! названа драбяза — забыта рулька,
Няма чаго, так лёгка памагчы й бядзе!
А на аблаву едзе ды за мілі дзве!»

На тракце тарахценне, пыл над ім падняўся,
Чуваць званок паштовы, станавы прымчаўся.

* * *

Аблавы не ўдаюцца на ваўкоў цяпер,
Малы з іх вынік, клапатных занадта мер.
А вырак гэтакі гаспадароў вясковых —
Ваўкоў трэ конча вынішчаць і тэрмінова.
Аблавы сельскай дысцыпліна — што й казаць,
Перашкаджае паспяхова паляваць.
Не тыя ўжо стральцы, паводзяцца нядбайна,
Ад месца ад свайго ў лес ціснуцца патайна,
І ў выніку старога шкодніка ніяк
Пакласці не ўдаецца, воўк стары ў гушчак
Заўжды ўцякае ўмела.
Грышка з тэй прычыны,
Стырно ў яго руках, меў клопат не адзіны.

Паліцыю і воласць упрасіў раней,
Каб у аблаве паспрыялі ахватней;
Загоншчыкаў спатрэбіў на гурты чатыры,
Дзяўчат прагнаў. «Нідзе ні ладу з іх, ні міру!
На паляванні дзеўкі — кіне й стрэльбу зух,
Не йгрышча лес! Іх у запечак! у катух!..
А то пачнуцца жарты, заляцанкі, смехі,
І драпануць пацiху парамі ў арэхі».

Дзесяткамі расставіў кожны гурт пасля,
Даў палясоўшчыкаў — людзей пад іх нагляд,
Асобна фракцыі стварыў, каб ім адказваць
За дысцыпліну ў лесе.
«Хлопцы! я адразу
Задам таму, хто праваронiць у кустох:
Са мною справу мець — хай укрывае Бог!
Фланг левы весці Базылю, Вінцэсю — правы,
Пакуль не стрэнуцца, маўчыць уся аблава,
І люлек не курыць нікому патайком,
Бо разаб'ю, дальбог, на пысе кулаком.
Праз дзесяць крокаў ставіць, дзе й гусцей, як трэба,
Глядзець, вачэй не зводзіць з-за куста ці дрэва.
Ну, з Богам!.. па чарзе!..
Прашу ласкава вас,
Вяльможныя панове, помніце наказ
Рыгораў у выправе... Пільнавацца месца,
Як дзе каго пастаўлю, маю вас я весці.
Бяруся сівізной маёй запрысягаць,
Што ў добрым месцы будзе кожны з вас стаяць.
Пазначыў пункты я галінкай заламанай,
Там толькі аднаму спыніцца трэба пану.
Як ваша воля й ласка, рушма ўсе за мной!..
Не мовіць, ідучы!.. — і гэтаю парой
Нікому не курыць!..»
Хто ў лесе з паляўнічых,
Калі надзеі не губляе таямнічай,

У стане праціўляцца ўражанням жывым,
На месцы ў час аблавы стоячы сваім.
Той момант, мілы сэрцу, тое хваляванне,
Калі губляе воля ўладу, панаванне
І водзіць толькі ў ведамых стральцоў рукой,
А маладым бракуе волі ўжо такой;
Той электрычны ток, што перад самым стрэлам
У нашай у істоце прабягае цэлай, —
Як выказаць, пачуцці перадаць стральца,
Калі бяжыць звер з пуду проста на лаўца.
Я ў думках месца кляў, зараслае лазою,
Мяне лазняк паблізу атачаў сцяною,
За крокаў трыццаць не прыкмеціш тут ваўка.
Зламаў галінак колькі, сцяў нажом з вяршка —
І ўбачыў справа выспачку неспадзявана,
На ёй быў трохі змяты куст, трава стаптана.
Я ўлажу!.. Аж пярэсмык добры там знайшоў!
І цэль відаць адсюль, стралец тут мае сход.
Прыгледзеўся пільней, заўважыў быў ля спуску
Галінкі заламаныя. Пярэсмык вузкі,
На стрэл прарэджаны, знікаў у гушчаку.
Пазнаў у зробленым і вока, і руку,
Меў Грышка рацыю, да месца прыглядаўся,
Сюдою воўк стары не раз, напэўна, краўся.
Нямая ў лесе цішыня, глухі спакой,
Хоць Грышка тут аблаву чыніць на ваўкоў.
Урэшце знак — далёкі стрэл — і закіпела
Шырокае паўкола!..
Купка праляцела
Драздоў, і цецярук мільгнуў быў, беляка
Я згледзеў, выскачыў з лазы ён, даў слупка
І ўцёк. А гоман рос, вось даязджачы трубіць
У рог — то блізкае ваўкам спавесце згубы.
Гон закіпеў, як толькі ўсім сігнал далі,
На вока, пэўна, купу ганчакі ўзялі.
Калі на флангах стрэлы ў лесе прагрымелі,
Загоншчыкі па ўсёй аблаве зашумелі.

Ваўкоў аблога прыціскае... І стральцы
Ўжо сыплюць стрэл за стрэлам. У другім канцы
Пачуўся крык: «Пільнуй!..»
У лазняку штось рушыць,
Штось шаснула і раптам выткнуліся вушы,
Пад ногі выскачыў вялікі воўк з кустоў,
Палю, шчаслівы момант улучыўшы той,
У лоб, праз дым убачыў — лапамі накрыўся
І тут жа ўскочыў і паўзе... у лес пашыўся!
Надзвычай дужы звер... Чакай, чакай, дружок!
Яшчэ табе дадам!.. і склаўся на разок,
Ды тут аблетак трапіўся з кустоў на вочы,
Палю па ім — уцэліў па баку, як скочыў —
І воўк перакуліўся...
Я заклаў набой.
Ляжыць аблетак, а стары, вялізны той,
Пацёгся, след пакінуў па сабе крывавы.
Шчэ колькі стрэлаў, крык яшчэ і шум аблавы,
Ды ўсё паволі моўкне, сціхла гранне псоў,
Канец аблаве, паляванню надышоў.
Змаўкае рог.
«Што пан мне паказаць гатовы?» —
«Тут малады, стары ж, як мае лоб сталёвы,
То шчэ жыве... Вось кроў!» —
«То ўдача паніча!
Дабіты ўнізе быў кіямі з-за пляча.
Яму пан перабіў пашчэнкі, выбіў вочы,
Скрываўлены, ды поўз у схоў — у воступ воўчы,
Ўзялі — як у цапы. Уцехі там было!..
Нябожчыка пярэсцяць шчэ й цяпер калом.

А што? Няблага выйшла? Столькі ўпалявалі,
Як меркаваў, калі аблаву пачыналі.
Вось два старыя, два аблеткі, маладых
Шэсць, ліс, барсук! Як Грышкаў рэй, вось так тады.
І кожны стрэліў пан або пабачыў воўка.

Мо чвэрць нібыта на вайне: бах! бах! — не моўкла.
Што пан старому скажа тут на гэткі рэй?» —

«За ўдачу й за тваё здароўе выпіць трэ!» —

«То дзякуй! Грышка і за ловы, і за пана
Звяселіцца ў бары пачосткай на паляне».

* * *

Вярталіся мы пад карчму, ваўкі амаль
Запоўнілі драбіны, цэлая гурма
За возам паляўнічых.
Трыумфатар быццам,
Разлёгся Грышка на ваўках — не надзівіцца.

## VIII. АПАВЯДАННЕ ДАЯЗДЖАЧАГА

Увечары агніста неба чырванее,
Здаецца, што ў пажары горад палымнее.
На небасхіле хмара ў сонечным агні,
Дзівосныя адценні множаць прамяні.
Блакіт цямнее, нікне, рэдкія хмурынкі
Чародкай лебедзяў паволі, безупынку
Плывуць на захад. Ціхай песняй угары
Здаецца пошум хвой высозных у бары.
Лясныя паступова пташкі замаўкаюць,
На ноч сярод галін увечары сядаюць.
Высока дзесь кружляюць толькі канюкі,
Піць! піць! — крычаць,
енк іхні жаласны такі.
Замоўкла, кончылася ў лесе паляванне,
Паважныя паны паселі на паляне,
Ліс і скрываўленыя шаракі ляжаць,
Пры дрэвах стрэльбы паляўнічыя стаяць.
Паблізу даязджачы трубіць, псоў склікае,
Гук хрыпкі рога адгалосак паўтарае.

Панове селі ў кола. Смех і шум размоў,
Папаскаю звяселена душа ў паноў.
«Што ж ты ад нас усіх трымаешся асобна?» —
Сказаў хтось да стральца.
«Мне цiснуцца нядобра,
Няёмка ў кола панскае, трэ воддаль быць.
Ці ж мне калодаю нячэсанаю слыць,
Каб тут няпрошаным да ягамосцяў лезці
І між паноў паважных бессаромна сесці?» —
«Не застанецца далікатнаму нічога!
Нас, бачыш, купа, а гарэліцы нямнога», —
І пан падаў бутэльку, каб стральцу даць слова.
«Уклон вам нізкі. За здаровейка, панове! —
На лык узяў, аж пацякло з даўгіх вусоў. —
Калі не супраць, дык я сяду між паноў...
Тых часаў дзе сляды, калі было багата
Глушцоў, больш, як цяпер баранчыкаў дзюбатых?!.
Калісь мы білі медзвядзя, лася, дзіка,
Цяпер за мілю ехаць трэ на шарака;
Не вабіў цецярук калісьці паляўнічых,
А сёння перапёлку за ласунак лічаць.
Цьфу! А стралец цяпер! няўклюда, целяпень!
Глядзець я не магу на гэтакую дрэнь!
Трымае стрэльбу, нібы мыліцу калека,
Пальне і тут падскочыць: схібіў, бо няўмека!
Ці ж хто на паляванні знаецца з хлапцоў?
Узяць аблаву. Згоняць зграю селюкоў,
Ні ладу, ні парадку, толькі крыкі, смехі!
Адны пайшлі ў грыбы, другія ж — у арэхі.
Бадай ім з пекла не вылазіць! Акурат
Вось пазаўчора і ўцякло ваўкоў тых шмат.
Аж чорт мяне насіў, аж засвярбела лапа,
За звычаем старым узяў бы я гарапнік.
Даўней, як да навукі прынялі хлапца,
Яго вучылі бізунамі на стральца,
Была за пудла скура кожнага ў рабоце:

Таму якія зухі ў пушчы, на балоце!
Вось так было тады. Пацвердзіць кожны з вас,
Сапраўдных паляўнічых мала ўжо ў наш час.
І я, хто бачыў тых стральцоў, навуку тую,
Па тэй мінуўшчыне ажно да слёз сумую.
Раз, помню, да двара з засценка прынялі
Двух хлопцаў, двух братоў. Што за стральцы былі!
Іх прозвішча Чырэц. Дваровыя другія
Стральцы да іх ні блізка, кулямі ржаныя
Саломінкі сціналі». —
«Дзе цяпер браты?» —
«Адзін з іх гаспадар, заможнік, багатыр,
А колькі ён зямлі паводле стану мае!
Другі ў спачыне Божым, ні пра што не дбае». —
«Памёр?» —
«Ага, быў гэткі зух, шкада яго,
Мядзведзь, кудлач, папераломваў усяго». —

«Як сталася? я ж чуў, не хібіў аніколі». —

«Калі запіша Бог каму якую долю,
Ужо таго не ўнікнуць, маюць лёс усе:
Мы толькі стрэліць можам, кулю Бог нясе.
Было вось гэтак. Нам асочнікі сказалі,
Што троп мядзведзіцы вялікай напаткалі,
Медзведзяняты і пястун хадзілі з ёй.
Трэ асачыць, быў момант надта зручны той.
На нас, стральцоў, ураз падзеяла выснова:
Як лоўчы ў двор дасць знаць, дык з'едуцца панове,
Аблаву сцягваць з вёскі — будзе ўсім наказ,
А нам што з гэтага? Без плёну амбарас.
Тады мы парашылі: без аблавы самі
На паляванне рушым тайна з ганчакамі.
Лясы мы знали тут і за Зарэччам шчэ,
Ды лёгкія на ногі. Кудла не ўцячэ!
За скуру мецьмем грошы, кішаню напоўнім.

Была тады ўжо восень позняя, як помню,
Дзён колькі замаразкі, меркавалі мы:
Мядзведзіца, пачуўшы надыход зімы,
Шукае месца добрага на свой спачынак,
А самка, як з малымі, страшная звярына,
Ды ў нас, у маладых, і сіла, й вострьі зрок,
А досвед каб здабыць, трэ не адзін гадок.
Мы псоў бярэм, пяцёра нас, і рушым, значыць, —
Браты Чырцы два, Грышка, я і даязджачы.
Ішлі мы разам, пэўна, больш за мілі тры,
Дзе багнішчы, імшары, галыя бары.
Заядлы, востры гон нарэшце мы пачулі,
Сабакі медзвядзя, няйначай, скубанулі.
Хто ўправа!.. хто налева!.. раптам трэск і роў,
Мядзведзіца бароніцца ад ганчакоў,
Шпурляе што папала: пні і лом усякі,
Дакучліва ўсё лезуць да яе сабакі.
Чырэц старэйшы — лясь! — ды стрэльба падвяла,
З другое рулькі — лясь! — зноў!.. яліна памагла,
Яго на хвілю ўкрыла ад зяругі тога,
Чырэц тут кінуў стрэльбу і дай Божа ногі.
На шчасце, псы змаглі хоць крыху паўстрымаць,
Мядзведзіцу рвуць ззаду, кудлы аж ляцяць,
Ды здаганяе хлопца, крык пачуў ягоны:
«Ратуй, о Божа!» — зваў Чырэц да абароны.
Прыцэліўся... але страляць было тут як,
Калі калені трэсліся, калі гушчак,
Калі напераменку бачыцца, паверце,
То чалавека галава, то пашча звера.
Нарэшце: бах! шчэ бах! страляў я з гушчару —
Мядзведзіца ажно падскочыла ўгару,
Схапілася за голаў лапаю і села,
Хіснулася і, падаючы, зарычэла.
Мы да яе, ўжо душаць псы медзвядзянят,
Пястун бароніць, пад лапаткі — пух! Віват!
Як раскусіць арэх — адразу ўсіх паклалі,
Чатыры трупы медзвядзячыя ляжалі.

Не парушаць жа звычаю, панове, нам,
За чарчынай разгаманіліся мы там,
Гарэзуем сабе, вясёлыя такія,
Нябожчыцу Чырэц старэйшы лупіць кіем
І прымаўляе: «Пападзерла ты калод?!
І маеш, дабрадзейка, кулю ў лоб за мёд!
А колькі коней, бараноў, цялят, кароваў
Задзерла ты, праклятая! Ляцела з ровам
За мною, каб узяць у кіпцюры свае?
Чакай жа!.. Косці я памацаю твае!
Калі Чырэц прыказваў і лупіў, шчэ тая
Нябожчыца мядзведзіца была жывая,
За ногі хоп і драпаць пачала Чырца...
За стрэльбу кожны — не набітая ў стральца...
Пасля да вуха рулю... стрэл... адныя раны:
Руку Чырцу пагрызла, скура ўжо садрана...
Убачылі мы ў тэй мядзведзіцы тады
Дзве баразны на мордзе — стрэлаў двух сляды,
Не закранулі мозку. Цэліў дасканала,
Ды следу кожнаму дзвюх цаляў бракавала.
Хвілінай гэткай сэрца грудзі разрывае,
А занямелая рука курок спускае.
Вось так па радасці прыйшла тады і страта,
Чырэц не скуру медзвядзёву нёс, а брата.
Пакуль дамоў занеслі сцежкаю лясной,
Гадзіны дзве мінула. Сплыў стралец крывёй,
Прытомнасць страціў ён. Не памаглі і лекі,
І праз два тыдні той Чырэц спачыў навекі». —

«А што тады панове?» —
«Па прыгодзе той
Спісаў нам скуру лоўчы ўласнаю рукой,
Бо заслужылі. Моладзь шкодная залішне,
То ж блаславёная рука, як скуру спіша.
А зараз што? Не чуе скура бізуна,
І ў галаве і ў сэрцы пустата адна».

## IX. СТАРЫ ПАЛЯЎНІЧЫ

«Паночку, май жа ласку на стары мой век,
Дай пораху набой! Стрэў ліха чалавек.
Сякі-такі дабытак нажывеш у хату,
А ліха падпільнуе дый учыніць страту.
Вось і цяпер: якое жарабё на звод,
То ж конік гаспадарскі быў бы на той год.
Мядзведзь задзёр і завалок у лес пад хвою.
Каб ліха скурчыла яго за гэта ўдвое!!.
Паночку, дайце пораху, і кудлачу
Адплата будзе — юху я яму спушчу!» —

Так згорблены і сівы, надышоўшы зрана,
Прасіў калішні дворскі паляўнічы ў пана.

«Рыгору, што пляцеш ты языком сваім?
На старасць з глузду з'ехаў, хворы ўжо зусім,
На кудлу йсці ён хоча, ногі суне ледзьве,
У лесе, дзеду, не ўцячэш ты з лап мядзведзя». —

«Паночку, невядома, стане што і як!
Хто там каго? Было, ласкавы пане, ўсяк,
Не раз глядзеў я смерці ў зекры, і нічога,
Яшчэ скрыплю на свеце гэтым з ласкі Бога.
Як воля Божая, мо я змагу й цяпер
Падолець шэльму, каб не шкодзіў болей звер.
Я ўжо маімі ўнукамі пакляўся дома,
Што шкодніка застрэлю. Чалавек не помніць,
Што выкажа з крывавай крыўды і бяды,
Казанне тое перашкодаю тады.
Ні Богу, ні людзям хлусіць не думаў Грышка,
Тым болей: мо мядзведзь старыя косці скрышыць?
Мо шкодзіць больш не будзе ў нашай старане?
Дай пораху, паночку, бо няма ў мяне.
Быў дома, праўда, порах, сын жа з бабскай зграяй
Уперліся і не даюць, забыць мне раяць». —

«І слушна, што так робяць!.. Адчуваюць грэх.
Рызыкаваць без сэнсу — то ж людзям на смех.
Мядзведзь не заяц, ты стары — вось і прычына.
Жыццём не даражыш — шчэ горшы грэх ты чыніш.
Я павяртаю шкоду, сунімі адчай,
Дарую ад буланкі жарабё, прымай». —
«Паночку, хай спашлецца ласка вам ад Бога
За сэрца добрае! Не скрыўдзілі старога.
Каб вашым дзеткам доўгі век Пан Бог судзіў!
За жарабё пан мецьме скуру ды на здзіў». —

«Якую скуру?» —
«Медзвядзёвую, паночку.
Ці кудлу пакладу, ці вечная ўжо ночка». —

«Што ж тут рабіць? Упартаму і памагай?!» —

«Пайду з сякерай — пораху, паночку, дай!» —

«Ото казёл!.. На кудлача схацеў спатрэбіць
Ламачыну сваю, на звера йдзе без стрэльбы,
Бяры ці дубальтоўку вось, ці штуцэр мой,
Што лепш да вока?.. Трэба ж у мясціне той
Мець схоў — палаткі добрыя, Базыль паможа». —

«Не трэ, паночку, не, хай укрывае Божа!
Не ўмею з панскай стрэльбы, ў клеці ёсць свая,
Папсулі дзеці, дык направіць мусіў я.
Пальне!.. — бы ў свечку ясную! бо анікрышку
З старой знаёмай стрэльбы не спудлуе Грышка.
Не трэ палаткаў, клопату ляпей не мець,
Бо шчэ да падлы можа не прыйсці мядзведзь.
Яго злаўлю дзе потым? Ледзьве носяць ногі,
За медзвядзём, як пойдзе, дык хадзіць трэ многа.
Спазнаць праклятага я звера добра змог». —

«На порах! — і няхай цябе бароніць Бог!»

***

Назаўтра толькі што прачнуўся пан уранку,
А Грышка з стрэльбаю чакаў ужо на ганку.

«Што скажаш, дзеду?» —
«Ёсць, паночку, просьба шчэ,
Па медзвядзя падводу дай у лес хутчэй!
Ляпей бы параконку, гразкая дарога,
Мядзведзь пудоў на дваццаць будзе, дзякуй Богу». —

«Апавядай, як там?» —
«Не памыліўся, бач,
Чакаў я ноч, на досвітку прыйшоў кудлач.
Як бавіўся пад хвояй з падлінай у ляпе,
Пад вуха пацягнуў — пераржагнаўся лапай».

## X. СМЕРЦЬ ГРЫШКІ

Вяртаўся я праз шмат гадоў бадзяння ў свеце —
Хоць раз убачыць родны кут было на мэце,
І праз вакно вагона, праз імклівы дым
Глядзеў удалячынь днём ясным веснавым.
Лятункі-думкі з дымам ды клубамі пары
Плылі й плылі чаргою ў родныя абшары!
Здзівіўся я, вачам не верачы сваім,
Што навакольле ўжо інакшае зусім.
І ледзьве-ледзьве змог пазнаць той край, дзе колісь
Я жыў, які і ўдоўж і ўшыр схадзіў даволі.
Усё, што там было вялікае даўней,
З вакна вагона стала неяк мізарнець.
Знаёмыя вось вёска, млын, ставок і рэчка
Мільгнулі й зніклі, вось і знаны гай, дарэчы.
За ім жа возера, там прыспарае бег
Удалеч леснічоўка, дзе я меў начлег.
Якая ніклая!.. нібы не гэта хата,
Пазнаў я дрэва, моху на страсе багата.

Пабежна прамільгнулі студня з жураўлём,
Адрынка, дранкай крытая, радок вуллёў.

Ды што ж тут?.. дзе ж лясы?.. Мо нешта ўжо з вачамі?
Ці ж гэтая вялікая пустэля з пнямі
І папараццяй леташняй, што крые дол,
Ёсць Кругліца, дзе чуўся птушак спеў наўкол,
Бярозы дзе шумелі, хвоі ды асіны?..
Дзе столькі ў гушчары таілася дзічыны!
Дашчэнту ўсё жывое вынішчана скрозь,
Пустэча, могільнік!..
Тут свішча паравоз:
Да станцыі ўжо мала...
Я пазнаў здалёку
Старую брычку, што мяне чакала збоку.

* * *

Пытаюся я ў дзеда: «Што чуваць у вас?»
У наваколлі знаным мы былі якраз,
Дзе паравоз за гаем сіпаватым свістам
Нам намякнуў на ўплывы поступу празрыста.
«Багата змен, панарастала маладых,
А век, паночку, сходзіць у людзей старых». —

«Што з леснікам Рыгорам? Ліст мне надасланы,
Што памірае». —
«Акурат сягоння рана
Прыбег унук яго, прасіў, як пан спачне,
Да іх каб выязджаў і як мага раней.
Пытаецца пра пана Грышка безустанку». —

«Мяне вы разбудзеце заўтра на світанку».

І я задумаўся ад сумнай явы той:
Мой дружа, маю развітацца ўжо з табой!
Чужыя мы зусім паводле роду, стану,
Ды я ўспамінамі з табою паяднаны,

Давеку спараднілася душа мая,
Мяне заўсёды шчырасць вабіла твая,
Вартнейшая яна за ўсякія пышноты,
Што ў сэрцы спараджаюць пачуццё самоты.

..............................

Рыгор, сівы як лунь, з вялікай барадой,
Быў на палацях, павітаў мяне рукой,
Парупіўся стары адразу злезці з печы,
Як я ўвайшоў, сказаў, што вельмі недарэчы
Быць там пры мне. Яго занеслі два сыны
На ложак, бо хадзіць стары не мог з вясны...
Я сеў пры ім, руку ўзяў ён маю ў далоні,
Маўчалі мы, мне слёзы падступілі ў лоне.

«Гм! — пан старэе ўжо!.. а мо вачэй падман?
То ж лысінка?.. Няхай жа схіліць голаў пан,
А як жа!.. Што ж такое?.. не пара, так скора!..
А ці ж даўно было, як на руках Рыгора
Пан жвава ножкамі перабіраў, дзіцём
Да стрэльбы ўсё цягнуўся?.. Як бяжыць жыццё!» —
«Ужо мінуў чацверты крыжык мне, зазначу». —
«Што кажа пан? Скуль — столькі?
Жарты, і няйначай!» —
«Мы ж аднагодкі, я і вось Вінцэсь, сын твой». —
«То праўда! так, то праўда!.. Як жа, Божа мой,
Павырасталі ўсе!.. Пятрусь, унук мой, бачу,
Баранавацъ ідзе, ўжо б'е драздоў і качак
І хваліцца на ўцеху дзеду пра паход.
То ж блага, пан не мае дзетак! Знікне род.
Адзінае на старасць шчасце ў бобе гэтым,
Лягчэй развітвацца з людзьмі і белым светам,
Як пакідаеш нешта... Ўнукі цепляць нас!
Хоць, праўду кажучы, калі б мне Бог шчэ раз
Пражыць мой век судзіў, было б ужо няміла,

Другі стаў свет!.. Змірыцца чалавек з магілай
Тут мусіць... Мне ж з натураю маёй як жыць!
Нялёгка сакалу, пан, курыцаю быць,
Ды трэба!..
Нашы мовы пан ці памятае?
Што ж? — на маё не выйшла?..
Праўда ёсць святая
І ў тым, што не пускаў на вецер пан слаўца:
Балота асушылі — прыбыло сянца,
І сталася, што родзяць даўнія аблогі,
Дык маем болей хлеба...
Краявід убогі
Там, дзе прыроду глуміць прагны чалавек,
Дзе гінуць соткі, тысячы за грош, дзе здзек
Канца не мае: шэльма лупіць скуру з люду,
Пустошыць, нішчыць Божыя дары прыблуда!..
Праз Кругліцу пан ехаў, дзе ж яе краса?
Як выглядае тая пустка, бачыў сам?
Ні роляў там не будзе, ні лугоў, ні пашы —
Зямліца мёртвая людзей пустэчай страшыць!
Які раскошны лес спакон вякоў там быў!
Дзе ж ён? — у злодзея, кішэню жыд набіў.
Пры дубе скрадзеным яму я ўсыпаў, браце,
Стоўк пыку ўсю, цёг за каўнер і калашмаціў!
У нас над Файтэля няма багатыра:
Купец і два фальваркі тут у махляра!
Вось так!.. Сабе падумаў: жыцьмуць як унукі?!
І паўтараю перад смертухнай: навукі!
Расповяды альбо старыя пераказы
Пан слухаў і запамінаў за кожным разам,
Не спаў, пра ўсё распытваўся, мой галубок,
А я выцягваў з пана тое, што з кніжок.
Ого — навука!.. Помню, як дакладна панам
Шлях, дзе капаць з дрыгвы канал, быў адгаданы.
Там выкапалі. На заломе, што й казаць,
Была, як бездань, багна — зараз сенажаць.

Пан меў мо сто прафесароў,
сядзеў над кніжкай,
Ды ў пушчы акадэмія была пры Грышку!
Бурчу, бывала, строю жарцікі свае,
Пан за навукі не загневаўся мае.
І як ні лез я ў вочы з павучаннем,
Пан да старога быў прыхільны без хістання.
Люблю я пана...
Паляўнічы хоць з яго
Такі, як люлька за тры грошы, і ўсяго.
Ахвота ёсць, — што з гэтага? — намер дарэмны!
На носе ў пана акуляры, бачыць дрэнна,
І блудзіць, і гарачы, як страляць, заўжды,
Не ўмее вабіць і знайсці след звера... Ды
Нікога не любіў над пана з паляўнічых,
За шчасце хвілі, як быў з панам, Грышка лічыць.
Ёсць пану памятка. Стары і хворы ўжо
Нейк выдаўбаў.
З каморы дайце мне ражок!..
Ён з дзіўнай верабіны, адшуканай мною,
Расла й звівалася вужакаю даўгою.
Ражок я гладкай скураю паспеў абшыць,
Далёка голас чысты ў пушчы паляціць.
У лесе паляўнічаму блудзіць ганебна,
Ражок на паляванні пану мець патрэбна.
Прыгадвай Грышку...
Раджу, будзе моц пакуль,
Няхай шануе паляванне пан паўсюль,
Не тое моднае, дзе знік лавецкі звычай,
Нішто стральца не вабіць, апрача здабычы,
А нашае — ў палёх, дуброве, мшарах, брат,
Здароўе што змацняе і не чыніць страт.
Не буду спору прыракаць наперад ловам,
Даўно жыды ў арэнду ўсё забраць гатовы.
Як апануе сэрца смутак, неспакой,
Душу суцешыць лесу шум над галавой.
Як тлум людскі далёкі свет пазаглушае,
Хай пан у наш куток зацішны паспяшае».

Замоўк стары ляснік, жыцця і веку схіл
Змарыў яго, але здабыў ён трохі сіл
На гутарку. Няхай стары спачне ў дрымоце.
Мы выйшлі зараз жа без шуму і ў нямоце.

Калі вяртаўся я, раі тужлівых дум
Навеялі на сэрца несуцешны сум.
З вачэй не сходзіў Грышка...
На дарозе Божай
Спакойны, — эх! хто з маладых быць гэткім зможа!

# Старасць не радасць

*Драматургічны абразок*

П і л і п. Старасць не радасць, куме! Не раўнуючы як той конь, быу ды з'ездзіўся, так і я.

Г р ы г о р. Яшчэ ж не саўсім з'ездзіўся. Па том аднaчэ на вас, куме, старога трэба са двое маладых сягонняшняга гатунку, каб падужалі

П і л і п. Ой не! не тое яно!.. Бывала, па паўбочкі жыта, ускінуўшы на плечы, нясу, а цяперака і самога сябе часамі панесці цяжка. Ну! на тое — век мой вялікі... Лічыце ж, што мой старшы сынок Ян пад Севастопалем галоўку палажыў. З другое дачкі Уляны, што за Прахорам, унучку; ужо гады чатыры, як замуж аддавалі. Другіх дзетах Бог забраў, а гэтыя два мае блазны... дык гэта ж саўсім смуроды... праціў братоў, а і яны ўжо на лес гледзячы павырасталі А ці мала на вяку ўсякага ліха перабылося?

Г р ы г о р. А ей!..

П і л і п. Тое ж то яно! Вось і цяпер і маю тую думку, што не жыць мне другога веку. Малады можа, а стары дык мусіць... Прызнацца, куме, не хацелася бы сякі-такі лад,

што ў хаце пазаводзілі, пабачыць на старасці лет маіх папсаваным. Што ж? падзяліўшы на двое і поле, і сенажатку, і хатку, і ўсякую худобу і таму і другому — не быць гаспадаром як мае быць... Не папнешся, калі няма на чым... От я, значыцца, і пастанавіў сабе так дзяліць маіх дзетак: аднаму здам гаспадарку, другому грашмі дам тое, што яна варта. Хочаш, купляй зямлю, будуйся, гаспадар, хочаш, за другое што бярыся... як сам ужо знаеш.

Грыгор. Ну, а сыны што на гэта?..

Піліп. От тут-то і самы клопат! І той бацькаўшчыну хоча і другі. Мы, кажуць, тату, тут параслі, тут і жыць хочам. Каб я, значыцца, аднаго сына відзеў за што лепшае проціў другога, ну сказаў бы, так! і канец! — так хачу, так і будзе. Дык што ж тут парадзіць, калі абодва, дзякаваць Богу, мае хлопцы і працавіты, і не лайдакі, і сумленны, і мяне старога і шанують і слухаюць!..

Грыгор. Але ж... гэта і мы відзім...

Пілiп. Вось жа, уважайце сабе, куме, які спосаб Бог мне і думцы пасылае... Не дзіва, што і Антось і Змітрук у мяне слухмяныя хлапцы, бо я яшчэ і цяпер і за лоб і бізуном задам, абы што... Пабачым, як яны спраўляцца будуць, па сваей волі жывучы!.. Няхай жа Антось з віцінай сходзіць аж за граніцу і раз і другі, а Змітрука аддам пану, ён бо, бачыце, пытаўся ў нас хлапца да гаспадаркі, аж кудысь на Украіну, казалі, ці што.. Ну, няхай хлопцы свету пабачуць.. Вось мы тагды і пабачым.. *(Уваходзіць Кацярына)*

Кацярына. Што? што ты кажаш?... кабы дзецюкоў нашых немаведама куды пасылаць?.. Ды не, ды што ты гэта!.. Што ты гэта, стары, уздумаў?.. Ці, дзякаваць Богу, у хаце няма куды дзецца?.. Ці што якое... ці роднаму дзіцяці хлеба шкадуеш?..

Пілiп. Ціха!.. не крычы!.. бабскі твой розум, як за грош люлька!.. Што ж, на згубу, ці што, альбо на век сыноў пасылаю. Дзеля іх жа дабра і навукі, вось што! Не бойся, і вернуцца, і нацешымся імі, і нам з табою скажуць: дзякуем! за гэта самае... Чаго раскудахталася?..

# З крывавых дзён

## Эпізод з паўстання 1863 года на Міншчыне

### УСТУП

Адным з самых цудоўных перыядаў у гісторыі Польшчы пасля падзелаў, які сабраў шмат фактаў ціхай, невядомай і разам з тым узнёслай ахвярнасці, шмат праяў звышчалавечага гераізму і дзякуючы гэтаму пакінуў, можа, самую цудоўную старонку ў айчыннай гісторыі, — гэта паўстанне 1863 года, апошняе намаганне прыгнечанага народа, здзейсненае з мэтаю скінуць ненавіснае, прыніжальнае ярмо. Гэтую старонку запаўнялі эпізоды, што адбыліся на тэрыторыі Літвы і Кароны і ў многіх працах былі апісаны ці відавочцамі, ці былі сабраны з польскіх і замежных дзённікаў. Да вядомых манаграфій паўстання належаць працы А Гілера, Ліманоўскага, Струся, Хацішэўскага, але ў ніводным з іх важны гістарычны факт не быў паказаны з усёй дакладнасцю. Шмат яшчэ выпадкаў, што адбыліся ў той перыяд, цалкам невядомыя шырокім колам. Мы не абвінавачваем аўтараў гэтых несумненна каштоўных прац, бо немагчыма абмаляваць поўны і ў кожнай дэталі закончаны вобраз падзей, што адбыліся ў недалёкім мінулым: кожны дзень яшчэ можа нам прынесці новыя адкрыцці на гэтай ніве. Агульная аснова паўстання трапна і з добрым намерам аўтараў была занатавана. Што да адзінкавых здарэнняў, многія з якіх яшчэ ляжаць у імгле забыцця, бо мы не маем амаль ніякіх падрабязнасцяў пра паўстанне ў некаторых ваколіцах Літвы, Валыні і Украіны, то калі б кожны з удзельнікаў нацыянальнай барацьбы 1863 года захацеў паводле магчымасці апісаць убачаныя ім самім эпізоды партызанскай вайны, прагалы і недакладнасці, што знаходзяцца ў папярэдніх манаграфіях, пачалі б запаўняцца. З такіх толькі на першы погляд паасобных старонак магла

б паўстаць пад рукою здольнага гісторыка вычарпальная кніга гісторыі паўстання. Натуральна, што самай галоўнай і неабходнай умовай такіх меншых апісанняў павінна быць шчырая любасць да радзімы і цяга да праўды ў апісанні падзей. Што далучэнне па магчымасці да высвятлення ходу нацыянальнай барацьбы з'яўляецца абавязкам кожнага сумленнага грамадзяніна краю, гэтага ніхто не здолее аспрэчыць. Кіруючыся жаданнем выканаць гэты абавязак, я асмельваюся паказаць землякам гэтую маю працу, у якой намерыўся апісаць паход на Міншчыне пад кіраўніцтвам Баляслава Свентарэцкага і Станіслава Ляскоўскага, афіцэра генеральнага штаба расійскіх войск Усе гэтыя партызанскія падзеі адбываліся ў Ігуменскім павеце. Спадзяюся, шаноўныя чытачы не будуць на мяне ў крыўдзе, што непасрэднае апісанне паўстання 1863 года на Міншчыне я падаў пасля замалёўкі падзей, якія папярэднічалі яму, а закончыў расказам пра сучасныя, вельмі сумныя на Літве стасункі.

Пісаў у Кракаве дня 8 жніўня 1889

## I

*Заступленне на трон Аляксандра II і яго рэформа. Цар у Мінску. Прыём. Уплыў італьянскага паўстання на моладзь. Вызваленне сялян. Абранне маршалка шляхты. Групоўкі і дэмакратыя. Варшаўскія падзеі выклікаюць хваляванне жыхароў Мінска. Першы этап вязняў. Ноч 3 чэрвеня. Памятка уніі. Рух на Падляшшы. Чытальня. Міхал Цюндзявіцкі.*

У 1858 годзе расійскі трон заняў Аляксандр II. Пачатак свайго царавання ён адзначыў у Варшаве вядомымі словамі: «Ніякіх мар!» — якімі, несумненна, хацеў пазбавіць палякаў надзеі на якое-небудзь палепшанне лёсу. Тым не менш ён зрабіў пэўныя льготы ў іх тагачасным становішчы, бо дазволіў выгнанцам вярнуцца на радзіму, заснаваць медыцынскі факультэт, сельскагаспадарчае

таварыства ў Варшаве. Апошняе, накіраванас энергічнай рукою Анджэя Замойскага, прынесла краю вялікую карысць. У Літве зменай на лепшае было ўвядзенне польскай мовы як дадатковага прадмета ў мужчынскіх школах, а таксама дазвол выдаваць творы Міцкевіча, праўда, са значнымі скарачэннямі.

Дваццатага верасня 1858 года цар Аляксандр прыбыў у Мінск-літоўскі, куды на яго прыём было загадана з'ехацца памешчыкам усёй губерні. На маскоўскай дарозе была ўзнесена трыумфальная брама. А дзевятай гадзіне вечара цар уехаў у горад і затрымаўся ў палацы губернатара. Назаўтра да дзесяці гадзін прымаў ён дэпутацыю шляхты, чыноўнікаў і вайсковых, пры гэтым перад шляхтаю меў прамову, у якой выказаў надзею, што памешчыкі дапамогуць яму пры ўрэгуляванні стасункаў з сялянамі, бо хутка надыдзе хвіліна іх вызвалення. Затым накіраваўся ў сабор, а адтуль да катэдры, дзе на яго спатканне выйшаў у адпаведным уборы біскуп Адам Вайткевіч з усім каталіцкім духавенствам. Пасля наведвання розных грамадскіх установаў у адзінаццаць вечара цар прыбыў у губеранскае праўленне на баль, што даваўся ў яго гонар, і сабраў усе вяршкі грамадства. Станцаваўшы паланез з жонкаю шляхецкага маршалка Слатвінскай, ён непрыкметна знік і выехаў у Вільню. Палякі, спадзеючыся, што цар пастараецца ў чым-небудзь палепшыць іх становішча, прымалі яго ў Мінску з вялікай урачыстасцю і магчымай пышнасцю, аднак гэтыя надзеі былі дарэмныя.

На розум і сэрца тагачаснай моладзі велізарны ўплыў зрабіў водгалас падзей у паўднёвай Еўропе, асабліва моцна адбілася на абуджэнні яе гераічнага патрыятызму вызваленне італьянцаў. Газеты расхоплівалі, з ліхаманкавай нецярплівасцю сачылі за ходам гэтага змагання за незалежнасць: у тагачасным становішчы Італіі знаходзілі пэўную аналогію з няшчаснай айчынай. Зара свабоды, якая заззяла над Апенінамі, здавалася, кідае слабы праменьчык на нашыя раўніны. У маладых сэрцах усё больш абуджалася парыванне да барацьбы, а разам з ім узраста-

ла ненавісць да ярма, не хапала толькі нейкага ўнутранага штуршка, каб запасы добрай волі ператварыліся ў дзеянне...

Восенню 1861 года ў Мінску адбыліся апошнія выбары маршалка. На гэтую пасаду звычайна праз кожныя тры гады, памешчыкі выбіралі з свайго асяроддзя аднаго прадстаўніка. Права голасу на выбарах мелі землеўладальнікі, у якіх было сама меней сто душ прыгонных У 1861 годзе, як звычайна, з'ехаліся ў Мінск памешчыкі і ў прызначаны дзень сабраліся ў шляхецкім доме. Выбаршчыкі падзяліліся на дзве групоўкі: патрыятычная, што спрыяла вялікаму нацыянальнаму руху, і ўмераная, што хацела шляхам перагавораў ісці на пагадненне з урадам. Апошняя намервалася нават паслаць цару вернападданніцкі адрас. На чале патрыятычнай групоўкі сталі Яленскія, якія на выбарах супрацiўляліся праекту наконт згаданага адрасу і заклікалі шляхту, каб яна не паддавалася на перагаворы з царызмам, аднадушна думала пра захаванне радзімы. Умераныя падтрымлівалі кандыдатуру Дамініка Лапы, аднаго з прадстаўнікоў свае групоўкі, што выклікала на выбарчым сходзе непаразуменні. Дробная шляхта, мяшчане, рамеснікі і навучэнцы, даведаўшыся пра гэта, надзвычай абурыліся і, паразбіваўшы вокны ў доме Лапы, папрыклейвалі на скрыжаваннях вуліц вельмі папулярную пад той час песню:

Калі йшоў на бітву народ у айчыне,
Панове пра чыншы гадалі.
Калі народ клікнуў: «Ці зможам, ці згінем!»,
Панове ў сталіцах гулялі...

Гэтыя плакаты выклікалі вялікае абурэнне. Паліцыя і ўмераная партыя пачалі іх здзіраць. Урад, бачачы, што выбары нічым не скончацца, загадаў памешчыкам раз'язджацца па хатах і без выбараў назначыў маршалкам Дамініка Лапу. Былі гэта апошнія ў Мінску выбары. Апошнімі былі яны, можа, таму, што ў іх, як заўсёды,

выявіліся адмоўныя рысы нашага грамадства: адсутнасць згоды і сапраўднай, бескарыслівай любасці да краю, прынамсі ў некаторых.

Пасля бурлівых выбараў колькі месяцаў працяклі спакойна. Крывавыя падзеі, што адбыліся на пачатку наступнага года ў Варшаве, знайшлі жывы і моцны водгук сярод мінчукоў і выклікалі ў іх незабыўнае ўражанне. Хто толькі належаў да людзей сумленных і меў любасць да айчыны, тут жа апранаў жалобнае адзенне. Спыніліся балі і забавы як у Мінску, так і ў ваколіцах, па касцёлах спявалася «Божа, што Польшчу», разам з патрыятычнымі пракламацыямі раздаваліся фатаграфіі забітых у Варшаве. Спачатку ўлады прыглядаліся да ўсяго гэтага з страхам, не чынячы перашкод патрыятычнаму руху. Аднак праз нейкі час абвастрылі сваю чуйнасць: мінскім генерал-губернатарам назначылі Кушалева, паліцыя атрымала тайны загад арыштоўваць падазроных, хто прымаў жывы ўдзел у маніфестацыях. Былі арыштаваны Барташэвіч, Дмахоўскі і іншыя. Іх тут жа выслалі ў глыбіню Расіі. Другія ж, менш скампраметаваныя, толькі за выплату значнага грашовага штрафу здабылі свабоду. Але не змагло гэта ні заглушыць нацыянальны дух, ні астудзіць запалу, што ўсё жывей абуджаўся і ахопліваў усё шырэйшыя колы. Дзіўна таксама нелагічнымі былі тагачасныя ўчынкі нашых ворагаў. Стараючыся, з аднаго боку, спыніць маніфестацыі, з другога — яны самі падштурхоўвалі да іх. Галоўным такім узбуджальнікам дэманстрацыі былі так званыя этапы вязняў. Зімою 1862 года праз Мінск прайшоў першы транспарт вязняў з Варшавы, асуджаных на выгнанне ў Сібір. Выгляд гэтых маладых пакутнікаў за справу айчыны глыбокае зрабіў уражанне на жыхароў горада, якія, хоць і стаяла непагадзь, усе, як адзін, выйшлі спаткаць іх. На простых сялянскіх санях у суправаджэнні эскорту салдат ехала болей дзесяці маладых хлопцаў, бледнатварых ад пакут і трывогі за сваю будучыню і родных, пакінутых у слязах. Калі вязні наблізіліся да горада, ім дазволілі злезці з са-

ней і ісці пешу. Яны маглі свабодна гутарыць з мінчукамі, якія наперабой выказвалі ім сваё спачуванне. Тут жа наладзілі для няшчасных збор на дарогу і суправаджалі іх праз увесь горад ажно да брамы казармы... Летам таго ж года разышлася чутка, што 3 чэрвеня праз Мінск маецца прайсці другі этап вязняў. Вялізны натоўп, за выключэннем жанчын і дзяцей, рушыў на гэтае спатканне за тры кіламетры ад горада, на Варшаўскі тракт, і рассеўся паабапал дарогі.

Каля натоўпу час ад часу праязджалі казакі, бо паліцыя, убачыўшы, што збіраюцца людзі, высылала насустрач этапу ганцоў з даручэннем узяць на бліжэйшай станцыі паштовых коней і як найхутчэй правезці вязняў праз горад, каб не даць ім паразумецца з жыхарамі. Аднак тыя ганцы, шчыра спачуваючы палякам, адкрыта паведамлялі натоўпу, куды і навошта едуць. Людзі ж увогуле не думалі разыходзіцца, тым болей што меліся ўручыць вязням складкі, сабраныя для іх у горадзе, пры самым старанным удзеле заможных жанчын.

Каля шасці гадзін вечара пачуліся паштовыя званкі. «Гэта яны! Едуць!..» — разнеслася па натоўпе. Неўзабаве на тракце паказаліся шэсць чатырохконных паштовых кібітак. Іх удалося затрымаць, хоць жандары аказвалі супраціўленне і фурманы намагаліся прарвацца праз натоўп. Пасля таго як вязням уручылі складкі і абмяняліся з імі некалькімі словамі, натоўп разышоўся, папярэдне дамовіўшыся выйсці на Маскоўскі тракт, за цвінтар, званы Залатой горкаю, каб праводзіць іх, калі яны выедуць з казармаў. Выязджаць яны павінны былі ноччу, у адзінаццаць гадзін. Але жандарскае начальства наўмысна запазніла гэты выезд, таму што, бачачы групы людзей, баялася, каб не было спроб адбіць вязняў. Толькі ў дзве гадзіны ночы вязні ў суправаджэнні казакаў выехалі за горад, на Маскоўскі тракт. Пры іх з'яўленні ў людскім натоўпе раздаліся патрыятычныя воклічы. Тады казакі выхапілі тупыя пікі і некаторых паадпіхалі, пасля чаго людзі, хоць і далі адпор жэрдкамі і каменнем, усё-такі рассыпаліся.

Адны ўцякалі ў лес або на цвінтар, другія падаліся ў горад. Гэтых апошніх акружылі салдаты і, давёўшы да цэнтра горада, адпусцілі. Назаўтра ж губернатар выклікаў найбольш прыкметных маніфестантаў і зрабіў папярэджанне, каб не лезлі без патрэбы на ражон. З таго часу вязняў не везлі праз Мінск, а ўбочнымі дарогамі, стараючыся трымаць іх дзень прыезду ў вялікім сакрэце. Дванаццатага жніўня ўрачыста адзначалася гадавіна уніі Літвы з Польшчай. На набажэнства ў касцёле бернардынаў сабралася многа людзей. У гэты дзень была адменена нацыянальная жалоба, і ўсе апранулiся ў святочнае адзенне, якім перш за ўсё вызначаліся жанчыны. Пасля набажэнства праспявалі «Божа, што Польшчу». Людзі ў пераважнай большасці былі ўзрушаны, па многіх тварах цяклі слёзы расчулення, а можа, і прадчування блізкай буры, якая праз колькі месяцаў мелася разгуляцца над няшчасным краем і столькі сямейных ачагоў ператварыць у пажарышчы, у столькіх бацькоў забраць сыноў, у столькіх дзяцей — бацькоў! На наступны дзень, 29 лістапада (17 паводле старога стылю), а сёмай гадзіне раніцы, у кафедральным касцёле з нагоды паўстання 1831 года таксама адбылося патрыятычнае набажэнства. У гэты дзень навучэнцкая моладзь самавольна кінула заняткі і пайшла ў касцёл. Калі школьнае начальства паспрабавала супыніць іх, то тыя, хто жыў у пансіёне, паспускаліся на ручніках з вакон другога паверха і накіраваліся на набажэнства. З таго часу гімназія была зачынена аж да сярэдзіны студзеня.

У студзені 1863 года выбухнула паўстанне ў Каралеўстве: чуткі пра яго маланкава разышліся па Літве. Жыхары Мінска, асабліва моладзь, горача ўспрынялі паўстанне. Адразу ж пачалася падрыхтоўка. Як маглі здабывалі сабе зброю: стрэльбы, шаблі і да таго падобнае. Адліваліся кулі, пры пасрэдніцтве яўрэяў куплялі порах, амуніцыю і кожную хвіліну чакалі выбуху...

Неўзабаве пачалі даходзіць чуткі, што ў некаторых мясцінах Літвы, напрыклад, на Гродзеншчыне, Віленшчыне, Ковельшчыне, з'явіліся партызаны. Улады пачалі

сцягваць войска і казакаў у Мінск. Горад аб'явілі на ваенным становішчы. Паліцыя і жандары пільна сачылі не толькі за вялікім, але і за нязначным, нават выпадковым рухам. Уночы неспадзявана хапалі людзей, якім урад не давяраў, і адразу ж вывозілі ў глыб Расіі. Аднак, нягледзячы на праслед, людзі, асабліва моладзь, кіпелі сваёй нецярплівасцю і чакалі хвіліны, калі будзе кінуты заклік: у бой! Так прамінула тры месяцы чакання і няпэўнасці.

Пад той час шляхам збораў была адчынена польская чытальня, у якой, акрамя кніг, меліся ўсе дазволеныя ўрадам часопісы. Грамадства гарнулася да чытальні, расхоплівала газеты і тэлеграмы, сачыла за ходам нацыянальнай справы. Вельмі многа рускіх, напрыклад Захараў Кукін і іншыя, прынялі чынны ўдзел у прадпаўстанцкім руху. Дзякуючы свайму паходжанню яны лягчэй маглі даступіцца да ўлад і ўстаноў, даведваліся аб розных патрэбных дэталях і перадавалі іх сваім прыяцелям-палякам. Усе яны пасля прынялі дзейсны ўдзел у партызанскай вайне і пагінулі ў снягах Сібіры.

Набліжаючыся да апісання падзей у Мінскай губерні, я вымушаны яшчэ напачатку прывесці эпізод, які зрабіў на ўсіх жыхароў балючае ўражанне. У маі 1863 года афіцэр Міхал Цюндзявіцкі, якога Нацыянальны камітэт прызначыў начальнікам аднаго з аддзелаў прыехаў з Пецярбурга ў ваколіцы Барысава да сваіх родных і пачаў пашыраць паўстанчую прапаганду Неўзабаве яго схапілі і прывезлі ў Мінск, дзе на тагачаснай Вайсковай плошчы, а цяперашняй Пецярбургскай вуліцы, яго расстралялі. Цела яго было пахавана на месцы расправы. Заліўшы яго вапнай, паставілі варту Баяліся, каб насельніцтва не адграбло астанкі пакутніка за радзіму

## II

*Паўночнае ззянне і прадказанні. Арганізацыя. Паход уначы. Карчма ў лесе. Прадбачлівасць. Юхнаўка. Пашто-*

*вые брычкі. Вечар пад Смалявічамі. Пераправа праз балоты. Салдацкі пікет. Начоўка ў лесе. Рака Пліса і міраж. Пуцічола. Нарада. Касцеша.*

Апошнія месяцы 1862 года адзначыліся некалькімі незвычайнымі аптычнымі з'явамі. Час ад часу на небе паказваліся падвойныя сонцы, месяцы, затым пасля надзвычай моцных маразоў, якія даходзілі да 30-ці градусаў паводле Рэамюра і трымаліся праз цэлы месяц, ад 13 лістапада да 14 снежня, ноччу 14 снежня заяснела прыгожае паўночнае ззянне, якога ў нашых ваколіцах самыя старыя людзі не памяталі. З'ява гэтая багаццем і разнастайнасцю колераў пераўзыходзіла ўсякія іншыя. Ад паўавальнага светлага воблака па-над даляглядам узносіліся нібы вогненныя слупы, сягаючы да зеніту. Гэтыя слупы, змяняючы колер, праходзячы ўсе асаблівасці ружовага, фіялетавага і вішнёвага колеру, утваралі пры паўднёвым святле чароўны малюнак, з прыгажосцю якога нішто не магло зраўняцца. Тады ў народзе распаўсюдзілася думка, што гэтая з'ява прадказвае крывавую вайну або іншую бітву, якая хутка павінна наступіць. Далей зіма была мяккая, снегу амаль не было, і вясна раней, чым звычайна, укрыла палі і лясы зелянінай.

Мінскае ваяводства мела свайго ваяводу ў асобе пана Пялікшы, вясковага землеўладальніка. Упаўнаважаныя Нацыянальнага камітэта прыслалі на яго рукі нелегальную адозву да жыхароў Мінскага ваяводства, прызначаючы дзейснае выступленне на першае мая паводле новага стылю. З тых, хто абяцаў прыняць удзел у паўстанні, былі абраны так званыя дзесятнікі, кожны з якіх абвясціў сваім падначаленым, каб у прызначаны дзень былі гатовыя да выступлення, і прыняў ад іх прысягу вернасці. Якісьці незвычайны і ліхаманкавы запал авалодаў галовамі і сэрцамі. Першага мая ўжо з самай раніцы асобныя людзі выбіраліся за межы горада, кіруючы да месца збору за цвінтаром Залатагорскім. І хоць паліцыя была чуйнай, яны ўмелі пракрасціся незаўважна, і каля шостай гадзіны вечара пяцьдзесят тры паўстанцы

сабраліся за Залатою горкаю. На чале гэтай малой групы, значную частку якой складалі навучэнцы гімназіі, стаў Канапацкі. Яго заданнем было, пазбягаючы, наколькі магчыма, сутычак з непрыяцелем, прывесці сваю групу з Мінска ў павет Ігуменскі, каб там злучыцца з Станіславам Ляскоўскім, афіцэрам генеральнага штаба расійскіх войск, які на першы заклік да бітвы стаў у шэрагі адданых сыноў радзімы, здольных кожную хвіліну, абараняючы яе, праліць сваю кроў.

З трапяткімі сэрцамі, з галовамі, поўнымі мараў аб героічных учынках, да здзяйснення якіх кожны адчуваў сябе гатовым, мінскія партызаны рушылі з сваім тагачасным камандзірам Канапацкім. У лесе, што належаў маёнтку Сляпянкі, паўстанцы знайшлі воз з харчамі і зброяй, якая складалася з стрэльбаў пісталетаў і шабляў. Камандзір адразу ж падзяліў зброю паміж паўстанцамі, даючы кожнаму па дзесяць набояў. Без малога пачатак паходу не скончыўся трагічна. Адзін з паўстанцаў не ўмеючы карыстацца агністрэльнай зброяй, міжволі выстраліў: куля праляцела міма астатніх таварышаў, нікога, на шчасце, не зачапіўшы.

Затым Канапацкі, які ведаў, што ў Сляпянцы ў памешчыка маецца восем дубальтовак, вырашыў забраць іх. Уся група, ідучы па двое ў шарэнзе, накіравалася да маёнтка. Тут насустрач выйшаў афіцыяліст Булгак і прывітаў лаянкай і пагрозамі, але неўзабаве падышоў сам гаспадар і, даведаўшыся аб жаданні паўстанцаў, сказаў:

— Добра, панове, аддам вам зброю, але папярэдне мусіце выдаць мне распіску на яе.

Выканаўшы пастаўленую ўмову група з новым запасам зброі рушыла каля васьмі вечара далей па Маскоўскім тракце. Камандзір загадаў некалькім таварышам наблізіцца да горада і забраць з сабою тых, хто на зборы, можа, спазніўся і не знайшоў нікога. Моўчкі партызаны пайшлі далей, імкнучыся да галоўнай групы пад камандаваннем Ляскоўскага.

Ноч была ціхая, пахмурная, зрэдку імжэў дробны дождджык. Паўстанцы ішлі адзін за адным, прадзіраючыся праз густы зараснік Глухая начная цішыня парушалася трэскам сухіх галінак пад нагамі і водгукам сігналаў царскага войска, што даносіліся з горада. Праз нейкі час паўстанцкі атрад выйшаў на гасцінец, і тут яму было дазволена крыху адпачыць. Партызаны тут жа расселіся на траве, прыслухоўваючыся да гарадскіх гукаў. Вакол было ціха, адзінока, дзіка; нейкія панурыя, змрочныя думкі агарнулі душы, і толькі надзея блізкай бітвы за незалежнасць айчыны надавала трохі бадзёрасці. Праз хвілю рушылі далей. Паўстанцы пасоўваліся па гасцінцы, а за імі зводдаль чутны быў тупат і ржанне коней і нейкія невыразныя шумы — гэта спяшалася царскае войска. Тады, каб збіць з тропу пагоню, камандзір загадаў затрымацца і размясціцца каля лесу, каб у выпадку нападу спадручней было абараняцца, некалькіх жа паслаў у карчму па ваду.

Прынеслі каля пяцідзесяці вёдзер вады, якую тут жа вылівалі на зямлю. Карчмар, бачачы гэтае бесперапыннае нашэнне вёдзер, нясмела спытаў:

— Што вы, ясныя панове, робіце з гэтаю вадою?

— Яна патрэбна, каб напаіць людзей і коней.

— То, відаць, вельмі многа тут вас?

— Каля тысячы, — быў адказ,

Тым часам Канапацкі загадаў сваім падначаленым выстраіцца ў доўгую лінію на адлегласці ў некалькі крокаў адзін ад аднаго і час ад часу паліць запалкі. Цігель гэты павёў сябе выдатна, бо калі партызаны праз чвэрць гадзіны адышлі і неўзабаве з'явіліся салдаты, то перапалоханы карчмар расказаў ім, што нядаўна тут былі паўстанцы і паілі коней, што насілі яны па пяцьдзесят вёдзер вады і выбралі поўную студню. Войска было нешматлікае, бо яго большая частка накіравалася з Мінска ў бок Вілейкі, дзе з'явілася дзейсная і моцная група пад камандаваннем Казелы. Пачуўшы такі расказ, не надта вялікая група войска пакінула намер даганяць паўстанцаў, бо не хапала адвагі ўступіць у сутычку з мацнейшым, як думалася, непрыя-

целем. Такім чынам, група Канапацкага, маючы адносна малыя сілы, здолела пазбегнуць спаткання з ворагам, якое магло мець для яе самыя сумныя вынікі. Я нават сам чытаў пасля ў «Кур'еры Віленьскім»: «Група, што складаецца амаль з тысячы чалавек, з'явілася пры барысаўскім гасцінцы ля Зялёнага лугу; малы атрад салдатаў пасланы з Мінска ў пагоню, вымушаны быў затрымацца».

Партызаны, пазбегнуўшы небяспекі дзякуючы прадбачлівасці камандзіра, ішлі ўсю ноч, адпачываючы зрэдку ў якім-небудзь ціхім закутку. Змучаныя, замёрзлыя, бо вясенняя ноч была даволі халодная — і ніхто, выходзячы з дому, не запасся цяплейшым адзеннем, каб не прыцягваць увагу паліцыі, — яны ў сем гадзін раніцы дабраліся да вёскі Юхнаўка. Тут, карыстаючыся гасціннасцю і паслугамі сялян, усе расселіся і разлегліся на траве адпачываць. Расставіўшы навокал пікеты, якія кожную хвіліну маглі паведаміць аб небяспецы, Канапацкі з дзесяццю таварышамі пайшоў на паштовую станцыю і забраў усе брычкі з запрэжанымі коньмі, па чатыры ў кожнай. Праз нейкі час уся група на паштовых брычках стралою памчалася ў напрамку Смалявіч, намерваючыся праехаць праз гэтае мястэчка. Вясёлая гэта была язда. Наперадзе, захоўваючы важнасць, на кані ехаў Канапацкі. За ім узнімалася цэлае воблака пылу, чуліся званкі, грукаценне брычак, воклічы фурманаў і галасы вясёлай партызанскай моладзі. Каля паўдня ўгледзелі здалёк на дарозе грамадку пешых людзей. Думаючы, што гэта вайсковы атрад, партызаны звярнулі ў лес і распраглі коней. Частка з іх засталася ў лесе, а частка пайшла ў разведку. Дамовіліся, каб на знак, дадзены стрэлам, тыя паўстанцы, што засталіся ля брычак, спяшаліся на тракт услед за папярэднімі. Хутка высветлілася, што гэтую грамаду людзей утвараў атрад салдат-інвалідаў, якія накіроўваліся ў Мінск. Яны не толькі не думалі шкодзіць паўстанцам, але папярэдзілі іх, што ў Смалявічах знаходзяцца казакі і войска. Таму было вырашана не ісці ў мястэчка, а абмінуць яго здалёк праз навакольнае балота. Пакінуўшы паштовых коней, паўстанцкая

групка пешшу рушыла праз лясы і балоты ў напрамку Смалявіч. Было яшчэ светла, калі наблізіліся да мястэчка. Канапацкі вырашыў абысці яго здалёк, але пакольні выпадала праходзіць па адкрытай раўніне, дзе іх лёгка можна было заўважыць, то дачакаліся змроку. Паўстанцы ўселіся на невялікай паляне між кустоў ядлоўцу і гадзіны дзве адпачывалі. Вечар быў ціхі, цёплы, лёгкі подых ветру прыносіў з сабою водар маладой лістоты дрэў з па-над свежа завораных палёў далятаў спеў жаўрука, дзесьці ў глыбіні лесу разлягаўся адрывісты голас зязюлі. Паўстанцы з цікавасцю прыслухоўваліся да яе, пытаючыся, колькі гадоў яна прызначае жыць кожнаму. Паволі сонца пачало апускацца за гарызонт, абліваючы чырвоным святлом зялёныя верхавіны дрэў, па небе плылі лёгкія празрыстыя аблачынкі, пафарбаваныя чырванню пераламаных промняў. Неба пачало пастунова шарэць, і на яго фоне былі відаць цёмныя доўгія постаці дрэў. Аціх спеў дзённых птушак, затое ўдалечыні ў гушчары чароўна загучаў пошчак салаўя.

Калі ўжо зусім сцямнела, паўстанцы рушылі ў дарогу, брыдучы па калена ў багне і дрыжучы ад холаду. Многія думалі, што захварэюць, але, на шчасце, непрыемная гэтая пераправа нікому не прычыніла шкоды. Перайшоўшы балота, група ўладкавалася каля лесу. Усе наракалі на холад і, забыўшыся пра асцярожнасць, як мага назбіралі гучкоў і развялі вогнішча. Водбліск яго, відаць, быў заўважаны ў Смалявічах, бо неўзабаве ў мястэчку пачуўся стрэл з карабіна, што было сігналам для войска. Вогнішча адразу ж было патушана, і група пайшла далей. Праз паўгадзіны паходу затрымаліся каля багны на малой палянцы, пакрытай дробным ляском. Партызаны пачалі прыслухоўвацца да галасоў, што даходзілі з мястэчка. Вакол жа панавала глухая цішыня. Надзея пазбегнуць бітвы, добрага выніку якой цяжка было чакаць, зацеплілася ў сэрцах, але хутка пераканаліся, што была яна вельмі здрадлівай. Салдаты моўчкі пасоўваліся гасцінцам, партызаны стаялі збоку на адлегласці ў паўтары вярсты і, напэўна, былі б заспетыя

знянацку, калі б адзін з іх не згледзеў здалёк, што хтосьці, напэўна, афіцэр, прыкурваў цыгару.

— Увага, панове, — паведаміў ён прыглушаным голасам, — перад намі салдаты! Там, на гасцінцы, я бачыў агонь ад запалкі. Гэта яны!

І сапраўды, праз колькі хвілін пачуўся тупат коней, накіраваных убок, дзе схаваліся партызаны

— Нас заціскаюць! — раздаўся голас.

І ўсе па камандзе збегліся да балота і прыпалі да зямлі. Хутка пад'ехалі конна некалькі дзесяткаў казакаў а на вазах узброеныя салдаты. Паўстанцы спачатку хацелі адкрыць агонь, але ўстрымаліся, бо весці адкрыты бой такімі малымі сіламі было немажліва. Салдаты, праехаўшыся пару разоў каля багны і нікога не ўбачыўшы, вярнуліся назад. Партызаны ж вылезлі з багны і выйшлі на пагорак сярод лесу, каб там размясціцца на начоўку, некалькі ж засталося на варце. Навокал было ціха і глуха, ніводны лісток не зварухнуўся на дрэвах, ніводны гук людскога жыцця не даходзіў да гэтага закутку. Толькі храпенне партызанаў кантраставала з пануючай у прыродзе цішынёю.

Ледзь першыя промні сонца пракраліся праз лясную гушчэчу пасля кароткай веснавой ночы, партызаны былі ўжо на нагах і, агледзеўшы зброю, пераладаваўшы пісталеты, праз дзесяць хвілін рушылі ў далейшае падарожжа.

Праз гадзіну яны спыніліся ўжо на беразе ракі Плісы: лёгкі туман пакрывалам слаўся па-над лугам, і прамяністае сонца, што адбівалася ў кропельках, цудоўны ўтваралі малюнак. Тут убачылі міраж. Здалёку, на фоне туману, паказаліся, праскакваючы хутка адзін за адным, коннікі. Спачатку падумалі, што гэта набліжаецца непрыяцель, аднак хутка пераканаліся, што гэта быў толькі абман зроку. Міраж цягнуўся ўсяго колькі хвілін, пасля чаго туман пачаў рассейвацца. Партызанскі атрад, крыху падсілкаваўшыся і ўмыўшыся ў крыштальнай вадзе Плісы, пусціўся ў дарогу.

А першай гадзіне па паўдні ён спыніўся ў вёсцы Пуцічола. Тут, у двары, былі вынесены да ганка доўгія сталы, засланыя абрусамі. Абед складаўся з кіслага малака і нейкага супу, усім раздалі таксама па кілішку старой гарэлкі. Гэтай гасціннасцю паўстанцы былі абавязаны аканому пані Манюшкавай, за што ён вымушаны быў адпакутаваць, бо салдаты, даведаўшыся аб такім ветлівым прыёме атрада, напалі на двор, аграбілі, а беднага аканома з усёй сям'ёю вывезлі ў Сібір.

Пасля абеду паўстанцы праз багністыя лугі, што акружалі Пуцічола, дабраліся да густога, цёмнага яловага лесу, якіх цяпер ужо меней на Літве. Вырашылі тут заначаваць, размясціліся на ўскрайку лесу і пачалі паднаўляць сваё адзенне, пашарпанае ў прадзіранні праз лясную гушчэчу, чысціць зброю, рабіць зарады і г.д. Гэты занятак суправаджаўся ажыўленай размоваю пра пакінутыя дома сем'і, пра будучы лёс паходу. Зрэдку хто-небудзь нават заводзіў вядомую на Літве песню... Сумныя і шчырыя гукі гэтай песні плылі далека, а таварышаваў ім спакойны шум бору і спеў птушак, схаваных у галінах.

Пасля ночы, праведзенай у лесе, адбылася баявая нарада наконт далейшага паходу. Як я ўжо гаварыў, Нацыянальны камітэт прадпісаў камандзірам асобных дробных атрадаў у Мінскай губерні пазбягаць сутычак з ворагам, каб яны маглі давесці іх да галоўнай пазіцыі ў Ігуменскім павеце, паміж вёскамі Марціянаўка і Юравічы. Акрамя групы пад камандаваннем Канапацкага, яшчэ адна група з сямідзесяці васьмі чалавек пад камандаваннем Вярбіцкага прабіралася да Юравіч Бабруйскім трактам. На агульнай нарадзе ў Пуцічоле пастанавілі злучыцца з групаю Вярбіцкага, каб ісці разам да прызначанага месца і ў выпадку, калі не ўдасца пазбегнуць спаткання з непрыяцелем, магчы лягчэй даць яму адпор. Акрамя гэтага, адзін партызан, найлепш знаёмы з мясцовасцю, быў пасланы з лістамі да галоўнага камандзіра Станіслава Ляскоўскага. У дзевяць гадзін раніцы ўсе ўжо былі гатовы і рушылі ў паход, каб аб'яднацца з Вярбіцкім. Пасыльны

ж праз багны і лясы пайшоў да галоўнай групы. Гэта быў хлопец гадоў дваццаці па прозвішчу Касцеша. Прыводжу тут амаль слова ў слова яго расказ пра небяспечнае падарожжа: «Развітаўшыся з групаю ў лясах ля Пуцічола, я вымушаны быў прабірацца праз лясы і палі, каб не трапіць у рукі салдат. Першы дзень я ішоў дарогаю, што вяла праз лес, збочваючы з яе і хаваючыся між дрэў, калі хто праязджаў або праходзіў. Пад вечар я наблізіўся да вёскі, названай Раваніцкая Слабада. Вёску трэба было абысці здалёк, а зрабіць гэта было цяжка: я вымушаны быў перабрацца праз раку Ушу, якая тады разлілася. Засеўшы ў густым яловым зарасніку, я адпачываў і раздумваў, дзе б пераправіцца. Усю маю страву складаў кавалак сухога чорнага хлеба. Паеўшы яго, я пайшоў улева ад дарогі, але там цякла другая рака, хоць і меншая, але цяжкая для пераадолення. За паўгадзіны хадзьбы паўз раку я знайшоў вузенькую кладку і, перайшоўшы па ёй рэчку, пайшоў па тракце, стараючыся абмінаць вёскі і млыны, што віднеліся здалёк. На дарозе я спаткаў мужыка, які вёз у млын збожжа, і запытаў у яго, ці не на Раванічы гэтая дарога.

— Не, гэта на Забашавічы, а да Раваніч ідзе праз млыны.

Рабіць не было чаго, я мусіў ісці з мужыком і гутарыць з ім аб розных рэчах. Так я прайшоў праз вёску і млыны. Спадарожніцтва гэтага мужыка мяне, можа, уратавала, бо дзякуючы яму ніхто на мяне не звярнуў увагі. На змярканні я быў у Раванічах, дзе збочыў на цвінтар і пераначаваў у нішы касцёла. Назаўтра ж раніцою праз вёскі Дабаўручы, Лагі дабраўся да Мікуліч, дзе на цвінтары лёг адпачыць і заснуў. Тут мяне заўважылі мужыкі. Аднак мяне яны не чапалі, а сачылі здалёк і, відаць, не адступіліся б. Але паколькі я заблудзіўся, я вымушаны быў зноў вярнуцца ў Мікулічы, каб запытаць пра дарогу на Юравічы. Тут мужыкі ўсе разам мяне затрымалі. Я пачаў выкручвацца, гаворачы, што быў настаўнікам у аднаго з чыноўнікаў раваніцкай суконнай фабрыкі і іду да знаёмых у Юравічах. Мне паверылі і не толькі накармілі, але нават далі праваднікa, які вечарам давёў мяне да

Юравіч. Дзякуючы, такім чынам, хітрасці і ўвішнасці я выканаў дадзенае мне даручэнне і назаўтра раніцою ўручыў Свентарэцкаму прызначаныя яму лісты».

## III

*Злучэнне з Вярбіцкім. Бітва пад Пятровічамі. Каралішчавіцкія сяляне. Лёсы Канапацкага і Вярбіцкага. Група Ацыпы і Сніткі. Паражэнне пад Марціянаўкай.*

Канапацкі ў той жа самы дзень, калі выйшаў з групай з пуцічольскіх лясоў вечарам, на заходзе сонца, сустрэўся з Вярбіцкім пад вёскаю Пятровічы. Аб'яднаныя сілы мелі каля ста трыццаці адважных і добра ўзброеных чалавек. На ноч умовіліся выбраць бяспечнае месца і быць напагатове, бо салдаты сачылі за кожным крокам Вярбіцкага і маглі нечакана напасці. Група спынілася непадалёку ад Пятровіч на пагорку, зарослым лесам і акружаным вакол балотамі. Месца здавалася бяспечным, але не абышлося без трагічнай бітвы. Вайскоўцы пранюхалі прысутнасць паўстанцаў і пастанавілі ўдарыць па іх пераўзыходзячымі сіламі. Ноч прайшла спакойна. На варту было пастаўлена больш дзесяці партызанаў, а дзеля большай надзейнасці пасты змяняліся праз кожную гадзіну.

Назаўтра на ўзыходзе сонца партызанскі пікет заўважыў набліжэнне казакаў і батальёна салдат у баявой гатоўнасці. Забілі трывогу. Паўстанцы падрыхтаваліся да бою, пастроіўшыся ў карэ, і вельмі спакойна, калі вораг наблізіўся, адкрылі агонь. Засвісталі кулі, казацкія коні павярнулі назад, у вайсковых парадках адбылося замяшанне. Але праз некалькі хвілін салдаты прыйшлі ў сябе, пастроіліся ў баявыя парадкі, і завязалася бітва. Некалькі нашых было ранена, бой станавіўся ўсё больш зацяты, напружаны з абодвух бакоў і цягнуўся тры гадзіны. Камандзіры стараліся вывесці групу. Таму, забраўшы раненых, пачалі памалу ў парадку адступаць, адбіваючы агнём узводаў наступленне ўрадавага войска. Бачачы

гэта, салдацкі ар'ергард абышоў партызанаў з тылу, чаго камандзіры не чакалі. У гэтым іх віна была немалая. Група, акружаная ворагам, вымушана была рассыпацца. Многіх узялі ў палон, адзінкі здолелі прарвацца праз салдацкія рады і схавацца ў бліжэйшых лясах. Такая неасцярожнасць і нядбайства камандзіраў прывялі да незваротных страт. Са ста трыццаці паўстанцаў ледзь дзевяноста засталося. З іх не ўсе дайшлі да галоўнага лагера, бо мужыкі і казакі даганялі іх па дарозе і пералавілі вельмі шмат.

Рэшткі групы, прабіраючыся праз глыбокія лясы, дабраліся да галоўнага камандзіра. Некаторыя ж з адбітай ахвотай, напалоханыя зведанай няўдачай, наважылі вярнуцца ў Мінск. Тут іх праследвала няшчасце. Сяляне, што вартавалі масты ў вёсцы Каралішчавічы, некаторых схапілі, сярод іх Фларыяна Міладоўскага, і адвезлі ўладам. Праз колькі дзён адзін з мінскіх ксяндзоў, канонік Казакевіч, прыехаў у Каралішчавіцкі касцёл і звярнуўся да парафіян з выдатнай казанню, у якой гарачымі, натхнёнымі словамі папракнуў людзей у здрадзе, назваўшы тых, хто меў да яе дачыненне, юдамі, якія за грошы не вагаючыся прадаюць ворагу братнюю кроў. У касцёле пачаўся плач і лямант, але гэта было запозненае шкадаванне, якое не магло выправіць лёс няшчаснай паствы. Адважнага ксяндза ўлады пакаралі высылкай у кляштар пры касцёле ўсіх святых у Вільні, дзе ён застаўся аж да смерці...

Не хочучы ідэалізаваць факты, я мушу тут дадаць, што колькасць асоб, выдаваных у рукі ўлад, проста зменшылася, калі паменшала за гэта ўзнагарода. Урад, а дакладней самаўладны Мураўёў-вешальнік, назначыў за кожнага дастаўленага паўстанца напачатку пяць рублёў, а затым тры рублі і ўрэшце знізіў аплату да сумы ў два польскія злоты. Таму спярша кінуліся на такі лёгкі шлях даходу і хапання па дарогах, нават па хатах, усякага, хто здаваўся падазроным, хоць на гэтае падозранне не было ніякіх падстаў. Здарылася нават такое, што, не ведаючы, з кім маюць справу, мужыкі ў Магілёўскай губерні злавілі на да-

розе князя Крапоткіна, які вяртаўся дамоў і даставілі яго губернатару.

Вяртаючыся да прадмета, ад якога я адхіліўся на хвіліну, каб даць уяўленне пра тагачасныя стасункі, якія ўскладнялі становішча паўстанцкіх рэштак, я павінен успомніць пра лес, што напаткаў камандзіраў групы пад Пятровічамі. Менавіта Вярбіцкі трапіў у палон і, паколаты штыхамі і казацкімі пікамі, быў адвезены ў Мінск, дзе на трэці дзень у турэмным шпіталі скончыў жыццё ў невыносных пакутах. Канапацкі ж, галодны і халодны, хаваўся на працягу ўсяго года ў лесе, названым Чорным Востравам. Не могучы трымацца далей, добраахвотна вярнуўся ў Мінск, гатовы да ўсяго, што яго напаткае. Сястра яго была настаўніцай у генерала Пузанава, заступніцтва якога паменшыла пакаранне Канапацкаму да ссылкі ў Цюмень. Праз колькі гадоў яму было дазволена вярнуцца ў Мінск. Тут палякі пастараліся знайсці для яго месца аканома ў Таварыстве дабрачыннасці, дзе ён заставаўся да скону.

На сумежжы Магілёўскай і Мінскай губерняў пад той жа самы час утварылася другая група пад камандаваннем Анцыпы і Сніткі. Пераправіўшыся на паромах праз Бярэзіну у мястэчку пад той жа назвай, яна падалася ў Юравіцкія лясы. Але ей шчасліва не вялося, таму што была высачана атрадам царскіх войск і разбіта ўшчэнт каля вёскі Марціянаўка. Снітка загінуў на месцы, Анцыпа ж трапіў у палон. Яго адвезлі ў Магілёў, дзе ён і быў расстраляны.

## IV

*Юравічы. Свентарэцкі. Ляскоўскі. Сумны выпадак на паштовай станцыі ў Лядах. Забалоцкі. Бітва пад Юравічамі. Варварства папа. Прасекі і паленне лясоў. Ляскоўскі прыводзіць групу. Узяцце ў палон генерала Грунта. Палітычная камісія.*

У Ігуменскім павеце, даўнейшым Мінскім ваяводстве, на дваццатай вярсце ад мястэчка Ігумена ляжыць вёска

Юравічы. За гэтай вёскай цягнуцца вялікія яловыя лясы, поўныя дзікіх звяроў і птушак У гэтых лясах была галоўная пазіцыя партызан Мінскага ваяводства. Гэта быў зборны пункт, да якога з усіх бакоў павінны былі сыходзіцца дробныя групы і там арганізоўвацца, каб у баявым парадку выступіць на абарону айчыны. З усіх ваколіц ваяводства сабралася болей за дзевяцьсот добра ўзброеных воінаў. Камандзірам над імі Нацыянальны камітэт паставіў Баляслава Свентарэцкага. Яшчэ ў першай палове мая, адвёзшы жонку і дзіця ў Парыж, ён вярнуўся ў родную вёску Багушэвічы, сабраў у сябе сялян і дробную шляхту, прачытаў ім маніфест Нацыянальнага камітэта пра дзейснае выступленне супраць царызму. У гэтым маніфесце было, між іншым, сказана пра вызваленне сялян і надзяленне іх зямлёй у выпадку, калі яны захочуць прыняць удзел у паўстанні. Мужыкі спакойна выслухалі адозву Нацыянальнага камітэта, але, будучы папярэджаныя папамі і царскімі чыноўнікамі, засталіся абыякавыя. Шляхта ж з запалам узялася за зброю. У гэты самы час прыбыло некалькі афіцэраў з Пецярбурга, навучаных ваеннай справе, каб кіраваць паўстаннем, прычым не абышлося без трагічнага сутыкнення. Адзін з афіцэраў, што вёз патрыятычныя пракламацыі, чакаў з канём на станцыі ў Лядах, непадалёку ад Ігумена. У гэты ж час над'ехаў у вайсковым мундзіры Станіслаў Ляскоўскі, афіцэр генеральнага штаба, арганізатар юравіцкай групы. Думаючы, што гэта пагоня, той афіцэр з Пецярбурга спаліў паперы і пакончыў самагубствам.

Баляслаў Свентарэцкі, зачытаўшы адозву Нацыянальнага камітэта, узяўся арганізоўваць групу, якая пачала называцца групай Свентарэцкага. Царскія ўлады са свайго боку таксама пачалі сцягваць войска адусюль: з Мінска, Бабруйска і Барысава сабралі каля пятнаццаці тысяч салдат разам з казакамі...

Дзесятага мая, а другой гадзіне па паўдні, у двух кіламетрах ад вёскі Юравічы распачалася бітва, якая цягнулася да сямі гадзін вечара. Каля дарогі, што ідзе праз

яловы лес з Юравіч да Мікуліч, пад прыкрыццем лесу паўкругам пастроіўся партызанскі атрад. Калі разведка данесла генералу Забалоцкаму, што паўстанцы стаяць лагерам пад Юравічамі, ён выслаў чатыры батальёны пяхоты і чатыры сотні казакаў па дарозе, што вяла з Юравіч да Мікуліч. Казакі ішлі паперадзе і пры першым залпе кінуліся назад, пакінуўшы больш дзесяці забітых на полі бою, пяхота ж вагалася, ці ісці ў глыбіню лесу. Тады адзін з афіцэраў, стаўшы наперадзе атрада, павёў яго ў атаку. Той афіцэр першы ўпаў ад кулі, а за ім амаль ці не ўвесь атрад. А хто застаўся, кінуўся назад. Тады ў бой уступіла большая колькасць салдат. Завязаўся крывавы бой, і паўстанцы вымушаны былі адступіць. Раненых і забітых з боку паўстанцаў было дваццаць чатыры, у праціўніка знішчаны амаль дзве роты. Свентарэцкі пасля гэтай бітвы перадаў камандаванне групай у рукі Ляскоўскага, а сам, пераапрануўшыся ў яўрэйскае адзенне, на фурманцы ад'ехаў у Мінск, а адтуль за мяжу. За яго галаву ўлады абяцалі пяць тысяч таму, хто яго зловіць. Само яго прозвішча такі вялікі наганяла на іх страх, што, калі аднойчы атрад казакаў прыбыў у маёнтак Іванаўскі па авёс для коней і аканом паклікаў рахункавода Свентарэцкага, казакі, пачуўшы гэтае імя, як мага паўскаквалі на коней і ўцяклі...

Імкнучыся ўшчэнт знішчыць групу Свентарэцкага і пазбавіць яе надзеі хоць дзе-небудзь схавацца, улады выкарыстоўвалі самыя разнастайныя сродкі. Напрыклад, загадвалі сялянам высякаць у лясах так званыя прасекі, гэта значыць дарогі па прамой лініі шырынёю на дваццаць метраў. Ссечаныя дрэвы адразу ж вывозілі за межы лесу, каб аблегчыць рух войску. У гушчарах каля дарог абсякаліся галіны, якія раслі нізка, каб ніводзін паўстанцкі ўцякач не мог схавацца ад вачэй сваіх праследнікаў. Ад таго, што лясы заставаліся адзіным сховам для партызанаў, іх пачалі падпальваць у розных месцах, каб, як гаварылі, выкурыць з іх палякаў. Палаючыя лясы ўяўлялі сабою прыгожы малюнак. Цэлыя ваколіцы ўсцілаліся

такім густым дымам, што нават сонца, пранікаючы праз яго тоўшчу, здавалася, набірае чырвоныя колеры,

Незалежна ад перашкод якія ставіліся царскім войскам на кожным кроку, Ляскоўскі, маючы даверааны яму атрад партызанаў, удала абмінаў пятнаццаць тысяч салдат і казакаў і здолеў правесці яго без аніякай сустрэчы з небяспекаю. Калі партызаны назаўтра пасля юравіцкай бітвы, блукаючы па лесе, здаралася, блудзілі ў зарасніках, Ляскоўскі загадаў усім несці ў руках запаленыя стэарынавыя свечкі, каб прасцей адзін аднаго маглі бачыць. Гэтая працэсія людзей з запаленымі свечкамі, якая цягнулася на фоне цёмнага бору, утварала дзіўна арыгінальны, дантаўскі амаль вобраз. Толькі не было каму дзівіцца, бо ўсіх вярэдзіла адзіная думка пра нядаўні бой і пра тое, як быць далей.

Праз колькі дзён паўстанцы выйшлі на дарогу паміж Ігуменам і вёскаю Дамавіцак і тут затрымалі генерала Грунта з суправаджальным эскортам казакаў. Генерал, прыведзены ў паўстанцкі лагер, мусіў прысягнуць, што ніколі супраць іх ваяваць не будзе. Пасля гэтага яго адпусцілі. І сапраўды, слова ён стрымаў, бо адразу ж падаў у адстаўку і выехаў на сваю радзіму

Тым часам на Ляскоўскага і яго атрад рабіліся сапраўдныя аблавы. Салдаты, адкрыўшы месца, дзе ён хаваўся, акружалі яго і, сціскаючы пастпова ланцуг, перакрывалі шлях да ўцёкаў. Аднак Ляскоўскі ўмеў так удала выкруціцца і пакінуць небяспечнае месца, што ўсе намаганні ворагаў загнаць яго з атрадам у расстаўленыя пасткі зводзіліся на нішто. Намаганні гэтыя рабіліся ўсё больш старанна, бо ўлады былі перакананы, што групай яшчэ камандуе Свентарэцкі. Мужыкі, бачачы, як неэнергічны камандзір змог столькі разоў пазбегнуць засады, свята верылі, што ў гэтым памагае нейкая нячыстая сіла.

Адначасна ўвесь край быў аб'яўлены на ваенным становішчы. З Пецярбурга прыбыла палітычная камісія, на чале якой стаялі так званыя дзеяцелі: генерал-губернатар Забалоцкі, абрусели ліцвін, пра якога мы гаварылі вышэй, Еўлеў, фон Братке, Крыжаноўскі, Русінаў і шмат

іншых. Арышты адбываліся адзін за адным, усе турмы былі перапоўнены паўстанцамі і падазронымі, не ашчаджалі тут ні кабет, ні дзяцей, а на каго падала падозранне ў спачуванні паўстанню, яго тут жа хапалі і саджалі ў турму. а пасля высылалі ў Сібір.

Тым часам, нягледзячы на цяжкія ўмовы і пастаянную небяспеку, Ляскоўскі некалькі месяцаў шчасліва праслізгваў паміж шэрагаў салдат. Бачачы, што набліжаецца зіма і што далей не зможа трымацца, ён аб'явіў усім сваім паплечнікам, што вырашыў прабірацца за мяжу, бо іншага выйсця не бачыць. Адны пагадзіліся таварышаваць свайму камандзіру, а другія наважыліся вярнуцца дахаты і аддацца на ласку ці няласку ўлад

У жніўні Ляскоўскі з малою жменькаю паўстанцаў пакінуў Літву а астатнія таварышы, не хочучы падзяляць яго далейшы лёс, або вярнуліся дахаты і былі арыштаваны, або бадзяліся па лясах ці пад чужым імем сталі фурманамі, лёкаямі і іншымі службоўцамі. Так скончылася паустанне, якое працягвалася ў Мінскім ваяводстве чатыры месяцы. Ахінула яно пакрывалам жалобы амаль усе шляхецкія дамы, бо не было сям'і, якая не аплаквала б хоць аднаго з сваіх членаў, што загінуў у паўстанні, быў пасаджаны ў турму, пакутаваў сярод ільдоў Сібіры ці ў капальнях Урала.

**Цішка Гартны**

# Каваль

Многа працы ў мяне —
Хоць ўсю пору працуй!
Грэй жалеза ў агне,
Вымай з горна і куй.

Молат важкі трымай
Над кавадлам якраз,
Знізу ўверх паднімай,
Зверху ўніз, раз у раз.

Адвярніся наспех,
Як сумееш урваць —
Не забыцца, каб мех
У свой час паддуваць.

Адно іскры ў бакі
І да верху лятуць,
Як паважна з рукі
Малаты важка б'юць.

Раз-другі, і сашнік
Можа ў поле ўжо браць
Гарацешны мужык
Сваю ніву араць.

Трэба шворан у воз —
Я згатую як след;
Абіць буксу калёс —
Я й да гэтага мэт.

Рукі знаюць настрой,
Молат ўслушны на мне,
На ўсё жыцце цяжкой
Працы хопіць ў мяне.

## Адвячоркам

Люблю сачыць, як дзень пагодлівы канае:
І шэрасць лёгкая пад горадам шумлівым
Памерна ў вуліцы глыбокія спадае,
А пад мурамі вісне дымам сівым.

Паветра ціхае паволі рэдне, стыне,
Выразней рэха гулкае ўтуруе;
Гудок фабрычны свіст зацяжны строма кіне,
Й працоўных натаўп рэзва, шумна зашнуруе.

Драты, што сеткамі крыжуюць вулкі, пляцы,
Губляюць ніткі доўгія ў прысценных цепях,
І пэнт нядаўны цяжкай творчай дзённай працы
Прымоўкне, стуліцца ў каменных цесных сценах.

Настрэчу ж месяцу блядому й зорак кучы
Агні электрыкі вакол з акон, з ліхтарань
Паднімуць ўверх прамень сярэбраны, бліскучы,
І зыкі выцісне дзяўчына на гітары...

Крыху пазней — і скрозь жыццё, як дым, знікае,
Адно з куткоў пачуеш парак шэпт шчаслівы...

Люблю сачыць, як дзень над горадам канае,
Летучы ціха к небу дымам лёгкім, сівым!

## Восень

З поўначы цёмнае, сіверу дальняга
Нудная восень прыйшла.
З поля убранага, з лугу зялёнага
Жыцце-красу прыняла.

Холадам, сцюжаю разам павеяла,
Смерць за сабой прынясла.
З дрэва прыбранага, лісцем адзетага,
Уборы сарвала, страсла.

Птушак міленькіх з краю радзімага
Ў вырай загнала ад нас;
Песні іх мілыя, дзіўна пяяныя
Ветрам заглушыла ўраз.

Ветрам, навеяным, з дальняга сівера,
Хмар прынясла за сабой,
Неба высокае, сінекрыштальнае
Усё спавіло туманом.

Восень ты нудная, восепь дажджлівая,
Ты немінуча ўсягды.
У сэрца балючае, ў душу сіротную
Многа ліеш ты нуды.

**Алесь Гурло**

* * *

Абнімаецца вецер з бярозай,
Абнімаецца, быццам каханак,
І ўцірае з вачэй яе слёзы,
Яны капаюць срэбрам на ганак.

Залацiста-ружовыя косы
Апусціла бяроза долу.
Многа думак навеяла восень —
І вясёлых і невясёлых.

Яна рада, што ў новым убранні
І што вецер больш неяк прыхільны,
А не рада, што золата ў твані
Рассыпаецца, мокне і стыне.

Ах, бяроза, бяроза-красуня!
Не сумуй па сваёй лістоце,
Бо твой сум адаб'ецца на струнах
І застыне ў маёй істоце.

# Я *вольна жыць хачу*

Змагацца я прывык... Жыццё — мая стыхія,
І з ранніх дзён вядома мне турма,
І дні вядомы мне, нявол́яю ліхія,
А шчасце — вораг мой: яго ў мяне няма!

За ім ганяюсь я, лаўлю яго вачамі,
І насустрэч я мыслямі лячу,
Не сплю, чакаючы, я цэлымі начамі,
Бо, — даўні раб, — я вольна жыць хачу!

Я прабаваў усё: ахвяры і маленні;
Не чуў іх Бог, не чуў і чалавек:
Заместа хлебных луст мне кідалі каменні...
Я кляў сябе і свой злашчасны век.

Бурліла кроў мая, мацнелі мае сілы,
Пуцінай барацьбы я шчасце стаў шукаць;
І што ж перада мной? Вялікі рад магілаў...
І мушу я між іх, бы ўкопаны, стаяць.

Наўкол ліецца кроў, наўкол людскія цені...
Як бы сшалелы, я не знаю, што рабіць.
А сонца кідае крывавыя праменні:
Куды ісці? Я вольна хачу жыць!..

**Канстанцыя Буйло**

# *Адна*

Адна, ізноў адна, як колас той у полі,
Не сцяты ў час жніва нагостраным сярпом,
Зламаны ветрамі гулячымі на волі
Між апусцелых ніў, спалосканых дагджом.

Адна, ізноў адна... Тужліва сэрца ные.
Наўкола пуста, глуш. Ноч цёмная стаіць.
А за акном віхор так жаласліва вые,
Як бы сканаць не мог, не хочучы больш жыць.

І сумна, сумна мне. Дзе ж той, каго любіла?
Дзе ж тыя, што мяне любілі так даўней?!.
Адны забыліся, другіх ўзяла магіла...
І жаль мне прошлых мар, шчаслівых шкода дней.

Адна, ізноў адна... А вецер думцы ўторыць,
І стогнамі мяне ўцяшае ён сваймі:
— Я — брат табе, я друг, — мне, стогнучы, гаворыць, —
Адзін нас ломіць боль — дык плачмо ж разам мы!..

## *Дзяўчына*

Ўжо свечка пагасла, ўжо ноч за акном...
Ў пасцелі мне душна, не спіцца...
О сон! Ты самкні мае вочы хутчэй,
Мо мілы сягоння прысніцца!

Гадзіны ідуць, я ў пасцелі ляжу,
І сон не смыкае мне вочы,
А месяц праз вокны лье свет залаты,
Малюнкамі сцены залоча...

Устану з пасцелі, акно адчыню, —
Мо вецер, што ў полі гуляе,
Мне скажа, што робіць мой мілы цяпер, —
Мяне, як даўней, ці кахае?..

У небе спакойна так зоркі дрыжаць,
А ветрык лісточкам шапоча;
Запеў салавей звонкай трэллю сваёй —
Заплача, то зноў зарагоча...

І ветрык, і зоркі, і месяца свет,
І звонкая трэль салаўіна,
Здаецца, што гэта гукае ўсё мне:
— Цябе ён кахае, дзяўчына...

А ночка халодна: ўжо чую, як мне
Дрыжанне пабегла па целе;
Іду ўжо, лажуся ў цёплай маёй,
І мяккай, і белай пасцелі...

............

Заснула дзяўчына, а месяца свет
На вочы і вусны лажыцца,

Праз сон штосьсмяецца дзяўчына мая:
Відаць, што ўжо мілы ёй сніцца.

«Люблю агонь, што нельга патушыць...»

Люблю агонь, што нельга патушыць,
Што свеціць іншым — непагасным бляскам.
Мне б верш такі, што можа доўга жыць,
Іскрыцца яркай цеплынёй і ласкай.

Іскрыцца думкай — светлай, як зара,
Натхненнем шчырым, сілаю вялікай,
Каб, трапіўшы да кожнага двара,
Ён мог людзей да будучыні клікаць.

**Цётка**

# **М***ае думкі*

Хацела б быць зярном пшаніцы,
Упасць на ніўкі вёскі,
Зазалаціцца, без мятліцы
Даць хлеб смачнейшы трошкі.
Хацела б быць я рэчкай быстрай,
Абегчы родны край!
Дзе напаіць, а дзе скупаць,
А дзе ўтуліцца ў гай,
То зашумець, то зашаптаць,
То спаць ў салодкім сне,
То зноў сарвацца, зноў гуляць,
Агнём кіпець у дне.
Ды так разгрэцца і спяніцца,
Каб ў неба хваляй здаць,
Украсці сонца, зноў спусціцца
Й больш света людзям даць.
Прыгарнуць усё ў дарозе,
Каплю шчасця, долі ўліць,
Думаць ўсюды аб народзе,
Родны край усюды сніць,
То рассыпацца расою
Па галінках, па лісткох,
То абняцца так з зямлёю,
Каб ніхто разняць не мог!

Альбо ветрам абярнуся
Ды над светам пралячу,
Цёмным віхрам закручуся,
Уверх на месяц заскачу.
З усёй сілы і размаху,
Як крэсівам, ў звёзды дам,
Сыпне іскраў сноп ад страху,
Задрыжыць аж месяц сам:
«Хто ты, скуль ты, чаго хочаш,
Чаго выеш і шуміш?
То праз слёзы нам рагочаш,
То гарыш весь і дрыжыш?»
— Я — пасланец, вецер буйны,
Прыляцеў на суд вас зваць!
У нас цёмна, край наш хмурны,
Ад цямноты людзі спяць.
Я там біўся, я там віўся,
Я ім хаты паламаў,
А ўсё ж такі не дабіўся,
Каб народ свой голас даў!..

## *Суседзям у няволі*

Ад сваіх хат, ад сваіх ніў,
Ад усіх братоў, хто толькі жыў,
Нясу слязу, нясу я стогн,
Нясу нагаек царскіх звон.
У нас там ноч, у нас там стук,
Мы ацямнелі з страшных мук,
З нас пот ліецца, сохнуць грудзі.
Нас катуюць! Чуйце, людзі!
Чуйце, чуйце, руку дайце!
Мы вам родны. Праўду знайце:
Ці у долі, ці ў нядолі —
З вамі станем ў адным полі,

Рука ў руку з вашым братам,
За свабоду перад катам.

## Вера беларуса

Веру, братцы: людзьмі станем,
Хутка скончым мы свой сон;
На свет божы шырэй глянем,
Век напіша вам закон.
Не чарнілам на паперу,
Дзесь ў архівы не здае, —
Ён збірае поту меру
І на ніву нашу лье.
Землю поіць — яна родзе
Сок ў зярнятах нам на хлеб.
Спажываем, а ў народзе
Штось як шэпча: «Ўставай, слеп!»
Веру, братцы, ў нашу сілу,
Веру ў волі нашай гарт:
Чую агонь ў нас — не брыну,
Бачу, братцы, мы не з карт,
Мы не з гіпсу, мы — з камення,
Мы — з жалеза, мы — са сталі,
Нас кавалі у пламенні,
Каб мацнейшымі мы сталі.
Цяпер, братцы, мы з граніту,
Душа наша з дынаміту,
Рука цвёрда, грудзь акута,
Пара, братцы, парваць пута!

# **М***ора*

*Рэвалюцыя народная*

Не такое цяпер мора,
На такі у хвалях шум:
Цяпер бурна, страшна мора!
Хваля поўна дзікіх дум.

Мора вуглем цяпер стала,
Мора з дна цяпер гарыць,
Мора скалы пазрывала,
Мора хоча горы змыць.

Мора злуе, крэпнуць хвілі,
З дзікім шумам бераг рвуць,
Гром грыміць ў сіняй далі,
З мора брызгі ў неба б'юць.

Месцам хваля стогнам рыкне,
Месцам плач сарвецца з губ,
Месцам бераг болем ікне,
Гром грыміць у тысяч труб.

Мора зброіцца палкамі,
Шум русалак разбудзіў,
Запаліўся смок агнямі,
Неба чорны гнеў пакрыў.

Бог сярчае: злая бура
Псуе вельмі святы сон.
Б'ецца, рвецца ўся натура,
Аж дрыжыць нябесны трон.

Трон дрыжыць, не спяць прарокі,
Бог склікае святы сход;

А там радзяць, што аблокі
Мусяць штурм пусціць у ход.

Бой пачаўся. Войска бога
Залпам паліць ў горды хвіль...
Мільён згіне, — нова змога
Расце крэпка праз сто міль.

Растуць сілы мора злога,
У размаху відзен гарт;
Не адступяць войскі бога...
Бой пачаўся не на жарт.

Такі бой вякамі жджэцца,
Такі бой гігантаў дасць,
Ў такім баю толькі грэцца,
Ў такім баю толькі пасць.

**Ядвігін Ш.**

# *Дуб-дзядуля*

Амаль не ўся вёска зайздросціла мне майго надзела. Шнур быў, праўду кажучы, ані большы, ані выгаднейшы, ані зямліца на ім не лепшая, — можа нават горшая, бо пры канцы шнура была страшэнная гара, дзе апроч грэчкі ды ярыцы нічога не радзіла, але на самым версе гэтай гары рос такі дуб, што аж дзіўіўся народ: веліч, таўшчыня, а сукі так разрасліся, што, здавалася, свет бы пад сябе хацеў падгарнуць.

З давён-даўна ўсе звалі яго: дуб-дзядуля.

Дык вот паслухайце, што мне пад гэтым дубам здарылася.

Раз улетку, ад цёмнага напрацаваўшыся, што аж пот з мяне цурком каціў, губы пасмяглі, босыя ногі да крыві патрэскаліся, — зацягнуўся я неяк на гару да свайго дзядулі — аддыхнуць у яго цяні. Толькі прылажыўся гэта я, уздыхнуў раз, другі і пачынаю драмаць... Ажно чую: не то над галавой, не то пад галавой нехта таксама два разы ўздыхнуў... Стаў я прыслухвацца: яшчэ і яшчэ ўздыхае, але так цяжка ўздыхае, што аж за сэрца бярэ, немаль стогне... Паражагнацца хачу — рукі падняць не магу!.. Струхлеў я — ляжу, чакаю, што будзе. Аж тут нехта ў вуха маё шэпча:

— Не бойся, не пужайся, дзіцятка ты маё, не пужайся: я гэтак дышу, я гэтак уздыхаю, я — твой дубочак старэнькі...

— Божа моцны!.. Што ты, дзядулька, як жа гэта можа быць, каб дрэва ўздыхала ды гаварыла? — пытаю ўжо смялей.

— Эх, дзіцятка, дзіцятка, — зноў шэпча мне на вуха, — шмат чаго ты яшчэ не ведаеш, шмат чаго не разумееш, але люблю я цябе, шчыра люблю, як любіў тваіх бацькоў, дзядоў ды прадзедаў, бо не зазнаў ніколі крыўды ад вас, а толькі векі пашанасць меў... Пара прыходзіць, дзіцятка ты маё, пара прыходзіць сказаць, адкрыць табе такое, чаго нікому яшчэ не гаварыў... Але пакляніся, што споўніш маё апошняе жаданне!

— Клянуся, дзядулька, клянуся, родненькі, споўню, усё споўню, — зноў, дрыжучы ўвесь, адказваю.

— Слухай жа! — кажа дуб-дзядуля. — Адкуль я тут узяўся і калі радзіўся, ніхто, ды і я сам добра не ведаю. Помню толькі — з малалецтва жылося нішто, суседства шмат меў: сваёй радні — цэлыя ваколіцы, — хлопцы адзін у адзін — дужыя, здаровыя; а тут да кампаніі зграбныя елачкі, — хоць сварлівыя, але сэрца добрага, — сасонкі. Міргнеш ім, бывала, жалудком, а яны табе шышкай у бок... А асінкі-пашаптушкі? Кіўні толькі ён галінай (бо дубу не след кланяцца асіне!), а яна, як тая сарамлівая панначка, затрасецца ўся і лісточкамі цябе абсыпе... От, ведама, забаўляліся, як умелі... Але што гэта ўспамінаць? Ляцелі годы, як вашы ляцяць дні, змяніліся вякі, як вашы годы, — а я стаяў і рос, рос і стаяў — крапчэў... Зрываліся не раз буры, — як пад тапаром, шмат нашых клалася, але тыя, што аставаліся, — яшчэ вышэй падымаліся; находзілі навальніцы, — гінулі тыя, што ў неба глядзелі, а знізу падымалася маладзёж; палятала свежага насення, і ўзрасталі суседзі невядомыя, незнаёмыя... Так вякі ішлі, аж мінула ўсё, — аж прыйшло і на тое, што з тутэйшых даўнейшых астаўся, як відзіш, адзін я. Праўда, вось глянь на захад: бачыш цёмную паласу? Але што гэта за лес? Хударлявы, крывы, увесь у суках — гніль нейкая, дый толькі. Глянь на ўсход, — прыслухайся да шуму гэнага лесу... Чуў ты калі шум здаровага, крэпкага дрэва? — не, не! не гэтак шуміць здаровы лес! А чаму ён так

шуміць? — бо змарыўся, ніколі перадышкі не мае, гэтак і згінуць мусіць... Паглядзі на поўнач: — ці бачыў ты калі такое дзіва? Такі гонкі, такі крэпкі здалёку выдае лес, а ўважай, як яго гайдае ва ўсе бакі, то да зямлі прыгне, то крыху адпусце, — здаецца, і вецер невялікі, а пень выпрастацца не можа. Цяпер глянь на мяне: пастухі бок асмалілі, людзі кару аскрэблі, колькі-то сукоў павыразалі? Лісты, жалуды — і тыя штогод падбіраюць; — усё, каб толькі сабе карысць мець; а ці падумалі, што стары ўжо я, пакалечаны, веку дажываю, а ніводзін жалудок мой не ўзрос... Сохну ўжо я. Каб хоць два, каб хоць год далі вы мне засілку — вадзіцы чыстай, здаровай, — можа б я вам памятку пакінуў: новае пакаленне. Прысягнуў ты, дзіцятка, — дык дабудзь жа ты мне цяпер гэткай вадзіцы, пашукай, прынясі, карэньчыкі мае бедныя падлі...

— Добра, — кажу, — дзядулька, добра, будзь спакоен: дастану, прынясу — хіба згіну!..

Бег я, змарыўся, — ужо і самому піць зажадалася. Цямнець стала, а вады як не відаць, так не відаць. Бачу, нейкая кабеціна — старэнькая, худзенькая — прыгаршчамі зямлю носіць.

— Ці не ведаеш, бабулька, дзе тут блізка вады дастаць? — пытаю.

— Хадзі за мной, сыночак, пакажу табе цэлае возера.

Уцешыўся я. Пайшлі, па дарозе пытаю:

— Адкуль ты, бабулька, і як завешся?

— Тутэйшая, — кажа, — а завуся Праца, сынок, Праца.

Дзіўнае, думаю, прозвішча. Прыйшлі да возера, — вялікае, што вокам не сцягнеш, і хоць вада мутная, брудная, — кінуўся я піць. Хлебануў раз — што гэта? Вада не вада, хоць смак і знаны. Ага, успомніў я, як напрацуешся ды пот, цякучы па брудным твары, пападзе ў рот, — от якраз гэтакі смак! Пытаю бабулькі:

— Праўда, сынку, праўда: пот. Паўнюсенькае возера людскога поту...

— А нашто ж ты зямлю прыгаршчамі носіш ды кідаеш у гэтае возера? — пытаю.

— Глыбокае яно без канца, а трэба, каб заўсёды было поўнае: дык вось, як засыплю яго зямліцай, тады і поту мала трэба будзе людзям ліць.

Здзівіўся я, але не было калі распытвацца, і пабег далей. Бег я, бег, — бачу зноў возера — больш за першае, але вадзіца ў ім такая чыстая, што аж свеціцца. Прыпаў я, хлебануў — горкая, але то такая горкая, што піць нельга! Прыйшло мне на памяць, як аднаго года апошнюю скацінку з хлева вывелі... Скацілася тады слязінка і ў рот мне папала... от якраз гэтакі смак!.. Бачу, старушка нада мной стаіць.

— Хто ты? — пытаю.

— Бяда, сынку, Бяда. Не пі, сыночку, гэтай вадзіцы, не пі: досі ты яе ўжо напіўся...

— А што ж ты тут робіш? — пытаю.

— Глянь, унь, на катлы вялікія, пад імі заўсёды агонь гарыць. Дзень і ноч наліваю я ў іх з гэтага возера поўна слёз людскіх і грэю, каб высахлі, аж пакуль усё гэта возера не высушу, аж пакуль пара ад іх не падымецца аж да неба!..

Здзівіўся я, але памчаў далей. Спатыкаю ізноў старэнькую кабеціну, — палівае яна зямлю з конаўкі.

— Дай, бабулька, напіцца, — прашу яе.

— Ідзі, — кажа, — да возера.

Падбягаю, — бачу: поўнае яно не вады, але віна чырвонага... Прыпаў, хлебануў... «Божа! — крыкнуў я са страху, — помню, помню гэтае віно: у губах яго было поўна, вочы ім заліты... помню яго! Але ж гэта не віно, але кроў! Людская кроў!..»

— Праўда, — кажа старушка, стоячы нада мной, — праўда, сыночку, людская гэта кроў, і вось мушу ўсё гэта возера конаўкай вынесці і ўсю зямліцу паліць!..

— Хто ж ты? — пытаю.

— Цярпенне, — ціханька адказала бабулька.

Без аглядкі кінуўся я ад гэтага страшэннага месца. Чую: у старане недзе бурчыць, пераліваецца, бяжыць, нібы, скажам, ручаёчак жывенькай вадзіцы. Я туды шукаць, аж тут — калі блісне, трэсне, заляскае, — здалося, увесь свет задрыжаў!

Усхапіўся я, вочы праціраю, не магу да сябе прыйсці... Не чуў я, як бура найшла, як перуны сталі біць, пакуль не дабраліся да майго дзядулі, пад каторым я так моцна спаў... Працёр вочы, сон свой страшны ўспомніў, закалаціўся ўвесь, зуб на зуб не пападае... Гляджу: дзядулька мой бедненькі ляжыць ціханька на баку...

З таго часу прайшло некалькі год. Ляжыць дзядуля на сваім месцы (сукі толькі паабразалі), а з-пад яго вылезлі тры, хоць яшчэ цененькія, але гладкія, роўныя дубочкі...

## Бярозка

Даждаўся Лявон, што яго пацеха Марыська выцягнулася ўгару, як тая маладая, гладкая бярозка. Ад хлапцоў адбою не было, і хоць сэрца кроўю аблівалася, а пара падышла замуж аддаваць.

Справіў Лявон вяселле як мае быць: каб у сэрцы дзіцячым на доўгія годы добрая памятка асталася і каб перад людзьмі сораму не было; але, як прыйшлося расставацца з дачушкай, сплакаўся, бедны, як бобр: быццам чуяла сэрца нешта нядобрае. Ён і кажа ёй на апошнім адвітанні:

— Слухай, пацеха мая, адну цябе толькі я маю і адну табе толькі даю раду: калі цябе прыцісне горкая доля, калі табе будзе вельмі цяжка жыць, што і змогі не будзе вытрываць, не жалься нікому-нікому, хіба знойдзеш такую спрыяючую верную душу, як спрыяла і верная была для цябе душа твайго бацькі; не знойдзеш — ідзі лепш у лес, выберы, каторае табе спадабаецца, дрэва і яму, толькі яму аднаму, маё ты дзіцятка, душу сваю адкрывай, жаль свой вылівай...

Прайшло нямала часу. Паехаў Лявон дачкі даведацца. Вылецела Марыська з хаты, кінулася бацьку да кален; прыпала пасля галоўкай да грудзей бацькавых, але ўскорасці, як бы засаромеўшыся, адскочыла, спусціла вочкі і стаіць, уся збялеўшая, толькі губкі дрыжаць...

Доўга Лявон моўчкі ўглядаўся на сваю пацеху, а пасля памалу падышоў да яе і глухім, быццам не сваім голасам стаў дапытваць:

— Цяжка?

— Ой, цяжка, татачка! — уздыхнуўшы, адказала дачка.

— Жалілася?

— Жалілася, — вышаптала Марыська.

— Каму?

— Бярозцы.

— А больш?

— Не знайшла каму.

— Нясі сякеру, пакажы мне гэтае дрэва.

Хістаючыся, як маладая ад буры бярозка, ішла наперадзе Марыся, а за ёй, як хмара, сумны ішоў з сякерай Лявон...

— Вось тая, на ўзгорку, — здалёк паказвала рукой Марыся. — Ой, татачка, — жалілася яна, — якая гэта была пекная бярозка, якая гладкая! Якія пекныя былі на ёй галінкі, а на галінках паўнюсенька зялёненькіх бліскучых лісточкаў!.. Лявон маўчаў.

— ...Татачка! што ёй зрабілася? Гэта ж цяпер лета... Чаму яна ўчарнела? Чаму здрабнела?

Лявон маўчаў.

— ... Чаму жаўцеюць галінкі свае яна ўніз апусціла, быццам яны плачуць?.. Я так любіла, а яна ўмір...

Не паспела слова скончыць Марыся, як цяжка грукнуў па дрэве абух... Як падстрэленая птушка, скокнула яна і схапіла за руку старога:

— Татачка, не чапай!! Не чапай, родненькі мой! — прасіла Марыся. — Баліць... баліць...

Але Лявон, нічога не кажучы, ізноў стукнуў абухом па дрэве; рэха не адазвалася — стук быў глухі, як бы гэта не па дрэве, а па зямлі стукаў... Марыська стаяла воддаль, заламаўшы рукі, і глядзела быццам на нешта вельмі страшнае, толькі з вачэй яе сыпаліся адна за адной слязінкі, як сыпаліся пажоўклыя лісточкі з здрыгануўшайся пад абухом бярэзіны... Лявон нагнуўся, абчасаў каля пня кару і, адагнуўшыся, са ўсяго маху запусціў сякеру ў бярозу і,

павярнуўшы тапарышча набок, адшчапіў вялікую трэску. Дрэва заскрыпела, запішчала, быццам стала жаліцца, як тое дзіця... а з-пад Лявонавай сякеры шчэпкі ляцелі і ляцелі...

Але нядоўга яму прыйшлося працаваць: нагнуўся Лявон, глянуў на падсечанае месца, ткнуў туды тапарышчам і, адагнуўшыся, глыбока-глыбока ўздыхнуў...

— Марыська, дзіцятка маё, — дрыжачым голасам пачаў Лявон, — бачыш? Гэта ж тут усяго на палец абалоні! А там — там парахня, адна парахня!.. А ведаеш чаму, гаротніца ты мая? Ведаеш? Гэта ж твой боль, гэта ж твой жаль спарахнілі гэту бярозку, — бо ты доляй сваёй жалілася ёй. Дрэва і то спужалася такой долі... Умірае гэта бярозка, умірае без пары, бо кожны раз, як ты прыходзіла жаліцца, ёй было штораз цяжэй, а ты, маё гаротнае дзіця, успомні, ты тады мела хвіліны, падобныя да шчасця...

І Лявон, узяўшы рукамі галоўку сваёй пацехі, моцна прыціснуў да сябе, а Марыська, тулячыся да бацькавых грудзей, прашаптала:

— Татачка, а чаму паміж людзей я не знайшла, каму пажаліцца?

Лявон маўчаў.

**Алесь Гарун**

# *Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...*

У чатырохлецце
«Н[аша]е нівы»

Ты, мой брат, каго зваць Беларусам,
Роднай мовы сваёй не цурайся;
Як не зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся.

Ад дзядоў і ад прадзедаў, браце,
Гэты скарб нам адзін захаваўся,
У сялянскай аграбленай хаце
Толькі ён незабраны астаўся.

Ў старыну Беларус, не падданы,
Гаспадарыў, быў сам над сабою
І далёка у свеце быў знаны
За літоўскай і ляшскай зямлёю.

Але час прамінуў, і нядоля
На народ, як бы камень, звалілась,
Беларуская слава і воля
Адышла, адцвіла, закацілась.

Не змяняючы шэрай апраткі,
Працаваў ты, як вол, гаратліва,
А у хаце тваёй недастаткі,
А на ніве тваёй неўрадліва.

А чаму? Ты не здольны, ці хворы,
Ці благі гаспадар, ці п'яніца?
Мусіць, не! Бо і іншым у пору
У цябе гаспадарыць паўчыцца.

Светлы розум твой, брат, але дзетак
Ад цябе, як і ўсё, адбіралі
І на бацькаўскі родны палетак
Працаваць-памагаць не пушчалі.

Хто хацеў, той і смеў рабаваці,
Без прыпросу з'язджаліся госці —
Абдзіраць, аб'ядаць, апіваці
І крышыць гаспадарскія косці.

Можа б, ты і памёр і загінуў,
Каб не вешчая мова Баяна.
Хто ж быў добры, яе хоць пакінуў?
Як жа так, што яшчэ не забрана?

Бо што бачылі госцікі-герцы![1] —
І зямлю, і лясы, і кілімы, —
Ўсё забралі. А мову у сэрцы,
Ў сваім сэрцы хавалі-няслі мы.

Дык шануй, Беларус, сваю мову —
Гэта скарб нам на вечныя годы;
За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацця-народы!

[1] Герцы — махляры, марнатраўцы.

# Ідуць гады

Ідуць сабе гады, ідуць,
Бы карагод, бясконца,
Што ў небе зорачкі вядуць
Ля месяца, ля сонца.
Ідуць сабе гады, ідуць —
І чалавек за імі.
Куды цябе яны вядуць
І сцежкамі якімі?

«Няведама мне, скуль усё і што я;
Няведама мне сама сцежка мая,
Няведама мне, і куды я іду.
Пытання не маю, ці што там знайду,
Ня ведаю жыццё, ці шчасце, ці не, —
Пачалося гэта, браток, не на мне».

Ідуць гады, ідуць гады,
І з імі ўсё на свеце.
Сягоння ты, а йшлі дзяды,
А заўтра пойдуць дзеці.
Ідуць гады, і ты ідзеш
Ўздагонь за імі, з імі.
Нашто, скажы мне, ты жывеш
І з думкамі якімі?

«З адною я думкай у свеце жыву,
Настаўнікам ўзяўшы і лес і траву,
Крыніцы, і кветкі, і цемру, і свет,
І месяц, і зоры, і сонца прывет.
Прысуджаны шлях свой рабі дарагім,
Красуйся на радасць сябе і другім».

## Паэту

Што кажаш мне, паэт, а праўдзе той, што будзе?
Мне сэрца кроіцца ад крыўды нашых дзён!
А бачу добра й сам: ідуць да праўды людзі,
Расцець яе жаўнер, і шырыцца загон
Марудна, братачка! І покуль сонца ўзыдзе,
Дык вочы выесць нам салёная раса,
І покуль першы дзень людскога шчасця прыйдзе,
Мільёны сэрц праткне гароты злой каса.

Пакінь, пакінь спяваць а праўдзе той, што ў небе!
Яна чужая нам, таемных праўда сіл;
Яна не сходзіць к нам ў канечнае патрэбе,
Калі пакуты дзень так довег і не міл!

Прашу цябе, мой брат, спявай аб нашым горы,
Аб тым, што ёсць цяпер і што даўней было,
І што на ўсякі твар кладзець, як плуг, разоры,
І што ў мільёнах душ разоры правяло.
Прашу цябе, спявай аб горы песнь адну ты
І наш гаротны лёс рабі яшчэ цяжэй,
Тагды, убачыш сам, парвуцца духа путы
І будзе ясны дзень да нас тагды бліжэй.

## Жыццё

Жыццё — гасцінец, гады — як вёрсты,
Канец жыццёвы — то небаспад.
Ідзеш паволі, што далей — болей
Тых вёрст жыццёвых цячэць назад.
Што далей — болей... Сціха, паволі
Старэеш, слабнеш, цяжэеш ты,
Аж ўрэшце ледзьве нагі абедзве

Дацягнеш неяк да той вярсты,
Дзе гэным знакам, што ўсім аднакаў,
Ці хто ялмужнік, ці хто купец,
На страх выразна, для ўсіх паказна
Стаіць: «Спыніся, вось твой канец!»

## **У** *прыпар*

Прыпарыла,
Нахмарыла
І ўдарыла!
— Святы Ілля...
Маланка ўраз з'явілася,
Мільгнула і звалілася,
І дожджыкам аблілася
Гарачая зямля.
Кроплі разам, згодна, жвава
Пояць ўсё, што хоча піць:
Збожжа, дрэвы, кветкі, травы,
Вулкі хочуць затапіць,
Б'юць у стрэхі, мыюць шыбы,
Мыюць хаты, мочуць сад,
Ў рэчцы спожыў маюць рыбы...
— Хто ў прыпар дажджу не рад?
Сцішаецца,
Змяншаецца,
Ўнімаецца.
— Няма!
І слонка паказалася,
Маўляў, само купалася;
Прыемна усміхаецца,
Блішчыць, пераліваецца,
Яскрава адбіваецца
На траўцы, на лісточку,
У рэчцы, ў раўчачочку,

На вулачцы, ў садочку,
Зямля ўздыхае поўнымі,
Шчаслівымі, чароўнымі
Грудзямі усіма.

## Мяцеліца

Ой, спаліце, перуны,
Майго Янку, бо дурны!
Назаляе толькі мне,
А каб сватацца, дык не!

Я казала, дый не раз:
Прысылай сватоў да нас;
Татка добры, ён аддасць,
У пасаг — цялушку дасць.

А той Янка, той благі,
Ўсё смяецца — «гі-гі-гі!»
Да таго ж часамі кпіць:
«Ну, чаго табе карціць?»

Ой, праліцеся, дажджы,
А ты, Янанка, пажджы:
Учыню табе бяду,
За нікога не пайду!

## Малітва

Я бачыў: Сын Яго стаяў
На пушчы і маліўся
І словы ў гневе прамаўляў,
А твар слязьмі абліўся.

— Ах, дай мне, Ойча, моцных слоў!
Маланак слоў палючых,
Бо кроў мая сачыцца зноў
Із ранаў тых балючых...
Дзівіся, Пане, слабы я,
Саўсім не маю сілы;
Гарыць, баліць душа мая, —
О, дай жа моцы, Мілы!
Паглянь: паўсюдах з краю ў край
Рабунак, глуз пануюць,
І льецца смех тых чорных зграй,
І ўсё з зямлёй раўнуюць.
Зірні: дзе пекнасць тая, што
Надаў нам, Міласцівы?
Тваіх правоў трымае хто,
Братэрства, згоды хцівы?
Схініся к нам Ты і абач:
З гадзінай горш жывецца,
Цяжэе боль, мацнее плач,
Галоў ўсё болі гнецца.
Паслухай ноччу, ўдзень, Святы,
Скажы маўчаці звонам, —
І колькі жальб пачуеш Ты!
Зямля азвецца стогнам...
Узглянь: навокал чорны свет,
Прыцьмена праўды слонца,
Надзеі ў людзях болей нет, —
Пашлі ж ім Абаронца!
Ах, дай мне, Божа, гэткіх слоў,
Зямля б ад іх траслася!..
Баляць бо раны мае зноў,
І кроў з іх палілася...
Пашлю тады маланкі ў люд,
Ў бясшчасны той брадзіці,
Блішчэць, яскравець там і тут,
Праўдзівы гнеў будзіці.
Мільёны кіну перуноў

У тых, каго я знаю,
У тых, маю што сочуць кроў,
У тую чорну зграю.
Тагды ізноў, як колькі раз
На свеце ўжо бывала,
Настане Твой вялікі час,
Твая засвеціць хвала.
Малюся ж, — дай мне гэтых слоў!
Сцаліш мяне, паможаш;
Гарыць душа, баліць ізноў...
Вялікі! дай, як можаш!

# Змест

Энеіда навыварат ... 3
**Адам Міцкевіч**
Гражына *(Літоўская аповесць)* ... 14
**Ян Баршчэўскі**
Шляхціц Завальня ... 49
Белая сарока ... 55
Плачка ... 66
Сын буры ... 76
**Канстанцін Вераніцын**
Тарас на Парнасе ... 80
**Тарас Шаўчэнка**
Думка ... 91
«Садок вішнёвы каля хаты...» ... 92
Цары *(Паэма)* ... 93
**Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч**
Пінская шляхта ... 101
**Альгерд Абуховіч**
Ваўкалак ... 125
Воўк і лісіца ... 126
Старшына ... 127
Суд ... 128
**Кастусь Каліноўскі**
«Марыська чарнаброва, галубка мая...» ... 129
Пісьмо з-пад шыбеніцы ... 130
Газета «Мужыцкая праўда», №2 ... 130
**Францішак Багушэвіч**
Прадмова да зборніка «Дудка беларуская» ... 133
Прадмова да зборніка «Смык беларускі» ... 135
Мая дудка ... 136
Ахвяра ... 139
Хмаркі ... 140

Бог не роўна дзеле .......... 140
Мая хата .......... 142
Быў у чысцы! .......... 143
Калыханка .......... 147
Кепска будзе! *(Паэма)* .......... 148
**Адам Гурыновіч**
«Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею» .......... 162
**Янка Лучына**
Роднай старонцы .......... 163
Паляўнічыя акварэлькі з Палесся *(Паэма)* .......... 164
Старасць не радасць .......... 217
З крывавых дзён .......... 219
**Цішка Гартны**
Каваль .......... 242
Адвячоркам .......... 243
Восень .......... 244
**Алесь Гурло**
«Абнімаецца вецер з бярозай...» .......... 245
Я вольна жыць хачу .......... 246
**Канстанцыя Буйло**
Адна .......... 247
Дзяўчына .......... 248
**Цётка**
Мае думкі .......... 250
Суседзям у няволі .......... 251
Вера беларуса .......... 252
Мора .......... 253
**Ядвігін Ш.**
Дуб-дзядуля .......... 255
Бярозка .......... 259
**Алесь Гарун**
Ты, мой брат, каго зваць Беларусам .......... 262
Ідуць гады .......... 264
Паэту .......... 265
Жыццё .......... 265
У прыпар .......... 266
Мяцеліца .......... 267
Малітва .......... 267

Літаратурна-мастацкае выданне

Школьная бібліятэка

# РОДНАЙ СТАРОНЦЫ

Зборнік твораў канца XVIII — пачатку XX ст.

Укладальнік
**Рослік** Таццяна Фёдараўна

Мастацкае афармленне І.А. Грынь
Камп'ютарная вёрстка М.Э. Малярэвіч
Карэктар В.А. Кульбіцкая

Падпісана да друку 16. 07. 2012
Фармат 60 × 90 1/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Гарнітура Гарамонд.
Ум. друк. арк. 17,0. Ул.-выд. арк. 12,4.
Тыраж 19 854 экз. Заказ 247.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494061 ад 03.02.2009.
Зав. Калініна, 16, 220012, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
ЛП 02330/0150496 ад 11.03.2009
Вул. Каржанеўскага, 20,
220024, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Школьная бібліятэка



# Роднай старонцы

Гісторыя літаратуры як арганічная частка нацыянальнай культуры, раскрываючы мастацкія багацці мінулага, дапамагае глыбей пазнаць народ і ўключыць лепшае з літаратурнай спадчыны ў наш духоўны актыў, зрабіць яго фактарам сучаснага культурна-гістарычнага працэсу, эфектыўным сродкам ідэйна-патрыятычнага, маральнага і эстэтычнага выхавання сучаснікаў, узбагачэння і ўдасканалення культуры.

А.Чамярыцкі

ISBN 978-985-11-0648-2
9 789851 106482

*Школьная бібліятэка*



# Роднай старонцы